

Уладзімір ПЕЦЮКЕВІЧ

# Узняўся белы птах

**УЛАДЗІМІР ПЕЦЮКЕВІЧ**

# УЗНЯЎСЯ БЕЛЫ ПТАХ

*ПЕСНІ*
*ВЕРШЫ*
*БАЛАДЫ*

Вілня, 2004

ISBN 9955-578-01-7
UDK 882.6-1
Пе 23

*Светлай Памяці дзядзькі*
*Мар'яна Пецюкевіча*
*прысвячаю.*

Тэкст апрацаваны і падрыхтаваны да друку рэдактарам Леакадзіей Мілаш.

Мастацкае афармленне Ігара Гардзіёнка і Вольгі Гардзіёнак - Кірэевай.

Дызайн вокладкі Алега Глекава.

Набор і вёрстка Дзмітрыя Даўгалёва.

Выдавецтва Таварыства Беларускай Культуры ў Літве.

Уладзімір Пецюкевіч нарадзіўся 1 сакавіка 1943 г. у маляўнічым азёрным куточку Беларусі - на Браслаўшчыне, у вёсцы Цяцеркі, Віцебскай вобл. Бацька яго ваяваў на Прыбалтыйскім фронце і загінуў у 1944 годзе, баронячы Радзіму ад ворожага нашэсця. Ці не таму нямала вершаў у паэта на тэму вайны і нялёгкага пасляваеннага жыцця, пра горкую ўдавіную долю маці.

Ул. Пецюкевіч закончыў Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Працаваў у будаўніча-мантажным упраўленні №7 трэста "Энергабудмантаж", а пасля ў Беларускім Дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. Выступае ў друку з 1975 г. Падборкі яго вершаў уключаны ў калектыўны зборнік "Лагодны промень раніцы" (1988) і "Браслаўшчына азёрная мая" (1998) Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1996 г.



Ул. Пецюкевіч, 2003 г.

Сваім духоўным бацькам Ул. Пецюкевіч лічыць святой Памяці, дзядзьку Мар'яна Пецюкевіча, вучонага-этнографа, заходнебеларускага дзеяча, пад дабратворным уплывам якога і склаўся ён як паэт.

Вялікі дзякуй кіраўніку выдавецтва "Jusida" Гядэмінасу Жукасу і рэдактару, сябру Рады ТБК, Леакадзіі Мілаш, якія патурбаваліся, каб мая кніга паэзіі ўбачыла свет. А таксама шчыра дзякую старшыні Таварыства Беларускай Культуры ў Літве, шаноўнаму спадару Хведару Нюньку, за клопат пра выданне гэтай кнігі.



Хведар Нюнька, Леакадзія Мілаш, Уладзімір Пецюкевіч. Вільня, 2004 г.

# *Да сузор'я Лебедзь*

Вялікае шчасце на творчым і жыццёвым шляху сустрэць сааўтара, які гарманічна дапаўняе тваё светаадчуванне, тонка чуе тваю душу і генерыруе новыя, часта, незвычайныя ідэі. Мне вельмі пашанцавала. Я знайшоў не проста сааўтара, сустрэў творчага сябра, чалавека, патрыёта, грамадзяніна, Паэта – **Уладзіміра Пецюкевіча.**

Першыя песні – "Поле горкіх палыноў" і "Гаю мой, не кліч..." сталі візітоўкай нашага творчага дуэта. Яны створаны ў сярэдзіне 80-х. З таго часу мы напісалі шмат іншых песень, а таксама араторыю "Зорка палын", кантату "Дарога-сцяжына матулі і сына", дзіцячую казку "Птушыны кірмаш". І чым болей музычных твораў я пішу на вершы У.Пецюкевіча, тым часцей стаўлю пытанне: чым так прываблівае ягоная паэзія і чаму яна сама просіцца на нотную паперу? Можа таму, што яна родная па духу, а можа таму, што вершы паэта самі па сабе меладычныя? Не ведаю, не магу адказаць дакладна, але ўпэўнены – вершы паэта аб'ядноўвае незямная Любоў да Бога, любоў да Маці, да жанчыны, любоў да Радзімы.

Вершы Уладзіміра Пецюкевіча – высакародныя па сваёй сутнасці. У думках і словах паэт часта звяртаецца да Бога, да Боскай Маці, да святых, да анёлаў. Ягоная чыстая хрысціянская душа імкнецца ўскрыліць, паляцець высока да зораў і запрасіць з сабой у чароўнае падарожжа блізкія, родныя душы. Гэтыя думкі праходзяць лейтматывам праз усю кнігу:

*"...Да сузор'я Лебедзь, да сузор'я Лебедзь*
*Мы ляцім як гусі-лебедзі, з табой.*
*Там далёка недзе, ў лебядзіным свеце,*
*Дом збудуем светлы над ракой..."*

*"...А навокал – анікога, размаўляем толькі з Богам,*
*Ды з найсамай дзіўнай Боскаю красой..."*
*"...хачу нахадзіцца, хачу заблудзіцца*
*у нечым святым і высокім..."*

Любоў да Жанчыны ў вершах Уладзіміра Пецюкевіча набывае надзвычай узнёслы змест, чаруе сваёй чысцінёй, пяшчотай і нейкай незямной прыгажосцю. Думаю, што кожная жанчына, калі не мае, дык марыць пра тое высокае каханне, якое маляўнічымі фарбамі ўсхваляе паэт.

Любоў да Маці ў Пецюкевіча – пачуццё святое і высакароднае. Дарагому і самаму блізкаму чалавеку паэт прысвяціў шмат вершаў і кожны з іх прасякнуты бясконцай удзячнасцю сына за падоранае жыццё, за матчына благаславенне. Асабліва ўраджваюць вершаваныя радкі, напісаныя ад імя матулі, у іх аўтар паказвае сваё тонкае адчуванне псіхалогіі жанчыны, маці. Тэме ўзаемаадносін маці і сына прысвечана наша кантата "Дарога-сцяжына матулі і сына", вершы якой чытач знойдзе ў гэтым зборніку.

Любоў да Радзімы – вельмі ёмістае пачуццё У.Пецюкевіча, ёю прасякнута ўся ягоная творчасць. Радзіма для паэта – гэта не толькі геаграфічная прастора Беларусі, не толькі дубровы, лясы, азёры, рэкі, Радзіма – гэта наша слаўная гісторыя, наша сучаснае і будучае, наш герб і сцяг, пакутная родная мова.

*"...Песня родная і мова –*
*нашай вечнасці аснова!"*

Радзіма – наша сыноўняя любоў да яе, Радзіма – гэта Маці, бацькоўская хата, Радзіма – гэта чыстая крыніца, наталіцца з якой так прагне стомленая паэтычная душа.

*"...а ўпаду я, знясілены,*
*ад людской глухаты,*
*Беларусь, занясі мяне*
*Да крыніцы Максімавай,*
*Да гаючай вады..."*

Уладзімір Пецюкевіч – не толькі лірык, ён яшчэ і паэт-грамадзянін, тонкая мастацкая натура якога супрацiўляецца *"...бяспамяцтву, здрадзе, застою..."* і несупынна б'е ў званы.

*“...жах манкуртамі быць;*
*жах не ўстаць з небыцця,*
*даканае духоўны Чарнобыль...”*
*“...Беларусь, бі ў званы, бі ў званы,*
*Адгукніся, высокае Неба!”*

Уладзімір Пецюкевіч, як паэт-гісторык, згадвае нам забытыя, слаўныя старонкі гісторыі, якіх было нямала. Перад чытачом з’яўляюцца постаці такіх гістарычных фігур, як Ефрасіння Полацкая, Князь Міндоўг, палкаводзец Канстанцін Астрожскі, Кастусь Каліноўскі, Эмілія Плятэр, Паўлюк Багрым, Ларыса Геніюш. Над гістарычна-патрыятычнай тэматыкай у творчасці У.Пецюкевіча быццам *“...лунае натхнёны, вольны дух Скарыны, Багдановіча, Купалы...”*

Сапраўдныя Мастакі – дзеці Космасу, Боскія пасланнікі, праведнікі. Толькі яны сваімі светлымі думкамі, пачуццямі, вобразамі, творамі здольны захапіць аблудныя душы людзей і дапамагчы ім пабудаваць свой новы свет. І чым больш людзей у думках, у марах, у душы збудуюць сабе гэты новы свет, тым болей шанцаў віртуальнаму свету пераўтварыцца ў рэальны. У гэтым – вышэйшая місія Мастака на планеце. Уладзімір Пецюкевіч, несумненна, – адзін з такіх Мастакоў.

Упэўнены, яшчэ не адно пакаленне чытачоў, кампазітараў знойдзе у паэтычным набытку У. Пецюкевіча сваё натхненне, сваю гаючую, невычарпальную, крыштальна-чыстую крыніцу. Яшчэ я жадаю, каб калісьці спраўдзіліся ўсе аптымістычныя думкі-мары выдатнага беларускага Паэта канца дваццатага – пачатку дваццаць першага стагоддзя Уладзіміра Пецюкевіча, асабліва тыя, што адрасаваны беларускаму народу:Ъ

*“ – На якія агні хочуць выйсці яны,*
*Каб зажыць у святле несмяротным?*
*– Уваскрэслай душой адрадзіць карані*
*І быць Вечным, як Неба, Народам!”*

Дзмітрый Даўгалёў, кампазітар

# ТРЫЯЛЕТ

*Дарагой сястры Марылі Пецюкевіч, пры матэрыяльнай падтрымцы якой выйшла гэтая кніга.*

Маці-Беларусі верная дачка,
Апякуешся ты спадчынай бацькоўскай,
Сэрцам саграеш, нібы крылом анёльскім.
Маці-Беларусі верная дачка,
Дзякуй, ты і мой радок, як галубка,
Выпусціла ў свет душою шчодра-ўзнёслай.
Маці-Беларусі верная дачка,
Апякуешся ты спадчынай бацькоўскай.

*лістапад 2003 г.*



Сястра Марыля Пецюкевіч. 2003 г.

# ЗЯМЛЯ МАЯ

*Зямля мая, табой народжаны*
*З цяпла карэнняў векавечных,*
*Хоць невялічкі і няўходжаны,*
*Але я твой жывы карэньчык.*

*І прарасці імкнуся дрэвам я,*
*Узняцца кронаю разгалай,*
*Каб ты ў сухмень і ў дні залеўныя*
*Пад ім утульна адчувала.*

*Зачараваны і аблашчаны*
*Тваіх легендаў-казак словам,*
*Цябе я чую ў мове матчынай,*
*Як гул вякоў і шум дубровы.*

*Узгадаваны, неабдзелены*
*Тваёй трывогай і надзеяй,*
*Цябе не помню я прыземленай,*
*З табой мы Небам летуценнім.*

*О Беларусь, святлом ахрышчаны*
*Тваіх бяроз і зорнай высі,*
*Хай сто разоў я буду знішчаны,*
*Ніхто мяне не перахрысціць!*

*ліпень 1991 г.*



# Зорка Палын




Уладзімір Пецюкевіч з кампазітарам Дзмітрыем Даўгалёвым. 2003 г.

# ЗОРКА ПАЛЫН

**араторыя***

## УЗНЯЎСЯ БЕЛЫ ПТАХ

Узняўся белы птах з палыну горкага,
Святло запальвае святым крылом.
Няўжо ды збудзецца мой сон вясёлкавы –
Спаўзе халодны змрок у буралом?

Над Белай Руссю дух асілкаў-волатаў,
На споведзь мы ідзем да курганоў.
Край абуджаецца, працяты цокатам, –
Імчыць Пагоня ўдаль з сівых вякоў

Ідзе Скарына ў дом, Купала з Коласам,
Нясуць нам іскры дум – душа, палай!
Гукай па-роднаму, натхнёна, голасна,
У свет дабра дзяцей багаслаўляй!

Палай, душа, гадуй асілкаў-волатаў
На змену тым, хто спіць курганным сном...
Спявай, зямля мая, узнёсла-молада,
Дзень новы саграваць жывым цяплом...

Узняўся белы птах з палыну горкага,
Святло запальвае святым крылом.
Няўжо ды збудзецца мой сон вясёлкавы –
Спаўзе халодны змрок у буралом?

*жнівень 1990 г.*

* - *музыка Дзмітрыя Даўгалёва*

## ШЛЯХАМ ПАЛЫНОВЫМ

Крыж пакуты нясем і нясем на плячах,
Аніяк іх не можам расправіць
З той пякельнай пары, як разбойнічаў страх,
Чорным воранам гойсаў па краі.

Па траве палыновай, па белых касцях,
Па сірочым, па ўдовіным плачы
Крыж цяжкі мы нясем, аж цямнее ў вачах.
Скалануўся ўвесь свет, як убачыў:

– Хто такі там ідзе ў немалой грамадзе
Курапацка-Чарнобыльскім шляхам?
– Беларусы. Іх Памяць наперад вядзе
Пад Крывіцкім пакутніцкім сцягам.

– А хто Памяць ім тую вярнуў да жыцця,
Разбудзіў непакорлівы нораў?
– Жах манкуртамі быць, жах не ўстаць з небыцця –
Даканае духоўны Чарнобыль.

– На якія агні хочуць выйсці яны,
Каб зажыць у святле несмяротным?
– Уваскрэслай душой адрадзіць карані
І быць вечным, як неба, Народам!

*лістапад 1990 г.*

## ЗОРКА ПАЛЫН

Чорныя палі, чорныя сады,
Чорныя буслы, учарнелы люд...

Тут маіх дзядоў-прадзедаў сляды,
Тут і я іду па шляхах пакут.

Тут шуміць, гудзе Курапацкі бор,
Карканне варон, смутак і жуда,
Аняменне душ, пацямненне зор... –
Зоркаю Палын узышла Бяда.

Чарнабылу пыл, спарахнення дым... –
І каго ж за здзек павядуць на суд
Чорныя палі, чорныя сады,
Чорныя буслы, учарнелы люд?

У руках Суддзі спадзявання сцяг:
З паласой зары белы небакрай...
Божа мой святы, вырві з небыцця
Бедную зямлю, злыдняў пакарай!

*сакавік 1991 г.*

## ЗНЯМЕЛІ САЛАЎІ

Знямелі салаўі, знямела ціша ў гаі,
Зязюльчына "ку-ку" не чуецца ў бары,
На возеры сівым адны вятры гуляюць,
І вёслы – напалам, і човен – дагары...

А некалі вясна была вясной кахання,
Наўкол зямля ў садах звінела і цвіла,
Здавалася, плылі мы ў белым акіяне,
Лябёдкай маладой са мною ты плыла.

Азёрныя вятры на беразе драмалі,
Імчала нас удаль вясёлае вясло,
Спявалі салаўі, ах, як яны спявалі!
Зязюльчына "ку-ку" бясконцае было...

Знямелі салаўі, знямела ціша ў гаі,
Зязюльчына "ку-ку" не чуецца ў бары,
На возеры сівым адны вятры гуляюць,
І вёслы – напалам, і човен – дагары.

*студзень 1991 г.*

## ДАРУЙ, ЗЯМЛЯ МАЯ

Палі жытнёвыя, лясы птушыныя,
Рачная плынь крыштальнай чысціні,
Што з вамі сталася, мае гасціныя,
Куды падзеліся уцехі-дні?

Чаму вы хмурыя, акамянелыя? –
Трава прагорклая, быльнёг шуміць,
А ціша курчыцца, крычыць, знямелая,
Вадой з Сажа каня не напаіць.

А мне так хочацца забыць, развеяцца,
Махнуць рукой на ўсё: на боль, на млосць,
Запрэгчы гнедага, прышпорыць лейцамі –
Ляцець, як некалі, у весялосць...

Зямля пакутная, душа балесная,
Даруй, што я цябе не засцярог,
Ды, можа, крышачку, сагрэю песняю,
Хоць і яна з тугі тваіх дарог.

*жнівень 1990 г.*

# МАЯ КНЯЗЁЎНА

У старажытнай старане
І маладой, як раніца,
Ты заляцела ў сэрца мне
Азёрнай чайкай-чаіцай.

З высокай Замкавай гары
Над водамі быліннымі
Трывожны голас твой вятры
Прыносяць мне ўспамінамі.

Плач Яраслаўны над зямлёй
Калышуць хвалі слынныя.
Не зводзься горкаю тугой,
Мая князёўна мілая!

Даўно ссівелі курганы,
Сплылі вякі аблокамі,
Няма і Замкавай сцяны, –
Адна гара высокая.

Грамы далёкіх навальніц
У сэрцы адгукаюцца.
Баюся зноў спакой згубіць –
Аб голас твой параніцца.

*кастрычнік 1990 г.*

## СПОВЕДЗЬ ЗБУДЖАНАГА

Не будзе, не будзе мне вечнага раю,
Не пусцяць і ў пекла – зацесна,
Пакуль не пяю, а другім падпяваю,
Забыўшыся матчынай песні.

Не будзе, не будзе ніколі мне волі,
Не скіну з душы я знямогі,
Пакуль не згадаю прапрадзедаў поле –
Адкуль я і роду якога?

Не будзе, не будзе спакою начамі,
Бы хтосьці сурочыў – Чарнобыль, –
Пакуль не пазбудуся гора-адчаю
І д'ябальскіх чараў... чарговых.

Не будзе, не будзе ад свету павагі,
Не будзе вясёлых ігрышчаў,
Пакуль толькі словы, малітвы, развагі,
А зло верхаводзіць і нішчыць.

Зямля не даруе, пакуль не павею
Вятрамі збавення над ёю, –
Пакуль не развею крутую завею
Бяспамяцтва, здрады, застою.

*люты 1991 г.*

# БОЖА, МАЛІТВУ ПАСЛУХАЙ

Палынная Зорка праменіць атруту
У полі, у лесе, ў душы...
О Божа мой мілы, якая пакута! –
Распятыя мы на крыжы.

Распятыя дзеці хваробай нязлечнай –
Лякарні набіты бітком,
Заплаканы вочы, прыгорблены плечы,
Матуля над свежым грудком.

Распяты наш гонар, распята сумленне,
З чым продкі спрадвеку жылі.
Прыбіты цвікамі знявагі страшэннай
Святыні радзімай зямлі.

Распяты пачуцці да родных мясцінаў,
Дзядоўскіх магіл, курганоў...
Як выстаяць, Божа, у здрадлівай ціне?
Вярні ў нашы сэрцы любоў!

Вярні пачуццё нам свабоднага духу,
З нас выцісні, ўрэшце, раба!
Мой Божа магутны, малітву паслухай,
Няволі і страху пазбаў!

*ліпень 1990 г.*

## МАЛІТВА

Божы сын, спусціся з Неба,
Абыйдзі зямлю наўкола...
Чуеш крык? Ён немы-немы,
Гэта наш адзіны голас.

Як ваўкі, мы у загоне,
За сцяжкамі – мова, Памяць...
Кім былі калісь! А сёння...
Што такое, Божа, з намі?

Бачыш хаты? Вокны – крыжам...
У руках дрыготкіх – свечкі.
Падыйдзі да гора бліжай.
Ці не гэта ўжо наш вечар?

Ноч насоўваецца хмарай
З чорным пылам, чарнабылам...
Ты не браў такіх ахвяраў
Шчэ ў нікога, Божа мілы!

Для адноўленых святыняў
Святароў чужых наймаем.
Мо таму малітва стыне,
Да цябе не далятае?

Божа мой, даруй нам, кволым,
Сілы дай расправіць плечы
І вярні, вярні нам голас
Векавечны, чалавечы.
Амін...

*жнівень 1990 г.*

## КУРГАНЫ

Курганы, курганы, курганы...
Не хапіла б дарог нахадзіцца –
Патрывожыць іх вечныя сны,
Перад кожным хоць раз пакланіцца.

Курганы, курганы, курганы –
Ад Дзвіны да сівой Белавежы!
Накурганіў набег сатаны,
Наслядзіў злютаваны драпежнік.

Дзе ні глянеш – курган да курган,
Дзе ні пойдзеш – святыні, святыні...
Па ўсім свеце нязводны туман
Курапацкай тугі і Хатыні.

Курганы, курганы, курганы...
Насыпае іх сёння Чарнобыль
Нам – ахвярам нябачнай вайны,
Нам – заложнікам вечнага болю.

Перастала зязюля лічыць,
Сціхла сіваваронка, не крача,
Анямела матуля, маўчыць –
Скамянелае сэрца не плача.

Курганы, курганы, курганы...
Крык душы вырываецца нема:
– Беларусь, бі ў званы, бі ў званы,
Адгукніся, высокае Неба!

*чэрвень 1991 г.*



# Дарога-сцяжына матулі і сына

# ДАРОГА–СЦЯЖЫНА МАТУЛІ І СЫНА

**Кантата***

## МАТЧЫНА БЛАСЛАВЕННЕ

Ты радзіўся, сынок, самай ранняй вясной,
Калі вырай вяртаўся дахаты.
Мой сынок-жаўручок, чую твой галасок –
І святлее ў душы, як у свята.

Благаслаўляю цябе, бласлаўляю цябе
На шчаслівую долю, сыночак,
Ты расці, як вярба, будзь здароў, як вада,
І прыгожы, як сінь-васілёчак!

Бацька твой паміраў і табе наказаў
У апошнім трохкутнічку з фронту:
Ўсім душэўным святлом берагчы родны Дом
І здабытую ў бітвах Свабоду!

Ты – уцеха мая і журбота мая,
Мілы клопат ад ранку да ранку,
Я малюся штодня, каб дарога твая
Асвяцілася Божай заранкай.

Бласлаўляю цябе, бласлаўляю цябе
На шчаслівую долю, сыночак,
Ты расці, як вярба, будзь здароў, як вада,
І прыгожы, як сінь-васілёчак!

*ліпень 1999 г.*

* *музыка Дзмітрыя Даўгалёва*

# ПРАВОДЗІНЫ

У нялёгкую дарогу
Маці сына выпраўляла:
Аднаму вядома Богу,
Як малога ўзгадавала.

Частавала шчодрай ласкай,
Захапляла марай смелай,
Навучала песням-казкам –
Гадавала, як умела.

Вырас хлопец – заглядзецца!
Нібы волат, дужы, хвацкі,
Да людзей – з адкрытым сэрцам...
Вось бы радаваўся бацька!

Ды яму не давялося
Сына бачыць, гадаваці –
Груганнё ўгару ўзнялося,
Цёмна стала ў роднай хаце.

Каб зямля ўздыхнула вольна,
На сябе прыняў ён стрэлы –
Стала маці удавою,
Як галубка, пасівела...

Наказала маці сыну:
– Будзе ў свеце лёгка-цяжка –
Не забудзь, мой сын, сцяжыны,
Па якой хадзіў твой бацька!

*верасень 1996 г.*

## ЯЗМІН ЦВІЦЕ

Не надзівіцца хлопец-месяц
Дзяўчынай-зорачкай ля весніц,
А тут яшчэ – ах, чарадзей! –
Язмін цвіце, язмін цвіце.

Не кліч, матуля, ў хату сына! –
Яму ў дарогу ранкам сінім,
Хай ночку ў садзе правядзе –
Язмін цвіце, язмін цвіце.

Не кліч, не плач, галубка-маці! –
Сын пойдзе ў свет, каб век вяртацца
Наяве – ў сне да родных сцен –
Язмін цвіце, язмін цвіце.

Не надзівіцца хлопец-месяц
Дзяўчынай-зорачкай ля весніц,
А тут яшчэ – ах, чарадзей! –
Язмін цвіце, язмін цвіце.

*чэрвень 2000 г.*

## ЕДЗЬ, СЫНОЧАК, З БОГАМ

Сына ў край далёкі маці выпраўляе,
Уздыхае горка, хрысціць, бласлаўляе:

– Дай табе, мой сыне,
Божанька, здароўя
І за морам сінім,
За гарой крутою.

Толькі добра знаю,
Трэба, сынку, помніць:
Старана чужая
Шчасцем не натоліць!

Не адновіць сілы звонам песні роднай,
Клёкатам буслiным, плёскатам азёрным.

Любы мой сыночак,
Я табе жадаю
Тога, што ты хочаш,
Так у снах шукаеш!

Толькі добра знаю,
Трэба, сынку, помніць:
Старана чужая
Шчасцем не натоліць!

Па якіх дарогах ні вадзіла б доля,
Роднага парога не забудзь ніколі!

Я табе не буду
Больш казаць нічога,
Калі ўжо надумаў,
Едзь, сыночак, з Богам!

Толькі добра знаю,
Трэба, сынку, помніць:
Старана чужая
Шчасцем не натоліць!

*снежань 2000 г.*

# ЗБОРЫ Ў ДАРОГУ

Матуля сына бласлаўляла,
У свет збіраючы, казала:
– Вазьмі, мой сынку, хлеба-солі,
Каб не стамляўся ты ніколі.

Вазьмі ручнік-набожнік бабчын
І абразок Прачыстай Маці,
Каб даў табе Гасподзь удачы,
Жыў у здароўі ты і шчасці.

Што людзям дарага і Богу,
Вазьмі, сыночак, у дарогу!

Вазьмі зямлі з магілы дзеда
І святаянскай руты-мяты,
Вазьмі вады з крыніцы светлай,
Каб не забыў бацькоўскай хаты.

Вазьмі ўсяго, што адгукнецца
Чароўным звонам песні роднай
І да краёў напоўніць сэрца
Любоўю, радасцю, пяшчотай.

Што людзям дарага і Богу,
Вазьмі, сыночак, у дарогу!

*жнівень 2000 г.*

# ГЭЙ, ВАНДРОЎНІК-МЕСЯЦ

Гэй, вандроўнік-месяц, і табе самотна,
Не старонься, дружа, вогнішча майго! –
Не стае мне сябра з позіркам пяшчотным,
Не хапае звестак з родных берагоў.

Месяц мой спагадны, месяц мой лагодны,
Як табе я рады ў старане бязроднай!

Пра маю старонку раскажы мне, дружа:
Што там робіць маці ў гэты позні час?
Мо сурвэтку вяжа і па сыне тужыць
Ды глядзіць з малітвай на святы абраз?

Месяц мой спагадны, месяц мой лагодны,
Як табе я рады ў старане бязроднай!

Я табе, мой дружа, праспяваю славу,
Падарую боскі, незямны ўспамін –
У акно матулі пасвяці ласкава,
Перадай, што хутка будзе дома сын.

Месяц мой спагадны, месяц мой лагодны,
Як табе я рады ў старане бязроднай!

*лістапад 1997 г.*

## ДА ЦЯБЕ ВЯРТАЮСЯ

Да цябе вяртаюся я марай,
У лагодны твой, матуля, спеў,
Што калісьці ў водбліску пажараў
Да мяне ў калыску заляцеў.

Да цябе вяртаюся я песняй,
Чарадзейнай музыкаю сноў –
Жаўруком пяю парою весняй
Пра святло радзімых берагоў.

Да цябе вяртаюся журбою,
У няспынны боль удовін твой –
Жураўлём сумую над зямлёю,
Над святою бацькавай гарой.

Да цябе вяртаюся лістамі...
Не тужы, матуленька, па мне,
Прыйдзе дзень, а ён не за гарамі, –
Абдыму цябе не толькі ў сне...

*верасень 2000 г.*

## ТАМ

Ой, мае вы чайкі, птахі залатыя,
Паляту я з вамі ў незабыўны край –
Там мае квітнелі вёсны маладыя,
Там зямля святая, там нябесны рай!

Там я маці роднай
Нізка пакланюся
І яна даруе
Мне за вырай мой,

Стол засцеле белым
Ільняным абрусам,
Разліе мне ў сэрцы
Ласку і спакой.

Там я луг мурожны пакладу ў пракосы,
Голаў мне закружыць хмельная трава,
Скіну з плеч прытому на азёрным плёсе,
Там, дзе белай чайкай любую назваў.

Там на чоўне мройным
З мілаю красуняй
Паплыву я ў казку
З песняй даўніх дзён.

Будзе гэта песня
Радаснай і сумнай,
Як мая дарога,
Як само жыццё.

Ой, мае вы чайкі, птахі залатыя,
Паляту я з вамі ў незабыўны край –
Там мае квітнелі вёсны маладыя,
Там зямля святая, там нябесны рай.

*верасень 2000 г.*

# МАТЧЫНА ТРЫВОГА

Вецер грукне аканіцай,
Пройдзецца па ганку –
І матулі ўжо не спіцца,
Мроіцца да ранку.

Хто там ходзіць?
Хто там лазіць?
У якой турбоце?
Халадзее сэрца маці –
Мо, крый Божа, злодзей?

Хто там ходзіць?
Можа, сына
Прывяла дарога
З непрытульнае чужыны
Да свайго парога?

Можа бацька?
Хоць нямала
Ад вайны прайшло ўжо,
Адгуло, адгрукатала
З той часіны грознай.

Грукне-бразне – і ні слоўца
У адказ на "хто там?"
Не трывож, вятрыска, моцна
Матчынай самоты!

*люты 1993 г.*

# НЕ ЎГЛЯДАЙСЯ ТАК, МАТУЛЯ!

Не стамляй, матуля, вочы, не ўглядайся ўдалячынь –
Да цябе на крылах ночы прылятае сёння сын.
Растрывожыць, расхвалюе, як салоўка, цішыню
І сцяжынку палявую, і бяссонніцу тваю.

Не ўглядайся так, матуля, не стамляйся,
Растрывожанае сэрца супакой –
Аж да раніцы агеньчык не пагасне:
Прылятае сёння сын дадому твой!

Стукне лёганька ў акенца, бразне клямкаю дзвярной –
І твой голас адгукнецца: – Гэта ты, сыночак мой?
У вачах ягоных блісне ціхай радасці сляза,
І забудзе ўсё на міг ён, што наважыўся сказаць.

На пытанне: як жывецца, свет аблётаў недарма?
Ён нявесела ўсміхнецца: – Добра там, дзе нас няма!
Не пытайся, маці, ў сына, што за ўсё яму мілей?
Атулі святлом Айчыны – песняй роднаю сагрэй...

Не ўглядайся так, матуля, не стамляйся,
Растрывожанае сэрца супакой –
Аж да раніцы агеньчык не пагасне:
Прылятае сёння сын дадому твой!

*чэрвень 1994 г.*

# НЕ ТРЫВОЖ

Не трывож мне, мама, сэрца
Успамінам дзён суровых,
Як гуло-раўло, бы ў страшным сне,
Як магло не стаць нікога
Ад адной чаргі свінцовай:
Ні цябе, ні брата, ні мяне.

Не трывож мяне расказам,
Як навала лютавала,
Як звінелі кулі, бы чмялі,
Як ляжала ў каляіне
І сабою прыцiскала
Ты мяне малога да зямлі.

Як малілася ты, мама,
І жыцця прасіла ў Бога
Для мяне і брацiка майго,
Што пад сэрцам ты насіла...
І радзіла ля парогу
Перамогі нашай дарагой...

Не трывож мне, мама, сэрца
Успамінам дзён суровых,
Як гуло-раўло, бы ў страшным сне,
Як магло не стаць нікога
Ад адной чаргі свінцовай:
Ні цябе, ні брата, ні мяне.

*люты 2000 г.*

# РАЗБУДЗІ МЯНЕ, МАТУЛЯ

Добрай ночы, маці, сноў табе чароўных,
І я заўтра ўстану раненька, з табой –
Затужыў я, мама, па раздоллі родным,
Адпачыць хачу я стомленай душой.

Натаміўся я, блукаючы па свеце,
Хоць і бачыў там нямала дзіўных дзіў,
Разбудзі мяне, матуля, на дасвецці,
Разбудзі мяне, галубка, разбудзі!

Не крыўдуй, матуля, без мяне паснедай,
А я выйду ў поле, там, дзе рай спазнаў:
Лётаў босы ў росах, гарцаваў на гнедым,
А падрос – пракосы ўслед за дзедам гнаў.

Паплыву я, мама, сінь-вадой азёрнай,
Дзе Зялёны востраў мне дарыў спакой,
Там, дзе піў я шчасце з чайкаю залётнай...
Дзе цяпер красуня, за якой гарой?..

Натаміўся я, блукаючы па свеце,
Хоць і бачыў там нямала дзіўных дзіў.
Разбудзі мяне, матуля, на дасвецці,
Разбудзі мяне, галубка, разбудзі!

*жнівень 2000 г.*

# ДЗЯКУЙ, МАТУЛЯ

Дзякуй, матуля, за веснія мары,
Дзякуй за песні і казак святло,
Дзякуй за сонца і дзякуй за хмары,
Дзякуй за ўсё, што жыццё мне дало.

Снішся ты мне на світанку,
Падаюць зоры ў траву...
Дзякуй, матуленька, дзякуй,
Што я на свеце жыву!

Дзякуй за радасць жытнёвых прастораў,
Дзякуй за сум надмагільных бяроз,
Дзякуй за шчасце і дзякуй за гора,
Што дараваў мне сіроцкі мой лёс.

Дзякуй за ласку бацькоўскае хаты,
Дзякуй за позірк самотны ў акне...
Мамачка-мама, даруй, што не часта
Дома бываю на яве і ў сне...

Снішся ты мне на світанку,
Падаюць зоры ў траву...
Дзякуй, матуленька, дзякуй,
Што я на свеце жыву!

*сакавік 1995 г.*

# Я ВЕРУ, СЫНОЧАК

За хатай зязюля кувае,
Пяе салавей ля парогу,
А маці слязы не хавае,
Праводзячы сына ў дарогу:

– Шчаслiва ляцi, мой саколе,
Да скорай сустрэчы, мой родны,
Жывi пад аховай анёла,
Я веру у шлях твой зваротны.

Я веру, сыночак, я знаю:
Ты вернешся, рана цi позна,
Сюды, дзе зязюля кувае,
Пяе салавейка дзiвосна!

Дзiцятка маё, не кажы мне,
Што ў свеце ты знойдзеш прыволле, –
Ты ж гэтак мiлуеш вачыма
Азерца i жытняе поле!

Ты ж гэтак любуешся садам,
Што з бацькам тваiм я садзiла!..
Я веру ў вялiкую радасць:
Ты вернешся ў казку, мой мiлы.

Я веру, сыночак, я знаю:
Ты вернешся, рана цi позна,
Сюды, дзе зязюля кувае,
Пяе салавейка дзiвосна!

*жнiвень 2000 г.*

## БЫВАЙЦЕ!

Бывайце, прасторы бацькоўскага краю:
Палі і дубровы ў красе маладой,
Дзе песні матуліны ў сэрца збіраў я,
Узяў у дарогу з сабой!

Спынілася ў смутку сцяжынка пад гаем,
Застыла рачулка ў журбе, не цячэ,
Самотна матуля мне ўслед пазірае,
Слязу выцірае з вачэй:

– Сыночак мой родны, шукаючы долю,
Не збіся з дарогі – свой памятай край,
Дай Божанька шчасця табе, мой саколе,
Дадому скарэй прылятай!

Бывайце, азёрныя плёсы і тоні,
Дзе радасць рыбацкую я напаткаў,
Дзе з любай дзяўчынай катаўся на чоўне
І гімны каханню складаў.

Бывайце, бывайце, бацькоўскія далі,
Дзе лёгка знаходзіў душэўны спакой.
Бывай, мая мама, дзён ясных жадаю
І скорай сустрэчы са мной!

– Сыночак мой родны, шукаючы долю,
Не збіся з дарогі – свой памятай край,
Дай Божанька шчасця табе, мой саколе,
Дадому скарэй прылятай!

*ліпень 1991 г.*

* * *

*– Не спяваем. Што нам песні*
*З галубінаю пяшчотай,*
*Дай нам музыкі нябеснай,*
*Што гукае да палёту!*

*– Не чытаем. Што нам словы*
*З перапёлчынаю смагай,*
*Дай нам гукаў перуновых,*
*Што гартуюць нас адвагай!..*

*Дзе знайсці мне песням сілы,*
*Каб спявалі іх ахвотна,*
*На распраўленыя крылы*
*Падымалі дух свабодны?*

*Дзе знайсці мне словам моцы,*
*Каб іх з тымі параўналі,*
*Што ўзнімалі каліноўцаў,*
*Меч у рукі падавалі?*

*жнівень 1991 г.*



# Бацькоўскі край

# БАЦЬКОЎСКІ КРАЙ

**песенны альбом***

## НЕ СУМУЙ, МАТУЛЯ

Не сумуй, матуля, усміхніся долі, –
Да цябе ляту я, да цябе.
Паблукаў па свеце, па гарах і долах,
Натаміўся сэрцам у журбе.

Над зямлёю кружыць белакрылы бусел,
Абдымае зорны небакрай,
Абдымае сонца роднай Беларусі –
Я вярнуўся, мама, сустракай!

Ой, як сэрца б'ецца, плача і смяецца! –
Светлыя азерцы, ясны гай.
А за гаем хата і дымок віецца...
На вячэру, мама, запрашай!

Мы з табой, матуля, не заснем да ранку:
Успаміны-згадкі – чарадой.
У вясну, у казку, ў песню-калыханку
Паляту я, мама, за табой...

Над зямлёю кружыць белакрылы бусел,
Абдымае зорны небакрай,
Абдымае сонца роднай Беларусі –
Я вярнуўся, мама, сустракай!

*сакавік 1992 г.*

* – *музыка Дзмітрыя Даўгалёва*

## СПАТКАННЕ

Ад азерца чыстага,
Светлага, празрыстага
Красна дзеўчына ішла.
Два вядзерцы поўныя,
З беражкамі роўныя,
Несла, несла да сяла.
А насустрач з вудачкай
Па сцяжынцы вузенькай –
Хлопец, хлопец малады.
Як убачыў дзеўчыну
З поўнымі вядзерцамі,
Войкнуў, здзіўлены, застыў:
– Ой, што робіш, кветачка,
Ой, што робіш, белая!
Пашкадуй сваю красу,
Два вядзерцы поўныя,
З беражкамі роўныя,
Дай я, дай я паднясу.
Дзеўчына спынілася,
Вочы засвяціліся,
Чорных броў вясёлы ўзмах:
– Дзякуй, мой рыбачанька,
Я вады у лазеньку
Неяк нанашу сама.
Не скажу, не ведаю,
Ці паднёс вядзерцы ён,
Толькі, толькі дні праз два
Хлопец той жа сцежачкай
На руках нёс дзеўчыну,
Нёс і песціў-мілаваў.

*верасень 1990 г.*

# БАЦЬКОЎСКІ КРАЙ

Бацькоўскі край – ты мой напеў шчымлівы,
Раздолле мар, памкненняў і надзей.
Дзе б я ні быў, твае мне сняцца нівы
І казка-ноч яснейшая за дзень.

Гарыць прастор купальскімі агнямі,
У небе зор, – бы ў жыце васількоў,
Іду на спеў дзявочы над палямі,
Нясу табе святло удзячных слоў.

Бацькоўскі край – ты мой віток высокі:
І слых, і зрок, няўтольная любоў.
У час любы, у радасны ці горкі,
Жыве ва мне твой векапомны боль.

Няхай парой бывае горка-горка,
Шчаслівы я, што ёсць ты, любы край.
Шчаслівым быць – цудоўна, хоць нялёгка,
Трымаць, як сцяг, бясхмарным небакрай.

Гарыць прастор агнямі Зорак вечных,
Званы звіняць – няма канца жальбе,
Іду на звон – да бацькі на сустрэчу,
Нясу яму падзяку за цябе.

*студзень 1992 г.*

## БАЛАДА

На гнядым звінела срэбраная збруя,
Біў ён капытамі ў прадчуванні сеч,
Дзеўчына-красуня у дарогу злую
Хлопцу маладому падавала меч.

– Любы мой, харошы, сокал мой адважны,
Ад варожай зграі барані наш край.
Будзе мне трывожна, будзе мне і страшна,
Будзеш ты мне сніцца, любы мой, бывай!

Барані сцяжынкі, там, дзе мы хадзілі,
Дзе спявала наша зорная вясна,
Барані каханне, барані Радзіму,
Барані, святую,– ў нас яна адна...

Стрэлы хмарай чорнай засланялі сонца,
Чырванела рэчка ад крыві людской.
Бітва на Нямізе на святую Тройцу
Апякла нам сэрцы жудаснай бядой...

На гнядым звінела срэбраная збруя,
Біў ён капытамі ў прадчуванні сеч,
Дзеўчына-красуня у дарогу злую
Хлопцу маладому падавала меч.

*чэрвень 1999 г.*

## ГАЮ МОЙ, НЕ КЛІЧ...

Гаю мой, не кліч пад каліны цвет,
Да крынічных вод, светлых, як вясна:
Там Яе няма – паляцела ў свет,
Наша рэчанька высахла да дна.

Паляцела ў свет русакосая –
Стан рабінавы, вочы – сінь азёр –
Не спяе ўжо мне мілым голасам
Пра дзівосны край у зіхценні зор.

Гай мою, не кліч на шчаслівы смех –
Касавіцаю весела ў лугах –
Там Яе няма – паляцела ў свет,
Наш мядовы луг палыном прапах...

Гаю мой, не кліч пад каліны цвет,
Да крынічных вод, светлых, як вясна:
Там Яе няма – паляцела ў свет,
Наша рэчанька высахла да дна.

*сакавік 1985 г.*

## КАЛЫХАНКА

Спі, мой хлопчык, спі, маленькі,
Спі, мой любы салавейка.
Спі, дзяўчынка-чараўнічка,
Спі, мая сінічка...

Добрай ночы вам, дзіцяткі,
Лю-лі, лю-лі, баю-бай!

Зайчык спіць і зайчаняткі,
Дрэмле поле, дрэмле гай.
    Спіць і сонейка, прылегла
    За гарой, за гарой,
    Толькі лётаюць анёлы
    Над зямлёй.

Хай прысняцца вам палеткі,
Зазвіняць купальскай ночкай.
Збераце матулі кветак,
Сініх васілёчкаў...

    Не трывожцеся, дзіцяткі,
    Лю-лі, лю-лі, баю-бай!
    Забіякі-ваўчаняткі
    Спаць пабеглі ў цёмны гай.
        Спіць і сонейка, прылегла
        За гарой, за гарой,
        Толькі лётаюць анёлы
        Над зямлёй.

Хай прысняцца вам нябёсы,
Свет бясконцы, таямнічы –
Збераце паўнюткі кошык
Ясных заранічак...

    Добрай ночы вам, дзіцяткі,
    Лю-лі, лю-лі, баю-бай!
    Зайчык спіць і зайчаняткі,
    Дрэмле поле, дрэмле гай.
        Спіць і сонейка, прылегла
        За гарой, за гарой,
        Толькі лётаюць анёлы
        Над зямлёй.

*верасень 1993 г.*

# БРАСЛАЎСКАЯ ЧАЙКА

Не ляціце, птахі, не ляціце
Нада мной, над горадам маім,
У чароўны край з сабой не клічце,
Не будзіце ў сэрцы успамін.

Не трывожце памяць пра старонку,
Дзе ні разу сонца не зайшло,
Дзе азёры коўшыкам глыбокім
Раздаюць блакітнае святло.

Там я рос – там лётаў я да зораў,
Выпраўляла ў неба сенажаць.
Чым тады мяне прывабіў горад,
Не магу вам сёння адказаць.

Там кахаў я – там зямля для шчасця,
Для спаткання з ласкавай душой:
Закружыла сон мой белай чайкай,
Асляпіла сонечнай красой.

Не магу вам сёння растлумачыць,
Як расстаўся з любаю маёй –
Па браслаўскай чайцы сэрца плача
І журыцца песняй над зямлёй.

Перадайце, птахі, перадайце
Любай чайцы сум мой і любоў,
Прыляту я ў край майго юнацтва
З веснавой чародкай жураваў.

*лістапад 1990 г.*

## ЗАСТОЛЬНАЯ

Бяжы, вінцо, само ў раток,
Гарэліца каціся...
Гуляй, сваток, гуляй, кумок,
Сябрына, весяліся!

Цячэ, "цячэ вада ў ярок",
Цвіце каліна ў полі...
Спявай, сваток, спявай, кумок,
Спявай усё застолле!

Зайграў Змітрок і – госці ў скок:
Эх, полечка–трасуха!..
Спачні, сваток, спачні, кумок, –
На ўсё не хопіць духу!

Яніну Ясь адвёў убок,
Штось шэпча ёй любоўна...
Глядзі, сваток, глядзі, кумок,
Звядуць і вашых жонак!

А ты, Пятрок, чаго замоўк?
Мо, сумнае прыпомніў?
Налі, сваток, налі, кумок,
Налі яшчэ па поўнай!

*жнівень 1993 г.*

## ГРАЙ, БАГРЫМЕ

Свята ў Храме, свята ў полі, свята ў хаце –
Ганаруем мы Паэта-Каваля.
– Грай, Багрыме, грай, мой сыне, просіць Маці –
Беларуская пакутная зямля.

Грай, Багрыме, грай, Паэце,
Душы сонныя на свеце
Чарадзейнаю жалейкай абуджай! –
Родным Словам, спеўным гукам
І кавальскім звонам-стукам
Край курганны, край туманны падымай!

Грай, Багрыме, не журыся! – ты вярнуўся
З палынова-кайдановай стараны,
Прыгарнуўся да Матулі-Беларусі,
Дачакаўся маладой сваёй вясны.

Грай, Багрыме, не журыся! – ў неба долі
Узляцелі сны твае, як жаўрукі.
Узнялася залатая жырандоля,
Засвяціла ясным знічам навякі.

Грай, Багрыме, грай, Паэце,
Душы сонныя на свеце
Чарадзейнаю жалейкай абуджай! –
Родным Словам, спеўным гукам
І кавальскім звонам-стукам
Край курганны, край туманны падымай!

*снежань 1992 г.*

## ПОЛЕ ГОРКІХ ПАЛЫНОЎ

Паплачце, кнігаўкі, паплачце
Над полем горкіх палыноў.
На гэтым полі, полі Брацкім
Ніхто не злічыць курганоў.

Над гэтым полем зорка ўпоўнач
Гарыць удовінай слязой...
На гэткім полі, жалю поўным,
Спіць недзе ў свеце бацька мой.

Дзе тое поле, мне скажыце,
Найсамых горкіх палыноў?
Дзе той курган, які баліць мне
Мацней ад іншых курганоў?

Нясіце, кнігаўкі, нясіце
Маю жалобу над зямлёй.
Пры маці толькі не тужыце –
Тугі за век хапіла ёй.

Паплачце, кнігаўкі, паплачце
Над полем горкіх палыноў.
Часцей жывым напамінайце
Пра смутак Брацкіх курганоў.

*студзень 1985 г.*

# ЧАРАДЗЕЙНАЯ ПТУШКА

Беларуская мова – слова роднага звон,
Чарадзейная птушка дум адвечных і сноў,
Саграваe нам сэрца твой купальскі агонь,
Акрыляе надзеі, узвышае любоў.

Чарадзейная птушка, на вятры не зважай,
Не губляйся ў тумане, у глыбінцы лясной.
Сцяг з Пагоняй прыпомні, залаты век згадай –
Узнімайся высока над усёй старaной.

Беларуская мова, не схіляйся ў журбе,
Салаўінаю песняй цэлы свет абдымай,
Абразамі Скарыны мы абносім цябе –
Адступаюцца хмары за сівы небакрай.

Звон мелодыі светлай над зямлёю плыве,
З караваем кладзецца на матулін абрус...
Покуль песня лунае, покуль мова жыве –
Дух жыве беларускі і жыве Беларусь!

*лістапад 1990 г.*

# А ТЫ КАЖАШ: ВЯСНА

Што я сёння ў бары, у зялёнай раскошы,
Дзе зязюля пяе ад відна да відна,
Вінаваты твае светларусыя косы,
А ты кажаш: вясна, вінавата вясна.

Што ізноў я іду салаўінаю сцежкай,
Дзе Бярозы-ракі плынь святлей ад акна,
Вінавата твая таямнічая ўсмешка,
А ты кажаш: вясна, вінавата вясна.

Што пакінуць гатоў назаўсёды свой горад
І пайсці за табой, дзе шуміць збажына,
Вінаваты жывы, срэбразвонны твой голас,
А ты кажаш: вясна, вінавата вясна.

Што з'ядналі навек нас маёвыя ночы,
Даль нязнаных дарог перад намі адна,
Вінаваты твае ясназорыя вочы,
А ты кажаш: вясна, мо і праўда – вясна?

*сакавік 1989 г.*

## ЛЕТА

Лета нам, як казку, даравала
Васількова-збожжавы прастор,
Незямныя мары ўскалыхала
Хвалямі ласкавымі азёр.

Лета, лета – вогнішча на ўзлессі,
Лета, лета – вёслы над вадой,
Лета – гэта радасная песня,
Калі ты, каханая, са мной!

Я згубіў спакой невыпадкова –
Летняй ночкай столькі дзіўных дзіў, –
Маладзік бліскучаю падковай
Да цябе сцяжынку асвяціў!

Лета – кветка-папараць, Купалле –
Рассцілае ясных зор кілім,
У чароўным возеры купае,
Што завецца шчасцем маладым...

Лета, лета – вогнішча на ўзлессі,
Лета, лета – вёслы над вадой,
Лета – гэта радасная песня,
Калі ты, каханая, са мной!

*ліпень 1989 г.*

## ЗАСПЯВАЙ МНЕ ПЕСНЮ, КРЫВІЧАНКА

Заспявай мне песню, крывічанка,
Пра вякі далёкія згадай,
Хай яна лунае гордай чайкай,
Абуджае сонны небакрай.

Разгайдай мяне на мройным чоўне,
Трапяткой душою раскажы
Пра каханне князя да князёўны,
Пра паходы князевых дружын.

Я не сплю, я думаю начамі
Пра цябе і наш курганны край.
Заспявай мне песню, крывічанка,
Пра вякі далёкія згадай!

Загудзе ад цокату пагоні,
Пераззвону дзідаў і мячоў –
І чарот азёрны і сасоннік
Адгукнецца болем крывічоў.

Панясецца крыкам гордай чайкі,
Паляціць за бор, за дальні гай:
– Біце ў сэрца, біце іх мячамі,
Хто прадаў і зганьбіў родны край!..

Я не сплю, я думаю начамі
Пра цябе і наш курганны край.
Заспявай мне песню, крывічанка,
Пра вякі далёкія згадай!

*люты 1991 г.*

# РАЗВІТАЛЬНЫ ВАЛЬС

Жыць бы мне ды жыць, сэрцам не тужыць,
Кветкі і вясну век табе дарыць.
Толькі вось бяда – восень замяла
Сцежку, сцежку, па якой
Ты са мной ішла.

Ой, губляе клён свой апошні ліст,
А ў канцы сяла грае гарманіст!
Пэўна, знае ён, што прыйшло да нас:
Льецца, льецца сумны звон –
Развітальны вальс.

На цябе зірну я ў апошні раз,
Як на Боскі лік, на святы абраз.
І скажу: – Даруй, строга не судзі,
Вінаваты толькі я,
Толькі я адзін.

У апошні раз кіну я пагляд
На самотны дом, на журботны сад,
У апошні раз танец кружыць нас –
Грае, грае гарманіст
Развітальны вальс.

*верасень 1992 г.*

## ГІМН БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

Беларусь, Беларусь – наша маці святая,
Славім, славім цябе, славім веліч тваю.
Мы ідзем грамадой, Сцяг з Пагоняй лунае,
Песня вольнай зямлі імкне ў вышыню.

Неабсяжная Даль у красе ганаровай.
Сцяг Свабоды гарыць векапомнай Зарой:
– Век ідзі, Беларусь, незалежнай дарогай,
Песняй вольнай ляці да Заранкі сваёй!

Беларусь, Беларусь, ты цярпела нямала,
Славім мужнасць тваю, што змагала прымус.
Гонар нам зберагла і жыццё ўратавала,
Горда коціцца кліч: – Жыве Беларусь!

Неабсяжная Даль у красе ганаровай.
Сцяг Свабоды гарыць векапомнай Зарой:
– Век ідзі, Беларусь, незалежнай дарогай,
Песняй вольнай ляці да Заранкі сваёй!

Век жыві, Беларусь!

*снежань 1991 г.*



# Мелодыя сэрца

# МЕЛОДЫЯ СЭРЦА

**песенны альбом***

## НЕ СПЯШАЙСЯ, ВОСЕНЬ

Надыходзіць восень з дробнымі дажджамі,
Блізіцца дыханне ранніх халадоў...
Ой, як мне самотна цёмнымі начамі,
Хоць бы на хвілінку каляровых сноў!

Не спяшайся, восень, трохі пачакай,
Песняй жураўлінай сэрца не кранай:
Нашаму каханню рана сумаваць –
Мы на неба думаем злятаць.

Хутка прычакаем Пакравы святыя,
Над палямі вырай, крылаў сумны ўзмах...
Адляцелі вёсны нашы маладыя,
Адлятаюць леты ў незваротны шлях.

Заблудзіся, восень, у далёкім лесе,
Затрымайся, восень, у гарах крутых:
Мы не даспявалі столькі летніх песень,
Столькі не схадзілі сцежак веснавых!

Не спяшайся, восень, трохі пачакай,
Песняй жураўлінай сэрца не кранай:
Нашаму каханню рана сумаваць –
Мы на неба думаем злятаць.

*верасень 1993 г.*

* – *музыка Дзмітрыя Даўгалёва*

## ПАЛАЧАНАЧКА-КНЯЗЁЎНА

Ля Сафіі, белакаменнай святыні,
Па Дзвіне плывуць купальскія вянкі,
Штосьці мройнае пяе краса-дзяўчына,
Узіраецца ў раку, нібы ў вякі.

Палачаначка–князёўна,
Палачаначка–князёўна,
Да цябе я птушкай прыляцеў,
Кліч мяне у сон чароўны,
Кліч мяне у сон чароўны,
Кліч мяне ў нябесны зорны спеў!

Я купаюся ў тваім паглядзе сінім,
Разыходзіцца таемнасці туман:
Прыгажосць твая ад мудрай Ефрасіні,
Слаўным родам ганарышся нездарма.

Ты занятая дзявочай варажбою,
Што ты ўбачыла у плыні люстраной?
Можа, пойдзем мы дарогаю адною,
Палачаначка-спадарыня, з табой?

Палачаначка–князёўна,
Палачаначка–князёўна,
Да цябе я птушкай прыляцеў,
Кліч мяне у сон чароўны,
Кліч мяне у сон чароўны,
Кліч мяне ў нябесны зорны спеў!

*чэрвень 1993 г.*

# МЕЛОДЫЯ СЭРЦА

Мкнецца ў нябёсы, віецца
Наша з табою дарога,
Льецца мелодыя сэрца,
Нам дараваная Богам.

Льецца мелодыя сэрца
Чыстай крыніцай кахання,
Плача душа і смяецца
У маладым парыванні.

Мелодыя сэрца, мелодыя сэрца
Ліецца крыніцай святой,
Мне мроіцца светла і шчыра пяецца
З табою і толькі з табой!

Недзе ў таемнай прасторы
Хочацца з Богам сустрэцца,
Хочацца вечна між зораў
Слухаць мелодыю сэрца.

Ні навальніца, ні вецер
Не перашкодзіць, здаецца,
Несці нам радасць па свеце,
Несці мелодыю сэрца.

Мелодыя сэрца, мелодыя сэрца
Ліецца крыніцай святой,
Мне мроіцца светла і шчыра пяецца
З табою і толькі з табой!

*лістапад 1993 г.*

## ЗАРАНІЦЫ

Пазнаёміў нас з табою месяц ясны,
Павянчала цудадзейная зара:
Рассыпае ў сэрцы промні долі шчаснай...
Не канчайся, наша юная пара!
    Павянчаныя зарою,
    Асвячоныя расою,
    Блаславення ў зораў просім мы з табой:
    – Зараніцы-зараніцы,
    Нам дарогу блаславіце
    Да высокай таямніцы незямной!
Мы ляцім-ляцім дарогаю нябеснай,
Зараніцы палымнеюць пад рукой,
Высцілаем мы яе сардэчнай песняй,
Называем ясназораю вясной.
    Зараніцы палымнеюць,
    Асвятляюць нам надзею:
    Будзем вечна маладыя мы з табой...
    – Зараніцы-зараніцы,
    Нам дарогу блаславіце
    Да высокай таямніцы незямной!
Ззяе вечнасць перад намі Млечным Шляхам,
А навокал анікога – ты і я.
Нехта здзівіцца здалёку: – Што за птахі!
Не пужае іх крутая вышыня.
    А навокал анікога,
    Размаўляем толькі з Богам
    Ды з найсамай дзіўнай Боскаю красой:
    – Зараніцы-зараніцы,
    Нам дарогу блаславіце
    Да высокай таямніцы незямной!

*верасень 1993 г.*

# СВЕТЛЯЧОК

Што са мной ты зрабіў,
Любы мой сынок! –
У душы запаліў
Мне маладзічок.

Пэўна, з неба ты
Да мяне прыплыў
На чаўночку залатым
І святло разліў.

Светла мне, спеўна мне
Уначы і ўдзень...
Мой сынок, светлячок
Ты маіх надзей.

Сынку мой, бачу ў сне:
Не агорне змрок –
Будзе век палымнець
Твой маладзічок.

Пэўна, з неба ты
Да мяне прыплыў
На чаўночку залатым
І святло разліў.

*верасень 1993 г.*

# НЕ КУВАЙ, ЗЯЗЮЛЕНЬКА

Па шырокім полі рэчанька цякла,
Ды яе не стала – палыном зрасла,
Недзе ў сінім моры знікла навякі –
Журацца са мною хлопцы-рыбакі.

Не кувай, зязюленька, не кувай, харошая,
Не лічы так жаласна мне гады трывожныя!

У суседняй хаце дзеўчына жыла,
І яе не стала – рэчанькай сплыла,
Недзе ў свеце белым, за гарой крутой,
Можа, ў сне гаворыць любая са мной.

Не кувай, зязюленька, не кувай, харошая,
Не лічы так жаласна мне гады трывожныя!

Рэчанькі не будзе ўжо ніколі той,
Што паіла сэрца мне вадой жывой.
Любая не гляне ў вочы болей мне,
Не заззяе сонцам у маім акне.

Не кувай, зязюленька, не кувай, харошая,
Не лічы так жаласна мне гады трывожныя!

*чэрвень 1994 г.*

# ЛЕЦЕЙКА, БЫВАЙ!

Адлятае лета з родных берагоў,
За нязнаным светам будзе сніць сяброў.
Лецейка-вясёлка, жураўліны клін,
Залатое пёрка нам на шчасце скінь!

Сумны вырай у далёкі край
Гоніць восень, лецейка, бывай!

Будзеш сэрцу сніцца сцежачкай лясной,
Спелаю сунічкай, спеўнай цішынёй.
Не забудзем ласкі зорнага святла,
Красачкі купальскай, што ў бары цвіла.

Сумны вырай у далёкі край
Гоніць восень, лецейка, бывай!

Радасці-пацехі столькі ў нас было,
Як на конях верхам мчалі за сяло.
Вараных купалі у вадзе рачной,
Плёскаліся самі ў плыні люстраной.

Сумны вырай у далёкі край
Гоніць восень, лецейка, бывай!

*чэрвень 2002 г.*

# РЭХА ЖУРАЎЛІНАЕ

Рэха журалінае
Над зямлёю коціцца,
А краса-дзяўчыначка
Над ракой самоціцца:

– Журавы-журавачкі,
Птахі сумнакрылыя,
Так журліва-жаласна
Не курлычце, мілыя!

Можа, сустракалі дзе
Вы майго каханага?
Можа, вы што знаеце
Пра майго жаданага?

Ой, мая ты долечка,
Ой, мая ты горкая! –
Не вярнуўся жораў мой
З выраю далёкага...

– Журавы-журавачкі,
Птахі сумнакрылыя,
Так журліва-жаласна
Не курлычце, мілыя!

*люты 2000 г.*

# ОЙ, ЗІМА, ЗІМА

Ой, зіма, зіма беласнежная,
Светлых сноў маіх ты не разганяй! –
Хай прысніцца мне сонца веснае,
Хай асвеціць мой запаветны край.

Запаветны край – салаўіны гай
І дарога ўдаль у вянку бяроз.
Запаветны край – белы-белы май
І каханых воч сіні-сіні плёс.

Ой, зіма, зіма беласнежная,
Сцежачкі маёй ты не замятай! –
Хай бяжыць яна, летуценная,
І вядзе мяне ў запаветны край.

Ой, зіма, зіма беласнежная,
Мне журбы-тугі ты не навявай! –
Дні халодныя не бязмежныя,
Абдыму я зноў запаветны край.

*студзень 1991 г.*

# НАША РЭЧАНЬКА

Хай будзе рэчанька, хай будзе, родная,
Заўсёды чыстая, заўсёды поўная,
Заўсёды поўная, незамутнёная,
Навекі вечныя багаславёная!

Дзе я, казачанька, з табой спазналася,
На зыбкім чоўніку плыла, каталася,
Спявала песеньку, спявала даўнюю
Пра нашу рэчаньку, пра нашу слаўную.

Дзе мыла я тваю кашульку белую,
І ты на рукі браў мяне нясмелую,
На рукі браў і нёс, кружыў, мілуючы,
Як тая весняя вада, віруючы.

Дзе коніка твайго паіла гнедага,
Як адпраўляўся ты за свет нязведаны,
І слёзы праліла ліхой гадзінаю,
Цябе чакаючы, майго адзінага.

Хай будзе рэчанька, хай будзе родная
Заўсёды чыстая, заўсёды поўная,
Заўсёды поўная, незамутнёная,
Навекі вечныя багаславёная!

*чэрвень 2001 г.*

# ТВІСТ

Сёння ночка здаецца мне казкай, –
Колькі чараў навокал і ласкі! –
Чуеш, мілы, як музыка льецца,
І хінецца пяшчотна да сэрца.

Не бядуй, любы мой, не журыся,
Нібы саду асенняга ліст, –
Ты прысні, прыгадай
Белаквеценны май –
Я цябе запрашаю на твіст!

На дзівоснай мелодыі танца
Павяслуем на бераг юнацтва –
І забудзем з табой на хвіліну
Пра турботы і сум жураўліны.

Усміхнецца ўвесь свет, загамоніць,
Чарадзейныя гукі падхопіць,
Будуць весела з намі кружыцца
Месяц ясны і зоркі-начніцы...

Не бядуй, любы мой, не журыся,
Нібы саду асенняга ліст, –
Ты прысні, прыгадай
Белаквеценны май –
Я цябе запрашаю на твіст!

*ліпень 1998 г.*

## АЗЯРЦО

Сінь азёрная разліваецца,
Чайка белая лунае,
А дзяўчыначка-чараціначка
Слёзы горкія раняе:

– Азярцо маё, і мяне вазьмі –
Там, на дне тваім, мой мілы.
Меўся ўчора ён на спатканні быць,
Чаўначком прыплыць імклівым!

Любага майго я чакала тут,
Калі ўзняўся вецер стылы,
Гнаў на бераг мой хваляў грозны вал
І абломкі вёсел-крылаў!..

Азярцо маё, ой, вазьмі, вазьмі
І мяне ў той свет нязнаны –
Стану ў сінь-вадзе я русалачкай,
Каб навекі быць з каханым!

*лістапад 1998 г.*

# НЕ КУРЛЫКАЙ

Не курлыкай, не курлыкай, сумны вырай жураўліны,
Не гукай мяне, не клікай за таемны далягляд –
Як жа я магу пакінуць дарагія мне мясціны:
Нівы шчодрыя і хаты з вокнамі у сад!

Не курлыкай, не курлыкай, сумны вырай жураўліны,
Не гукай мяне, не клікай на чужыну, на чужыну!

А матуля мне што скажа за бяздомнае блуканне,
Колькі вылье слёз і думак палыновых наснуе,
Як зірне, з якім дакорам слаўных прадзедаў курганне!
І куды падзену, птахі, вочы я свае?

Не курлыкай, не курлыкай, сумны вырай жураўліны,
Не гукай мяне, не клікай на чужыну, на чужыну!

Хай там недзе на аргане акіян бяскрайні грае,
Хай шаманіць на тамтаме вышыня арліных гор, –
Толькі музыка другая мне душу перапаўняе,
Як пачую гуслі-хвалі Браслаўскіх азёр.

Не курлыкай, не курлыкай, сумны вырай жураўліны,
Не гукай мяне, не клікай на чужыну, на чужыну!

*лістапад 1995 г.*

## ЛЕТУЦЕННІЦА

Сад красуецца, сад праменіцца
Чарадзейным граннем –
Хлопец дзеўчыну-летуценніцу
Кліча на спатканне:

– Выйдзі, выйдзі ў сад, выйдзі ў зарапад,
Любая дзяўчына,
Летуценніца, летуценніца
З яснымі вачыма!

Цуда-вёсламі над азёрамі
Узмахнем з табою,
Паплывем удаль светлазорую
З песняй веснавою.

Паплывем удаль неаглядную
Зорным небакраем –
Знойдзем мы сваю зорку шчасную,
Знойдзем шлях да раю...

Выйдзі, выйдзі ў сад, выйдзі ў зарапад,
Любая дзяўчына,
Летуценніца, летуценніца
З яснымі вачыма!

*красавік 2000 г.*

# НЕЗАБЫЎНАЯ МАЯ

Без цябе, без цябе мне самотна і горка,
Без цябе, без цябе ў сэрцы гасне агонь.
Узыйдзі нада мной непагасная зорка,
Пасвяці, пасвяці мне з юнацтва майго.

Дзе я ні бываю, чую голас мілы,
Поўніцца табою неба і зямля,
Што ты нарабіла, што ты нарабіла,
Незабыўная мая?

Нараджаецца дзень і світае табою,
Неабдымную даль залівае святло.
Мкну-ляту я ў вясну, у былое-святое –
Што было, не прайшло і вадой не сплыло.

Мкну-ляту я ў вясну, ні на міг не спыніцца,
Сню і сню я цябе, сноў маіх не стрымаць.
П'ю і п'ю – не магу з той крыніцы напіцца,
Што каханнем назваў, буду век называць.

Дзе я ні бываю, чую голас мілы,
Поўніцца табою неба і зямля,
Што ты нарабіла, што ты нарабіла,
Незабыўная мая?

*травень 1996 г.*

# БОЖАЯ КАРОЎКА

Божая кароўка, Божая кароўка,
Узніміся ў неба, слаўная мая,
Запытайся ў Бога: дзе мая дарога
Заўтрашняга дня?

Божая кароўка, хочацца мне ведаць:
Дзе знайду-спаткаю шчасце я сваё?
Мо яно ў віхурным, нестрыманым ветры?
Мо яно пад мачтай дальніх караблёў?

Божая кароўка, запытайся ў Бога:
Ці я ўжо вярнуся ў залатыя сны,
Што мяне люлялі некалі малога
На азёрных хвалях роднай стараны?

Божая кароўка, Божая кароўка,
Узніміся ў неба, слаўная мая,
Запытайся ў Бога: дзе мая дарога
Заўтрашняга дня?

*жнівень 1993 г.*

# ПЕСНЯ ПРА МІНСК

О, векавечны горад мой!
Я заварожаны табой,
Красой нябесна-маладой, –
З цябе вачэй не звесці:
    З тваіх праспектаў і садоў,
    З царкоўных вежаў-купалоў,
    З арганнай Горкі Залатой,
    З Траецкага прадмесця.
Дзе б я ні быў на яве, ў сне,
Тужу па роднай старане,
Ляту, мой горад, да цябе,
Ляту з любой дарогі.
    Тваім асвечаны святлом,
    З табой будую вольны Дом,
    Схіляю голаў над Агнём
    На плошчы Перамогі.
Вяслую Свіслаччу-ракой,
Гляджу, як свеціцца зарой,
Лунае чайкай веснавой
Твой новы дзень, мой горад.
    Чаруй, дзівосны мой, чаруй,
    Імкні акрылена ўгару,
    Узнось Матулю-Беларусь
    Да самых ясных зораў!
Прыгожы, мужны, малады –
Табой не надзівіцца,
Мой родны Мінск, мой слаўны Мінск,
Краса-сталіца!

*верасень 1996 г.*

# АДПРАЎЛЯЎСЯ ХЛОПЕЦ НА ЧУЖЫНУ

Адпраўляўся хлопец на чужыну,
Варанога коніка сядлаў,
Да грудзей туліў красу-дзяўчыну,
Як суцешыць, любую, не знаў:

– Не тужы, не плач, мая князёўна,
Беражы-хавай пярсцёнак мой,
Зберагу я твой ручнік цудоўны,
На вяселле вытканы табой.

Вышываны ў зоры-зараніцы,
Дапаможа мне твой ручнічок
Устаяць прад бурай-навальніцай,
Перажыць халоднай ночы змрок.

Глянь, мая галубка, ў паднябессе –
Жураўы з далёкай стараны!
Так і я, дасць Бог, парою веснай
Прыляту дамоў на вараным…

Адпраўляўся хлопец на чужыну,
Варанога коніка сядлаў,
Да грудзей туліў красу-дзяўчыну,
Як суцешыць, любую, не знаў.

*верасень 2000 г.*

# АГНІ ЗАЛАТЫЯ

Электрастанцыі – сонцы зямныя,
Электралініі – промні святла.
Будзь прамяністай навекі, Айчына,
Болей не вернецца цемра-імгла!

Хай нам нялёгка сягоння жывецца,
Цешыць святло, што ў дамы падаём,
Свецяцца вокны, як нашыя сэрцы, –
Мора агню, дзе ні глянеш, кругом!

Болей не вернуцца страхі начныя
З дымнай лучынай далёкіх вякоў.
Людзі, прыміце агні залатыя:
Ласку сардэчную – нашу любоў!

*сакавік 2001 г.*



# Мілая спадарыня

# МІЛАЯ СПАДАРЫНЯ

**песенны альбом***

## ЦІШЫНЯ ЗВІНЕЛА

Цішыня звінела ў жытнім красаванні,
Ты зіхцела ў сонцы сінім васільком,
Залятала песняй у мае жаданні,
Акрыляла марай, ласкай і цяплом.
    Акрылі мяне, Алеся,
    Як калісьці марай весняй –
    Паляцім з табой за небакрай,
    Шлях абновім паднябесны,
    Цішыню разбудзім песняй,
    Вернемся у рай!

Цішыня звінела ў квецені садовай,
Ты калінай белай зваблівa цвіла,
Распускала косы хваляю шаўковай –
Я купаўся ў плыні русага святла.

Цішыня звінела на азёрных тонях,
Мы плылі з табою ў срэбранай вадзе,
Называў цябе я рыбкай залатою,
Дзякаваў нябёсам за шчаслівы дзень.
    Акрылі мяне, Алеся,
    Як калісьці марай весняй –
    Паляцім з табой за небакрай,
    Шлях абновім паднябесны,
    Цішыню разбудзім песняй,
    Вернемся у рай!

*лістапад 1993 г.*

* – *музыка Дзмітрыя Даўгалёва*

## РАКА КАХАННЯ

Рака цячэ, рака вірує,
Як думкі светлыя мае,
Душа мая табой святкуе,
Табой, каханы мой, пяе.
  Дзе б ні была я, у сэрцы
  Льецца кахання рака.
Жыве душа тваім паглядам,
Жыве пяшчотаю тваёй,
Цвіце яна вясновым садам,
Вірує зорнаю ракой.
  Дзе б ні была я, у сэрцы
  Льецца кахання рака.

Плыві, плыві са мной, каханы мой,
Шчаслівых дзён бясконцаю ракой!
Плыві, плыві са мной, каханы мой,
Плыві бясконцаю ракой!

Рака імкне да акіяна,
Да акіяна вешчых сноў,
Давай мы спраўдзім, мой каханы,
Усё, што сніцца нам вясной.
  Дзе б ні была я, у сэрцы
  Льецца кахання рака.

Плыві, плыві са мной, каханы мой,
Шчаслівых дзён бясконцаю ракой!
Плыві, плыві са мной, каханы мой,
Плыві бясконцаю ракой!

*травень 1992 г.*

# ДА СУЗОР'Я ЛЕБЕДЗЬ

Ні бяды, ні гора, ні бяды, ні гора,
Толькі сіне мора, ціша ды спакой –
Па нябесным моры да высокіх зораў
Мы плывем з табою казачнай парой.

Да сузор'я Лебедзь, да сузор'я Лебедзь
Мы плывем, як гусі-лебедзі, з табой –
Там, далёка недзе, ў лебядзіным свеце,
Дом збудуем светлы над ракой.

Дом збудуем светлы вокнамі да сонца,
Цэлы свет запросім за гасцінны стол –
Будуць цуда-песні чараваць бясконца,
Будзе з намі вечна зорны наш анёл.

Дом збудуем светлы, вогнішча распалім
Жарам зор і сэрцаў юных над Зямлёй –
Хай яна палае полымем кахання,
Не губляе сцежкі ў цемені начной.

Да сузор'я Лебедзь, да сузор'я Лебедзь
Мы плывем, як гусі-лебедзі, з табой –
Там, далёка недзе, ў лебядзіным свеце,
Дом збудуем светлы над ракой.

*лістапад 1995 г.*

# МІЛАЯ СПАДАРЫНЯ

То сумую лебедзем, у віры купаюся –
Дзе ты, чарнабровая?
То журуся жоравам, угару ўзнімаюся –
Адгукніся, родная!

Дзе ты, чарнабровая, дзе ты, светларусая?
Пра цябе я думаю, думаю штодня,
Бела-беларусачка, бела-беларусачка,
Мілая спадарыня!

То ў зары, то ў месяца пра цябе пытаюся:
Дзе мая заранachка!
То спакойна веру я: з выраю ты вернешся,
Веснавой журавачкай.

Мы з табою вернемся да бацькоўскіх весніцаў,
Нізенька паклонімся,
Упрыгожым песнямі хату нашу веснюю –
Зноў на свет народзімся.

Дзе ты, чарнабровая, дзе ты, светларусая?
Пра цябе я думаю, думаю штодня,
Бела-беларусачка, бела-беларусачка,
Мілая спадарыня!

*жнівень 1992 г.*

# БЕЛАЯ ЛІЛЕЯ

Спалынела сцежка там, дзе ты гуляла,
Зарасло азерца там, дзе ты плыла,
Там, дзе мроі-казкі вёсламі люляла,
Там, дзе самай вабнай кветкаю цвіла.

– Белая лілея! – азярына кліча,
– Белая лілея! – журыцца зямля,
Белая лілея, дзе ты, чараўніца,
Белая лілея, любая мая?

Кажуць, ты ўзнялася чайкаю адлётнай,
Позіркам самотным далеч абняла...
А мне ўсё здаецца: ты ля хаты роднай –
Адцвісці так рана кветка не магла.

Ля крыніцы светлай свеціцца надзея –
Тут я адшукаю след жаданы твой.
Дзе ты, адгукніся, белая лілея,
Супакой мне сэрца – дай вады жывой.

– Белая лілея! – азярына кліча,
– Белая лілея! – журыцца зямля,
Белая лілея, дзе ты, чараўніца,
Белая лілея, любая мая?

*ліпень 1993 г.*

## ДЛЯ ЦЯБЕ АДНОЙ

Недзе за гарой,
За гарой крутою,
След згубіўся твой
Юнаю парою.
Для цябе адной
Сны мае і мроі,
Сад саджу вясной
Для цябе адной.

Расцвіце ён, расцвіце,
Белым цветам замяце,
Замяце ён свет чароўна.
Адгукніся на красу
І развей, развей мой сум,
І развей мой сум, Алёна!

Па табе адной
Я згараю сэрцам.
Ой, калі ж яно
Радасна заб’ецца?
Сад саджу вясной,
Даглядаю дрэўцы
Для цябе адной,
Для цябе адной.

Расцвіце ён, расцвіце,
Белым цветам замяце,
Замяце ён свет чароўна.
Адгукніся на красу
І развей, развей мой сум,
І развей мой сум, Алёна!

*снежань 1993 г.*

## БЕЛАСНЕЖКА

Што за дзіва засвяціла? –
Светла-светла навакол.
Беласнежка? Божа мілы!
Белакрылы мой анёл!

Беласнежная усмешка,
Белізна шаўковых кос...
Беласнежка, Беласнежка,
Ты адкуль, з якіх нябёс?

Пэўна, ты з дзівоснай казкі,
З таямнічай стараны:
Светлыні тваёй і ласкі
Сэрца прагне, як вясны.

У вачах тваіх палае
Сінь далёкіх берагоў,
Калыхае, калыхае
Човен мар маіх і сноў...

Беласнежная усмешка,
Белізна шаўковых кос...
Беласнежка, Беласнежка,
Ты адкуль, з якіх нябёс?

*сакавік 1992 г.*

## ТЫ ПАЧУЙ МЯНЕ

Я малю цябе, як Бога, і прашу,
Ты пачуй мяне, каханая, пачуй:
Ашчасліў маю самотную душу –
Падаруй ты мне сыночка, падаруй.

Ты пачуй мяне, каханая, пачуй:
Падаруй ты мне сыночка, падаруй!

Калыханку я складу яму, спяю:
– Падрастай, мой слаўны хлопчык, падрастай.
Будзем разам мы любіць мацней зямлю,
Саграваць сардэчнай песняй родны край.

Ты пачуй мяне, каханая, пачуй:
Падаруй ты мне сыночка, падаруй!

На руках яго ўзніму над галавой
І скажу яму: – Бясконцы твой прастор,
Набірайся моцы-сілы незямной,
Паляцім, крылаты мой, да ясных зор.

Ты пачуй мяне, каханая, пачуй:
Падаруй ты мне сыночка, падаруй!

*сакавік 1995 г.*

# МЫ АДНЫ З ТАБОЙ НА СВЕЦЕ

Зорны лівень залацісты ціха-ціха льецца,
У святле таемным тоне неба і зямля...
Мне чамусьці, мой каханы, ў гэты міг здаецца:
Мы адны з табой на свеце – толькі ты і я.

Мне здаецца, мне здаецца:
Мы адны з табой на свеце –
Толькі ты і я, толькі ты і я.

Сцежка ўецца ў жыце росным,
Песня ўвысь імкнецца,
На развесненай жалейцы грае цішыня...
Мне чамусьці, мой каханы, ў гэты міг здаецца:
Мы адны з табой на свеце – толькі ты і я.

Мне здаецца, мне здаецца:
Мы адны з табой на свеце –
Толькі ты і я, толькі ты і я.

Ні трывогі, ні самоты, лёгка-лёгка сэрцу,
Азярынаю бяздоннай ласкавасць твая...
Мне чамусьці, мой каханы, ў гэты міг здаецца:
Мы адны з табой на свеце – толькі ты і я.

Мне здаецца, мне здаецца:
Мы адны з табой на свеце –
Толькі ты і я, толькі ты і я.

*чэрвень 1992 г.*

# АЛЁНА–АЛЁНКА

Спаткаўся з табой я светлай парой –
Ты вішанькай белай у садзе цвіла,
Бы ў казачным сне, ўсміхнулася мне,
У дзіўнае дзіва мяне павяла.

Азёрная сінь – як музыкі плынь,
Над вёсламі ўзнёсла ліецца святло:
Куды мы плывем, плывем і плывем? –
Так мройна-узнёсла яшчэ не было.

Так мройна-узнёсла ніколі яшчэ не было.
Алёна-Алёнка, ты – мроя мая і святло!

У сэрцы ўзышлі, цяпло разлілі
Пяшчотныя словы і песні твае –
Звініць небакрай, заслухаўся гай,
Замоўк салавейка на міг, не пяе.

Нябесны прастор, мелодыя зор,
Высока-высока лунае крыло:
Куды мы ляцім, ляцім і ляцім? –
Так зорна-высока яшчэ не было.

Так зорна-высока ніколі яшчэ не было.
Алёна-Алёнка, ты – неба маё і крыло!

*травень 1993 г.*

# ТЫ ТОЛЬКІ ЎСЛУХАЙСЯ, АЛЕСЯ

Які святы вясны пагляд,
Якая музыка святая! –
Квітнее сад, як зарапад,
Зязюлька вешчая кувае.

Ты толькі ўслухайся, Алеся,
Мой залаты праменьчык весні,
У гэты Божы спеў жыцця! –
Здаецца, свет увесь кувае
Пра наша светлае каханне,
Пяе пра святасць пачуцця!

Нібы ляцім з табой да зор,
Душа набожна замірае:
Гучыць арганам шчыры бор,
Зязюлька вешчая кувае.

Нібы зайшлі ў нябесны рай,
У сэрцы радасць незямная:
Звініць харалам ясны гай,
Зязюлька вешчая кувае...

Ты толькі ўслухайся, Алеся,
Мой залаты праменьчык весні,
У гэты Божы спеў жыцця ! –
Здаецца, свет увесь кувае
Пра наша светлае каханне,
Пяе пра святасць пачуцця !

*сакавік 1994 г.*

# АЙ ДЫ ЖОНАЧКУ Я МАЮ

Жыў адзін – бяды не ведаў:
У дарозе я абедаў,
У дарозе на марозе начаваў,
За гарамі, за марамі
Весяліўся я з сябрамі,
Гора-ліха лёгка абмінаў.

А як толькі ажаніўся,
Нібы ў бездань праваліўся,
Што я, Божа, што я нарабіў!
Ай ды жоначку я маю! –
Пад замком мяне трымае,
Каб да іншых, іншых не хадзіў.

Ды які з мяне хаджэнец! –
Жонка вытрасе кішэні –
І сяджу я без адзінага граша.
Эх, бывайце, донны-панны,
Не хадзіць мне ў рэстараны,
Не пяе замкнёная душа!

Жыў адзін я без турботы,
Ад суботы да суботы
Весяліўся, забаўляўся, як хацеў:
То зарою любаваўся,
То з заранкай мілаваўся,
То ўслед за мроямі ляцеў.

*красавік 1994 г.*

# ОЙ, ЛЯЦІ, ЗЯЗЮЛЕНЬКА

Ой, ляці, зязюленька, у далёкі край,
Закувай там жаласна, закувай! –
Недзе там каханы мой, нібы снег, растаў,
Як паехаў з дому ён – і прапаў.

Закувай, зязюленька, ў тым чужым краі,
Едзе там казачанька на кані,
Скача з вострай шабелькай па крутых гарах –
Сніцца мне мой Ясенька па начах!

Закувай, зязюленька, ў тым чужым краі,
Свет маімі слёзкамі затапі –
Хай пачуе Ясенька горкі мой адчай
І паверне коніка ў родны край!..

Ой, ляці, зязюленька, у далёкі край,
Закувай там жаласна, закувай! –
Недзе там каханы мой, нібы снег, растаў,
Як паехаў з дому ён – і прапаў.

*студзень 1997 г.*

# АКІЯН ЖЫЦЦЯ

Сэрца ўратавала я ў расстанні,
Для цябе, мой любы, зберагла.
Ты ратуй цяпер мяне каханнем,
Не шкадуй сардэчнага цяпла.

Добры мой, шчыры мой,
Для мяне ты – сон світальны,
Для мяне ты – ясны шлях,
Веснавы прасцяг.
Ты – жаўрук з Божых рук,
Спеўны гук выратавальны:
Зацiхае пры ім акіян жыцця.

Акіян жыццёвы неспакойны –
Ён шуміць і пеніцца штодня.
Мне не страшна, калі я з табою,
Не пужае бездань-глыбіня.

Нашых мараў ветразь белакрылы
Мкне на хвалях веры і надзей.
Жаўручок, спявай, спявай, мой мілы,
Да пляча тулі мяне мацней.

Добры мой, шчыры мой,
Для мяне ты – сон світальны,
Для мяне ты – ясны шлях,
Веснавы прасцяг.
Ты – жаўрук з Божых рук,
Спеўны гук выратавальны:
Зацiхае пры ім акіян жыцця.

*чэрвень 1993 г.*

# ДАРОГА ДА НЕБА

На гуслях надзеі я граю ды граю,
Мелодыя льецца, як звонкае срэбра:
Дарогу да сэрца твайго пракладаю –
Дарогу да неба, да неба.

Дарогу да неба – да сэрца твайго –
Ой, як жа нялёгка праклaсці, –
Дарогу да зорных, святых берагоў,
Дарогу да шчасця, да шчасця!

Да неба вясновых тваіх летуценняў
Высока-высока, вышэй як да сонца!
У неба вясёлых тваіх захапленняў
Гукаю, гукаю – ні слоўца!

То светлаю марай, то шчыраю песняй
Кружу і ляту я, сусвет абдымаю,
І веру я, веру у шлях мой нябесны –
Мяне прывядзе ён да раю.

Дарогу да неба – да сэрца твайго –
Ой, як жа нялёгка праклaсці, –
Дарогу да зорных, святых берагоў,
Дарогу да шчасця, да шчасця!

*верасень 1993 г.*

## КАХАННЯ ЛІВЕНЬ

Вясёлы дождж, нібы прыбой,
Шуміць тваім вяртаннем,
Віруе песняй веснавой,
Звініць каханнем.

Была зіма, віхурыў снег,
Гучаў напеў трывожны,
Ды, дзякуй Богу, зноў пяем
Пра лівень зорны.

Мы зноў плывем у сон шчаслівы,
Душой пяем, як і раней:
Кахання лівень, кахання лівень,
У сон шчаслівы гукай часцей!

Ты нас, былое, не трывож
Разлукаю тужлівай –
У сэрцы дождж, у сэрцы дождж,
У сэрцы лівень.

Была пара журлівых сноў,
Самотнага блукання,
Ды лёс нам даў вярнуцца зноў
У дождж кахання.

Мы зноў плывем у сон шчаслівы,
Душой пяем, як і раней:
Кахання лівень, кахання лівень,
У сон шчаслівы гукай часцей!

*ліпень 1993 г.*

# БЕРАЖАНКА–ЛАСТАЎКА

Нібы зоры – ластаўчыны гнёзды
На пясчанай кручы над вадой...
Помніш, як на беразе азёрным
З ластавак дзівіліся з табой?

Так яны лялі чарадзейна,
Шчабяталі – цешылі да слёз!
І мы самі з песнямі ляцелі
У чаўночку мройным да нябёс.

Ды, на жаль, пакінулі мы вёслы
І марнуем дні ў чужых краях.
Беражы дзівосы нашых вёснаў,
Беражанка-ластаўка мая!

Як згадаю ластаўчыны гнёзды,
Сэрца аж заходзіцца журбой! –
Ой, чаму, скажы, ў старонцы роднай
Не звілі гняздзечка мы з табой?

Помніш, як аднойчы ранкам сінім
На таемны востраў мы плылі,
І махалі ластавачкі крыллем –
Нам жадалі казачных хвілін?..

Ды, на жаль, пакінулі мы вёслы
І марнуем дні ў чужых краях.
Беражы дзівосы нашых вёснаў,
Беражанка-ластаўка мая!

*чэрвень 2003 г.*

## ЦЯЖКА САДУ БЕЗ ЗЯЗЮЛІ

Лье малодачка слёзы горкія
І зязюленьку просіць мройна:
Ой, зязюленька лёгкакрылая,
Паляці ў садок мой зялёны!

Закувай-заплач, птаха сумная,
Пад акном маёй маці мілай,
Хай матуленька чуе, родная,
Як мне без яе сіратліва.

Цяжка саду без зязюлі,
Як без ласкавага сонца,
Цяжка доньцы без матулі
У чужой старонцы.

Забяры мяне, мая мамачка,
Да сябе скарэй ад свякроўкі,
Па мяне прыйшлі майго браціка,
Калі любіш ты сваю доньку.

Ой, матуленька, каб я ведала,
Што так буду тут сумаваці,
Што так будзе мне ў свеце цяжанька,
Век сядзела б я ў роднай хаце!

Цяжка саду без зязюлі,
Як без ласкавага сонца,
Цяжка доньцы без матулі
У чужой старонцы.

*жнівень 2003 г.*

# КЛЁН З ТАПОЛЯЮ

Клён з таполяю, клён з таполяю
Полю роднаму век адданыя.
Толькі мы з табой, толькі мы з табой
Ад зямлі святой адарваныя.

Клён з таполяю, клён з таполяю
Не нагледзяцца ў сінь азёрную.
Толькі мы з табой, толькі мы з табой
Абнялі журбой даль бязродную.

Клён з таполяю, клён з таполяю
Песні слухаюць салаўіныя.
Толькі мы з табой, толькі мы з табой
Чуем воклічы жураўліныя...

Клён з таполяю, клён з таполяю
Полю роднаму век адданыя.
Толькі мы з табой, толькі мы з табой
Ад зямлі святой адарваныя.

*верасень 1994 г.*



# Літвіначка



Уладзімір Пецюкевіч каля помніка кампазітару
Ст.Манюшку
г. Вільня. 2004 г.

# ЛІТВІНАЧКА

**песенны альбом***

## ПРЫДЗІ З ЧАРОЎНЫХ СНОЎ

Мне ў краі чужым душою не прыжыцца...
Беларусь мая, прыдзі з чароўных сноў –
Прытуліся мне да сэрца Мілавіцай,
Асвяці круты мой шлях дамоў!

Без цябе мне тут халодна і завейна,
Забяры мяне, Радзіма, ў родны дом –
Прытуліся мне да сэрца салавейкам
У вясновым садзе пад акном.

Зачаруй мяне кароткай летняй ночкай,
Хараством забаў, купалак і вянкоў –
Прытуліся мне да сэрца васілёчкам,
Абнімі жытнёвым каласком...

Мне ў краі чужым душою не прыжыцца...
Беларусь мая, прыдзі з чароўных сноў –
Прытуліся мне да сэрца Мілавіцай,
Асвяці круты мой шлях дамоў!

*кастрычнік 1999 г.*

* – *музыка Дзмітрыя Даўгалёва*

# ГУСІ–ЛЕБЕДЗІ

Ой, вы птахі мае, гусі-лебедзі,
Не спяшайцеся так, лёгкакрылыя,
Вы вазьміце мяне на агледзіны
Залатых астравоў мора сіняга!

Ой, вы птахі мае, гусі-лебедзі,
Вы вазьміце мяне на агледзіны!

З явай казачнай там я сустрэнуся –
І мне ў шчасце зямное паверыцца:
Лебядзіным каханнем і вернасцю
Мой асвеціцца шлях, развясенніцца.

Ой, вы птахі мае, гусі-лебедзі,
Вы вазьміце мяне на агледзіны!

Рэхам песні марской дні адкоцяцца,
Адплывуць, адшумяць белым ветразем –
І натхнёна-шчаслівай лябёдзіцай
Я вярнуся дамоў з мілым лебедзем.

Ой, вы птахі мае, гусі-лебедзі,
Вы вазьміце мяне на агледзіны!

*снежань 1998 г.*

## НАВАСЕЛЬНАЯ

Гаспадару, гаспадару,
За цябе ўзнімаем чару,
Расчыняем нашы дзверы насцеж…
    Каб не знаўся век з бядою,
    Мы падковай залатою
    Падкуем твой дом на шчасце!

Гаспадару, гаспадару,
Светлых сноў табе і мараў
І нябесна-зорнага натхнення…
    Каб жылося ў весялосці,
    Не вялося ў хаце злосці,
    Мы табе даруем пеўня!

Гаспадару, гаспадару, –
Каб у хаце валадарыў
Дух багацця – водар караваю,
    Мы табе не толькі песні,
    Дзежку хлебную прынеслі
    І на кут пачэсны ставім!

*верасень 1999 г.*

## РУСАЛКА

Сняцца родныя сінія далі,
Сняцца цёплыя рукі твае,
Што калісьці мяне абдымалі
І гублялі ў траве-мураве.

Наўздагон за імклівай смуглянкай
Бег я ветрам да светлай вады –
Ты нябесна-крылатай русалкай
Снішся-мроішся мне праз гады.

Год за годам імкне – не стрымаць,
Даганяю цябе – не дагнаць.
Сумна стукае сэрца штодня:
Не мая, не мая, не мая!

С крутабокага берага смела
Мы кідаліся ў хвалі з табой,
Ты плыла – нібы чайка ляцела –
Пад вясёлкай пары маладой.

Ты плыла, напявала: – Мой мілы,
Больш не будзе ўжо гэткага дня!
Таямнічай усмешкай свяціла:
– Дагані – і навек я твая!

Год за годам імкне – не стрымаць,
Даганяю цябе – не дагнаць.
Сумна стукае сэрца штодня:
Не мая, не мая, не мая!

*кастрычнік 1997 г.*

## БРАСЛАЎЧАНКА

На страсе – вясёлая буслянка,
На стале – духмяны каравай…
Добры дзень, красуня-браслаўчанка,
Земляка з дарогі прывітай!

У тваіх вачах адбітак сонца
І азёрнай сіні глыбіня,
Я гатоў купацца ў іх бясконца –
Мілавацца чарамі штодня.

Нагадала ты мне беражанку,
Што кахаў калісьці юнаком,
Зачаруй мне сэрца, браслаўчанка,
Незабыўнай песняй рыбакоў!

Я пачуў цябе з далёкай далі,
Прыляцеў на спеўны голас твой,
Акрылі надзеі песняй даўняй,
Сілы дай мне ўзвысіцца душой.

Закружы ў чароўным карагодзе,
Абудзі мне юны неспакой, –
Маладыя хлопцы-рыбалоўцы
Уздыхнуць зайздросна над вадой…

Нагадала ты мне беражанку,
Што кахаў калісьці юнаком,
Зачаруй мне сэрца, браслаўчанка,
Незабыўнай песняй рыбакоў!

*лістапад 1990 г.*

# НАС ВЯНЧАЛІ АНЁЛЫ

Нас вянчалі анёлы
Ў святочна-нябесным касцеле,
Бласлаўлялі ў таемна-бязмежным разліве святла –
Нам калядныя свечкі
На ёлках, як зоркі, гарэлі
І анёльская музыка з Вечнасці ў сэрца плыла:

– Авэ Марыя!

Прамаўлялі анёлы
Над намі малітвы-літанні –
Нам у Бога прасілі дарогі натхнёна-святой...
Мы, здавалася, самі
Анёламі ў Небеляталі
І крылом атулялі зямлю і ўвесь свет над зямлёй...

– Авэ Марыя!

Нам жадалі анёлы
Штодзённага з Небам спаткання,
Спавівалі нам рукі яны ручніком залатым...
Мы з табой прысягалі
На вернасць і вечнасць кахання
Перад Богам Айцом, Сынам Божым
і Духам Святым...

– Авэ Марыя!

*студзень 1996 г.*

# ОЙ, ЛЯЦІ, КАЗАЧАНЬКА

Да цябе, казачанька, шлях даўгі-даўгі,
Да цябе і ластаўкай мне не даляцець,
Снішся мне ўсе ночанькі, любы, дарагі,
Я зачараваная, ты – мой чарадзей.

Дзе твая дарожанька, у якіх краях?
Пра цябе пытаюся ў птушак і вятроў,
За цябе малюся я, за твайго каня,
За імклівасць лёгкую срэбраных падкоў.

Песня спавядаецца ў немай цішыні,
Голас мой зрываецца, змучаны тугой...
Ой, ляці, казачанька, мчыся на кані
Ў родную старонaчку, на падворак мой!..

Да цябе, казачанька, шлях даўгі-даўгі,
Да цябе і ластаўкай мне не даляцець,
Снішся мне ўсе ночанькі, любы, дарагі,
Я зачараваная, ты – мой чарадзей.

*ліпень 1993 г.*

# ПАЖАДАЙ МНЕ, МАМА

Пажадай мне, мама, пажадай мне
Ясных дзён і самых светлых сноў! –
Я іду ў нязведанныя далі
Вечным полем горкіх палыноў.

Я іду на кліч світальнай чайкі –
Недзе там світае ранак мой,
Недзе там спаткаю вечнасць бацькі,
Што ўзышла курганнаю гарой.

Недзе там, за той гарой святою
Наталю душу з жывых крыніц
І знайду я, мама, краску-долю
У святле купальскіх зараніц.

Недзе там, за той гарой святою,
Я не раз згадаю твой наказ:
– Помні, сын: і ты, як бацька, волю
Заслані сабой у грозны час!..

Пажадай мне, мама, пажадай мне
Ясных дзён і самых светлых сноў! –
Я іду ў нязведанныя далі
Вечным полем горкіх палыноў.

*чэрвень 1998 г.*

## ЛІТВІНАЧКА

Перахрысціла доля нас у беларусаў.
Мы называліся літвінамі здаўна.
Цябе літвіначкай назваць мне так спакусна,
Святое слова хай звініць, нібы струна.

Літвіначка, літвіначка,
Майго жыцця святлiначка,
Чырвоная касыначка,
Бялюткая каса.
Літвіначка, літвіначка,
Купальскіх зор іскрыначка,
Пявуння-весялiначка,
Славянская краса!

Мы ганарымся, будзем вечна ганарыцца:
Вялікакняская дзяржава ў нас была,
Не наталіцца нам з яе жывой крыніцы,
Крыніцы боскага натхнення і святла.

Плывем з табою мы глыбокаю ракою,
Ракою велічы і славы даўніх дзён,
Ляцім з табою мы на крылах песні-мроі
За ветрам вольніцы літвінскай наўздагон.

Літвіначка, літвіначка,
Майго жыцця святлiначка,
Чырвоная касыначка,
Бялюткая каса.
Літвіначка, літвіначка,
Купальскіх зор іскрыначка,
Пявуння-весялiначка,
Славянская краса!

*травень 1996 г.*

## НАРАЧ

– Нарач, Нарач – Нара, Ач! –
Над вадою чаек плач.
Ой, чаму яны рыдаюць,
Гэтак сэрца нам кранаюць?

Мо не могуць расказаці нам іначай
Пра няшчаснае каханне Нары з Ачам,
Што пакінулі паданне на зямлі,
Як яны пачуцці берaглі.

Мо прыпомнілі, як вырвалася Нара
З хіжых панскіх рук і пацерак не стала:
Падарунак Ача след пакінуў скрозь –
Сінія азёры, поўны слёз.

– Нарач, Нарач – Нара, Ач! –
Над вадою чаек плач.
Ой, чаму яны рыдаюць,
Гэтак сэрца нам кранаюць?

Мо яны згадалі, як ад пана злога
Нара кінулася з берага крутога,
Як забралі Ача гайдукі ў палон,
Калі ратаваў дзяўчыну ён.

Мо таму, што забываем пакланіцца
На Купалле прыгажуням-беражніцам,
Што выходзяць апаўночы з цёмных вод,
Разам з Нарай водзяць карагод.

*люты 2002 г.*

## РЫБКА ЗАЛАТАЯ

Як на сінім на Дунаі
Ды Ігнат купаўся,
Да дзяўчыны-прыгажуні
Шчыра заляцаўся:

–Ганна, Ганначка, Ганулька,
Рыбка залатая,
Не плыві ты гэтак хутка –
Сіл дагнаць не маю!

Па Дунаі разгайдайным
Хваля ў бераг б'ецца,
А гарэзлівая Ганна
Весела смяецца:

–Ой, Ігнатка, не ўтапіся,
Калі сіл не маеш,
А яшчэ казаў-бажыўся,
Што мяне кахаеш!

–Ганна, Ганначка, клянуся:
Далібог, кахаю –
Як з табою расстаюся,
Не магу, ўміраю!

–Ах, мой бедненькі Ігнатка,
Не ўмірай, прашу я,
Ты злаві, злаві спачатку
Рыбку залатую.

*снежань 1995 г.*

## РЭЧКА–РЭЧАНЬКА

Рэчка ўдаль бяжыць, праменіцца
Па лясах, палях, па аселіцах,
Мору сіняму паклоніцца,
І зліецца з ім, супакоіцца.

Толькі я адна – самотніца,
Песня сумная з сэрца коціцца –
Любага свайго, адзінага
Клічу з выраю лебядзінага.

Рэчка-рэчанька глыбокая,
Дзе, скажы, падзець долю горкую? –
Як вярбінку тую тонкую,
Гнуць вятры мяне, адзінокую.

Ой, вазьмі мяне ты, рэчанька, –
Паплыву за свет я лябёдачкай:
Там каханы мой на сінь-вадзе
Недзе плавае белым лебедзем...

Рэчка ўдаль бяжыць, праменіцца
Па лясах, палях, па аселіцах,
Мору сіняму паклоніцца,
І зліецца з ім, супакоіцца.

*лістапад 1983 г.*

# ЭХ, ВАЗЬМУ Я ДУДКУ

Эх, вазьму я дудку, дудку-самаграйку –
Зашуміць азерца – хвалі цераз край:
– Дзе ж ты, адгукніся, прыгажуня-чайка,
Прыляці, вярніся ў наш блакітны край!

Эх, вазьму я дудку, дудку-самаграйку –
Запяю-зайграю, пагукаю чайку!

Запяю пра тую, вечна маладую,
З позіркам ласкавым, сэрцам залатым:
– Ой, вярніся, чайка, на зямлю святую –
Прыгадай азерца з беражком крутым.

Эх, вазьму я дудку, дудку-самаграйку –
Запяю-зайграю, пагукаю чайку!

Запяю пра тое шчасце незямное,
Што са мною побач некалі ішло:
– Ой, вярніся, чайка, да нябесных мрояў –
Нас чакае ў небе зорнае вясло!

Эх, вазьму я дудку, дудку-самаграйку –
Запяю-зайграю, пагукаю чайку!

*сакавік 1994 г.*

# ГОЛУБ ГАЛУБКУ ЦАЛУЕ

Голуб галубку цалуе-мілуе,
Штосьці пяшчотнае бае...
Маці трывожыцца, маці сумуе,
Донечку-доню чакае.

Ой, не трывожся, матуля, дарэмна! –
Донечку неба вартуе:
Пад зарападам анёльска-таемным
Голуб галубку цалуе.

Чуеш, матуля, як весела ў садзе?
Чуеш, як доня спявае?
Хай жа галубка натоліцца шчасцем,
Покуль яшчэ маладая.

Маці-матуля, не плач, не журыся!
Помніш дзівосную казку? –
Помніш, як ты буркавала калісьці
З голубам ясным да ранку?..

Голуб галубку цалуе-мілуе,
Штосьці пяшчотнае бае...
Маці трывожыцца, маці сумуе,
Донечку-доню чакае.

*снежань 1995 г.*

# АСЯНІНЫ

Ранак ззяе так прасветла і шчымліва,
Нібы грае на жалейцы жураўлінай, –
Сёння кожны двор прыбраны і гасцінны –
Асяніны, асяніны, асяніны!

Хто там дзынкнуў у акенца зухавата?
Мо Дзяды ўжо на двары? Гукнем у хату,
Паднясем мы ім свае дары-даніны –
Асяніны, асяніны, асяніны!

Спелых яблыкаў і хлеба свежы водар,
Верашчака і бліны ды чарка мёду –
І пальюцца задушэўныя ўспаміны –
Асяніны, асяніны, асяніны!

Людзі добрыя, у госці завітайце,
Будзем разам мы з Дзядамі частавацца!
Сёння свята нашай Памяці глыбіннай –
Асяніны, асяніны, асяніны!..

Ранак ззяе так прасветла і шчымліва,
Нібы грае на жалейцы жураўлінай, –
Сёння кожны двор прыбраны і гасцінны –
Асяніны, асяніны, асяніны!

*травень 1996 г.*

## АД ПАНЯДЗЕЛКА – ДА ПАНЯДЗЕЛКА

Ў панядзелак – што са мной?! –
Росна мне і млосна,
Галава гудзе, як рой,
Проста невыносна.

У аўторак – не спыніць! –
Гужам – планы-мроі,
У руках усё гарыць,
Хоць тушы вадою.

Ў сераду душа пяе,
Сам з сябе дзіўлюся:
Выганяю нормы дзве,
Выгнаць тры – баюся.

У чацвер, што ў сераду,
Не шкадую сілы,
Пераводжу ледзьве дух –
Ух ты, Божа мілы!

У пятніцу, што ў чацвер…
Ды ўсё роўна жонка
Мне аддзячыць – абзаве
Лежнем-абібокам.

У суботу раніцой
Я ляту да цешчы,
Там касьба тупой касой
Гне ў дугу мне плечы.

У нядзелю – ў дзень святы –
Цешча ў луг не гоніць,
На стале сыры-мяды,
Чарка кругам ходзіць.

*студзень 1998 г.*

## ДЗЕ Ж ВЫ, МАЕ МАЛАДЫЯ ДЗЯНЬКІ?

Дзе ж вы, мае маладыя дзянькі,
Вырай вясны карагоднай?
Можа, у мора сплылі, як вянкі,
Плынню рачной, незваротнай?

Можа, вы ззяеце ў любых вачах
Водсветам кветкі купальскай?
Можа, да зор пракладаеце шлях
Самай дзівоснаю казкай?

Можа, у сэрцах людскіх узышлі
Песняй маёй спавядальнай,
Вечнай любоўю да роднай зямлі,
Самай святой і жаданай?..

Ўдалеч нямую гляджу з-пад рукі,
Сцежкі віюцца крутыя...
Дзе ж вы, мае маладыя дзянькі,
Дзе ж вы, мае залатыя?

*ліпень 1996 г.*

# ДРУЖА, НЕ СУМУЙ

Адцвіла вясна – не да песень птушкам.
Ці не час і нам прыцішэць, мой дружа?
Казка – маладосць, ды, на жаль, мінае.
Хай твая душа цяжка не ўздыхае.

Ну іх, братка мой,
Гэтыя залёты:
Ані ўночы сну,
Ані ўдзень работы!

Годзе ўжо хмялець ад дзявоцкіх чараў,
Годзе па начах брынкаць на гітары.
Вокны да зары аганькамі ззяюць,
Мацяркі не спяць, блуднікаў чакаюць.

Ну іх, братка мой,
Гэтыя залёты:
Ані ўночы сну,
Ані ўдзень работы!

Ты сваю знайшоў, я сваю нагледзеў,
Дружа, не сумуй, што ў сваты паедзем.
Як бы не гуляў і сябе не цешыў,
Ды ўступіць пара сцежку маладзейшым.

Ну іх, братка мой,
Гэтыя залёты:
Ані ўночы сну,
Ані ўдзень работы!

*ліпень 2002 г.*

# БЫВАЙ, ДВАЦЦАТЫ ВЕК

Сплыло дзве тысячы гадоў
Ракой бурлівай Новай эры,
У Лету кануў – адыйшоў
Дваццаты век туманам шэрым.

Было нямала ясных дзён,
А болей – горка-палыновых:
Па кім так звоніць медны звон?
Каго яшчэ змяце Чарнобыль?

Век дваццаць першы ўдаль заве,
А расставанне сэрца паліць:
– Бывай, бывай, дваццаты век,
Вяртайся ў памяць!

Мы азіраемся назад,
Каб параўняцца з хуткім часам,
І сеем поле, садзім сад
Вялікай будучыні нашай.

Скідаем з плеч нядолі груз,
Вяртаем гонар свой і годнасць –
Вядзе нас Маці-Беларусь
У новы век дарогай вольнай.

Век дваццаць першы ўдаль заве,
А расставанне сэрца паліць:
– Бывай, бывай, дваццаты век,
Вяртайся ў памяць!

*люты 1999 г.*



# Птушыны кірмаш

# ПТУШЫНЫ КІРМАШ

**дзіцячая музычная казка***

## ПЕСНЯ – УСТУП

*( спяваюць усе ўдзельнікі кірмашу )*

Тук-тук-тук, ча-ча-ча, чык-чырык, курлы,
Дзінь-дзінь, глю, чуф-чуф, кар,
Добры дзень, сябры!

Вас вітае, сонцам свеціць,
Непаўторны наш,
Самы лепшы ва ўсім свеце
Песенны кірмаш.

Тут заўважаць і ацэняць
Талент спевака,
Тут высокага натхнення
Плешчацца рака.

Тут рука руку не мые,
Подкупу няма.
Злосных, хітрых, ганарлівых
Тут шукаць дарма.

Тук-тук-тук, ча-ча-ча, чык-чырык, курлы,
Хто ёсць хто, вы самі ўбачце,
Юныя сябры!

* – *музыка Дзмітрыя Даўгалёва*

## ПЕСНЯ ЖАЎРУКА

Крылам – неба яснае.
Песні – свет нязмераны.
Я спяваю, кажуць мне,
Як званочак срэбраны.

Так гаворыць сонейка,
Зоркі, месяц, воблакі.
І ў мяне бяссонніца:
Хто ж я, хто я ўсё-такі?

Як жа мне даведацца:
Добрых слоў ці варты я?
На кірмаш наведацца?
Чым жа ён парадуе?

Дзінь-дзінь-дзінь, – я думаю,
Свет зачараваці як
Нашай песняй цуднаю,
Што пачуў ад маці я.

# ПЕСНЯ ВЕРАБ'Я

Я – Верабей, за ўсіх мацней,
Мне сіне мора па калена.
Я не баюся злых завей,
А запяю – трасуцца сцены.

Чык-чык-чырык, чык-чык-чырык!
А ці не праўда – мілагучна?
Спявае іншы – рык ці крык,
Яшчэ другога, невук, вучыць.

Чык-чык-чырык, чык-чык-чырык,
Я – Верабей, за ўсіх мацней.
Чык-чык-чырык, чык-чык-чырык,
Я – Верабей, за ўсіх мацней!

Калі вучыцца – ў Вераб'я!
Хоць і жаўрук мой здольны вучань,
Але ніяк не возьме "ля",
Чык-чык-чырык, зусім замучыў.

Чык-чык-чырык, чык-чык-чырык!
Услухайся, цягні за мною.
Ізноў сфальшывіў? Правучыць
Цябе, жаўрук, як след, лазою!

Чык-чык-чырык, чык-чык-чырык,
Я – Верабей, за ўсіх мацней.
Чык-чык-чырык, чык-чык-чырык,
Я – Верабей, за ўсіх мацней!

# ПЕСНЯ САРОКІ

Хто адчайна там балбоча:
Я – не важная па чыне?
Я ж не простая сарока –
Сіньярыта Сарачыні!

Хто мяне вучыць сабраўся,
Як спяваць – дарма імкнецца:
Голас мой – жалейка часу,
Што і плача, і смяецца.

Ча-ча-ча-ча, ча-ча-ча-ча,
Як увесь я свет частую
Чарадзейнай песні чарай,
Мо адзін глушэц не чуе!

Хто не чуе і не славіць
Сарачыных песень-чараў,
Той у казку не адчаліць
На чаўночку зорных мараў.

Хто мяне вучыць сабраўся,
Як спяваць – дарма імкнецца:
Голас мой – жалейка часу,
Што і плача, і смяецца.

Ча-ча-ча-ча, ча-ча-ча-ча,
Як увесь я свет частую
Чарадзейнай песні чарай,
Мо адзін глушэц не чуе!

# ПЕСНЯ ВАРОНЫ І ВАРАНЯТ

Не лятуць вароны ў вырай –
Грэх і кара выракацца
Лесу-бору, што даў крылы,
Каб у небе красавацца.

Каб накаркацца уволю,
Час дарэмна не марнуем.
Цуда-песняй край прывольны –
Кар-кар-кар-кар, каранyем!

Кар-кар-кар, кар-кар-кар,
Кар-кар-кар, кар-кар-кар!

Крочым горда каралямі
І па лузе, і па полі.
Нас не клікаць песнярамі
Мы нікому не дазволім.

Безгалоссе ў родным лесе,
Хоць сябе самога цеш ты:
Кар-кар-кар-кар, краска-песня,
Ды не б'юць у крылы нешта.

Кар-кар-кар, кар-кар-кар,
Кар-кар-кар, кар-кар-кар!

# ПЕСНЯ ІНДЫКА

Мяне ўсе ведаюць – глю-глю!
Сіньёр я Індычыні.
Аблётаў з песнямі зямлю,
Прасторы-далячыні.

Лясныя птахі, глю-глю-глю!
Чаго маўчком пасталі?
Спявайце мне, як каралю,
Я ацаню ваш талент.

Глю-глю-глю, глю-глю-глю,
Спявайце мне, як каралю!
Глю-глю-глю, глю-глю-глю,
Спявайце мне, як каралю!

А кепска будзеце спяваць –
Аж пер'е з вас, шаноўных!
Ды мне і так усё аддаць –
На што каторы здольны.

Вось я, паслухайце, спяю –
Замрэ зямля і неба:
Глю-глю, глю-глю, глю-глю, глю-глю!
Вось так, няўмекі, трэба!

Глю-глю-глю, глю-глю-глю,
Спявайце мне, як каралю!
Глю-глю-глю, глю-глю-глю,
Спявайце мне, як каралю!

## ПЕСНЯ ГЛУШЦА

Чуф-чуфы, чуфа-чуфом –
Тут няма сакрэту:
Хто мяне заве глушцом –
Сам глушэц адпеты.

Хто мне каркае, што сеў
Я ў чужыя сані –
У таго самога спеў
Шэры, бесталанны.

Чуф-чуфы, чуфа-чуфом,
Чуф-чуфы, чуфом!

Хто глюкоча нада мной:
Я пыхлівы, грубы –
Сам надзьмуты – качаргой
Не дастаць да дзюбы.

Ды ці варта крыўдаваць
Доктару на хворых?
Хто славутым хоча стаць,
Да мяне, у хор мой!

Чуф-чуфы, чуфа-чуфом,
Чуф-чуфы, чуфом!

## ПЕСНЯ ЖУРАЎЛЯ

Наўкол развеснена,
Узнёсла-мройна.
Кірмаш хоць песенны,
А мне журботна.

Курлы-курлы-курлы –
На сэрцы раны:
Лятаюць каршуны
Над курганамі.

Гаворыць сонейка:
Спявай вясёла.
А мне не можацца –
Сціскае горла.

Курлы-курлы-курлы –
На сэрцы раны:
Лятаюць каршуны
Над курганамі.

Аж голаў кружыцца,
Мне сніцца ўдача –
Журы зажурыцца,
Журы заплача.

Курлы-курлы-курлы –
На сэрцы раны:
Лятаюць каршуны
Над курганамі.

## ПЕСНЯ ДЗЯТЛА

Праграма ў школе дзятлавай
Для самых здольных і старанных.
Той будзе век мне дзякаваць,
Хто пройдзе гэтую праграму.

Тук-тук, так-так – вучыцеся,
Пакуль я тут, пакуль я ў сіле.
На талент мой маліцеся –
Тады і ваш высока ўскрыліць!

Тук-тук, так-так, тук-тук!
Тук-тук, так-так, тук-тук!

Без толку з пер'я лезці вон –
Чачэкаць, каркаць, дзінькаць горлам.
А дзюбай даў – і рэхам звон –
Тук-тук, так-так!.. – ляціць над борам.

Што тое горла, голас той!
Патрэбна дзюбай прабівацца.
Так-так-так – дзюбаю крутой
Да славы вечнай узнімацца.

Тук-тук, так-так, тук-тук!
Тук-тук, так-так, тук-тук!

# ДРУГАЯ ПЕСНЯ ЖАЎРУКА

Індык, сарока, верабей –
Надзьмутыя цяцеры.
Дзінь-дзінь – хто я для фанабэр?
Клубочак з неба шэры.

Палі жытнёвыя люблю,
Лугі, азёры, рэкі.
Вясновы гімн зямлі пяю,
Душою з ёй навекі.

Дзінь-дзінь-дзінь, дзінь-дзінь-дзінь,
Дзінь-дзінь-дзінь, дзінь-дзінь-дзінь!

Няхай мяне не прызнае
Сям'я ляснога птаства,
Спяваю я не для яе,
Дару сваё мастацтва.

За ўсё на свеце мне мілей
Зямля і сонца, верце.
Дзінь-дзінь – хоць я не салавей,
Спяваю шчырым сэрцам.

Дзінь-дзінь-дзінь, дзінь-дзінь-дзінь,
Дзінь-дзінь-дзінь, дзінь-дзінь-дзінь!

## ПЕСНЯ – ФІНАЛ

*( спяваюць усе ўдзельнікі кірмашу )*

Тук-тук-тук, ча-ча-ча,
Чык-чырык, курлы…
На расстанне многа шчасця
Зычым вам, сябры!

Прысылайце водгук, дзеці,
Вам ці ў радасць наш,
Справядлівы самы ў свеце
Песенны кірмаш?

Хто быў хто, як зразумелі –
Рады мы за вас.
Праспявалі, як умелі,
Развітацца час.

Ча-ча-ча, чык-чырык,
Дзінь-дзінь-дзінь, курлы…
Да спаткання, да сустрэчы,
Верныя сябры!

*лета 1987 г..*



# Нябесны раяль

# НЯБЕСНЫ РАЯЛЬ

**песенны альбом***

## ФЛЕЙТА

Флейта іграе, флейта спявае,
Чары-дзівосы лье ў цішыні.
Флейта спявае, казку вяртае –
Найпрыгажэйшыя юныя дні.

Грай, мая флейта, грай, мая флейта,
Грай, незямная, спявай!
Грай, мая флейта, светла-прасветла,
Вёсны мае ўспамінай!

Помню, калісьці, ночкаю весняй,
Ясную зорку ў полі сустрэў,
З ёю кружыўся ў танцы нябесным
Пад летуценны флейты напеў.

Ой, як чаруе зорная ночка!
Звон карагодны ў сэрца плыве –
Флейта спявае, верыць не хоча,
Што адзвінелі вёсны мае...

Грай, мая флейта, грай, мая флейта,
Грай, незямная, спявай!
Грай, мая флейта, светла-прасветла,
Вёсны мае ўспамінай!

*ліпень 1994 г.*

* – *музыка Дзмітрыя Даўгалёва*

# КЛАВЕСІН І ГАБОЙ

Па белым свеце, як вольны вецер,
Ляцім з табой – душа спявае.
Так летуценна, што нам здаецца:
Увесь Сусвет мы абдымаем.

За морам сінім, за морам сінім
Мы пабылі ў гасцях з табою.
На клавесіне, на клавесіне
Іграла ты, я – на габоі.

Заліта сцэна святлом крыштальным,
Натхнення ўзлёт – і міг крылаты:
Апладысменты – як сон світальны,
Век не забыць – такое свята!

Мы адляталі, як з дзіўнай казкі,
Пілі з табой пах райскіх кветак,
Плылі ракою ўсмешак ясных...
Бывай, бывай, край запаветны!..

За морам сінім, за морам сінім
Мы пабылі ў гасцях з табою.
На клавесіне, на клавесіне
Іграла ты, я – на габоі.

*красавік 1995 г.*

## СКРЫПАЧКА–БАГІНЯ

Я – не геній Паганіні,
Я – не геній Паганіні,
Проста ў дзіўных снах лятаю, –
З мілай скрыпачкай-багіняй,
З мілай скрыпачкай-багіняй
Дзе я толькі не бываю.

Грай жа, скрыпачка-багіня,
Век не знай тугі-адчаю!..
Я – не геній Паганіні,
Проста ў дзіўных снах лятаю.

Проста ў дзіўных снах лятаю,
Дзе я толькі не бываю! –
То ў Японіі, то ў Штатах.
То імчуся на Канары
Па гарах, па крутаярах,
На мелодыі крылатай...

Проста ў дзіўных снах лятаю! –
Дзе я толькі не бываю! –
У нябёсах, на Парнасе.
У Багоў жыву, гуляю,
Ды на скрыпачцы іграю,
З ёй усюды маю шчасце...

Грай жа, скрыпачка-багіня,
Век не знай тугі-адчаю!..
Я – не геній Паганіні,
Проста ў дзіўных снах лятаю.

*верасень 1995 г.*

## НЯБЕСНЫ РАЯЛЬ

Як светла на душы! –
Наўкол цвітуць сады,
Спеў птушак у цішы
І за раялем ты.
    Рух лебядзіных рук
    Па клавішах святых –
    Заслухаўся жаўрук
    І салавей прыціх.

        Мелодыя віруе
        Нябачных зорных хваль –
        Увесь Сусвет чаруе
        Нябесны твой раяль!

І я плыву, плыву –
Мне сніцца дзіўны сон,
Што быццам я жыву
Ў сузор'і Арыён.
    Заслонена смугой
    Далёкая Зямля –
    І толькі ты са мной,
    І музыка твая.

        Мелодыя віруе
        Нябачных зорных хваль –
        Увесь Сусвет чаруе
        Нябесны твой раяль!

*верасень 1994 г.*

# ГАВАЙСКАЯ ГІТАРА

Паблукаем, паблукаем
Па зямлі з табою,
Пабываем, пабываем
За гарой крутою.
    Пабываем на Гаваях,
    Што за морам сінім,
    Наспяваем, наспяваем
    Песень самых дзіўных.

        Гавайская гітара,
        Ты – мой пявучы вецер,
        Нясі дзівосы-чары
        Па белым свеце!

Мы гавайскую гасціннасць
Зведаем з табою:
Ананасы, апельсіны
І віно – ракою.
    Нам гаваечка-красуня
    Ласкава ўсміхнецца –
    І расчуленыя струны
    Зазвіняць у сэрцы.

        Гавайская гітара,
        Ты – мой пявучы вецер,
        Нясі дзівосы-чары
        Па белым свеце!

*кастрычнік 1994 г.*

## АРФА

Напэўна, арфу сам Арфей
Стварыў душою Боскай,
Што нават слаўны салавей
Так не спявае ўзнёсла.

Звініць на струнах арфы свет
Прывабна-неспазнаны –
Ракою музыкі плыве,
Вяслуе неба з намі.

Вяслуе з намі зорны птах
З заранкай маладою,
Вяслуе ўвесь Гусіны шлях,
На гонар нам з табою.

Вяслуе з намі маладзік,
Чаўночкам залаціцца
І на красу тваю глядзіць,
Ніяк не наглядзіцца…

Звініць на струнах арфы свет
Прывабна-неспазнаны –
Ракою музыкі плыве,
Вяслуе неба з намі.

*кастрычнік 1994 г.*

# ГУБНЫ ГАРМОНІК

На гармоніку я граю,
На губным,
Як трафей, яго я маю
З той вайны.
З той вайны, што майго бацьку
Узяла,
З той вайны, якую маці
Пракляла.

Мой гармонік грае хвацка,
Мой губны,
Мне яго прынёс мой дзядзька
З той вайны.
З той вайны іду, задумны,
Па жыцці,
З той вайны іду, іду я –
Не прыйсці.

Мой гармонік людцаў будзіць,
Мой губны:
– Не дапусцім, не дапусцім
Той вайны.
Той вайны, што хочуць злыдні
Развязаць,
Той вайны, што ўсім Хатыняй
Можа стаць!

*верасень 1994 г.*

## МАНДАЛІНА

Раскажы, матуля, сыну,
Хвалі боскія прымрой,
Як іграў на мандаліне
Бацька мой.

Бацька граў, а ты спявала,
Шчасцем неба абдымала,
Дзякавала Богу.
Мандаліначка звінела,
Чаравала, сэрца грэла,
Ды, на жаль, нядоўга.

Сёння ўдовінай сцяжынай,
Мама, ў згадках не блукай,
Самым цёплым успамінам
Волю дай.

Не чытай мне сёння, мама,
З фронту бацькавых лістоў,
Атулі зарой світальнай
Юных сноў...

Бацька граў, а ты спявала,
Шчасцем неба абдымала,
Дзякавала Богу.
Мандаліначка звінела,
Чаравала, сэрца грэла,
Ды, на жаль, нядоўга.

*снежань 1994 г.*

# АКАРЫНА

Эх, акарына, акарына, акарына,
Хвіліны светлыя няспынна абуджай,
Будзі, будзі мае найдзіўныя ўспаміны,
Пра незваротную вясну маю спявай!

Іграў Кірыла, мой сусед, на акарыне,
І я штовечар на "канцэрты" прыбягаў,
Расла дачка ў яго, чароўная Карына,
Па ёй нямала я начамі уздыхаў.

Мая абранніца музыку падпявала –
Плыла мелодыя, бы звала ў вечны рай...
На жаль, не доўга маё сэрца святкавала –
У горад з'ехала каханне – і бывай!..

Эх, акарына, акарына, акарына,
Хвіліны светлыя няспынна абуджай,
Будзі, будзі мае найдзіўныя ўспаміны,
Пра незваротную вясну маю спявай!

*сакавік 1994 г.*

## ЦЫМБАЛЫ

Цудадзейны звон цымбалаў, як прадвесне,
Ажыўляе мне душу на чужыне,
Узнімае летуценні ў паднябессе,
І нясе ў старонку родную мяне.

Хваляй музыкі плыву я ў край дзівосны,
Дзе пачуў я ўпершыню цымбалаў звон,
Дзе мае адпалымнелі зоры-вёсны,
Адмахалі крылы-вёслы юных дзён.

Хваляй музыкі плыву я ў казку-мрою
Да адзінай незамутненай ракі,
Дзе Алёна-прыгажуня пад вярбою
Мыла белыя льняныя ручнікі...

Цудадзейны звон цымбалаў, як прадвесне,
Ажыўляе мне душу на чужыне,
Узнімае летуценні ў паднябессе,
І нясе ў старонку родную мяне.

*верасень 1994 г.*

## ВІЯЛАНЧЭЛЬ

Цябе назваў я незямной,
Ад Бога ты, няйначай,
Струна твая, як мой настрой,
То цешыцца, то плача.

Як ціша летняя начэй,
Звіні пявуча-светла,
Віяланчэль, віяланчэль,
Чароўная басэтля!

Гукай каханую маю,
Гукай з вышынь нябесных,
А я душою падпяю,
Яна пачуе песню.

Анёлам спусціцца з нябёс
Узнёслая такая,
Што мой самотна-сумны лёс
На радасны змяняе...

Як ціша летняя начэй,
Звіні пявуча-светла,
Віяланчэль, віяланчэль,
Чароўная басэтля!

*люты 1994 г.*

## ЖАЛЕЙКА

Не сумуй, мая жалейка, не сумуй,
Зачаруй зямлю-матулю, зачаруй,
Дай ёй радасць, дай ёй свята хоць на міг,
Каб заслухаўся вятрыска і заціх!

Не сумуй, мая жалейка, не сумуй,
Зачаруй зямлю-матулю, зачаруй!

Прытулі яе пяшчотна, абагрэй,
Растапі халодны іней у душы –
Заіграй, хоць на хвілінку, весялей,
Зварушы душу нямую, зварушы!

Не сумуй, мая жалейка, не сумуй,
Зачаруй зямлю-матулю, зачаруй!

Дай ёй трохі адпачыць ад горкіх слёз,
Запалі надзеі зорку, запалі:
Узнясі маю малітву да Нябёс –
Замалі грахі людскія, замалі!

Не сумуй, мая жалейка, не сумуй,
Зачаруй зямлю-матулю, зачаруй!

*кастрычнік 1995 г.*

## ГАРМОНІК

Развясельса, разыдзіся,
Вечар звонкі, весні,
Над прасторамі ўзніміся
Лёгкакрылай песняй.

Сумнавата штосьці сёння
Стала ў нашых вёснах.
Грай, іскрыся, мой гармонік,
Раскажы пра лёс мой.

Раскажы, як захапляўся
Родным спеўным словам,
Васільком як любаваўся,
Каласком жытнёвым.

Як спазнаў я вір бяздонны
Першага кахання...
Грай, іскрыся, мой гармонік,
Радуйся да рання.

Прыгадай званочкі-бомы
І сватоў вясёлых..,
Каб варочаўся ў бяссонні
Горад мой вясковы,

Сумаваў па сініх тонях,
Хлопцах-рыбалоўцах...
Грай, іскрыся, мой гармонік
На ўвесь свет бясконцы.

*кастрычнік 1982 г.*

## АНЁЛЬСКІ АРГАН

Калі мы паспелі з табой награшыць,
Патрапіць у шэры спадманны туман?
Даўно не хадзілі мы ў Храм, дзе гучыць
Анёльскі арган, анёльскі арган.

Мы сёння з табою прыйшлі да імшы
Пазбыцца душэўных пакутлівых ран.
Прачыста-прасветла гучыць у душы
Анёльскі арган, анёльскі арган.

Каханне сваё пранясем па жыцці,
Яго не загубіць спадманны туман, –
Нябеснаю музыкай нас асвяціў
Анёльскі арган, анёльскі арган.

*студзень 1994 г.*

## ТРАМБОН

Нібы сню я сон прарочы,
Нібы хто мяне сурочыў,
Так заваражыў,
Што я ў музыцы таплюся,
Ратаваць ніхто не хоча,
Што са мной, скажы?

Што са мною? – На трамбоне
Граю дзень і ноч:
Слаўлю вір тваіх бяздонных
Цёмнасініх воч!

Слаўлю, слаўлю, апяваю
Я твае даўгія косы –
Белы-белы лён,
Аж няма калі з табою
Бегчы лугам, там, дзе росы
І вяснянак звон.

Слаўлю, слаўлю, апяваю
Я твае чарнявы бровы –
Жураўліны клін,
Аж няма калі з табою
Скалыхнуць вяслом натхнёным
Веснавую плынь.

Што са мною? – На трамбоне
Граю дзень і ноч:
Слаўлю вір тваіх бяздонных
Цёмнасініх воч!

*жнівень 1994 г.*

## ЛІРА

Адляцелі птушкі ў вырай,
А душа тужыць не стала –
Сёння мне ў сузор'і Ліры
Зорка Вега запалала.

Вера, Вера, Вегай мройнай
Мілы позірк твой іскрыцца.
Грай жа, грай на ліры Боскай,
Грай мне, чараўніца!

Грай жа, грай, лятункі гушкай,
Закружы кахання вірам –
Паляцім і мы, як птушкі,
У далёкі зорны вырай.

Грай жа, грай, спявай пра вырай,
У які я шчыра веру –
Сёння мне ў сузор'і Ліры
Запалала зорка Вега.

Вера, Вера, Вегай мройнай
Мілы позірк твой іскрыцца.
Грай жа, грай на ліры Боскай,
Грай мне, чараўніца!

*чэрвень 1994 г.*

# ВАЛТОРНА І ФАГОТ

Звініць вясёлы карагод
У навагоднім красаванні,
Пяе валторна і фагот,
Плыве мелодыя кахання.

Пяе валторна і фагот,
Жадае долі нам прыгожай.
Што нам падорыць Новы год,
Давай з табою паварожым.

Давай падлогу і куты
Апсыплем зернем чарадзейным,
Як нашы некалі дзяды,
Каб жыць заможна і надзейна.

Давай запалім свечку мы,
Што асвяцілі на Грамніцы,
Каб не пужалі нас грамы,
Міналі буры-навальніцы.

Пяе валторна і фагот,
Жадае долі нам прыгожай.
Што нам падорыць Новы год,
Давай з табою паварожым.

*сакавік 1995 г.*

## ТУБА

Зазвінела труба, заспявала,
Льецца музыка ў зорны прастор:
Ёй зямных даляглядаў замала,
Ёй замала блакіту азёр.

Туба, туба, туба,
Туба, туба, ту...
На спатканне з любай
Я да зор ляту!

Туба, туба, дай радасці ўзняцца
Да анёльска-святых берагоў.
Ой, як хочацца зноў мілавацца
З Мілавіцаю сэрца майго!

Туба, туба, туба,
Туба, туба, ту...
На спатканне з любай
Я да зор ляту!

Туба, туба, дай шчасцю вярнуцца
Да цвіцення вясны маладой.
Ой, як хочацца зноў прыгарнуцца
Да нябеснай Багіні маёй!

Туба, туба, туба,
Туба, туба, ту...
На спатканне з любай
Я да зор ляту!

*сакавік 1995 г.*



# Кружыцца месяц з заранкай

# КРУЖЫЦЦА МЕСЯЦ З ЗАРАНКАЙ

**абразкі з народнага жыцця**

## КАЛЯДА

Накрывай сталы святочна і багата,
Грамада! –
Ходзіць з песнямі нябеснымі па хатах
Каляда.

Бліны-ладачкі і скваркі з каўбасою –
Смаката.
Поўны мех у механошы за спіною –
Каляда.

Каляда, эх, Каляда!
Што за дзіва – Каляда! –
Карагодзіцца, віхрыцца,
Зоркай Божаю іскрыцца,
Каляда

Свеціць Зорачка святая, прамяніцца –
Ззяе даль,
Скача Козачка з Мядзведзем, весяліцца –
Каляда.

Го-го-го – каза! – разносіцца наўкола
Тут і там,
Рассыпае смех і жарты развясёла
Каляда.

Каляда, эх, Каляда!
Што за дзіва – Каляда! –
Карагодзіцца, віхрыцца,
Зоркай Божаю іскрыцца,
Каляда!

# НОВЫ ГОД

Б’е дванаццаць, келіхі узняты...
Журыцца Ялінка на куце –
Дзед Мароз мінае нашу хату:
Да дзяцей з дарункамі ідзе.

Над зямлёй святочная завея,
Навакол сняжынак белы дым...
Новы год, – а я былым хварэю,
Новы год, – і ты яшчэ ў былым.

Любая, хто ў гэтым вінаваты?
Ці не наша гордая любоў?
Хто такі, душэўны, нас пасватаў?
Хто такі, бязлітасны, развёў?

Шчырасці-любові – дзверы насцеж!
Міру-згодзе – вечны добры час!
Новы год, – мы п’ем з табой за шчасце.
Новы год, – а шчасце – міма нас.

*студзень 1997 г.*

# ГУКАННЕ ВЯСНЫ

Я вясну гукаю – я цябе чакаю,
Без твайго дыхання мой халодны дом.
Любы салавейка, прынясі вясеньку,
Атулі цяплом.

Пад гарой крыніца светла забруіцца,
Дам табе напіцца я вады жывой –
Падужэюць крылы, мой салоўка мілы
На зямлі святой.

– Гу-у, гу-у, гу-у! – я вясну гукаю
І вясёлы вырай з песняй веснавой.
– Гу-у, гу-у, гу-у! – я цябе чакаю,
Салавейка мой!

Паляцім з табою росным лугам-полем,
Навіем вяночкаў, пусцім па вадзе,
На прасторы вольным наша краска-доля
Гожа расцвіце.

Будзем песняй мройнай славіць край наш родны:
Сінь азёрных плёсаў, белы цвет садоў.
Толькі не забаўся, а скарэй вяртайся,
Весні птах, дамоў...

– Гу-у, гу-у, гу-у! – я вясну гукаю
І вясёлы вырай з песняй веснавой.
– Гу-у, гу-у, гу-у! – я цябе чакаю,
Салавейка мой!

*кастрычнік 1998 г.*

## ВАЛАЧОБНІКІ

Мілыя мае, слаўныя мае
Велікоднічкі-валачобнічкі,
Нізкі вам паклон – наспявалі мне,
Нажадалі мне светлай долечкі!

Наспявалі мне, нажадалі мне
Самых ясных дзён, шчасця поўны воз,
Чарку я ўзніму, з вамі паўтару:
– Хрыстос уваскрос, Хрыстос уваскрос!

Пакладу я ў мех трохі яек вам,
Сыру, каўбасы і збажовачкі...
Весяліся, люд, услаўляй Хрыста –
Па дварах ідуць валачобнічкі!

Валачобнічкі, госцікі мае,
Цешыцца душа на ўвесь белы свет:
Дзіва ўсіх дзівос, дзіва ўсіх дзівос –
Хрыстос уваскрос, Хрыстос уваскрос!
Сапраўды ўваскрос!

*сакавік 1993 г.*

## РАДАЎНІЦА

Да крыжоў народ ідзе –
І знікае змрочны цень –
Радаўніца.

На магілках чысціня –
Пастаралася радня –
Радаўніца.

Свечкі зоркамі гараць,
Кветак – вокам не абняць –
Радаўніца.

Дух Дзядоў лунае скрозь –
Не стрымаць усцешных слёз –
Радаўніца.

Вялікоднае яйко
Прыкацілася з вякоў –
Радаўніца.

Вып’ем, людцы, уздыхнем –
Продкаў нашых памянем! –
Радаўніца.

Будзем душы весяліць –
Хай не рвецца з родам ніць –
Радаўніца.

*красавік 1994 г.*

# ВЯСНА І КАХАННЕ

Хлопец любую туліць да сэрца
І маўчыць, не знаходзячы слоў,
А дзяўчына вясёла смяецца,
Летуценным іскрыцца святлом.

Прыглянулася Янку Настасся,
З ёй гуляе ў лугах давідна –
Закахаўся ў зару месяц ясны,
Не нацешыцца імі вясна.

Усміхаецца ім таямніча,
Наталяе крынічнай вадой,
Асвячае бліскучаю знічкай,
Акрапляе духмянай расой.

Калыхае на хвалі азёрнай
Човен песень чароўных і сноў
І вяшчуе зязюлькаю шчодрай
Ім нямала шчаслівых гадоў...

Прыглянулася Янку Настасся,
З ёй гуляе ў лугах давідна –
Закахаўся ў зару месяц ясны,
Не нацешыцца імі вясна.

*сакавік 1999 г.*

# КВЕТКА КУПАЛЬНАЯ

Човен самотны, човен бяссонны,
Хвалі нястомныя –
Хлопец блукае ночкаю цёмнай
З яснай паходняю:

– Дзе ты, мой востраў, з казак сатканы,
Марай асвечаны?..
Хлопец шукае, хлопец гукае
Любую дзеўчыну:

> – Ой, купалінка, дзеўчына-мара,
> Сэрцу жаданая,
> Выйдзі на бераг з лесу-гушчару,
> Кветка купальная!

Дзе ён, той востраў, дзе, таямнічы,
З кветкай купальнаю?
Кажуць, там нехта яркія znічы
Ўпоўнач запальвае...

Запалымнела цёмная ночка
Яркімі знічамі,
Чуецца песня, голас дзявочы
Льецца крынічкаю.

> – Ой, купалінка, дзеўчына-мара,
> Сэрцу жаданая,
> Выйдзі на бераг з лесу-гушчару,
> Кветка купальная!

*чэрвень 1997 г.*

## О МОЙ МЕСЯЦ!

Калыхае зорку ў чоўне
Летняй ночкай месяц ясны,
Казкі бае.
Мой каханы, нарачоны
Звёз кудысьці маё шчасце,
Не вяртае.

Як паехаў ён аднойчы –
І прапаў, не дачакацца.
Што з ім, Божа?
Ані следу, ані слоўца.
Не кувай, зязюлька ў садзе
Так трывожна!

О мой месяц – чоўнік зорны,
Палюляй маю дачушку,
Мілавіцу, –
Паляту я ў луг раздольны
Да сяброўак вольнай птушкай,
Да крыніцы.

Так хачу я з той крыніцы
Зноў напіцца, што мне крылы
Падарыла,
Дзе знайшла пад зараніцай
Кветку-папараць я з мілым...
І згубіла.

А мне ж толькі васемнаццаць.
Так хачу я ў карагодзе
У вяночку,

Накружыцца, наспявацца –
Сум развеяць на свабодзе
Летняй ночкай.

*жнівень 2003 г.*

## КРЫВІЧАНАЧКА–КУПАЛІНАЧКА

Карагод – вянком, сінім васільком,
Жытнім каласком нашай песні роднай –
Льецца голас твой з глыбіні вякоў,
Крывічаначка, слаўная князёўна.

Крывічаначка–купаліначка,
Слаўная мая князёўна!

Хто там загрымеў, хто там захадзіў,
Хто там злы такі ў баравіне цёмнай?
Ой, дзе ж ты, мая, хто цябе схапіў,
Крывічаначка, слаўная князёўна?!

Крывічаначка–купаліначка,
Слаўная мая князёўна!

Княжыч малады ў карагод прывёў
Купаліначку з баравіны цёмнай –
Ведзьмакам цябе не аддасць любоў,
Крывічаначка, слаўная князёўна.

Крывічаначка–купаліначка,
Слаўная мая князёўна!

*ліпень 1996 г.*

## СЕНАКОСНАЯ ПАРА

Сенакосная пара,
Сенакосная...
Хлопца вывела з двара
Сцежка росная.

А насустрач матыльком –
Русакосая.
Зазвінела ручайком –
Срэбным голасам:

– Што ты сёння, мілы мой,
Гэтак позненька,
З кім жа, з кім жа пад вярбой
Бавіў ночаньку?

Косіць хлопец, як у сне,
Косіць пожаньку:
То на любую зірне,
То на сонейка.

Разумее сонца ўсё –
Усміхаецца:
Росы падаюць – кассё
Угінаецца.

Прытупілася каса,
Прытамілася –
І дзяўчына да касца
Прытулілася.

*чэрвень 1992 г.*

# ТЫ ПАСТОЙ, ДЗЯЎЧЫНКА

Зорнай ночкай летняй
Вуліца з вячорак,
Як вулей, гудзе.
За дзяўчынай следам
Хлопец закаханы
Подбегам ідзе:

– Ты пастой, дзяўчынка,
Не ляці так хутка,
Я цябе прашу.
Хоць адну хвілінку
Ты маю паслухай
Сумную душу.
– Не хадзі за мною!
Ты дарэмна, хлопча,
На мяне глядзіш,
Не пайду з табою –
Ты на працы дрэмлеш,
На гулянцы спіш!

– Ластаўка, спыніся,
Чуеш, як салоўка
Над ракой пяе?
Пад вярбою ніцай
Вершы пачытаю
Я табе свае.
– Чым уздумаў цешыць!
Ты дарэмна, хлопча,
На мяне глядзіш:
Што твае мне вершы! –
Ты на працы дрэмлеш,
На гулянцы спіш.

– Зорка Мілавіца,
Не крыўдуй, спусціся
З неба на зямлю –
Тут, ля сінь-крыніцы
Песню падарую
Я табе сваю.

– Годзе байкі плесці! –
Ты дарэмна, хлопча,
На мяне глядзіш, –
Што мне твае песні! –
Ты на працы дрэмлеш,
На гулянцы спіш!

*ліпень 2002 г.*

## ТЫ ПРЫЕДЗЬ, НЕ СПАЗНІСЯ

На чужыне далёкай звоняць сумныя струны,
Льецца голас хлапечы, рэчкай горнай цячэ:
– Ты прыедзь, не спазніся да мяне, прыгажуня,
З таямнічым паглядам васільковых вачэй.

Ты прыедзь, не спазніся, кветка роднай старонкі, –
Не жыву, як не бачу сіні цвет васількоў.
Снішся ты мне і снішся купалінкай чароўнай
З даўняй песняю звонкай, з васільковым вянком.

Ты прыедзь, не спазніся, о краса незямная, –
Не магу перанесці горкіх дзён і начэй.
Асвяці мне дарогу да бацькоўскага краю
Таямнічым паглядам васільковых вачэй.

*сакавік 2001 г.*

## МЕСЯЧНАЯ НОЧКА

Месячная ночка
Лавачка пад вішняй,
Цёплае дыханне,
Дотык мілых рук.
  Звон струны нябеснай –
  І начніца-песня
  Вылятае з сэрца
  Птушкаю ўгару.

У святле таемным
Ночка, нібы казка, –
Адліваюць срэбрам
Вербы над ракой...
  Гэй, паслухай, месяц,
  На хвілінку з неба
  На зямлю спусціся
  З зоркай маладой!

Раскажы нам, месяц,
Раскажы нам, ясны,
Падзяліся з намі
Радасцю сваёй:
  Як знайшоў такую
  Кветку веснавую –
  Зорку-заранiцу
  З дзіўнаю красой?

Раскажы нам, месяц,
Раскажы нам, ясны,
Падзяліся тайнай:
Як сваю любоў

Ты нясеш праз вернасць
Па шляхах нязменных
Летам і зімою
Столькі ўжо вякоў?

*травень 2002 г.*

## ДАЖЫНКІ

Зжалі жнейкі поле, зжалі-зваявалі,
Навілі вяночкаў, песні заспявалі –
І снапок апошні хату асвячае,
Гаспадар да жнеек слова прамаўляе:

– Дзякуй, жнеечкі-жанкі дарагія, –
Вашы серпікі-сярпы залатыя,
Падымаю чарку мёду ў добры час,
Жнейкі мілыя, за вас!

Што вы нарабілі ўмелымі рукамі? –
Свет заваражылі шчодрымі дарамі,
Будзем мы з духмяным хлебам-караваем,
Будуць песні нашы плыць да небакраю.

Дзякуй, жнеечкі-жанкі дарагія, –
Вашы серпікі-сярпы залатыя,
Падымаю чарку мёду ў добры час,
Жнейкі мілыя, за вас!

*верасень 1998 г.*

# КЛАДАЧКА

Хлопец цешыцца з дзяўчынай
Жартаўлівай спрэчкай,
І, як лебедзь той з лябёдкай,
Кружыцца над рэчкай:

– Што ты, мілая, баішся,
Апусціла вейкі? –
Людзі ходзяць, не баяцца
Кладачкі вузенькай.

– Не пайду я, не ўгаворыш,
Любы мой, міленькі,
Над вірліваю вадою
Кладачкай вузенькай.

Плаваць я зусім не ўмею,
Глыбіні баюся,
А як раптам ды ў прадонне
З кладачкі сарвуся.

– Ой, не бойся, не журыся,
Любая дзяўчына,
Абнімі мяне пяшчотна
Крыллем лебядзіным.

На руках, мая лябёдка,
Панясу цябе я
На той бераг, дзе частуе
Рута-мята хмелем.

– Згодна, згодна, калі гэтак,
Мой ты лебедзь ясны,
Толькі я заплюшчу вочы,
Бо занадта страшна!

*кастрычнік 1996 г.*

## КРАСУНЯ І ДЗІВАК

У суседнім двары дзіўны хлопец жыве.
А ці ж гэта не дзіва! –
Ўсё глядзіць ды глядзіць, воч не зводзіць з мяне,
І маўчыць сарамліва.

Ці я з дому іду, ці дадому ляту,
Я шчаслівa ўсміхаюся –
Аб ласкава-жывы, закаханы пагляд
Спатыкаюся!

Так і хочацца мне ў дзівака запытаць,
Не хаваючы ласкі:
– Ой, чаму ты, сусед, так глядзіш на мяне,
Уздыхаючы цяжка?!

Так і хочацца мне дзівака здзіўляць:
– Кінь, сусед, заглядацца,
На спатканне прыходзь вечарком на раку,
Будзем там цалавацца!

*снежань 1998 г.*

## ДОЧАЧКА МАЯ, НЕ ЖУРЫСЯ

Красна-дзеўчына просіць маці
Рана замуж не аддаваць:
– Мамачка мая, мне, як шчасця,
Хочацца яшчэ пагуляць.

Хочацца яшчэ сноў дзявочых,
Карагод вадзіць над ракой,
Ночачкай святой віць вяночкі
І пускаць удаль сінь-вадой.

– Дочачка мая, не журыся,
З долечкай сваёй прымірыся:
Рэдзька горкая, ды ядуць,
Кепска замужам, ды ідуць!

– Ой, матуленька, што ты кажаш,
Нешта іншае мне парай,
Бо як толькі я выйду замуж,
Па вясне маёй – памінай!

– Позна, мілая, – заўтра госці,
Мусіш ты сватоў прывітаць,
А то будзеш век у самоце
Ты зязюленькай кукаваць.

Дочачка мая, не журыся,
З долечкай сваёй прымірыся:
Рэдзька горкая, ды ядуць,
Кепска замужам, ды ідуць!

*студзень 2003 г.*

## ОЙ, МАЯ ТЫ ЛАСТАЎКА

Лістапад не кружыцца,
Снег ісці не думае,
А чаго ж так журыцца,
Песня льецца сумная?

Лесам-баравінаю –
Сцежкі верасовыя,
Полем-лугавінаю –
Травы палыновыя.

Без цябе, харошая,
Без цябе, жаданая,
Луг мой не пакошаны,
Поле не ўзаранае!

З рук плужок мой валіцца,
А каса не вострыцца,
Сваякі пытаюцца,
Што са мною робіцца?

Ой, калі ж пакосяцца
Травы палыновыя,
Песня ў свет папросіцца
Светлая, вясновая?

Без цябе, адзіная,
Сны табою поўняцца –
Сняцца вочы сінія,
Спеўны голас мроіцца!

Ой, мая ты ластаўка,
Дзе ты сінявокая?
Шчабятуняй ласкавай
Прыляці, далёкая!

*снежань 1996 г.*

## ЯБЛЫЧНЫ СПАС

Падаюць яблыкі долу, як зоры,
Мёдам налітыя, водар ліюць...
Госці ў застоллі не ведаюць зморы,
"Горка" крычаць нам, вясёла пяюць.

Ой, не чаруй, не хвалюй гэтак нас,
Яблычны, яблычны, яблычны Спас!

Мы выбягаем у сад непрыкметна,
Кружымся, кружымся ў вальсе з табой,
Пахнуць малінаўкі, пахнуць ранеты,
Радасцю хмеляць і светлай журбой.

Ой, не чаруй, не хвалюй гэтак нас,
Яблычны, яблычны, яблычны Спас!

Госці ўстрывожана выйшлі на ганак,
Клічуць-гукаюць за стол маладых...
Яблычным Спасам праменіцца ранак,
Свецяцца ў росах юнацтва сляды.

Ой, не чаруй, не хвалюй гэтак нас,
Яблычны, яблычны, яблычны Спас!

*жнівень 1995 г.*

# СЁННЯ Ў НАС ВЯСЕЛЛЕ

Маладыя Яня з Ясем сталі на ручнік,
Кабісці дарогай яснай праз турботы-дні.
Маці з бацькам бласлаўляюць, зычуць шчасця ім,
Абразамі асвячаюць на куце святым.

Сёння ў нас, браткі, вяселле,
Яню з Ясем жэнім, жэнім,
Дзелім каравай.
Грай, гармонік, грай, вясёлы,
Разлівай святло наўкола,
Скрыпачка, спявай!

Маладыя нам "салодзяць" горкае віно,
Аж п'янеюць, карагодзяць зоркі за акном.
Сват са свацццяй маладзеюць, у заслонкі б'юць,
А музыкі-чарадзеі граюць ды пяюць.

Маладую пару дорым слоўцам і дабром...
Дай ім, Божа, плёну-спору, дзетак поўны дом.
Зычым, зычым маладому, зычым маладой
Самай светлай, шчаснай долі, верных сто гадоў...

Сёння ў нас, браткі, вяселле,
Яню з Ясем жэнім, жэнім,
Дзелім каравай.
Грай, гармонік, грай, вясёлы,
Разлівай святло наўкола,
Скрыпачка, спявай!

*верасень 1994 г.*

# АДВІХРЫЛАСЯ ВЯСЕЛЛЕ

Адвіхрылася вяселле
Карагодам шумна-звонкім –
І дачку багаслаўляе
Маці ў дальнюю старонку:

– Едзь, бывай, мая дачушка,
І не плач ты гэтак горка,
Буду я цябе чакаці,
Як вясну-красну, здалёку.

Прыязджай, не забывайся,
І прывозь бабулі ўнукаў –
Прылятай часцей дадому,
Прылятай, мая галубка!

Слухай мужа, не сварыся,
Паважай, глядзі, свякроўку,
Будзь вясёлай, думкай сумнай
Не трывож сваю галоўку.

За цябе маліцца буду
Дзень і ноч, мая крывінка,
Каб ішла з сямейкай дружнай
Ты шчаслівай пуцявінкай...

Прыязджай, не забывайся,
І прывозь бабулі ўнукаў –
Прылятай часцей дадому,
Прылятай, мая галубка!

*кастрычнік 2002 г.*

## БЯРОЗКА

Бярозка ці дзяўчына –
Не распазнаць адразу,
Пытаюся вачыма:
– Што, можа, едзем разам?

І тут яна раптоўна
Пагляд на мне спыніла,
Няголасна, жартоўна
Са мной загаварыла:

– Ты, хлопец, не ўглядайся –
Прыйшла не на спатканне,
А лепей сам прызнайся,
Куды ў такое ранне?

І слова так за словам
Аб важным і няважным –
У ясную дуброву
Звярнулі незаўважна.

Ой, што мы нарабілі? –
Аўтобус празявалі!
Пайшоў дарогай пыльнай –
І памінай, як звалі...

Букет кляновых лісцяў
Гарэў асеннім жарам.
Было нялёгка выйсці
Нам не з дубровы – з мараў.

*верасень 1982 г.*

# ДОБРА БУДЗЕ – НАКРАСУЕШСЯ

Выйшла дзеўчына на ганачак,
Следам – маці, весняй раніцай.
Ветрам дрэвы разгайданыя –
Цвет вішнёвы асыпаецца.

Каля веснічак спыніліся,
Маці кажа: – Мая дочачка,
Едзь, калі ўжо зажурылася,
У далёкую староначку.

Добра будзе – накрасуешся,
Нібы ў садзе вішня белая.
Кепска будзе – накукуешся,
Як зязюлька тая шэрая!

Прыляціш у сад зялёненькі,
Станеш плакаць-кукаваці ты,
Доўга ліці слёзы горкія,
Спавядацца роднай мацеры.

Пэўна, ростань доляй суджана,
Будзь навек шчаслівай, дочачка,
Едзь-ляці, мая ты птушачка
У далёкую староначку.

Добра будзе – накрасуешся,
Нібы ў садзе вішня белая.
Кепска бужзе – накукуешся,
Як зязюлька тая шэрая!

*кастрычнік 2002 г.*

# ОЙ, ДЗЯЎЧЫНА–КАПРЫЗУЛЯ

– Што ты, любы, прычапіўся,
Як лісточак лазневы?
З кім, скажы, блудзіў-любіўся,
З кім учора лазіў ты?

– Ой, дзяўчына-капрызуля,
Ты ж не будзь няўдаліцай –
Хлопец схопіць, пацалуе,
Не спяшайся жаліцца!

– Што тваe мне заляцанкі,
Пацалункі грэшныя!
Падміргну суседу Янку –
Буду ім суцешана.

– Ой, дзяўчына-капрызуля,
Ты няўжо забылася?
Трэслі ўчора ў садзе дулі
Мы з табою, мілая!

– Не жартуй са мной, саколік,
Не кляніся ў вернасці,
Покуль грэх свой не замоліш,
Да мяне не вернешся.

– Ой, дзяўчына-капрызуля,
Крапіва пякучая,
Раскажу тваёй матулі,
Як мяне ты змучыла!

*ліпень 1998 г.*

# ПЛАЧА КВЕТКА–ДЗЯЎЧЫНА

Плача кветка-дзяўчына,
Слёзы горкія лье.
А малойца-хлапчына
Суцяшае яе:

– Ой, не плач, мая кветка,
Не трывож мне душы,
Хто пакрыўдзіў цябе так,
Ты прызнайся, скажы?

– Не скажу – і не думай –
І намёку не дам:
Ад чаго мне так сумна,
Здагадайся ты сам.

– Як жа мне здагадацца,
Чаго льецца сляза –
Кветка-дзеўчына плача,
Ільняная каса?

І бярэ чараўніцу
Ён на рукі, і з ёй
П'е настой медунічны
У траве лугавой.

– Адпачні, мілы хлопча,
Годзе сёння забаў,
Ой, які ж ты пяшчотны
І здагадлівы стаў!

*кастрычнік 2000 г.*

# КУМ І КУМА

Гаспадар паехаў з хаты,
Атуліў яго туман,
А да жонкі кум багаты:
– Добры дзень, мая кума!

Як табе, кума, жывецца,
Мо хацела б ты чаго?
Ці на месцы тваё сэрца,
Мо ірвецца да каго?

– Не пытайся, сумна нешта,
Мой кумочак, хоць памры:
І няўежна, і няўлежна,
Пуста ў хаце і ў двары.

Рвецца сэрца, ды што толку –
Каля боку мужычок,
Паляцела б я высока,
Толькі дзе ты, мой кумок?

– А ў мяне дык сёння зранку
Ўсё круцілася на ўме,
Як настольнік-самабранку
Падарыць маёй куме.

Вось табе дарунак, кумка,
Накрывай гасцінна стол,
Будзе нам з табой не сумна –
Шугане віно пад столь.

– Чуеш, кум? – званок у дзверы,
Ой, вярнуўся, пэўна, мой!
Кум не чуў, куме паверыў –
І ў акно ляціць стралой.

А кума услед рагоча:
– Ой, умора, мой кумок,
Гэта ж чайніка свісточак,
Я ж падумала – званок!

*ліпень 2002 г.*

## ШУКАЕ ЦАР ЦАРЫЦЫ

Каб сум развеяць, Саўка
Зайшоў да сябра Вені,
І той, кульнуўшы чарку,
Бяднягу Саўку цвеліць:

– Ну як там горад стольны?
Хадзіў ты на панэлі
Да міс-мадэляў модных?
І дзе ж твая мадэля?

Шукае цар царыцы,
Пастух жа – пастушыцы,
Мой дружа, пагадзіся
І дужа не журыся!

Бяры даўгую пугу,
Гані на пашу статак,
Кружыся полем-лугам,
Як бусел той цыбаты.

І помні, што бывае
На свеце і такое:
Вяскоўцу гарадская –
Нібы сядло карове.

Ты чуеш спеў дзявочы,
Што з поля далятае? –
Сумуе днём і ноччу
Твая любоў былая.

Вярніся да Настассі,
А то завяне кветка:
Адна каровак пасвіць
Такім гарачым летам!..

Шукае цар царыцы,
Пастух жа – пастушыцы,
Мой дружа, пагадзіся
І дужа не журыся!

*кастрычнік 2002 г.*

# НЕ ВЕР КАНЮ Ў ДАРОЗЕ

Сустрэў Ахрэм суседа
І стаў з яго ён кпіць:
– Я чуў: у Крым адправіў
Ты жонку адпачыць.

Ну як такое глупства
Зрабіць ты, Юрка, мог?
Табе там жонка рогі
Наставіць, далібог.

Не вер каню ў дарозе,
Хоць добры ты яздок,
А жонцы на курорце
Не вер, не вер, браток!

Раз ты зламіў варону,
Не трэба крыўдаваць,
Калі дзіця цужога
Ты будзеш гадаваць.

Ты думаеш: чаму я
Жанаты пяты раз? –
Даваў свабоду жонкам
У летні пляжны час.

Не вер каню ў дарозе,
Хоць добры ты яздок,
А жонцы на курорце
Не вер, не вер, браток!

Курорт – куточак райскі,
Ну як там не зграшыць!
Любога Змей спакусы
Там можа спакусіць.

Заводзіць шуры-муры
Там юны і стары,
Хоць збан ваду і носіць,
Як кажуць, да пары.

Не вер каню ў дарозе,
Хоць добры ты яздок,
А жонцы на курорце
Не вер, не вер, браток!

*ліпень 2002 г.*

## ПЛАЧА ДУДАЧКА

Ходзіць хлопец малады,
І туды ён і сюды,
Не знаходзіць месца,
Ды ўсё грае, сам не свой,
На жалеечцы сваёй –
Замірае сэрца.

Плача дудачка: – Ду-ду-ду-ду-ду! –
Журыцца-ўздыхае, –
Ду-ду-ду-ду-ду-ду! – на сваю бяду
Пакахаў я!

Выйшла дзеўчына з двара
І красою, як зара,
Асляпіла хлопца.
Ад красы яе такой
Засланяецца рукой
Ён, нібы ад сонца.

Плача дудачка: – Ду-ду-ду-ду-ду! –
Журыцца-ўздыхае, –
Ду-ду-ду-ду-ду-ду! – на сваю бяду
Пакахаў я!

Прыгажуня, як ішла
Міма хлопца і пайшла,
Кроку не спыніла.
Пазірае бедны ўслед,
Дзівіць граннем белы свет
Жаласна-шчымліва.

Плача дудачка: – Ду-ду-ду-ду-ду! –
Журыцца-ўздыхае, –
Ду-ду-ду-ду-ду-ду! – на сваю бяду
Пакахаў я!

*люты 1998 г.*

# ОЙ ВЫ, КРЫЛЫ–ВЁСЛЫ

Там, дзе сінь без краю, дзе віруюць хвалі,
Пара маладая човен разгайдала
І плыве-імкнецца ўслед за марай зорнай,
Дзівіцца раздоллем, напявае мройна:

– Ой вы, крылы-вёслы, занясіце ў казку –
На нябесны востраў з лебядзінай ласкай!

Разгарыся, далеч, зорачкай світальнай,
Азары дарогу ў незямныя тайны –
Пад іграннe хваляў, пад напевы чаек
Блаславіць нас неба, месяц павянчае.

– Ой вы, крылы-вёслы, занясіце ў казку –
На нябесны востраў з лебядзінай ласкай!

Пакажыся, бераг цішыні і волі,
Там, дзе не бывае буры злой ніколі,
Там, дзе мы збудуем дом-палац надзейны
З цеплыні кахання, з песень чарадзейных.

– Ой вы, крылы-вёслы, занясіце ў казку –
На нябесны востраў з лебядзінай ласкай!

*кастрычнік 1999 г.*

## СУСТРЭЧА

Вось іду я неяк раз ад сяброў дахаты,
Зорны вечар быў якраз і настрой прыўзняты.
Напяваю: цёх ды цёх, нібы той салоўка, –
Ні турботаў, ні трывог, ні сварлівай жонкі.

Цёх ды цёх! – ні трывог, ні сварлівай жонкі!

Чуюць жытнія палі мой напеў шчаслівы,
А насустрач – ой-люлі! – казачнае дзіва.
Руса косанька на дол сцелецца дарожкай,
Ну, а ножка! – як у той маладой бярозкі!

Ой-ё-ёй! – як у той маладой бярозкі!

Ні наперад, ні назад – стаў, як укапаны.
– Глянь, – сказаў яе пагляд, – ты зачараваны!
Глянуў я – і ай-я-я! – дзівата якая! –
Гэта ж жоначка мая мяне сустракае.

Ай-я-я! Ай-я-я! – дзівата якая!

Я душою да яе: – Жоначка, здарова!
А яна гняце мяне, б'е апошнім словам:
І такі я і сякі, гультай, апівоха,
Хоць куляйся ў глыб ракі з берага крутога!

Жах які! – ў глыб ракі з берага крутога!

*люты 1998 г.*

# Я ЗАЙЗДРОШЧУ ВАСІЛЮ

Я зайздрошчу Васілю – бабылю, як жураўлю, –
Ён не ходзіць па зямлі, а лятае:
То за мора ён імкне, то на дудачцы гудзе –
Халасцяцкае жыццё праслаўляе.

Я зайздрошчу Васілю – бабылю, як жураўлю,
Хоць і жоначку-раўнівіцу люблю!

Я зайздрошчу Васілю – бабылю, як матылю, –
Можа ён штодня блукаць полем-лугам:
Сёння – з кветачкай адной, заўтра – з вабнаю другой –
І ніхто не абзаве валацугам.

Я зайздрошчу Васілю – бабылю, як матылю,
Хоць і жоначку-раўнівіцу люблю!

Я зайздрошчу Васілю – бабылю, як каралю, –
Ад "кароны" ён сваёй не стаміўся –
Прагуляе ноч і дзень – і ніхто не лае: дзе,
Дзе ты, п'яніца, блудзіў, валачыўся?

Я зайздрошчу Васілю – бабылю, як каралю,
Хоць і жоначку-раўнівіцу люблю!

*красавік 1996 г.*

## РУСАЛАЧКА

Неяк раз, не помню ўжо,
У чацвер ці ў пятніцу
Цераз рэчку я ішоў
Па зыбучай кладачцы.

Тут як блісне прада мной,
Што тая маланачка,
Прыгажосцю незямной
Юная русалачка!

З неспадзеву аж прысеў –
Ой, мая ты мамачка! –
Пахіснуўся, паляцеў
У прадонне з кладачкі…

Апрытомнеў на пяску,
Бераг пахне кветкамі,
Чую голас: – Ты адкуль,
Смелы ўзяўся гэтакі?

Хоць успомніў ты цяпер,
Гора маё, горайка,
Як цягнула я цябе
З вір-вады на сонейка?!

З той пары не маю дня,
Каб не зыбаў кладачкі,
Бо вучуся плаваць я
У маёй русалачкі.

*ліпень 1997 г.*

# ТРЭБА ЖОНАЧЦЫ ДАГАДЖАЦЬ

Трэба жоначцы дагаджаць
Днём і ночкай цёмнай –
Яснай зорачкай называць,
Кветачкай чароўнай.

Трэба жоначку не гнявіць
Хатай не прыбранай,
Каб па струначцы не хадзіць
У сарочцы рванай.

Трэба жоначку не журыць
За яе няўдачы –
Хоць талерачку ды разбіць,
Калі суп нясмачны.

Трэба жоначцы дагаджаць,
Як той каралеве,
Трэба жоначку мілаваць,
Як лябёдку лебедзь.

Трэба жоначку не злаваць –
Не глядзець на іншых,
Ціха ў госцікі забягаць
Да суседкі-вішні.

Трэба жоначцы даваць
За настрой бяскрылы –
Шчырай плётачкай частаваць,
Каб мацней любіла…

Трэба жоначцы дагаджаць
Днём і ночкай цёмнай –
Яснай зорачкай называць,
Кветачкай чароўнай.

*снежань 2000 г.*

## ГАМАНІЛА СЯЛО

Гаманіла сяло, гаманіла,
Наваколлем гамонка плыла:
– Хоць бы Ясь ажаніўся з Янінай,
Вось бы слаўная пара была!

Кавлеру, напэўна, ўжо сорак –
Годзе хлопцу хадзіць бабылём,
Хай дзяўчына асвеціць красою
І напоўніць цяплом яго дом!

Далятала гамонка такая
Да Яніны і Яся здалёк,
Хвалявала, як плынь веснавая,
І сасватала іх незнарок…

Гаманіла сяло, гаманіла
І прыціхла шчаслівa на міг:
Ясь бярэ прыгажуню Яніну,
Дай ім, Божанька, дзён залатых!

*сакавік 1997 г.*

# РАМОНКІ

Галя-красуня на лузе ад ранку –
Кветкі збірае, вяночкі віе,
Мроіць свайго чарнабровага Яську
І на рамонках варожыць, пяе:

– Чароўны красачкі мае, чароўны красачкі мае,
Наваражыце:
А ці кахае Ясь мяне, а ці кахае Ясь мяне? –
Вы мне скажыце!

Любіць, не любіць, да сэрца прыгорне,
Любіць, не любіць, да д'ябла пашле,
Любіць, не любіць… І дзеўчыне горка,
Зноў паўтарае, пялёстачкі рве:

– Чароўны красачкі мае, чароўны красачкі мае,
Наваражыце:
А ці кахае Ясь мяне, а ці кахае Ясь мяне? –
Вы мне скажыце!

Любіць, не любіць, да сэрца прыгорне,
Любіць, не любіць, да д'ябла пашле,
Любіць, не любіць, пярсцёнак падорыць,
Любіць… І Галя ад шчасця пяе:

– Чароўны красачкі мае, чароўны красачкі мае,
Наваражылі:
Кахае Ясенька мяне, кахае Ясенька мяне,
Кахае мілы!

*ліпень 1995 г.*

# ДЗЕ ТЫ БЫЎ?

Залаціцца раса, як сляза, на сонцы,
А дзяўчына-краса спавядае хлопца:

– Ой, Ягорка-Ягор, гора маё, гора,
Дзе ты быў, дзе ты быў,
Любы мой, учора?!

Не кажы, не кажы, што ў цябе адна я,
Ад тваіх ясных воч іншых засланяю!

Не мані, не мані – знаю ўсё, мой любы,
З кім стаяў, з кім стаяў
Ты пад нашым дубам?!

Ну і стой, ну і стой – гараваць не стану,
А махну я рукой на цябе, каханы!

Ёсць сусед у мяне, хлопец зухаваты,
Кружыць ён матыльком
Каля маёй хаты!

Дзень і ноч пад акном на гітары грае,
Так звініць, як жаўрук, – сэрца замірае!..

Ой, Ягорка-Ягор, гора маё, гора,
Дзе ты быў, дзе ты быў
Любы мой, учора?!

*чэрвень 1996 г.*

# ОЙ, ЧАМУ ТЫ, ЯНКА...

– Ой, чаму ты, Янка, гэтакі пануры,
Нібы градам ніву патаптала бура?

– Касенька-галубка, весяліцца рана –
Не мяне твой голас кліча на сняданак.

– Ой, чаму ты, Янка, гэтакі маўклівы?
Заспявай вяснянку – падаруй мне дзіва!

– Касенька-галубка, не пяецца слова –
Не мяне ты слухаць дзень і ноч гатова!

– Ой, чаму ты, Янка, луг ніяк не скосіш,
Затупела коска ці апалі росы?

– Касенька-галубка, жах! – а не работа –
Не мяне галубіць рук тваіх пяшчота!

– Ой, чаму ты, Янка, ля ракі блукаеш,
У віры крутыя сумна пазіраеш?

– Касенька-галубка, а куды ж мне дзецца? –
Не мяне купаюць воч тваіх азерцы!

– Яначка мой любы, пачакай тапіцца! –
Надта ж ледзяная ў сінь-рацэ вадзіца!

*чэрвень 1996 г.*

# Я ДЗЯЎЧЫНА – ХОЦЬ КУДЫ

Я дзяўчына – хоць куды:
І ў гарох, і ў лес густы,
Ў ягады-маліны!
Ну, а ты, мой мілы, ты,
Што хаваешся ў кусты
Ад такой дзяўчыны!

Ці ж не маю я красы?
Паглядзі, такой касы,
Свет прайдзі, не ўбачыш!
Я яе як расчашу
Ды па ветры як пушчу,
Мілы мой, ты ахнеш!

Даганяй – я пакажу:
Закружу, заваражу
Хваляй руса-белай!
Толькі дзе ж табе дагнаць,
Мілаваць ды цалаваць,
Мой жа ты, нясмелы!..

Я дзяўчына – хоць куды:
І ў гарох, і ў лес густы,
Ў ягады-маліны!
Ну, а ты, мой мілы, ты,
Што хаваешся ў кусты
Ад такой дзяўчыны!

*ліпень 1997 г.*

## ЯГАДКА МАЯ

– Ой, ты, ягадка мая,
Не пазнаў цябе здаля –
Будзеш ты багатая.
Ў цёмным лесе – не ў гасцях,
Не баішся медзвядзя,
Бурага, калматага?

– Ну чаго баяцца мне
У радзімай старане
Бурага, калматага?
Хай мне толькі падміргне,
Біч паходзіць па спіне,
Палка сукаватая.

– Знаю, ягадка мая,
На любога медзвядзя
Пойдзеш, не разгубішся.
Калі ж я цябе злаўлю,
За касу і прытулю,
Ты й на біч забудзешся!

– Ой, мядзведзік дарагі,
Развязаў ты слоў мяхі
І не можаш сцішыцца.
У малінавым бары
Гучна так не гавары –
Ягадкі абсыпяцца.

*ліпень 1996 г.*

# ОЙ, СЯБРОВАЧКА

– Ой, сябровачка, адшыла
Ты такога сокала! –
Ён ужо расправіў крылы
Пад маімі вокнамі.

– Разлюбіла я Сяргея –
Не хачу з ім мучыцца:
Зачасаць кала не ўмее,
Мо з табой навучыцца?

– Ой, сябровачка, і сонца
Мо цябе не радуе?
Вунь Рыгор, такі малойца,
Хочаш, я пасватаю?

– Не хачу я і Рыгора –
Дома не стыкаецца:
То ў Хвядоры, то ў Тадоры,
Нібы кот, бадзяецца.

– Ой, сябровачка, ні разу
Ты не пахвалілася,
Як прымаеш ад Тараса
Васілёчкі сінія.

– Не магу цярпець Тараса –
Ён як затарможаны:
Упацее, покуль скажа:
"Любая, харошая!"

– Ой, сябровачка, ты свята,
Бачу я, не зведала,
Ты прыгледзься да Ігната –
Ён вясёлы, ветлівы.

– Ды ідзі ты з тым Ігнатам –
Ходзіць уразвалачку,
Падпірае дрынам хату
І хлявочак палачкай.

– Ой, сябровачка, ты нешта
Аж занадта гордая.
Пакахала б ты Міхеда:
Не тутэйшы, з горада.

– Не кажы мне пра Міхеда,
Штосьці з ім здараецца:
Роўна ходзіць да абеда,
А пасля хістаецца.

Пакахала я Сцяпана,
З ім і павянчаюся,
"Мэрсэдэс" набыў ён файны,
Ай ды пакатаюся!

Мы прыпеўкі праспявалі.
Дзякуй, што вы слухалі
І даруйце, калі з намі
Час дарэмна ўбухалі.

*сакавік 2001 г.*

# НЕ ДЗІВІСЯ, МОЙ СУСЕД

Не дзівіся, мой сусед, на суседку –
Расцвіла не для цябе ружа-кветка.
Ці ж не ведаў для каго расцвіла я? –
Хлопца-сокала даўно я кахаю.

Падару яму красу маладую –
Ён і радасць, і мой сум сэрцам чуе,
Я аддам яму сябе да драбніцы,
З ім не страшны будуць мне навальніцы.

Не дзівіся, мой сусед, не гарніся да суседкі –
Толькі любы мой сарве садавую ружу-кветку!

Асвячу яму я шлях белацветам –
І ў нязведанных краях будзе светла.
Да яго імкну душой – ён галубіць,
За калючы нораў мой не разлюбіць.

Пакахала б і цябе, мой суседзе,
Калі ты запрог бы мне моцны вецер.
Я магла б з табой імчаць на край свету,
Толькі дзе ж табе стрымаць тога ветру!

Не дзівіся, мой сусед, не гарніся да суседкі –
Толькі любы мой сарве садавую ружу-кветку!

*красавік 2002 г.*

## ТЫ НЕ КЛІЧ МЯНЕ

Ты не клiч мяне, мой любы,
Не гукай у стольны горад! –
Ён каханне нам загубiць,
Як вiхура лодку ў моры.

Столькi ў горадзе спакусы!
Спакусiцца там недоўга.
Вось вазьму я i ўлюблюся
Ў бiзнесоўца маладога.

Буду з iм на самалёце
Па ўсiм свеце я катацца,
Загараць пад шчодрым сонцам
На Канарах i Ямайцы…

А не лепей нам з табою
Горад свой пабудаваці
З вечнай ласкі і любові,
Дзе духмяняць сенажаці?

Ці ж нам сумна тут бывае?
Ў нас канцэрты пад рукою:
Нам пяе зязюлька ў гаі
І салоўка над ракою…

Ты не клiч мяне, мой любы,
Не гукай у стольны горад! –
Ён каханне нам загубiць,
Як вiхура лодку ў моры.

*жнівень 1997 г.*

# ЦЕШЧА І ЗЯЦЬ

Ой, ты кумачка мая,
Што рабіць, не знаю?
Не знаходжу месца я,
Так перажываю!

Аддавала я дачку,
Цешылася зяцем:
Будзе ён надзейны муж,
А мне сын удзячны.

Быў спачатку ён, ну хоць
Прыкладай да раны,
Як мой шэры коць-Маркоць,
Ціхі, паслухмяны.

Мала еў і мала піў,
Уставаў на золку,
І араў ён, і касіў
Сена на кароўку.

І палоў, і паліваў
Агарод старанна,
Дроў гару такую склаў! –
Люба-міла глянуць.

Ды праз год зяцька майго,
Нібы падмянілі, –
Ні з таго і ні з сяго
Апусціў ён крылы.

Агрызацца нават стаў:
– Што ты, – кажа, – цешча
Ў крук мяне сагнула так –
Не распраміць плечы.

Закіпела ў сэрцы злосць –
І я не ўтрывала:
– А не гнешся, ягамосць,
Ты ад торбы з салам?!

Праваліся гэткі зяць,
Што не мае чэсці:
Ўсё глядзіць, каб толькі ўзяць
І дамоў панесці…

Ой, ты кумачка мая,
Што рабіць, не знаю?
Не знаходжу месца я,
Так перажываю!

*ліпень 2002 г.*

## ШТО ЗА ЗВЫЧАЙ ГЭТКІ?

Ой, мая сястрыца,
Дзеецца што ў свеце, –
Як у навальніцу,
Ўся зямля трасецца!

Паглядзі, якая
Сёння наша моладзь:
Богам пагарджае,
Ў Храм святы не ходзіць.

Весяліцца ў блудзе,
У грахоўнай твані,
За грахі што будзе,
Ёй зусім не важна.

Што за звычай гэткі
Сёння ў нашых дзетак? –
Шлюб бяруць пад плотам,
А вяселле потым!

Ім паганскі звычай
Найбліжэй, па густу,
Плёскаюцца звычна
У рацэ распусты.

Я яшчэ не помню,
Каб пілі дзяўчаты
З хлопцамі па-роўну,
Неслі хмельным матам.

Ой, мая сястрыца,
Пра нудыстаў чула?
Як тут не нудзіцца,
Не ўзмаліцца сумна:

Што за звычай гэткі
Сёння ў нашых дзетак? –
Шлюб бяруць пад плотам,
А вяселле потым!

*ліпень 2002 г.*

## ЗАЦВІЛА КАЛІНА

Зацвіла каліна, а віхурны вецер
Белы цвет зрывае, сцеле над ракой.
Ой, краса-дзяўчына, не трывож мне сэрца
Сумнымі вачыма, горкаю слязой!

Родная, не бойся буры-навальніцы,
Акрапі куточкі свенчанай вадой,
Дай і мне ў дарогу той святой вадзіцы,
Каб дамоў вярнуцца з добрай навіной.

Мне пара, сястрыца, – трубіць рог турыны:
У паход гукае матухна-зямля.
З ласкі Божай спынім віхру вал нястрымны,
Вер у перамогу, слаўная мая!..

Зацвіла каліна, а віхурны вецер
Белы цвет зрывае, сцеле над ракой.
Ой, краса-дзяўчына, не трывож мне сэрца
Сумнымі вачыма, горкаю слязой!

*люты 2001 г.*

## ГОДЗЕ, СЫНКУ МОЙ

Журыць сына бацька:
– Годзе, сынку мой,
Годзе ўжо бадзяцца
Цемраю начной.

Што табе не спіцца? –
Блудзіш, як мядзведзь,
Час табе жаніцца
І сям'ю займець!

Годзе, сын, бадзяцца
Годзе лынды біць,
Час на хлеб старацца
І па-людску жыць!

Кожны твой равеснік
Спазнае ўжо свет,
Ажаніўся недзе
І жыве, як след.

Толькі ты, бадзяга,
У гульбе пустой,
Вось уклею дзягай,
Будзеш знаць за што.

Хутаранку Галю
Ведаеш ці не?
Я цябе адпраўлю
Ў сваты да яе.

Ажаню цябе я
З дзеўчынай-красой –
Зашуміць вяселле
Весняю ракой…

Годзе, сын, бадзяцца
Годзе лынды біць,
Час на хлеб старацца
І па-людску жыць!

*ліпень 2002 г.*

## ХЛОПЦЫ–МАЛОЙЦЫ

Хлопцы-малойцы ў карчомку зайшлі,
Хлопцам-малойцам віна падалі.
Выпілі хлопцы – віно не п'яніць,
Просяць гарэлкі па кварце наліць.

Хлопцы-малойцы гарэлачку п'юць
Да сумнаватыя песні пяюць.
Кідаюць хлопцы самотны пагляд,
Просяць паклікаць прыгожых дзяўчат.

Хлопцы-малойцы, як сад, расцвілі –
Краскі-дзяўчаткі ў карчомку прыйшлі.
Хлопцы-малойцы частуюць гасцей,
Просяць музыкаў іграць весялей.

Пара за парай ідзе ў карагод,
Песні і танцы ўсю ноч напралёт.
Хлопцы не маюць спачынку і сну –
Заўтра казакам ісці на вайну.

*студзень 1998 г.*

# НЕПАГОДА

Ой, мой Божанька, што ўжо робіцца!
Глянь, мая сястрыца:
Бура носіцца, ў хату ломіцца –
Грукат-навальніца.

Ці ж не так парой непагодзіцца
У раўнівым сэрцы:
Як узвіхрыцца, не ўгамоніцца
Звада-калатнеча.

Хлопец з дзеўчынай сустракаюцца –
Цешацца, смяюцца,
А пажэняцца – забіваюцца,
За чубы бяруцца.

Свежы прыклад ёсць – Ян з Марысяю,
Вабныя сабою,
Так любіліся – ўсе дзівіліся –
Не разліць вадою.

А пасля вянца, месяцы праз два,
Іх як падмянілі:
То расходзяцца, то сыходзяцца,
Свет ім стаў не мілы…

Хлопец з дзеўчынай сустракаюцца –
Цешацца, смяюцца,
А пажэняцца – забіваюцца,
За чубы бяруцца.

*верасень 2001 г.*

# ОЙ, ШТО ДЗЕЕЦЦА!

Ой, што дзеецца, ой, што робіцца! –
І куды ж, куды свет наш коціцца?
Як пчаліны рой – дзеўкі з хлопцамі:
Рок-скок і поп-гоп! – скачуць-гоцаюць.

"Ціскатэка", пляж – як ні цешыцца:
Ёсць дзе цiскацца ды вылежвацца,
Байструкоў пасля плодзяць блудніцы.
Вось так, свацейка, свет і губіцца.

Пра такіх распусніц пляжных
Нездарма ў народзе кажуць:
"Лю-лі, лю-лі, дзіця, спаць –
Адна маці, бацькоў пяць!"

Знаеш навіну, мая свацейка?
Бэнся прывяла дачка Каціна.
Прывязе дамоў, маці згодзіцца:
Гадаваць адной цяжка ў горадзе.

Гандляваць сабой дык ёй лёганька.
Ой, што робіш ты, грош зялёненькі? –
"Матылькоў" начных столькі лётае!
Нашто ж замуж ім – меней клопату...

Пра такіх распусніц пляжных
Нездарма ў народзе кажуць:
"Лю-лі, лю-лі, дзіця, спаць –
Адна маці, бацькоў пяць!"

*ліпень 2002 г.*

## СУСЕДКІ

Размаўляюць суседкі,
Бы віхурыцца вецер,
За ўсіх больш ад кабетак
Мужыкам дастаецца:

– Вунь Лявон сталяруе,
А што з гэтага мае? –
Яго жонка гаруе
І свой лёс праклінае.

Ну нашто гэткі майстра
З залатымі рукамі,
Што забыць дзеля п'янства
Жонку можа з дзіцямі.

Ці вазьмі вунь Віталя,
Ён каваль адмысловы:
З-пад рукі вылятаюць
Залатыя падковы.

Хоць куе адмыслова,
Дорыць іншым на шчасце,
А сабе той падковы
Ён не можа скаваці…

Так жыццё ўжо і пройдзе
Адзінока-самотна,
І, магчыма, ён знойдзе
Міг апошні пад плотам…

Размаўляюць суседкі,
Бы віхурыцца вецер,
За ўсіх больш ад кабетак
Мужыкам дастаецца.

*ліпень 2002 г.*

## ПРЫМАКІ

Я прымак і ты прымак,
Нас, вясёлых, двое.
Пойдзем, швагра, адпачнем
На раку з табою.

Там такая прыгажосць:
Хваля ў бераг плешча,
Кружыць-меле шумны вір,
Бы язык у цешчы.

Я прымак і ты прымак,
Нас, вясёлых, двое.
Пойдзем, швагра, адпачнем
На раку з табою.

Цешчы мы паведамім
Пра сябе ў запісцы:
"Даражэнькая, бывай,
Мы пайшлі тапіцца!"

А тым часам мы з табой
Там па кроплі возьмем
І гаворку пра жыццё
Песняй упрыгожым.

Там мы з плотак-печкуроў
Юшкі нагатуем…
Дома цешчаньку сваю
Рыбкай пачастуем.

Падаруем ёй букет
Беленькіх лілеяў.
Ад здзіўлення цешча: “Ах!”
І на міг самлее.

Я прымак і ты прымак,
Нас, вясёлых, двое.
Пойдзем, швагра, адпачнем
На раку з табою.

*ліпень 2002 г.*

## ГАРА СВЯТАЯ І БЯРОЗКА

Няма спакою ў свеце:
Гудзе варожы вецер,
Наўкол наводзіць жах –
І хлопец, юны воін,
Здабыць у бітвах волю
Адправіўся у шлях.

Праводзіла дзяўчына
У грозную чужыну
Каханага свайго.
Не ведала, не знала,
Што вылье слёз нямала, –
Не ўбачыць больш яго.

Жыла надзеяй светлай –
Прыходзілі са свету
Ад любага лісты.
У іх ні ноткі суму –
Бадзёрыў ён красуню,
Адводзіў страх бяды.

Бяда ж прыйшла раптоўна,
Ударыла, як громам,
Смяротэльнай навіной:
У вечнасць ратным полем
Пайшоў адважны воін –
Гарою стаў святой.

Дзяўчына абамлела,
Бярозкай зашумела
Над сумнаю ракой.
А з той гары далёкай
Вяртаецца салоўка
Ёй песні пець вясной.

*студзень 2003 г.*

## ЧАЙКА БЕЛАКРЫЛАЯ

На вадзе ўстрывожанай
Човен калыхаецца –
Кружыць хлопец возерам,
Тужыць па абранніцы:

– Там, дзе хвалі зорныя,
Там, дзе светла мроіцца,
Па табе, чароўная,
Сэрца маё зводзіцца.

О мая ты, мілая,
Чайка белакрылая,
Веру і надзеюся –
Мы з табой сустрэнемся!

Павяслуем, верная,
Павяслуем, шчырая,
Да святога берага,
Ў лета незабыўнае.

Пойдзем, летуценная,
Хмельна-кветнай пожанькай,
Дзе сушылі сена мы,
Снілі сны прыгожыя…

О мая ты, мілая,
Чайка белакрылая,
Веру і надзеюся –
Мы з табой сустрэнемся!

*лістапад 2000 г.*

# СПЕЎ КАРАГОДНЫ

Спеў карагодны чаруе зямлю,
Кружыцца явар з калінай –
Мройна спяваюць у тон салаўю
Хлопец з дзяўчынай:

– О як таемна ў світальным гаі,
Сцежка бяжыць над ракою!..
Што перад намі? Якія шляхі
Пройдзем з табою?

Сіняя далеч нязнаных краёў
Казкай якою спаткае?
Колькі зязюля шчаслівых гадоў
Нам накувае?

Толькі ці трэба нам казкі чужой,
Хоць і нябесна-чароўнай?
Дом пабудуем над роднай ракой,
Шчасцем напоўнім…

Спеў карагодны чаруе зямлю,
Кружыцца явар з калінай –
Мройна спяваюць у тон салаўю
Хлопец з дзяўчынай.

*верасень 2001 г.*

## НЕ ТРЫВОЖСЯ, МАРЫСЬКА!

Вецер ярасна вые,
Гоніць птахаў у вырай –
І дзяўчына ў адчаі,
Горкіх слёз не хавае:

–Ой, куды ж, мой каханы,
Ты сабраўся так рана
І сядлаеш гнядога
У такую дарогу?!

–Не трывожся, Марыська,
Не тужы, не журыся,
Не згінайся, дзяўчынка,
Як ад ветру былінка!

Я вярнуся дадому,
Як асілім дракона,
Што зямлю нам святую
Гэтак люта дратуе.

Вер, мая залатая, –
Злая хмара сканае,
І пярсцёнкам вянчальным
Сонца ўзыйдзе над намі…

Не трывожся, Марыська,
Не тужы, не журыся,
Не згінайся, дзяўчынка,
Як ад ветру былінка!

*снежань 1997 г.*

## ГОРАЧКА ЧУБАТАЕ

– Маё горачка чубатае, –
Плача дзеўчына, ўздыхае, –
Аніхто мяне не сватае,
Што рабіць ужо, не знаю.

Столькі хлопцаў добрых мела я,
Не было ад іх адбою,
І куды яны падзеліся –
Паплылі якой вадою?

Маё горачка чубатае,
Аніхто мяне не сватае.
Дзе ж ты, сокал мой крылаты?
Прылятай скарэй у сваты!

Ой, у чым я вінаватая,
Што нікога ўжо не маю?
Я ж не злая, не кудлатая,
Не распусніца якая.

Можа трохі ганарлівая,
Ну дык ёсць чым ганарыцца,
Самі хлопцы гаварылі мне:
Я дзяўчына-чараўніца...

Ой, як сумна, мама родная,
Што рабінцы ў чыстым полі,
Ты скажы, скажы мне, полейка,
Ці знайду я шчасце-долю?

Ты скажы, маё шырокае,
Свята ўбачу я ці скора?

Запражэ мой любы коніка
І прымчыць на мой падворак?..

Маё горачка чубатае,
Аніхто мяне не сватае.
Дзе ж ты, сокал мой крылаты?
Прылятай скарэй у сваты!

*жнівень 2002 г.*

## ОЙ, СЫНКУ!

– Ой, сынку, сынку, што гэта з табою?! –
Маўчыш, не гаворыш, дзе ты бываеш.
Відаць па вочках, што ходзіш па ночках,
Дзяўчыну маеш і забаўляеш.

Мой мілы хлопча, зусім ты забыўся,
Што ў войска збірацца табе ўжо скора.
Глядзі, да службы, каб не ажаніўся,
Няўжо ты хочаш набрацца гора?

– Не бойся, маці, не бойся дарэмна,
Чаго не бывае на белым свеце!
Майго не будзеш дзіця гадаваці,
Паможа цешча яго прыгледзіць.

– О не, мой сынку, калі ўжо так выйшла,
То вас, галубочкаў, мы павянчаем.
Дзіцятка будзе ў мяне падрастаці,
Чакаці татку з чужога краю.

*травень 2002 г.*

## АД’ЯСНЕЛА ЗАРАНКА–ЗАРА

Ад’яснела заранка-зара,
Развіталася з раніцай яснай.
Мне таксама расстацца пара
З незабыўнай часінай юнацтва.

Адзвіняць залатыя дзянькі
Карагодам над быстраю рэчкай,
Дзе пускаў я з каханай вянкі,
А на іх – мігатлівыя свечкі.

Хоць і весела быць бабылём,
Ды скарыцца каханню я мушу:
Не аб’едзеш таго і канём,
Што прызначана лёсам, мой дружа!

Я адчуў на вяселлі тваім:
І мая будзе гэткая доля –
Адспяваюць мае салаўі,
Адквітнеюць лугі на прыволлі.

Давядзецца, мой сябра і мне
Развітацца з жыццём халасцяцкім,
Маладой бесклапотнай вясне
Несуцешна рукой памахаці...

Хоць і весела быць бабылём,
Ды скарыцца каханню я мушу:
Не аб’едзеш таго і канём,
Што прызначана лёсам, мой дружа!

*верасень 2002 г.*

# З ДОБРЫМ МУЖАМ – НАЖЫВЕШСЯ

Вецер гойдае каліну,
Ледзь галінкі не ламае,
А дачку, красу-дзяўчыну,
Маці вучыць-навучае:

– Райся, дачачка, ты з сэрцам,
Калі мужа выбіраеш,
Каб пасля не выць, як вецер,
І душу слязой не раніць.

З добрым мужам – нажывешся,
Будзеш радасцю іскрыцца,
З кепскім – гора набярэшся,
Учарнееш, як зямліца.

Калі я была такая,
Навучала мяне маці:
Без глыбокага кахання
Ў вір замужжа не кідацца.

І жыву я, дзякуй Богу,
Сама бачыш, з бацькам добра,
І хачу ў жыцці дарогі
Я табе такой жа роўнай...

Не вадзіся ты з Яўхімам,
Ён пад "мухай" ходзіць часта,
І бацькі ў яго такія,
Ты за ім не мела б шчасця.

Пакахала б ты Сцяпана,
Хлопец, ён, разумны, дужы

І з сямейкі паважанай,
Ты жыла б за ім, дачушка...

З добрым мужам – нажывешся,
Будзеш радасцю іскрыцца,
З кепскім – гора набярэшся,
Учарнееш, як зямліца.

*жнівень 2002 г.*

## ВЯСКОВАЯ ЎДАВА

Пра ўсё рознае на свеце
Разважае непаспешна,
А найбольш, бадай, аб дзецях –
То журліва, то усцешна:

– Бальшуну свайму казала:
Не жаніся з гарадскою –
Пазяхае – сну ёй мала,
А гарод зарос травою.

Меншы мой са мной быў згодны,
Ўзяў руплівіцу-вяскоўку:
Хлеб у хаце невыводны,
І адзетыя з іголкі...

Задрыжаў кабецін голас,
Апаліў мой слых знянацку:
– Ні аднога, ні другога
Гадаваць не даў Бог бацьку.

*сакавік 1983 г.*

## АДЧАПІСЯ, БАРАДАТЫ

На рачным прычале ў лодцы
Дзеўчына сумуе,
А прад ёю гожы хлопец
Галубком буркуе:

– Ты чаго, мая галубка,
Сумная такая,
Мо цябе пакінуў любы
І з другой гуляе?

– Адчапіся, барадаты,
Кроч сваёй дарогай,
У цябе на сэрцы свята,
У мяне – трывога:

Мой каханы-нарачоны
У далёкім краі,
Дзён мінула незлічона,
Што з ім, я не знаю.

– Я хацеў пачуць такое,
Любая галубка,
Хто стаіць перад табою,
Ты пазнаеш хутка.

– Ой, не верыцца, што голуб
Мой дамоў вярнуўся,
Мо паверу, як паголіць
Бараду і вусы!

*верасень 2000 г.*

## ШТО МНЕ ТЫЯ ГРОШЫ!

Не прыносіць ні рубля
Любы мой, харошы,
Ды жыву шчаслівa я –
Што мне тыя грошы!

Мужычок мой, я не лгу,
Як дубок, прыгожы,
Наглядзецца не магу –
Што мне тыя грошы!

Хоць без хлеба я сяджу,
На адной вадзіцы,
Ды на мілага гляджу,
Як не пахваліцца!

Помню, з лесу прынясла
Я грыбочкаў кошык,
Тыдзень ела ўся сям'я, –
Што мне тыя грошы!

Мо таму я стройная,
Што няма раскошы?
Я каханнем поўная –
Што мне тыя грошы!

Хоць без хлеба я сяджу,
На адной вадзіцы,
Ды на мілага гляджу,
Як не ганарыцца!

*лістапад 2000 г.*

## КАЛІНА

Расцвіла каліна ў полі,
Свет чаруе белым цветам.
– Ой, не баўся, мая доня,
З хлопцам гэтым!
Што ты ходзіш з абібокам,
Не глядзі, што ён прыгожы,
Языком мянціць без толку
Толькі й можа.

– Не кажы, матуля, гэтак,
Не судзі яго дарэмна.
Помніш, нам памог ён летась
Касіць сена?
Ён касіў, а я сушыла,
Песня радасна лілася,
Ой, чаму ты не ўзлюбіла
Майго Яся?!

– Я старэйшая і знаю:
Хто ёсць хто, таму і раю,
Бо сама была такая,
Як сляпая.
Быў і бацька твой няленны,
Гаваркі, жывы, як вецер,
Сёння ён сабакам сена
Косіць недзе...

Расцвіла каліна ў полі,
Свет чаруе белым цветам.
– Ой, не баўся, мая доня,
З хлопцам гэтым.S

*жнівень 1998 г.*

## КАЛЯ МЛЫНА

Над ракою, каля млына,
Пара юная гуляе.
Прытуляючы дзяўчыну,
Хлопец уздыхае.
　　Уздыхае, не пускае
　　Светлакосую дадому:
　　– Зацалую, залюляю
　　На чаўночку мройным.

А ўцячэш імклівай чайкай –
Быстрым сокалам зраблюся,
Даганю я сваё шчасце,
Сэрцам прытулюся.
　　Прытулюся, прыгарнуся,
　　Ахіну крылом пяшчотным –
　　Любай чаечкаю будзеш
　　Ты маёй заўсёды.

А яму красуня кажа:
– Хлопча мілы мой, не трэба,
Калі сокал ты адважны,
Узніміся ў неба.
　　І дастань мне Мілавіцу –
　　Кветку зорнай сенажаці,
　　Я ж яе ў сваю касіцу
　　Запляту на шчасце.

І пакуль ты не дастанеш
Той мне зорачкі, саколе, –
Любай чаечкай не стану
Я тваёй ніколі...

Над ракою, каля млына,
Пара юная гуляе.
Прытуляючы дзяўчыну,
Хлопец уздыхае.

*студзень 2002 г.*

## ШУРЫ – МУРЫ

Я кахаю толькі Яся –
Хлопца зухаватага,
Сню яго, як тога князя,
Шчырага, спагаднага.

Шуры-муры у мяне:
Адзін – любы, адзін – не!

Ой, мяне нялюбы Ромка
Замуж браць наважыўся,
Ў лесе гоніць самагонку
Для вяселля нашага!

Шуры-муры у мяне:
Адзін – любы, адзін – не!

Яся любага мілую –
Аж душа праменіцца,
А Раман хай не бядуе –
Самагонкай цешыцца.

Шуры-муры у мяне:
Адзін – любы, адзін – не!

*лістапад 2000 г.*

## ЯК АЖЭНІЦЦА – ПЕРАМЕНІЦЦА

Гулкай раніцай рэха коціцца
Прамяніста-звонка –
Дзве суседачкі ля калодзежа
Завялі гамонку:
– Што рабіці мне, мая Зосечка,
Неспакойна ў хаце? –
Як за горачку зойдзе сонейка,
Сына не ўтрымаці.

Ходзіць-блудзіць ён невядома дзе,
Па якіх гулянках,
А я плачу ноч, не магу заснуць
Да самага ранку.
– Ой, Мальвіначка, не журыся так,
Не ўздыхай тужліва:
Як ажэніцца – пераменіцца
Твой сынок блудлівы!

– Ды баюся я, мая Зосечка, –
Грымне навальніца –
Сын мой выбера для свайго жыцця,
Як і сам, блудніцу.
– Ой, Мальвіначка, надта не бядуй,
Ты ўратуеш сына:
У мяне ў гасцях братава дачка,
Файная дзяўчына!

Я тваю бяду скора развяду,
Як кажуць, рукамі:
Свацця́й буду я на вяселлі іх,
Параднюся з вамі.

– Дзякуй, Зосечка, толькі ў гэта мне
Верыцца не дужа.
Буду я маліць, каб дайшлі твае
Слоўцы Богу ў вушы.

*ліпень 2002 г.*

## ОЙ, НЕ ЧАРУЙ!..

Ой, не чаруй, ой, не чаруй, краса-дзяўчына,
Бяздонна-чорнымі, агністымі вачыма!
Не спакушай, не спакушай мяне ты гэтак –
Гатоў ад позірку твайго не край Сусвету!

Ой, не чаруй, ой, не чаруй, краса-дзяўчына,
Бяздонна-чорнымі, агністымі вачыма!

Любой парой: у дождж, у снег, у спёку-сцюжу,
Гатоў табе з сузор'я Льва прынесці ружаў,
Але бяздоннасці вачэй тваіх баюся,
А як сарвуся ў вір круты і захлынуся!

Ой, не чаруй, ой, не чаруй, краса-дзяўчына,
Бяздонна-чорнымі, агністымі вачыма!

Калі не хочаш на зямлі, то я душою
Гатоў на Марсе рай стварыць для нас з табою,
Але агністасці вачэй тваіх баюся,
А як згару я ў іх, бы знічка, адыскруся!

Ой, не чаруй, ой, не чаруй, краса-дзяўчына,
Бяздонна-чорнымі, агністымі вачыма!

*жнівень 2000 г.*

## ХТО КАХАЕ, ТОЙ ЗНОЙДЗЕ

Над ракою вірыстай
Вербы ціха шумяць.
Закахана-іскрыста
Вочы ў хлопца гараць:

– Не хавайся, дзяўчына,
Пад вярбой у журбе –
Аніводзін хлапчына
Тут не знойдзе цябе.

– Хто кахае, той знойдзе
І з сабой павядзе,
А хто не – міма пройдзе,
І Бог з ім – хай ідзе.

– Я знайшоў, бо кахаю
І стаю прад табой,
О краса незямная,
Будзь навекі маёй!

– У мяне ёсць умова:
Будзе мой толькі той,
Хто запросіць у човен,
Павяслуе са мной.

А куды, я не знаю,
Можа, ў казачны край,
Што заранкай міргае,
І падорыць мне рай.

– Згодзен я, прыгажуня,
І з умовай такой –

Загадай – паплыву я
І да зораў з табой.

*чэрвень 2002 г.*

## БЕРАЖЫ, КАЛІНА...

– Беражы, каліна, тонкія галіны –
З ветрам не гуляй.
Не кахай, Яніна, малада дзяўчына,
Янку-бабыля.

– А чаму, скажы мне, Янку не кахаці
Ды не мілаваць?
Ён жа так умее хораша спяваці
Ды на скрыпцы граць!

– А ці ты не чуеш, ці вачэй не маеш,
Што ты ў ім знайшла?
Ён жа п'е, гуляе, ні пра што не дбае,
Як бы ты жыла?

– Не хачу нічога я ні чуць, ні бачыць,
Дай ты мне спакой.
Сэрца – мой дарадца, што пяе і плача,
Калі Ян са мной...

– Беражы, каліна, тонкія галіны –
З ветрам не гуляй.
Не кахай, Яніна, малада дзяўчына,
Янку-бабыля.

*жнівень 1998 г.*

## НЯХАЙ САБЕ МУЖЫК, ЯК ЛАПАЦЬ

Мая суседачка, ты чула?
Пайшла гамонка па дварах,
Аж сэрца мне кальнула.
Паслухай – проста жах!

Гавораць: мой мужык няўдалы –
Ніжэй травы, цішэй вады.
А мне ён – лепшы самы,
А мне ён – залаты.

За ім спакойна і надзейна,
Як за каменнаю сцяной,
Душою маладзею
І ведаю адно:

Няхай сабе мужык, як лапаць,
І ходзіць-робіць, нібы спіць,
Абы за ім не плакаць,
Гаручых слёз не ліць.

Мая суседачка, жыву я
І зла нікому не раблю,
Чаму тады я чую
Такую балбатню?

Гавораць: мой мужык бяздарны,
Не мае смелых крылаў-мар.
А мне ён – самы здатны,
А мне ён – гаспадар.

Не знала б я другога ліха,
А плёткі злыя, як віно,

Перашумяць і схіснуць,
Я ж ведаю адно:

Няхай сабе мужык, як лапаць,
І ходзіць-робіць, нібы спіць,
Абы за ім не плакаць,
Гаручых слёз не ліць.

*ліпень 2002 г.*

## СПЕЛАЯ СУНІЧКА

Прыгажуня Яня ягады збірала,
Спелаю сунічкай рдзелася яна.
Ягады збірала, з Янкам жартавала:
– Ты ляці, мой голуб, набяру адна!

– Ой, мая галубка, зборы тут малыя:
Дзе-нідзе чырвона, болей – пустацвет.
Завяду цябе я ў ягады такія,
Буйна-сакаўныя, што не бачыў свет!

– Дзякуй, мой спагадны, я і тут спяваю,
Не пайду, баюся, ў бор далёкі твой:
Там мядзведзі ходзяць, там ваўкі блукаюць,
На маёй палянцы – ціша і спакой...

І раптоўна сціхла ўсё наўкол пад сонцам,
Змоўклі на хвіліну дрэвы і трава,
Затаіў дыханне ўвесь Сусвет бясконцы –
Прыгажуню Яню Янка цалаваў.

*жнівень 1994 г.*

# ДЗЕ ТЫ, МОЙ ХАРОШЫ?

Птушкі ў вырай адлятаюць,
Халады перачакаюць
І вяртаюцца ізноў.
Толькі ты, мой ясны сокал,
З той старonачкі далёкай
Не вяртаешся дамоў.

Дзе ты, мой харошы, дзе ты?
Вочы ўсе я прагглядзела,
Пазіраючы на шлях,
Сны усе я перасніла,
Што ўзнімалі нас на крылах
У мядункавых лугах.

Ўсе дарожкі абхадзіла
Па якіх з табою мілы
Я гуляла да відна,
Песні ўсе перапяяла,
Што калісьці даравала
Нам чароўная вясна...

Птушкі ў вырай адлятаюць,
Халады перачакаюць
І вяртаюцца ізноў.
Толькі ты, мой ясны сокал,
З той старonачкі далёкай
Не вяртаешся дамоў.

*ліпень 1995 г.*

# НАШТО ЗАМУЖ ПЫТАЕШ?

Прыляцеў на радзіму
Шумны вырай шчаслівы
І шчабеча-звініць.
З ім вярнуўся і хлопец,
Кажа любай: – Ну хопіць
Нежанатым мне быць.

О мая ты дзяўчынка,
Без цябе, чарацінка,
Ў маім сэрцы зіма –
Гэткай кветачкі весняй,
Гэткай сонечнай песні
Ва ўсім свеце няма!

Ты чакай мяне ў сваты,
Я хачу, каб была ты
Назаўсёды маёй.
Да цябе я прыеду –
Прыімчуся на гнедым
Пад дугой распісной.

– Хлопча мой, ты здзіўляеш,
Нашто замуж пытаеш,
Маёй просіш рукі,
Калі хаты не маеш
І па свеце блукаеш,
Як бадзяга які?

Калі ў сваты ўжо ехаць,
То на новенькім "Мэрсе",
Толькі ж ты не круты:
І машыны не маеш,

Ўсё на коніку скачаш,
Пра што мовіць тады!

О, мая ты дзяўчынка,
Залатая іскрынка,
Не пужай круцізной,
Я яе не баюся,
Хоць ушчэнт разаб'юся,
А ты будзеш маёй!

*жнівень 20002 г.*

## ЧАРАЎНІЦА

Па чарніцы, па чарніцы, як па былі-небыліцы,
Завітаў аднойчы я ў зялёны бор,
Там, ля хаты-леснічоўкі, спатыкаю чараўніцу –
І не ведаю, як зладзіць мне з сабой.

Не магу знайсці я месца – так пячэ і коле сэрца
Позірк сонечна-гарэзлівых вачэй:
– Пераспеюць, перабродзяць мае ягады ў вядзерцы –
Пацалуй мяне, ласкавы мой, хутчэй!

Разгубіўся я спачатку – адхінуўся, адвярнуўся
Ад дзявочага спякотнага пляча:
– Ой, што будзе, ой, што будзе! – утаплюся, захлынуся
У бяздоннасці вачэй тваіх і чар!

Абняла мяне пяшчотна прыгажуня-чараўніца,
Белым крыллем лебядзіным абвіла –
Паплылі кудысьці дрэвы, з імі – ягады-чарніцы,
І душа мая кудысьці паплыла.

*травень 1995 г.*

## ДЗЕД МЯНЕ ВУЧЫЎ

Дзед мяне вучыў, дзед мой мудры быў,
Добра помню я, ён мне гаварыў:
– Сенажаць агледзь, як раса спадзе,
А дзяўчыначку – на градзе.

Не паслухаўся я яго тады,
Надта юны быў, не чакаў бяды.
А бяда прыйшла нечаканая,
Як прывёў у дом я каханую.

А яна – ні мыць, а яна – ні шыць,
Ні гарод палоць, ні абед зварыць,
Толькі сварыцца, прыдзіраецца,
Ды малюецца, прыбіраецца.

І прыпомніў зноў дзеда я свайго,
Калі рэчка ўжо выйшла з берагоў:
– Сенажаць агледзь, як раса спадзе,
А дзяўчыначку – на градзе.

Як далей мне быць, доўга думаў я
І сказаў: – Бывай, жоначка мая!
Не умела жыць, пажыві з другім,
Я ж пайду касіць новыя лугі...

Калі ж выбіраў жонку ў другі раз,
Дзеда зноў згадаў і яго наказ:
– Сенажаць агледзь, як раса спадзе,
А дзяўчыначку – на градзе.

*жнивень 2002 г.*

## НЕ СВАТАЙ МНЕ, МАМА

Спрачаецца з маці
Красуня-дзяўчына:
– Мяне ты не змусіш
Сцяпана пакінуць.
За ўсіх, што я знаю,
Ён лепшы найсамы,
Другога не трэба,
Не сватай мне, мама.

Лясок невялічкі,
А столькі малін!
Мой Сцёпка маленькі,
А ў сэрцы адзін.
Хоць ён і нізенькі,
Хоць з шапкай аршын,
Але зухаваты,
І добрай душы.

Нашто мне, матуля,
Пархом даўганогі:
Ён ведае толькі
Ў піўніцу дарогу.
Не трэба мне, мама,
І Грышкі-асілка:
Знясіліць работай,
Не дасць адпачынку.

Лясок невялічкі,
А столькі малін!
Мой Сцёпка маленькі,
А ў сэрцы адзін.

Хоць ён і нізенькі,
А з ім у мяне
Высокія мроі
Наяве і ў сне!

*чэрвень 2003 г.*

## ЧАМУ ТЫ, ХМЕЛЮ?..

– Чаму ты, хмелю, не развіўся,
Да часу вянеш малады?
Чаму ты, хлопец, зажурыўся,
Ад ранку ходзіш ля вады?

– Ой, як жа мне ды не журыцца
І не хадзіць каля вады! –
Маю дзяўчыну-чараўніцу
Рака забрала ў вір круты.

– Ой, бедны хлопча, кінь жалейку –
І так нявесела ў жыцці,
Няма для сэрца лепшых лекаў,
Як радасць новую знайсці!

– Ой, як жа мне ды не іграці,
Іграй жалеечка мая,
Каб на ўвесь свет было чуваці,
Па кім сумую я штодня!..

– Чаму ты, хмелю, не развіўся,
Да часу вянеш малады?
Чаму ты, хлопец, зажурыўся,
Ад ранку ходзіш ля вады?

*жнівень 1998 г.*

## НЕ ЎТРЫМАЕШ СЭРЦА НА АБРОЦІ

Неспакойна б'ецца ў маці сэрца:
– Што, дачка, ты думаеш сабе? –
Янку ты не любіш, мне здаецца,
Хоць вачэй не зводзіць ён з цябе.

– Мамачка, няхай сабе не зводзіць,
Не аб ім я думаю штодзень.
Не ўтрымаеш сэрца на аброці,
Да другога сцежачка вядзе.

– Дочачка, ну што ты нарабіла? –
Кінула такога малайца.
Ты ж яго спачатку так любіла,
З ім была гатова да вянца!

– Што са мной зрабілася такое,
Мамачка, не ведаю сама:
Гляне на мяне сусед Мікола –
І нідзе спакою мне няма.

– Чуеш, мама, як гармонік грае?
Гэта Коля кліча ў сад мяне.
Што са мной, матуленька, не знаю –
Так я рада сёлетней вясне!

– Я цябе не буду павучаці,
Хоць мая і лёгкая рука,
Толькі ад дабра дабра шукаці
Я табе не раіла б, дачка.

*жнівень 2002 г.*

## КУМАЧКІ

Сядзяць на прызбе кумачкі
І кумкаюць па-трошку:
– Прыехаў сын да Клумавых,
Прывёз са свету жонку.

Узяў бы ён тутэйшую,
А то, падумай, Ганка,
Прывёз фуфыру нейкую,
Чарнейшу за цыганку.

Сказала і спынілася,
Другая ёй пярэчыць:
– Што ж ты хацела, мілая? –
Яшчэ не гэтак грэшаць.

Маліся Богу, Фанечка,
Бацькі і гэткай рады.
А каб ён негрыцяначку
Прывёз сабе дахаты?

Ды не бяда, што чорная,
Нібы варона тая,
Абы была праворная,
Як ластаўка, лятала.

Ты кажаш пра тутэйшую...
І пра тутэйшых слава:
Апрануцца, як вешалкі,
І ходзяць, быццам павы.

Шыкуюцца, малююцца,
Бацькам адзець іх – гора.

Палоць гарод лянуюцца,
Давай хутчэй ім горад...

Сядзяць на прызбе кумачкі
І кумкаюць па-трошку...

*жнівень 2002 г.*

## ДУБОЧАК, НЕ ХІЛІСЯ

Да пары, дубочак, не хіліся,
Не скідай лісточкаў на зямлю.
Не спяшайся, хлопец, не жаніся,
Покуль не спаткаеш ты сваю!

Не кажы, што ты амаль шчаслівы,
Да сваёй абранніцы прывык.
Прывыкае й вогнішча да ліўня,
Толькі ў ім агонь як не жывы.

А сваю каханую ты знойдзеш,
Толькі пашукай яе сляды
У гародзе, а не ў карагодзе,
Як нам раяць мудрыя дзяды...

Да пары, дубочак, не хіліся,
Не скідай лісточкаў на зямлю.
Не спяшайся, хлопец, не жаніся,
Покуль не спаткаеш ты сваю!

*жнівень 1998 г.*

## НАВІНА

– Навіну табе раскажу я, маці:
Пазнаёміўся я з такой дзяўчынай! –
Ад красы яе воч не адарваці,
Ажанюся з ёй – буду я шчаслівы.

– Любы мой сынок, трэба ажаніцца,
Толькі ты глядзі, каб не памыліцца:
Не хвалі каня запрагаючы,
А дзяўчыначку – выбіраючы.

– Што ж тады рабіць мне, скажы, матуля?
Не магу заснуць я вясновай ночкай –
Сняцца косы мне белыя, бы кужаль,
Вочы сінія, нібы васілёчкі.

– Любы мой сынок, пагадзіся з маці:
Жонку – не касу ў краме выбіраці,
Не хвалі каня запрагаючы,
А дзяўчыначку – выбіраючы.

– Не згаджаюся я з табой, матуля, –
Да мяне яна – з добрым, шчырым сэрцам,
А як запяе, хоць каго расчуліць,
Цэлы век яе слухаў бы, здаецца.

– Любы мой сынок, ты рабі, як знаеш,
Толькі ўдумайся, што табе я раю:
Не хвалі каня, запрагаючы,
А дзяўчыначку – выбіраючы.

*ліпень 2002 г.*

## ПРА ШТО Я МАРУ, ЛЮБЫ МОЙ

Над рэчкай ціша і спакой,
Будан над ёю з лапак хвойных.
Пра што я мару, любы мой,
Лятаю ў думках светла-мройных?

Збудуй, мой родны, гэткі дом,
Каб век надзейна ў ім жылося,
І звіў бацян над ім гняздо,
Што долю шчасную прыносіць.

Хоць добра тут з табою мне,
Паверыць сэрцайка не хоча,
Што з любым рай і ў будане,
А ці не праўда, мілы хлопча?

Напэўна, час ужо такі –
Крутых, нібы чмялёў, наўкола,
У іх – ого! – асабнякі,
Што нам не сніліся ніколі.

Вязуць красуняў маладых
Не ў цесны кут у інтэрнаце
На іншамарках дарагіх,
А ў найсвятлейшыя палацы...

Хоць добра тут з табою мне,
Паверыць сэрцайка не хоча,
Што з любым рай і ў будане,
А ці не праўда, мілы хлопча?

*красавік 2002 г.*

## СКАРДЗІЦЦА СУСЕДКА

Скардзіцца суседка:
– Як у сумнай байцы,
Адракліся дзеткі
Ад старога бацькі.

Ох, сыны-нявесткі!
Не душа ў іх – камень:
Ні саміх, ні весткі,
А бядак чакае.

На кійку трасецца
І губляе памяць...
Дзе ў тых дзетак сэрца?
Што ў жыцці іх вабіць?

Як жыла шчэ маці,
Быў стары не хворы, –
Вабіла багацце
Ў бацькавай каморы.

Прылятуць, бывала:
Пётра, Янка, Іра... –
Гнецца стол ад сала,
Каўбасы і сыру.

Маці як памерла,
Занядужыў бацька,
Хата іх сустрэла
Скрухаю бядняцкай.

Больш не едуць. Дзіўна,
Грэх каму прызнацца:

Роднае хаціны
Столькі год цурацца!

Зноў злятуцца хіба,
Як прымусіць гора, –
Бацькава магіла
Будзе ім дакорам.

*лістапад 1986 г.*

## ГОЛУБ

– Голубе мой, голуб, голуб шызакрылы,
Не буркуй так горка, не буркуй.
Ой, чаму ты, голуб, гэткі невясёлы?
Не тужы так цяжка, не сумуй!

– Як жа не тужыці, як не сумаваці,
Як жа мне вясёлым, бесклапотным быць? –
Столькі адляцела ў вырай зім і летаў! –
Любую галубку не магу забыць!

– Голубе мой, голуб, голуб шызакрылы,
Не буркуй так горка, не буркуй!
Паглядзі наўкола – колькі ёсць прыгожых,
Знойдзеш ты другую, не сумуй!

– Як жа не тужыці, як не сумаваці,
Як жа мне вясёлым, бесклапотным быць? –
На зямлі і ў небе мне другой не трэба –
Любая галубка ў сны мае ляціць!

*травень 1993 г.*

## НЕ ЧАПАЙ, НЕ ЗАЛЯЦАЙСЯ

Адбіваецца дзяўчына
Ад залётаў хлопца:
– Адчапіся ты, хлапчына, –
Скора ўзыйдзе сонца.
Гэткіх ведаю я вёрткіх,
Іх намеры злыя:
Як дамогуцца – наўцёкі,
Бы зладзеі тыя.

Ты шукай сабе такую,
Як і сам, вяртуху,
Што цябе ў пару любую
Шчыра будзе слухаць.
І з ахвотаю дазволіць
Аддавацца жарсці,
А пасля дзіця ў падоле
Прынясе да маці.

Будзе маці абліваці
Слёзкамі малога,
А дачка ёй гадаваці
Прынясе другога...
Не чапай, не заляцайся,
Хлопец зухаваты,
І мне хітра не ўсміхайся,
Не праводзь дахаты.

Той няхай мяне чапае
І дамоў праводзіць,
Хто каханне ў сэрцы мае,
Воч з мяне не зводзіць.

*ліпень 2002 г.*

## ОЙ, НЕ СТУКАЙ!..

Ой, не стукай у вокны, мяцеліца,
Не трывож маё сэрца:
Мой каханы ніколі не вернецца,
Мне ўжо з ім не сустрэцца.

Ўсе дарожкі-сцяжынкі замецены,
Анідзе ні слядочка,
Адзінокай блукае мядзведзіцай
Неспакойная ночка.

Не ляжыцца, не спіцца, не мроіцца
На халодных падушках:
Цёмнай ночкаю сэрца не гоіцца
У параненай птушкі.

Узніміся хутчэй, маё сонейка,
Засвяціся над краем –
Я на долю сваю, долю горкую,
На людзях забываю...

Ой, не стукай у вокны, мяцеліца,
Не трывож маё сэрца:
Мой каханы ніколі не вернецца,
Мне ўжо з ім не сустрэцца.

*чэрвень 1991 г.*

## БЫВАЙ, КАХАНЫ!

У садзе веснім, пад акном,
Зязюля сумная кувае:
Дзяўчына любага свайго
Ў дарогу выпраўляе:

– Бывай, каханы мой, бывай,
Жадаю скорага вяртання,
Не забывай, не забывай
На ўсё, чым сэрца раніў!

Не забывай на сінь азёр,
Дзе мы з табою веславалі
І нам здавалася: да зор
На чоўне мы ўзляталі.

Не забывай на млын стары,
Што нам крылом махаў з пагорка
І баіў казкі, гаварыў
Пра слаўны час далёкі.

Не забывай на ясны гай,
Дзе салаўю мы падпявалі,
І даганялі небакрай –
У мройным сне блукалі...

Бывай, каханы мой, бывай,
Жадаю скорага вяртання,
Не забывай, не забывай
На ўсё, чым сэрца раніў!

*чэрвень 2000 г.*

# ЗА ПАСАГАМ НЕ ГАНІСЯ

Сёння Ясь да Касі ў хату
Завітаў уранку,
Ён рукі сваёй каханай
Просіць маці й бацьку.

А бацькі і кажуць хлопцу:
– Мы аддаць гатовы
Нашу радасць, наша сонца,
Ды з адной умовай:

Ажаніцца – ажаніся,
Даражэнькі наш хлапчына,
За пасагам не ганіся,
Твой пасаг – краса-дзяўчына!

Ты, відаць, з сям'і заможнай –
Як той князь, прыбраны,
Калі ж ты й душой прыгожы,
Будзеш нам жаданы.

Ну, а ў нас, як бачыш, сціпла,
Лішняга не маем,
Калі ў хату госць, гасцінна
Мы яго прымаем...

Ажаніцца – ажаніся,
Даражэнькі наш хлапчына,
За пасагам не ганіся,
Твой пасаг – краса-дзяўчына!

*кастрычнік 2002 г.*

# КАЛІ ЛЮБІШ – АЖАНІСЯ

Папракае маці сына:
– Што ты, сынку, верцішся?
Знаю, маеш ты дзяўчыну,
А чаму не жэнішся?

Калі штосьці ўбок адводзіць,
Трэба з сэрцам раіцца.
Калі любіш і не возьмеш –
Будзеш вечна каяцца.

Калі любіш – ажаніся,
Не блудзі, мой сыне,
А не любіш – адкасніся,
Дай спакой дзяўчыне!

Помню, бацька твой не доўга
Да мяне прыглядваўся:
Дні праз два запрог гнядога
І прымчаў – пасватаўся.

Пражылі б мы век у згодзе
Богу й людзям мілыя,
Каб не ліха, не страхоцце,
Не туга ўдавіная...

Зладжу, сын, табе вяселле,
Як ва ўсіх, не горшае...
Помню, вэлюм я надзела –
Слёзы, як гарошыны.

За сталом на нас глядзелі,
Як на зорку з месяцам,

Скрыпкі гралі, госці пелі,
Не маглі нацешыцца...

Калі любіш – ажаніся,
Не блудзі, мой сыне,
А не любіш – адкасніся,
Дай спакой дзяўчыне!

*снежань 2002 г.*

## МРОІ БАБЫЛЯ

Пагадаў бы я табе на рунах,
Ды такой прамудрасці не знаю.
Паіграў бы я табе на струнах,
Ды чароўнай скрыпачкі не маю.

Пагадаў бы я табе на картах,
Ды не навучыўся я ад маці.
Запрасіў бы я цябе на свята,
Ды не маю чым пачаставаці.

Пагадаў бы я табе на зорах,
Ды забыў, які твой знак нябесны,
Пакатаў бы я цябе па моры,
Ды разбіў я човен свой на трэскі.

Пагадаў бы я табе на каве,
Ды яшчэ Каляды за гарою...
Лепей я пайду спачну на лаве
І цябе, харошая, прымрою.

*верасень 2000 г.*

# І НЕ СЦЕРПІЦЦА, І НЕ ЗЛЮБІЦЦА

Дзеўчына на дзверы пазірае,
А яе матуля не пускае:
– Годзе, доня, бавіць давідна
Ночкі цёмныя на гуляначках –
Адцвітае ўжо твая вясна.

– Што хаджу дарма я па начаньках,
Мая мамачка, не кажы.
Я хачу знайсці хлопца слаўнага,
Хлопца любага, па душы.

– Выйшла б ты, дачушка, за Лявона,
Ён такі багаты і вучоны!
Што яму паўвеку, не зважай.
З часам сцерпіцца, з часам злюбіцца,
Будзе з ім спакойна, не ўздыхай.

– І не сцерпіцца, і не злюбіцца,
Мая мамачка, не кажы.
Трэба стройнага, трэба дужага,
Трэба хлопца мне па душы.

– Ну, тады пайшла б ты за Аксёна,
Стройны ён і дужы, і вясёлы.
Што развёўся з жонкай, не зважай.
З часам сцерпіцца, з часам злюбіцца,
Будзе з ім не сумна, не ўздыхай.

– І не сцерпіцца, і не злюбіцца,
Мая мамачка, не кажы.
Трэба добрага, трэба шчырага,
Трэба хлопца мне па душы.

*чэрвень 2002 г.*

# ОЙ, ГАДЫ МАЕ, ГАДОЧКІ!

– Ой, гады мае, гадочкі,
Хто вас просіць так імчаць?!
Па дарожках, па масточках
Даганяю, не дагнаць!

– Усіх коней перагоніш,
І гнядых, і вараных,
А гадочкаў не дагоніш
Ты, Марыська, маладых.

Не дагоніш, не павернеш
Маладой сваёй вясны,
Не адчыніш вокны-дзверы
Ў залатыя мроі-сны.

– Ой, не можа быць, сястрыца,
Што вясны мне не дагнаць –
Так за мною шлях пыліцца,
Гэтак конікі імчаць!

– Не сумуй па тым, Марыська,
Што пайшло за небакрай,
А гады, што засталіся,
Юнай песняй напаўняй.

Не дагоніш тога чоўна,
Што па возеры катаў,
Дзе каханы-нарачоны
Вёслы ў хвалі апускаў...

– Гэй, гнядыя, вараныя,
Гэй, імклівыя мае,

Мне гадочкі маладыя
Даганіце, хоць у сне!

*ліпень 2002 г.*

## Б'ЮЦЦА ХЛОПЦЫ

Б'юцца хлопцы не на смех,
Нібы пеўні тыя,
За Галіну, за яе
Чары незямныя.

Ходзіць ходырам зямля,
Пыл – аж да аблокаў,
Што, здаецца мне здаля,
Гаснуць нават зоркі.

І Галінка – любата! –
Кінулася ў бойку:
– Ой, бяда мая, бяда –
Б'юць майго Сымонку!

Адпіхнула буяноў
Ад свайго мілога:
– Знайце, хлопцы, дзе любоў,
Там і перамога!

Стогнуць хлопцы: ох ды ах!
І красуню славяць –
Аж пад неба на руках
Галю падкідаюць.

*сакавік 1995 г.*

## НЕ СВАРЫСЯ, МАТУЛЯ

Слёзнай просьбай красуня
Сэрца маці кранае:
– Не сварыся, матуля,
Што сватам адмаўляю.
Азірніся навокал,
За каго тут ісці мне?
Мо за п'яніцу Хомку,
Ці за старца Яўхіма?

Чым жаніх абыякі
На маю галаву,
То ўжо лепей ніякі,
І адна пражыву!

Ты дарэмна мне раіш,
Каб я выйшла за Філю,
Хоць машыну і мае,
Што бацькі падарылі.
А які з яго будзе
Гаспадар, мне скажы ты:
Нібы кот, ноччу блудзіць,
А днём спіць, як забіты.

Не пайду і за Фрола,
Кажуць, мае ён дзетак
Ад трох жонак ці болей,
Плаціць ім аліменты.
І не трэба мне, маці,
Багацея Гаўрылы,
Што з яго мне багацця,
Калі сэрцу не мілы...

Чым жаніх абыякі
На маю галаву,
То ўжо лепей ніякі,
І адна пражыву!

*травень 2003 г.*

## СЛЁЗКА–РАЗБІТАЕ СЭРЦА

Журыцца слёзка-разбітае сэрца –
З вочак ружовых расою сляза.
Ціха навокал – заслухаўся вецер –
З кветкай гаворыць дзяўчына-краса:

– Кветачка слёзка-разбітае сэрца,
Дзе нам з табою ад болю падзецца?
Доля такая ўжо: век сумаваць,
Шчасце былое сваё ўспамінаць.

Шлях пачынала я з мілым шчасліва:
Нас пазнаёміла цуда-вясна,
Ў танцы кружыліся лёгка-імкліва,
І летуцелі ўсю ноч, давідна.

Рэчаньку быструю чоўнам люлялі,
Вёсламі-крыламі светлых надзей...
Чайкі над намі трывожна крычалі,
Як прадчувалі расстайны наш дзень...

Кветачка слёзка-разбітае сэрца,
Дзе нам з табою ад болю падзецца?
Доля такая ўжо: век сумаваць,
Шчасце былое сваё ўспамінаць.

*чэрвень 2001 г.*

# НОЧКА ЗОРЫЦЦА

Так дзіўна ночка зорыцца! –
Гаворыць хлопец з любаю,
Ніяк не нагаворыцца,
Як салавей з зязюлькаю:

– Мая дзяўчынка светлая,
Краса нябесна-мройная,
Каб знала ты, каб ведала,
Як ты мне міла-дорага!

З табой, мая ласкавая,
Я адчуваю сокалам –
Здаецца, узнімаюся
Высока-правысока я.

І там, дзе далеч райская,
Нібы у лесе ягады,
Збіраю зоркі ясныя,
Нясу цябе парадаваць.

Кінь, мілая, трывожыцца,
Што заўтра адлятаю я,
Праз год які, дасць Божанька,
Вярнуся з краю дальняга.

Я не забуду, родная,
Цябе ні ў якім выраі:
Ні за лясамі цёмнымі,
Ні за марамі сінімі...

Так дзіўна ночка зорыцца! –
Гаворыць хлопец з любаю,
Ніяк не нагаворыцца,
Як салавей з зязюлькаю.

*снежань 2000 г.*

## КЛІЧА ХЛОПЕЦ

Кліча хлопец на спатканне любую дзяўчыну:
– Хочаш, мілая, ў арэхі сходзім мы з табой?
У бары, на баравіне, ядрыцца ляшчыннік,
Як ён вабіць, каб ты знала, спелаю красой!

– Не пайду я, мой харошы, не пайду, мой родны,
Хоць няхай растуць бананы там, у тым бары.
А што скажа мне матуля пра мае паходы?
Ды й сама зблудзіць баюся ў цёмным гушчары.

– Сходзім, мілая, не бойся, маці знаць не будзе,
Назбіраем кош арэхаў – і дамоў хутчэй,
А калі ж раптоўна зблудзім, выведуць нас людзі,
Не хаваць жа нам кахання ад людскіх вачэй!..

Кліча хлопец на спатканне любую дзяўчыну:
– Хочаш, мілая, ў арэхі сходзім мы з табой?
У бары, на баравіне, ядрыцца ляшчыннік,
Як ён вабіць, каб ты знала, спелаю красой!

*лістапад 1995 г.*

# НЕ Б'Е ЖОНКІ МУЖЫК

Што за крык, што за енк
Над зямлёю плыве? –
Мужык жоначку б'е
Прыгаворвае:

– Не б'е жонкі мужык,
Не лупцуе вяроўкай,
А б'е жончын язык,
Што трашчыць, як сарока.

Што за крык, што за енк
Над зямлёю плыве? –
Мужык жоначку б'е
Прыгаворвае:

– Не б'е жонкі мужык,
А яе б'е няўменне
Бурачкоў наварыць
І аўсяных крупеняў.

Што за крык, што за енк
Над зямлёю плыве? –
Мужык жоначку б'е
Прыгаворвае:

– Не б'е жонкі мужык,
А яе б'е ўсміханне,
Як сусед малады
Ёй з-за тыну міргае.

*ліпень 2002 г.*

## АХ, СЫМОНЕ!

– Быў учора я ў Рыгора,
Ён прыйшоў нядаўна з мора,
Пра цябе казаў ён: – Ой,
Ні за чары, ні за мары,
Ні за якія даляры
Не вадзіўся б я з такой!

– Ах, Сымоне мой, Сымоне,
Ты, напэўна, сонны сёння?!
Прабудзіўся, мілы мой.
Хай гаворыць, хай гамоніць,
Абгавор мы ў кут загонім
Абгаворшчыка рукой!

Запрасі Рыгора ў госці,
Хай табе ён пазайздросціць
За абедзеным сталом –
Будуць віны з рэстарана,
Кока-кола і бананы,
Сервілат... і рок-эн-рол.

– Што ты мне, Ядвіська, раіш,
Мо з гасцямі пачакаеш
Да вяселля, а тады...
Бо Рыгор не проста цвеліць,
На цябе ён вока цэліць –
Не далёка да бяды.

*ліпень 1996 г.*

## ЗМЯНІЎ ГАЛУБКУ НА САВУ

О, Божа, свет пайшоў які,
Як рэчка, выйшаў з берагоў:
Зусім здурнелі мужыкі,
На сына, кумка, глянь майго.

А хай яго, кума, няхай,
Згубіў Амелька галаву:
З другой жаніўся мой бугай,
Змяніў галубку на саву!

Яе савіны мне пагляд
Пакуль даводзіцца цярпець,
Ды выспявае ўжо разлад,
Сябе я стрымліваю ледзь.

Няхай, няхай распуснік мой,
Пакуль нацешыцца, пяе
І скача з лялькай гарадской,
Пасля ён кіне і яе.

Пачне ён трэцюю шукаць,
Па цёмных ночачках блудзіць,
А я – трывожыцца, не спаць,
Ратунку ў Божанькі прасіць...

А хай яго, кума, няхай,
Згубіў Амелька галаву:
З другой жаніўся мой бугай,
Змяніў галубку на саву!

*жнівень 2002 г.*

## КНЯЗЬ ВЯЛІКІ

– Ты чаго, Іван, прыйшоў?
Па каханне, па любоў?
Я ж цябе не клікала.
Мой шаноўны кавалер,
Пакахала, вер, не вер,
Князя я вялікага.

– Хто ён, Юленька мая,
І знайшоў цябе ён як,
Гэты князь вялікі твой?
– Ён з чароўных сноў маіх,
Скача, скача на кані
З вострай дзідай залатой.

– На каго ж так, на каго
Ён вядзе дружыну ў бой,
Гэты Князь вялікі твой?
– На крыўдзіцеляў ліхіх,
На зямных і незямных,
Што трывожаць нам спакой.

– Чым жа, Юленька мая,
Чым, князёўначка мая,
Я не Князь вялікі твой! –
Ці на радасць, ці бяду,
Заўтра ў войска я іду
Сцерагчы і твой спакой.

– Мой Іванка, я цябе
Сёння бачыла у сне
На параду клікала.
Ты скажы, скажы, як быць,

Дачакацца, не забыць
Князя мне вялікага?

*ліпень 1995 г.*

## ВАСІЛЁК

– Васілёчак ты мой, Васілёк,
Па табе, галубок, я сумую.
Ты чаму не глядзіш у мой бок,
Ці ж я сэрца тваё не хвалюю?

– Ой, няпраўда, Марылька мая,
Я табой заварожаны проста –
Я і зблізку гляджу, і здаля
На тваю лёгкакрылую постаць!

– Васілёчак ты мой, Васілёк,
Што хаваешся ў жыце высокім!
Не падходзь, не падходзь, галубок,
Бедаваць я не стану ніколькі!

– Ах, Марылька мая, і у сне
Да цябе падыйсці я баюся –
Мне здаецца: ты спаліш мяне
Палыханнем малінавых вуснаў!

– Васілёчак ты мой, Васілёк,
Падміргну я Іванку спакусна,
Ён ахвотна згарыць, як лісток,
Ад маіх палыхаючых вуснаў!

*жнівень 1996 г.*

## РАСКАЖУ ТАБЕ Я, МАЦІ

– Раскажу табе я, маці,
Пра бяду хлапечую:
Таямнічай кветкай шчасця
Шлях мой не асвечаны.

Па зямлі іду-блукаю,
Быццам непрыкаяны, –
Можа, недзе напаткаю
Я сваю каханую.

– Не нудзіся, не журыся,
Кінь, сынок, трывожыцца:
Шчэ дзяўчаты не звяліся
Добрыя, прыгожыя.

Да суседчынай Яніны
Я цябе пасватаю:
Працавітая дзяўчына,
Вабная, спагадная.

– Ні Яніны, ні Галіны
Не хачу я, матанька, –
Маё шчасце на чужыну
Паляцела ластаўкай...

Па зямлі іду-блукаю,
Быццам непрыкаяны –
Можа, недзе напаткаю
Я сваю каханую.

*кастрычнік 2000 г.*

## НЕ ВЕРЫЦЦА

Не верыцца нават, няўжо
За сорак я маю
І стала бабуляй ужо,
Ўнучка калыхаю.

Так хутка гадочкі прайшлі,
Сплылі, як вадою,
І вёсны мае адцвілі,
І юныя мроі.

Пяю калыханкі ўнучку
І казачкі баю,
А зяця свайго і дачку
Усё навучаю:

– Калі вы любілі гуляць
Ўсю ночку, да ранку,
Любіце дзіцятка люляць,
Спяваць калыханку!

Я ведаю, хочацца ім
Схадзіць пагуляці
І вольна ў садку веснавым
Надыхацца шчасцем.

Ім хочацца зноў паляцець
У марах высокіх
І недзе жар-птушку сустрэць
У далях шырокіх...

Пяю калыханкі ўнучку
І казачкі баю,

А зяця свайго і дачку
Усё навучаю:

– Калі вы любілі гуляць
Ўсю ночку, да ранку,
Любіце дзіцятка люляць,
Спяваць калыханку!

*ліпень 2002 г.*

## ЗАТУЖЫЎ ХЛАПЧЫНА

Затужыў хлапчына –
Ён такое чуў! –
І красе-дзяўчыне
Ў вочы зазірнуў:

– Кажуць, не кахаеш,
Зоська, ты мяне,
Бо другога маеш,
З ім – наяве-сне.

– Хай сабе гавораць,
Не маўчаць ні дня,
Захлынецца скора
Гэтая брахня.

На чужыя вусны,
На чужы раток
Не накінеш хусты,
Мой ты Васілёк!

– Нібы кошка з мышкай,
Кажуць, ты са мной,
Пагуляеш крышку
І махнеш рукой.

Паляціш у горад –
І навек забудзь:
Гарадскія доўга
Ў вёсцы не жывуць.

– Хай сабе пабрэша
Злосны язычок,
А ты нос не вешай,
Любы Васілёк.

Сціхнуць абгаворы,
Вечна ім не быць,
Бо вяселле скора
Наша зазвініць!

*ліпень 2002 г.*

## НАСІЛЬНА ЛЮБ НЕ БУДЗЕШ

Пад вокнамі каханай
Пяе на ўсе лады
Рамансы-серэнады
Хлапчына малады.

Усклікнула дзяўчына:
– Ой, бедны хлопча мой,
Пад вокнамі ўсю ночку
З гітараю не стой!

Насільна люб не будзеш,
Не думай і не мар,
Ты сёння ў маім сэрцы –
Ні госць, ні гаспадар!

Не для цябе квітнеюць
Лугі маёй вясны,
Прыедзе скора любы
З далёкай стараны.

Для мілага ў садочку
Я вішанькай цвіту,
Да мілага у мроях
Я ластаўкай ляту.

Не для цябе спявае
Мой салаўіны гай,
Ідзі сваёй дарогай
І крыўды не трымай.

Як лебедзь, ты прыгожы,
Лябёдку знойдзеш ты.
Пакінь мяне ў спакоі,
Забудзь мае сляды...

Насільна люб не будзеш,
Не думай і не мар,
Ты сёння ў маім сэрцы –
Ні госць, ні гаспадар!

*верасень 2002 г.*



# Пад зоркай Мілавіцай



Брат Мар'ян Пецюкевіч, дзядзька Мар'ян Пецюкевіч і Уладзімір Пецюкевіч. 1979 г.

# ПАД ЗОРКАЙ МІЛАВІЦАЙ

**песенны альбом***

## ЗОРНАЯ НОЧ

Ноч, як маці над калыскай,
Ціха, ласкава спявае,
Сон-дрымоту навявае
Летнім стомленым палям.

У прасторы неабсяжнай
Зоркі водзяць карагоды,
І ляціць пад сон прыроды,
Як пылiначка, Зямля.

Там і нашы зоркі-знічкі –
Дзве начніцы-чараўніцы
Неспазнанай таямніцай
Крэсляць свой бліскучы след.

Што на свеце ёсць чароўней
Ад начэй такіх бяссонных,
Ад вачэй тваіх бяздонных,
Ад кахання – як Сусвет!

*студзень 1981 г.*

* – *музыка Мар'яна Пецюкевіча*

# ПАД ЗОРКАЙ МІЛАВІЦАЙ

У роднай старане, пад зоркай Мілавіцай,
Для шчырай песні рай – прыволле і спакой.
Адчуй яе душой, няхай табе прысніцца
Спатканне першае над соннаю ракой.

Прыпомні, як з табой глядзелі мы з любоўю
На зорны небакрай, і песня ўдаль плыла
Пра зорку, што ўзышла Паэту над зямлёю
І згадкі светлыя з сабою прывяла.

Мелодыя плыла пад зоркай Мілавіцай,
Кружыліся наўкол і дрэвы, і трава.
І я цябе назваў пявунняй-чараўніцай,
Сваёй каханаю на ўсё жыццё назваў.

Не думаў, не гадаў, што некалі ў растанні
З нябёсамі злію пагляд самотны свой
І песню запяю, крылом тугі дастану
Да зоркі, што ўзышла Паэту над зямлёй.

*травень 1978 г.*

## БРАСЛАЎ

Чоўнам маёй вясны,
Хваляй празрыстых вод
Ты да мяне плывеш у сны,
Мой дзіўны родны Браслаў.
Сонцам свяціў ты мне,
Яркай начной зарой,
Свеціш і сёння мне ў акне,
Мой горад, сонцам ясным.

Браслаў – азёр сталіца,
Браслаў – блакітны рай…
Нельга надзівіцца
На мілы мой край!

Казка, паданне, быль
Замкавы вал круты
Клічуць сюды, дзе б я ні быў,
У край мой ясназоры.
Люстры азёрнай шыр,
Чайкі світальнай крык…
Ласкавы спеў нясу ў душы –
Я зноў з табой, мой горад!

Браслаў – азёр сталіца,
Браслаў – блакітны рай…
Нельга надзівіцца
На мілы мой край!

*снежань 1976 г.*

## РАДЗІМА СНІЦЦА

На варце няспыннай
Пад крык жураўліны
Каля абеліска
Смуткуюць кляны:
"Спакойна ляжыце,
Сны вечныя сніце,
Пакутнай Радзімы
Героі сыны."

А вецер на ўзвышшы
Галіны калыша –
І рэха Айчыннай
Трывожыць салдат:
Ідуць у атакі,
Кладуцца пад танкі
Ахвярна-бясстрашна,
Са звязкай гранат.

Над родным прасторам,
Над болем, над горам
Іх мужныя сэрцы
Паходняй гараць.
За вольную волю,
За светлую долю
Імчыць на чужынцаў
Нястрымная раць!

Ішла Перамога
Нялёгкай дарогай
Пад плач мацярынскі,
Жалобу удоў.

Салдатам не спіцца,
Радзіма ім сніцца
У зорах світальных,
У белі садоў…

*сакавік 1978 г.*

## МАЯ БЕЛАРУСЬ

О, мая Беларусь – неба сонечных мар,
Ты для сэрца майго кожны дзень адкрыццё,
Найдарожшы мой скарб, найбясцэннейшы дар,
Што у спадчыну мне даравала жыццё.

Я з'явіўся на свет сынам звацца тваім –
Садам веснім квітнець на тваіх берагах,
Думай-песняй звінець, чыстай, светлай, як гімн.
Сынам звацца тваім – несці гонару сцяг.

О, Радзіма мая – Маці гордых сыноў –
Слаўлю мужнасць тваю, п'ю тваю цішыню,
Нізка голаў хілю каля вечных Агнёў, –
На ўвесь свет – чуйце ўсе – я Хатыняй званю!

*студзень 1981 г.*

# КУПАЛА – КУПАЛЛЕ

Песня над вогнішчам крылы расправіла –
Цёмная даль занялася зарой.
Словы Купалы,
Чары Купалля
Папараць-кветкай гарацъ над зямлёй.
Хто іх убачыць,
Сэрцам пачуе,
Міма не пройдзе трывогі людской.

Рады прасторы старонкі Купалавай
Зорным агням, як жаданым гасцям.
Мара Купалы,
Радасць Купалля
Льецца крыніцай у родны прасцяг.
З гэтай крыніцы
Піць, не напіцца,
Каб наталіцца, не хопіць жыцця.

Зорка Паэта, як ночка купальная,
Грэе душу жыватворным цяплом.
Янка Купала,
Свята Купалля –
Быццам звязалі іх жытнім вязьмом.
Жыць ім заўсёды
Разам з народам,
Век палымнець першародным святлом!

*чэрвень 1985 г.*

## НАШ КРАЙ

Бацькі Нёмана берагі,
Кожнай рачулачкі, азярца
З песняю радасці і тугі –
У сэрцы беларуса.
Земляка пазнаем здалёк –
Як не пазнаць каваля, касца! –
Волата постаць, шырокі крок,
Віхор бялява-русы.

Гэта наш край – просты, адкрыты народ,
Гэта наш край – светлых надзеяў узлёт:
Будзем сяброў песняй вітаць весялейшай,
Жыць шчаслівей з году ў год!

Курганы ў збажыне густой –
Поле хавае маланак бліск.
Вечны агонь – у цішы святой,
У смутку-болю вечным.
Наш паяснеў родны прастор –
Зоркаю свеціцца слаўны Мінск,
Памаладзеў партызанскі бор,
Шырэй расправіў плечы.

Гэта наш край – просты, адкрыты народ,
Гэта наш край – светлых надзеяў узлёт:
Будзем сяброў песняй вітаць весялейшай,
Жыць шчаслівей з году ў год!

*чэрвень 1980 г.*

# ЯСНЫ ГАЙ

Апошні дзень, апошняя хвіліна –
І пойдзе лета ўдаль за небакрай,
Махне чырвонай хустачкай рабіны,
Пакіне ў светлым суме гай.

Той ясны гай, дзе мы з табой спявалі,
Збіраючы суніцы між бяроз,
Дзе мы з табой каханне напаткалі,
Смяяліся, шчаслівыя, да слёз.

Няхай павее восень сцюжным ветрам –
Засцеле шэрай хмарай небакрай –
Нам будзе сніцца, сніцца наша лета,
Успамінацца ясны гай.

Цяплом вясновых песень-успамінаў
Напоўнім нашы сэрцы цераз край,
І будзе з намі лета штохвілінна,
І будзе з намі ясны гай.

Дзе б ні былі, якой бы нас красою
Ні дзіваваў чужы, далёкі край –
З любых дарог мы вернемся з табою
У свой чароўны ясны гай.

*жнівень 1979 г.*

## О БЕЛАРУСЬ, ЦЯБЕ ЯК НЕ ЛЮБІЦЬ

Люблю зялёную, зіхотнаросную
У зорным полымі азёр-крыніц,
Люблю завейную, люблю марозную.
О Беларусь, цябе як не любіць!

Як не здзіўляцца мне табою, дзіўная, –
Як маці, ты ў мяне адна-адзіная,
Адна-адзіная!

Люблю вясёлую, узнёсла-мройную
З купальскім водбліскам агнёў-зарніц,
Люблю журботную, люблю трывожную.
О Беларусь, цябе як не любіць!

Як не здзіўляцца мне табою, дзіўная, –
Як маці, ты ў мяне адна-адзіная,
Адна-адзіная!

Люблю нястрымную, імклівакрылую,
Калі душа звініць, услед ляціць,
Люблю вясельную, люблю радзінную.
О Беларусь, цябе як не любіць!

Як не здзіўляцца мне табою, дзіўная, –
Як маці, ты ў мяне адна-адзіная,
Адна-адзіная!

*сакавік 1978 г.*

# ВЕСНАВЫЯ ВЕТРЫ

Веснавыя залётныя ветры
Паразвейвалі зборышчы хмар,
І мільгаюць, плывуь кіламетры
Песень спетых і здейсненых мар.

І ляцім мы з каханымі поруч
З новай песняй да новых вышынь,
Да святла неразведанных зораў,
Да глыбінь непазнаных душы.

Ой вы ветры, залётныя ветры –
Маладыя прарочыя сны,
Да вышынь і глыбінь запаветных
Нас нясіце на крылах вясны!

Ад раздолля бацькоўскага поля,
Бестурботных маленства дарог
Адлятаем у вырай міжволі
Да раздолля турбот і трывог.

Дзе патрэбны нястомныя рукі
І юначага сэрца агонь,
Мы імчымся туды без прынукі,
Неспакойным вятрам наўздагон.

*люты 1978 г.*

## МЕДЫЦЫНСКІЯ СЁСТРЫ

Танга – танец кахання –
Ад вячэрняй зары
Аж да самага рання
Юным радасць дарыў.
Гралі звонкія струны
Пра усмешку вясны...
Ды раптоўна віхурны
Загрымеў гром вайны.

Хвалі болю і суму,
Ззянне помсты ў вачах.
Санітарныя сумкі
На плячы у дзяўчат.
Іх бясстрашныя сэрцы
Пад смяротным агнём –
Як ратунак ад смерці,
Як спатканне з жыццём.

Надышоў дзень чаканы,
Далягляд развіднеў,
Танга – танец кахання –
Перамогай звінеў.
Медыцынскія сёстры
Навальнічнай пары
Ваявалі за вёсны,
За бяссмерце зары...

*ліпень 1977 г.*

# МАЦІ–КРАІНА

Ты не здавалася,
Мужна змагалася,
Зносіла стойка нядолі груз,
Ты набалелася,
Ты нацярпелася –
Стала навек святой, Беларусь!

Маці – Краіна,
Наша Святыня,
Колькі ў Тваім паглядзе святла! –
Зорка Пагоня
Яснай паходняю
Над зямлёй узышла.

Дзень нараджаецца,
Край абуджаецца,
Бел-чырвон-белы палае сцяг –
З марай нябеснаю,
З роднаю песняю
Выйшла Ты ў свет на вольны прасцяг.

Маці – Краіна,
Наша Святыня,
Гонар Табе і слава Табе –
Цемра спадае,
Золак займаецца,
Дзень Свабоды ўстае!

*жнівень 1992 г.*

# ЗОРКА ПЕРШАЯ

Хто аблётаў свет,
З намі згодны ўсе –
Чайкі, ластаўкі, жураўлі:
Край наш Браслаўскі
Па сваёй красе –
Зорка першая на зямлі.

Хто гасціў у нас,
Зноў сюды вясной
Птушкай з выраю прыляціць
Да святла кастроў,
Сонца над вяслом,
Прыгажэйшых сноў у жыцці.

Калі ты рыбак
Ды яшчэ паэт,
Сэрцу хочацца бачыць рай –
З россыпу азёр
Падары букет,
Падары яму сіні край.

Калі ж ты ляцець
Здумаў над зямлёй –
Дапаможа наш край дзівос:
Крылы вырастуць
За тваёй спіной
На прыволлі хвой і бяроз.

*лістапад 1979 г.*

## ПЕСНЯ ПРА ГОМЕЛЬ

Над роднаю зямлёй,
Над палескім прасторам
Ты свецішся зарой,
Старажытны наш горад.
У засені садоў
І квяцістых каштанаў
Не лічыш ты гадоў,
Малады, закаханы.

Убранне на табе
З шоўку чыстых нябёсаў,
У вокнах і траве –
Сонца, зоры і росы.
Аддаў навечна ты
Улюбёнаму сэрцу
Палацы і масты,
Залатыя азерцы.

Над Сожам хвойны пах,
Салаўіныя песні,
Над імі зорны шлях
Нашых мараў нябесных.
Чаруй, прыходзь у сны
Звонам новых вяснянак,
Наш Гомель – сын вясны,
Малады, закаханы.

*верасень 1977 г.*

## МІНСК

Прыйшоў з вякоў ты, горад мой,
Спавіты былямі, легендамі сівымі,
Замала цешыўся гадамі маладымі
Ды даўняю парой.
Нямігі пеннаю вадой
Пажары ты гасіў, гулі бары, дубровы;
Упершыню апеў твой подзвіг аўтар “Слова”,
Як ты ішоў на бой.

Твае далёкія гады –
Званы жывыя памяці народнай.
Які ты, Мінск мой, векапомны
І на здзіўленне малады!
Расці шчасліваю парой,
Пад мірным небам велічна красуйся,
Сталіца Маці–Беларусі,
Славуты горад мой – герой!

Як белы лебедзь, нада мной
Плыве твой сёння дзень, у сонцы прамяніцца.
З руін узнятая, здзіўляй, мая сталіца,
Набранай вышынёй.
Над беларускаю зямлёй,
Над цэлым светам твой ліецца голас.
Спакойны, важкі, як жытнёвы колас,
Магутны голас твой.

*красавік 1979 г.*

## ДЫМ РАССТАННЯ

Васількі ў збажыне
Несарваныя павянуць.
Нашай першай вясне
Не спяваць нам, мой каханы,
Нашай першай вясне
Не спяваць табе і мне,
Васількі не рваць у збажыне.

Хай не знаюць бяды
Краскі сінія кахання.
Ах, навошта нам дым,
Горкі-горкі дым расстання!
Ах, навошта нам дым,
Гэты горкі-горкі дым,
Дым расстання ў сэрцы маладым!

Нада мной і табой
Льецца звон расстайнай песні.
Ах, навошта жальбой
Узрушаць нам ранак весні!
Хай звіняць над зямлёй,
Над старонкай дарагой
Толькі песні шчасця, родны мой!

Пранясем праз гады
Радасць першага спаткання,
Бераг рэчкі круты,
Краскі сінія кахання.
Ах, навошта нам дым,
Гэты горкі-горкі дым,
Дым расстання ў сэрцы маладым!

*кастрычнік 1976 г.*

# КАНВАЛІЯ

Пара дзівосная, пара жаданая
Маімі марамі раскалыханая:
Цвіце канвалія, цвіце канвалія,
Званочкі белыя чароўна-вабныя.

Расой сцюдзёнаю ты умываешся,
Зарой пяшчотнаю ты уціраешся,
Дубок зялёненькі табе ўсміхаецца,
Зязюлькай шчодраю кувае раніца.

З табой спаткаюся – з журбой не знаюся,
У ясным позірку тваім купаюся,
Плыву бясконцымі тваімі ласкамі –
Ляснымі былямі, ляснымі казкамі.

Пара дзівосная, на жаль, не вернецца,
А мне ўсё помніцца, а мне ўсё верыцца:
Цвіце канвалія, цвіце канвалія,
Званочкі белыя чароўна-вабныя.

*1991 г.*

# КАЛІНАВЫ МАСТОЧАК

З асеннім халадком
Рачулка за сялом,
Калінавы масточак.
Каліны беражком –
Чырвоным пояском, –
Чароўны наш куточак.

Палі і паплавы
Кранулі журавы
Курлыканнем расстайным.
– Каханая мая,
Якую ты штодня
У сэрцы носіш тайну?

– Спытай, мая любоў,
У вольных журавоў,
Пра што заўсёды мрою.
Хачу я крылы мець,
Жураўкай паляцець
У дальні край з табою.

– Журавачка мая,
Быў я ў чужых краях,
Журыўся дні і ночы.
Мне сніўся родны дом,
Рачулка за сялом,
Калінавы масточак.

*травень 1982 г.*



# Кветка надзеі

# КВЕТКА НАДЗЕІ

**песенны альбом**

## НЕ СВЯЦІ, БЛІСКАВІЦА*

Не свяці, бліскавіца, не бліскай,
Не высвечвай боль-смутак зямны,
Над Агнём курганоў-абеліскаў
Не грыміце, грамы-перуны!

Не грыміце, грамы, не нясіце
Над зямлёй адгалоскі баёў,
Не бяліце бялей, не бяліце
Скроні белыя маці маёй!

Не параньце душу – не паліце
Несціханай трывогай вайны!
Не будзіце салдат, памаўчыце,
Не трывожце іх вечныя сны!..

Загрыміце, грамы, загрыміце
Пераможным салютам Вясны,
Разбудзіце салдат, разбудзіце,
Хай паслухаюць песні яны!

Праспявайце вы ім, раскажыце,
Як паўсталі з руін гарады,
Забруілі жывыя крыніцы,
Расквітнелі палі і сады!

*красавік 1983 г.*

* – *музыка Сяргея Новіка-Пеюна*

# Я РАД, МАЯ РАДЗІМА*

Я рад, мая Радзіма,
Любіць твой шчодры сад,
Дзеля цябе, адзінай,
Не знаць парою свят.

Я рад, што ў садзе гэтым
І мой расточак ёсць,
Што ў ім зімой і летам
Садоўнік я – не госць.

Інакш ці ж меў бы права,
К зямлі прыпаўшы ніц,
Згубіцца ў хмельных травах
І піць з тваіх крыніц,

Тваім паветрам дыхаць,
У мройным сне лятаць,
Блукаць ля рэчак ціхіх,
Смяяцца і кахаць...

Я рад, мая Радзіма,
Любіць твой шчодры сад,
Дзеля цябе, адзінай,
Не знаць парою свят.

*сакавік 1979 г.*

*– *музыка Сяргея Новіка-Пеюна*

# КВЕТКА НАДЗЕІ*

Мак на гародзе маім пунсавее,
Макам пунсовым усходзіць зара,
Дзень нараджаецца з яснай надзеяй:
Вернецца, вернецца дзіва-пара.

Не проста так, не проста так
Палае мак зарой –
Пунсовы цвет – як добры знак,
Што будзеш ты са мной!

Мак высеваю я кожнай вясною,
Як толькі шчасце пакінула дом,
Лета зажурана светлай журбою,
Кветкай надзеі цвіце пад акном.

Вернуцца песні, забавы і жарты,
Вернуцца зоры і звон цішыні,
Шчодрае лета запросім у хату,
Макам асвецім шчаслівыя дні.

Не проста так, не проста так
Палае мак зарой –
Пунсовы цвет – як добры знак,
Што будзеш ты са мной!

*чэрвень 1992 г.*

* – *музыка Мікалая Даўгалёва*

# МАЯ ЖУРАЎКА*

З нябёс высокіх ты спусціся
І асвяці мой родны дом –
Цябе гукаць я так стаміўся
І жыць у снах тваім святлом!

Нясі хутчэй вясну з вяснянкай –
Спыні крутых завей крыло...
Ты, толькі ты, мая жураўка, –
Адна надзея на цяпло!

У свет красы тваёй і ласкі
Пусці мяне і супакой,
Заваражы паглядам ясным –
Дай мне ажыць навек душой!..

Нясі хутчэй вясну з вяснянкай –
Спыні крутых завей крыло...
Ты, толькі ты, мая жураўка, –
Адна надзея на цяпло!

*люты 1999 г.*

* – *музыка Мікалая Даўгалёва*

# СВЯЦІ МНЕ, ЗАРА*

Зара палымнее ўспамінам,
Іскрыцца слязой на вачах.
Свяці мне зара, не свяці мне –
Туман засцілае мне шлях.

Свяці мне, зара, не свяці мне, зара, –
Туман засцілае мне шлях.

Мой шлях, дзе ішоў я з адзінай,
Што кветкай купальскай цвіла.
Свяці мне, зара, не свяці мне –
Таго ўжо не будзе святла.

Свяці мне, зара, не свяці мне, зара, –
Таго ўжо не будзе святла.

Святла, што нядаўна дзівіла,
Губляў я і сон, і спакой.
Свяці мне, зара, не свяці мне –
Пары не вярнуць маладой.

Свяці мне, зара, не свяці мне, зара, –
Пары не вярнуць маладой.

*студзень 1999 г.*

** – музыка Мікалая Даўгалёва*

## КУПАЛЬСКАЯ*

Купалінкі-зоры
Ў вышыні нябеснай
Разліліся морам
У чаканні песень.

І дзяўчына-кветка
Летуценна-светла
Просіцца у маці
Пакупалаваці:

– Маці, мая маці,
Не трымай у хаце
Мяне, маладую,
Ў ночаньку святую!

Пайду пашукаю
Папараць чароўну,
Мне яна заззяе
У дуброве цёмнай.

Пайду на ўсю ночку,
Песень наспяваю,
Навію вяночкаў,
Любага спаткаю...

Маці, мая маці,
Не трымай у хаце
Мяне, маладую,
Ў ночаньку святую!

*чэрвень 1990 г.*

* – *музыка Леаніда Захлеўнага*

## АЛЁНА*

У вачах тваіх восень ясная –
Так зажурана-чароўна!
Мройным позіркам, сумна-ласкавым,
Не спалі мяне, Алёна!

Што было святым, не забудзецца,
Абаўе душу любоўна,
Сны прасветлыя нашы збудуцца –
Не журыся так, Алёна!

Прыгадай-прысні шлях развеснены,
Узмахні крылом натхнёна –
Небам казачным, небам песенным
Паляцім з табой, Алёна!

Паляцім з табой, нібы лебедзі,
За раку, за гай зялёны,
На краі зямлі знойдзем недзе мы
Свой нябесны рай, Алёна!..

У вачах тваіх восень ясная –
Так зажурана-чароўна!
Мройным позіркам, сумна-ласкавым,
Не спалі мяне, Алёна!

*верасень 1993 г.*

** – музыка Леаніда Захлеўнага*

## РЭЧАНЬКА*

Не выходзь ты, рэчанька,
З беражкоў крутых,
Не тапі мне сцежачак,
Сцежак залатых.
    Тут збірала кветачкі
    І вянкі віла,
    І пускала рэчанькай,
    Беражком ішла...

Закружыла галаў мне
Быстрая вада,
Падыйшоў каханы мой
І руку падаў.
    Не выходзь ты, рэчанька,
    З беражкоў крутых,
    Не тапі мне сцежачак,
    Сцежак залатых.

Ой, жуда-бяда, ой, як шуміць вада!
А дзе ж буду, дзе ж я карагод вадзіць,
А дзе ж буду, дзе ж я, рэчанька мая,
Любага чакаць, вяночкі віць?

Тут гуляла з мілым я
Да світальных зор,
З ім у снах аблётала
Ўвесь зямны прастор.
    Ды не доўга шчасцейка
    Зоркай ззяла мне,
    За гарой згубілася
    Ў горкім палыне –

Паляцеў каханы мой
У далёкі свет,
Засталіся сцежачкі,
Незабыўны след.
    Не выходзь ты, рэчанька,
    З беражкоў крутых,
    Не тапі мне сцежачак,
    Сцежак залатых...

Ой, жуда-бяда, ой, як шуміць вада!
А дзе ж буду, дзе ж я карагод вадзіць,
А дзе ж буду, дзе ж я, рэчанька мая,
Любага чакаць, вяночкі віць?

*ліпень 1991 г.*

* *– музыка Паўла Яроменкі*

# НЕ СУМУЙ, ДЗЯЎЧЫНА*

Гоніць восень вырай, гоніць на чужыну,
Коцяцца далінай крыкі журавоў.
Не сумуй, дзяўчына, жура-журавіна, –
Вернецца твой жораў з дальніх берагоў!

Толькі не згінайся тонкаю рабінай,
Толькі не здавайся волі злых вятроў,
Не глядзі гаротна ў вочы далячыні,
Не трывож самотай даль крутых шляхоў.

Толькі не спужайся завывання сцюжы,
Толькі дачакайся ласкі веснавой.
Веру я: не звянуць аніколі ружы,
Што цвітуць каханнем у душы тваёй...

Гоніць восень вырай, гоніць на чужыну,
Коцяцца далінай крыкі журавоў.
Не сумуй, дзяўчына, жура-журавіна, –
Вернецца твой жораў з дальніх берагоў!

*кастрычнік 1996 г.*

* *– музыка Паўла Яроменкі*

## ДЛЯ КАГО ТАК ГАРАЦЬ ВАСІЛЬКІ ? *

Для каго так гараць васількі –
Промні сонца блакітнага ў жыце,
Для каго так пяюць жаўрукі
І звіняць пад гарою крыніцы?

Раскашуе вясновы мой сон
У бурштынным святле завушніцаў,
У льняной белізне валасоў,
У паглядзе тваім таямнічым.

Праз гады, як праз белы туман,
Я гляджу – і душой ажываю:
Каласы твой рабінавы стан
Абдымаюць, у росах купаюць.

І гараць для цябе васількі –
Промні сонца блакітнага ў жыце –
І пяюць для цябе жаўрукі,
І звіняць пад гарою крыніцы.

*травень 1989 г.*

* – *музыка Паўла Яроменкі*

## КОНЬ КАЛІНОЎСКАГА*

Зямля пад ворагам гарыць –
Ідуць за Волю змагары –
Касіянеры.
А перад імі на кані
Іх палкаводзец малады,
Крылата-смелы.
– Наперад, з Богам, ваяры! –
Кружляе голас угары
Над полем сечы.

Конь Каліноўскага ляціць –
Цок-цок-цок-цок, дзінь-дзінь-дзінь-дзінь!
– За Беларусь! – лунае кліч.

Шугае мужных вояў раць,
Грымяць іх стрэльбы і блішчаць
Маланкі-косы.
Стаіў дыханне край лясны –
Няроўны бой вядуць сыны
З навалай грознай.
О Божа, дай ім устаяць,
Свой дух ваярскі захаваць
Непераможны!

Конь Каліноўскага ляціць –
Цок-цок-цок-цок, дзінь-дзінь-дзінь-дзінь!
– За Беларусь! – лунае кліч.

Мне сніцца сон далёкіх дзён:
Плыве над краем цокат-звон
І гул суровы –
Касіянеры ў бой ідуць,

Аж навакол лясы гудуць,
Бары-дубровы.
Імчыцца конь праз дым-агонь,
Нясе ён вершніка свайго
У несмяротнасць.

Конь Каліноўскага ляціць –
Цок-цок-цок-цок, дзінь-дзінь-дзінь-дзінь!
– За Беларусь! – лунае кліч.

*студзень 2003 г.*

** – музыка Пётры Русава*

## ТРУБІ, ТУРЫНЫ РОГ! *

Калі ж, беларусы, мы ўскрылім
Да зораў сям'ёй сакалінай?
Санліва брыдзем, як рабы...
Трубі, рог турыны, трубі!

Трубі, трубі, турыны рог,
Будзі нам Памяць векавую:
Пачуем мы – пачуе Бог
І верне годнасць нам былую!

Ніяк не ўзляцім пад Нябёсы –
На крылах атрутныя росы,
Гарчыць у грудзях чарнабыл...
Трубі, рог турыны, трубі!

Трубі, трубі, турыны рог,
Будзі нам Памяць векавую:
Пачуем мы – пачуе Бог
І верне веліч нам былую!

Ніяк мы, ніяк не ўваскрэснім
Ні матчыным словам, ні песняй,
Ні клічам паходнай трубы...
Трубі, рог турыны, трубі!

Трубі, трубі, турыны рог,
Будзі нам Памяць векавую:
Пачуем мы – пачуе Бог
І верне славу нам былую!

*кастрычнік 1997 г.*

* – *музыка Пётры Русава*

# ДУША МАКСІМАВА*

*Клубу “Спадчына”*
*з нагоды 20 – годдзя*

Душа Максімава з касмічных сфер няласкавых
Вярнулася дадому, дзякуй Богу,
Крылом Страцімавым абняўшы сэрца бацькава,
Знайшла прытулак у Старых Дарогах.

Знайшла прытулак тут, дзе так шануюць роднае,
Дарэшты аддаюць любоў і ласку!
Маліцца будзе тут за Беларусь свабодную,
За мову матчыну, за песні-казкі.

Маліцца будзе тут, каб дні настали райскія
І не спазналі больш ярма чужога...
Душа Максімава з касмічных сфер няласкавых
Вярнулася дадому, дзякуй Богу.

*сакавік 2004 г.*

* *– музыка Ігара Лучанка*

# СОН ГАЛУБКІ*

У дзяўчыны-чараўніцы
Хлопец ласкава пытае:
– Што табе, галубка, сніцца?
Дзе твая душа лятае?

– О мой голуб лёгкакрылы,
Заляці ў мой сон чароўны –
Таямнічым небасхілам
Паплывем у зорным чоўне!

– А куды ж, куды з табою
Паплывем, галубка міла,
Над здзіўлёнаю зямлёю
Таямнічым небасхілам?

– О мой голуб лёгкакрылы,
Свет аблётаў – здагадайся:
У якой святой краіне
Вечна ззяе кветка шчасця?

– О галубка дарагая,
Я, здаецца, здагадаўся:
Там, дзе шчыра ўсе кахаюць,
Вечна ззяе кветка шчасця!

– Так, мой голуб, так, мой ясны,
У краіне закаханых
Вечна ззяе кветка шчасця,
Чары лье, нібы на Яна!

*ліпень 1996 г.*

** – музыка Віктара Малых*

## МІЛАВІЦА*

Дзе ты, незямная, грэшная, святая,
Светлая паглядам, шчырая душой?
Я цябе шукаю, я табе гукаю:
– Узыйдзі заранкай нада мной!

Узыйдзі нада мной, абудзі неспакой,
Зноў на свет я хачу нарадзіцца,
Асвяці, асвяці мне дарогу ў жыцці,
Мілавіца мая, Мілавіца!

Да цябе, далёкай, даляту жаўронкам,
Заспяваю звонка, як яшчэ нідзе, –
На азёрнай тоні скалыхнецца лодка,
Зацвітуць лілеі на вадзе.

Казачныя вёслы узлятуць узнёсла,
Панясуць удалеч нашы мроі-сны –
Паплывем з табою на таемны востраў
Першага кахання і вясны...

Узыйдзі нада мной, абудзі неспакой,
Зноў на свет я хачу нарадзіцца,
Асвяці, асвяці мне дарогу ў жыцці,
Мілавіца мая, Мілавіца!

*ліпень 1991 г.*

* – *музыка Алега Елісеенкава*

## ДЗІВА–КРАЙ*

Ветразь белы чайкаю марскою
Крылы развінае над вадой,
Хвалі-віраванкі за кармою,
Нібы скрыпкі, штосьці граюць нам з табой.

П'ем з салёных вуснаў хмель і росы
І глядзім на сіні небакрай.
Недзе там мы знойдзем райскі востраў,
Недзе там мы адшукаем дзіва-край!

Дзе ён, той востраў жаданы,
Любая, ты не гадай –
Мы знайшлі дзіва-каханне,
Знойдзем свой і дзіва-край!

Нас вядуць гасцінныя дэльфіны,
Мы плывем за імі ў казку-даль.
Дзе ты, пакажыся, бераг слынны,
Штосьці доўга скал арліных не відаць?!

Сонца расчасала промні-косы –
Свеціцца таемны небакрай.
Недзе там мы знойдзем райскі востраў,
Недзе там мы адшукаем дзіва-край!

Дзе ён, той востраў жаданы,
Любая, ты не гадай –
Мы знайшлі дзіва-каханне,
Знойдзем свой і дзіва-край!

*красавік 1999 г.*

* – *музыка Якава Навуменкі*

# КАСАВІЦА*

Хто там, на лузе, так слаўна спявае?
Хто там заслухаўся – змоўк, не звініць?
Красачка Яня там славіць каханне,
 Яська заслухаўся – кінуў касіць.

Кінуў касіць ён, прысеў на пракосе,
Залюбаваўся дзявочай красой:
Русыя косы ў мядункавых росах,
Срэбраны голас віруе ракой:

– Ой, касавіца, мая касавіца,
Не пакасі медуніцаў маіх,
Дай наспявацца мне, дай нахадзіцца
Хмельнымі сцежкамі дзён маладых...

Хто там, на лузе, так слаўна спявае?
Хто там заслухаўся – змоўк, не звініць?
Красачка Яня там славіць каханне,
Яська заслухаўся – кінуў касіць.

*чэрвень 1991 г.*

* – *музыка Сяргея Аляксеева*



# За маладых!



Мастак Мікола Кірэеў, Уладзімір Пецюкевіч, кампазітар Мікола Алешка і пляменніца Алена Бубнік з мужам Эдуардам. 2003 г.

# ЗА МАЛАДЫХ !

**песенны альбом беларускага вяселля***

## ЖАЎРУЧОК, СКАЖЫ

Ранак зорыцца, ранак ясніцца,
І жаўрук звініць, залiваецца.
Толькі любы мой штосьці позніцца,
Круцізной дарог не натоміцца.
Жаўручок, скажы: можа, бачыў ты
Майго Ясеньку на шляху крутым,
Светларусага, сінявокага?
Дзе ён лётае ясным сокалам?

Дзе ён, родны мой, хоць бы словачка?
Можа, з ім бяда, не дай Божачка? –
Даль чужынская небяспечная:
Мора бурнае, горы снежныя...
Жаўручок, скажы: можа, бачыў ты
Майго Ясеньку на шляху крутым,
Светларусага, сінявокага?
Дзе ён лётае ясным сокалам?

Спеў лаўлю я твой, як шумёлаў звон,
І рыхтуюся да шчаслівых дзён:
Ручнікі я тку на вяселейка,
Нарачонаму – самы беленькі.
Ой, скажы, скажы, мілы жаўручок,
Добру вестачку скінь мне з-пад аблок,
Што я шчасцейка дачакаюся –
З любым Ясенькам павянчаюся!

*студзень 2002 г.*

** – музыка Міколы Алешкі*

## ОЙ, ХАДЗІЛА Я, ГУЛЯЛА!..

Затужыў, заплакаў горка
Салавейка-чарадзей –
Дабаўляе мне самоты
На лугах маіх надзей.

Ой, хадзіла я, гуляла
І спявала не адна –
Карагод вадзіла з мілым
Ночкай зорнай давідна!

Не магу я дачакацца
Яся любага свайго –
Ні самога, маладога,
Ні лісточкаў ад яго.

Пазіраю на дарогу,
Вочы выглядзела ўсе,
А з пагорачка крутога
Толькі пыл віхор нясе.

Чуеш, Ясю, чуеш, любы,
Лугавога салаўя?!
Плача ён, што вяне ў скрусе
Кветка белая твая...

Затужыў, заплакаў горка
Салавейка-чарадзей –
Дабаўляе мне самоты
На лугах маіх надзей.

*снежань 1997 г.*

## КЛІЧА СЭРЦА

Да цябе вярнуцца кліча сэрца,
Да кужэльных кос і чорных броў.
Як далёкі вырай мой мінецца,
Прыляту з чародкай жаўрукоў.

На дасвецці песняй жаўруковай
Растрывожу сон дзявочы твой –
Да маёй русалачкі азёрнай
Я вярнуся веснаю парой!

Зноў пяшчотны голас твой пачую,
Нібы летуценны плёскат хваль,
Паплыву з табою, павяслую
Сінь-вадою ў казачную даль.

Ты чакай квітнеючай вясною
І сватоў вясёлых ад мяне –
Звон вясельных бомаў пад дугою
Аж да слёз душу нам закране...

Да цябе вярнуцца кліча сэрца,
Да кужэльных кос і чорных броў.
Як далёкі вырай мой мінецца,
Прыляту з чародкай жаўрукоў.

На дасвецці песняй жаўруковай
Растрывожу сон дзявочы твой –
Да маёй русалачкі азёрнай
Я вярнуся веснаю парой!

*студзень 2002 г.*

## ЗБІРАЙСЯ ДА ШЛЮБУ, ДЗЯЎЧЫНА

Збірайся да шлюбу, красуня-дзяўчына:
Вярнуўся твой любы з далёкай чужыны,
Вярнуўся твой голуб, вярнуўся, крылаты,
Рыхтуйся, галубка, рыхтуйся да свята!

Прымерай, нявеста, вясельнае плацце,
У вэлюме белым кружыся па хаце –
Хай сонейка ў вокнах шчасліва смяецца,
У садзе салоўка вясёла зальецца.

Рыхтуй на вянчанне ручнік вышываны,
А шлюбны пярсцёнак падорыць каханы,
Расчэшуць сяброўкі твае русы косы,
Надзенуць на галаў вяночак прыгожы...

Збірайся да шлюбу, красуня-дзяўчына:
Вярнуўся твой любы з далёкай чужыны,
Вярнуўся твой голуб, вярнуўся, крылаты,
Рыхтуйся, галубка, рыхтуйся да свята!

*снежань 1997 г.*

# ЗАМУЖ ВЫЙСЦІ – ТРЭБА ЗНАЦЬ

Сонейка зайшло, развіталася –
І маці ў дачкі запыталася:
– Ці гатова ты, мая дочачка,
Да шлюбу-вянца, да вяселейка?

Замуж выйсці – трэба знаць,
Любая дачушка, –
Позна легчы, рана ўстаць,
Быць нястомнай птушкай.

Мала мець пасаг – куфар залаты
Дываноў льняных, што наткала ты!
Мала на ручнік вышываны стаць
І пярсцёначак з любым абмяняць.

Мала вэлюм свой беленькі надзець,
На пачэсны кут з нарачоным сесць.
Мала ручнічок свату падарыць,
Дружкаў ля сябе побач пасадзіць.

Замуж выйсці – трэба знаць,
Любая дачушка, –
Позна легчы, рана ўстаць,
Быць нястомнай птушкай.

*чэрвень 2002 г.*

## ЖЫВАЯ КРЫНІЦА

Жывая крыніца віруе, іскрыцца,
Вясёлы звініць ручаёчак.
Да любай галубкі, красы-чараўніцы,
Вярнуўся здалёк галубочак.

– Дай мне, чараўніца, крынічнай вадзіцы,
Дай мне наталіцца, галубка:
Хачу асвяжыцца, хачу ажывіцца,
Здарожаны доўгай разлукай.

На роднай зямліцы, ля чыстай крыніцы
Хачу акрыяць я душою,
У радасці-шчасці, у горы-напасці
Заўсёды быць побач з табою…

Жывая крыніца віруе, іскрыцца,
Вясёлы звініць ручаёчак.
Да любай галубкі, красы-чараўніцы,
Вярнуўся здалёк галубочак.

*студзень 2002 г.*

## СВАТЫ

Просім, бацька, просім, маці,
Нам галубку паказаці –
Мы прыехалі здалёку
На красуню кінуць вокам.
Не хавайце, пакажыце –
Хочам мы яе купіці,
За цаной стаяць не будзем,
За любыя грошы купім.

Ой, што гэта запалала,
Як жар-птушка, – ўсё заззяла?!
Ці не наша чараўніца,
З кім жадаем параднідца?!
  За такую цуда-птушку
  Даць гатовы мы цялушку
  І каня, авечак статак
  Ды кабанчыка ў дадатак.

Што ж ты, дзіўная красуня,
Уздыхнула гэтак сумна?
Не журыся, не трывожся –
Галубочак наш прыгожы.
  Ой, які ён, глянь, малойца! –
  І лагодны, нібы сонца,
  І вясёлы, і руплівы...
  Будзеш век за ім шчаслівай!

Дзякуй, бацька, дзякуй, маці,
Што згадзіліся прадаці
Нам такую Мілавіцу!
Будзем разам весяліцца.

Чарку ўзняць пара, сваточкі,
За галубку з галубочкам.
Вып'ем, шчасця пажадаем,
На заручынах дабавім.
  Ой, што гэта ды за пара! –
  Заглядзенне, казка-мара.
  Як вясна, закрасавала,
  Увесь свет зачаравала!

*студзень 2002 г.*

## ЗАРУЧЫНЫ

Месяц ясны праз ваконца углядаецца,
Як дзяўчына маладая заручаецца.
Госці ночку п’юць-гуляюць, не ўгамоняцца
Ды цікавяцца пасагам заручоніцы.

І куфры свае красуня адкрывае ім
З дыванамі, з ручнікамі саматканымі...
Ах, якое бела плацце падвянечнае! –
Не ўглядайся, не любуйся, ясны месячык!

Не ўглядайся, не любуйся, ясны месячык,
У дзявочы карагод не клікай дзеўчыну!
Адгуляла ўжо сваё, адвесялілася,
Каля вогнішчаў, як песня, адыскрылася.

Заручоная, вяночкам увянчаецца,
А музыкі, як зайграюць, – разрыдаецца.
Павянчаную, журбою паланёную,
Павязуць яе ў старонку незнаёмую.

*ліпень 1999 г.*

## ВЯНОЧАК

Покуль цеста падыходзіць, мы спяваем:
“Караваю наш вясельны, караваю...”
І віем табе, сябровачка, вяночак
З руты-мяты і блакітных васілёчкаў.

У вяночку, перад выездам да шлюбу,
Закрасуешся ў застоллі побач з любым,
Як лябёдачка, асвеціш кут пачэсны
Белым вэлюмам і плаццем беласнежным.

Прыгадаеш сны дзявоцкія і песні,
Карагоды над ракою ў лузе веснім –
І зальешся несуцешнымі слязамі...
Ой, няўжо такое здарыцца і з намі?..

Покуль цеста падыходзіць, мы спяваем:
“Караваю наш вясельны, караваю...”
І віем табе, сябровачка, вяночак
З руты-мяты і блакітных васілёчкаў.

*ліпень 1999 г.*

## ВЯНЧАННЕ

Купалы царквы залачоныя,
Красна-дзеўчына заручоная.
Стала на ручнік, павянчалася
І з матуляю развіталася:

– Бывай, мамачка, бывай, родная,
Маё сонейка незаходнае,

Павязуць мяне ў край нязведаны,
Ласкай матчынай неасветлены!

Павязуць мяне ў тлумна-грэшны свет,
Зімка снежная замяце мой след,
Мамку я сваю буду ў сне гукаць,
Дні дзявочыя цёпла ўспамінаць!

Мамка любая, мамка мілая,
Блаславі мяне, акрылі мяне,
Птушкай-ластаўкай прыляту вясной
Да тваіх вачэй, што гараць слязой…

Купалы царквы залачоныя,
Красна-дзеўчына заручоная.
Стала на ручнік, павянчалася
І з матуляю развіталася.

*чэрвень 1999 г.*

## ВЫКУП МАЛАДОЙ

– Прапусціце, людзі добрыя,
Выкуп маем, вось, трымайце,
І вярніце нарачоную,
Толькі нас не ашукайце!

Ой, каго ж вы нам падсунулі?
З вамі мы не пасябруем,
Забірайце вы бабуленьку,
Нам аддайце маладую.

Мы за нашу птушку райскую
Заплацілі вам нямала –
І гарэлка, і шампанскае,
Цэлы бохан хлеба з салам!

– А нам мала, мала гэтага,
Вы яшчэ не заплацілі
За яе усмешку светлую,
За пагляд чароўна-мілы!

– Вось яшчэ вам колькі тысячаў –
І нявесту забіраем,
Хоць і грошы ў нас не лішнія,
Аддаем усё, што маем!

Мы далі б за ружа-красачку,
Каб маглі, і зор каралі,
І настольнік-самабраначку
Перад вамі разаслалі!

– Мы не верым вам, прыблуднікі,
З вас мы возьмем, як належыць,
За абцасік белай туфелькі
І за вэлюм беласнежны!

– Бачым, з вашаю дружынаю
Не старгуемся ніколі.
Вызваляем, хлопцы, сілаю
Наша сонейка з няволі!

Ой, якое дзіва яснае
Перад намі зноў заззяла! –
Усміхнулася нам Касенька,
Сэрца наша заспявала!

*люты 2002 г.*

# ПАСАД

Не скідай белаквецце, каліна, –
Чым жа будзеш ты свет чараваці?
Кінь журыцца, красуня-дзяўчына,
Па дзявоцкай пары сумаваці!

На высокі пасад, як царыцу, –
На дзяжу з кажухом старадаўнім
Мы пасадзім цябе, узвялічым –
Добрых песень табе наспяваем.

Блаславім мы цябе, пажадаем
Шчасця-долі ў жыцці даўгавечным
І абыйдзем цябе, дарагая,
Тры разочкі з запаленай свечкай.

Застрыжом мы цябе – русы косы
Праз вянчальны пярсцёнак прыпалім…
Не сумуй, маладая, па вёснах,
Што пайшлі ў незваротныя далі!..

Не скідай белаквецце, каліна, –
Чым жа будзеш ты свет чараваці?
Кінь журыцца, красуня-дзяўчына,
Па дзявоцкай пары сумаваці!

*ліпень 1999 г.*

## ВЯСЕЛЛЕ ВІРУЕ

Вяселле віруе,
Вяселле чаруе,
Бы звонкая плынь веснавая.
Сябровачкі-дружкі –
Як ластаўкі-птушкі,
Лябёдкай між іх – маладая.

Іграйце, музыкі,
Ў гармонікі – скрыпкі,
Спявайце, шаноўныя госці, –
Дарыце нявесце
Дзівосныя песні,
Каб век пражыла ў весялосці!

О, Касенька, Кася –
Лябёдачка наша,
Плыві па жыцці, не стамляйся –
Хай вечна ліецца
Ў тваім добрым сэрцы
Святая мелодыя шчасця!

А вы, сват і сваццця,
Кружыце па хаце,
На стол каравай падавайце,
Каб век маладыя,
Што князь і княгіня,
Купаліся ў моры багацця!

*кастрычнік 1999 г.*

## ЗА МАЛАДЫХ!

Гудзе вяселле і звініць:
Музыкі граюць – не спыніць!
Пяе застолле – не суняць!
Сват запрашае чарку ўзняць:

– Давай, браткі, нальём,
Давай, браткі, кульнём
Па чарцы беленькай,
Па чарцы светленькай,
За нашых маладых,
За шчасце-долю іх!
Мы вып’ем, зноў нальём
За маладых!

За маладых, за іх святло,
Што ў сэрцы любасцю ўзышло,
За іх каханне, за любоў,
Каб не згасала сто гадоў!

За маладых, за іх красу,
Што так нагадвае вясну,
За бацяна, каб ён насіў
Штогод чароўных дзетак ім!

– Давай, браткі, нальём,
Давай, браткі, кульнём
Па чарцы беленькай,
Па чарцы светленькай,
За нашых маладых,
За шчасце-долю іх!
Мы вып’ем, зноў нальём
За маладых!

*верасень 1998 г.*

## ТАНЕЦ ДЛЯ МАЛАДЫХ

Расступіўся круг сяброў вялікі,
Расквітнеў усмешкай незямной –
Першы танец шчодрыя музыкі
Дораць нашай пары маладой.

Не спыняйся, чарадзейны танец,
Маладых на крылах падымай,
Лебядзінай вернасці кахання
І шчаслівых дзён ім пажадай!

Звон мелодыі ракой віруе,
Нібы ў казку цудную заве, –
Маладая з маладым танцуе,
Як лябёдка з лебедзем плыве.

Вэлюм белы воблачкам у небе
Прамяніцца, дзівіць харавством,
Да грудзей сваю лябёдку лебедзь
Прытуляе ласкавым крылом.

*снежань 2001 г.*

## АЙ ДЫ ПОЛЬКА

Не сумуе маладзіца-удавіца:
Рукі ў бокі ды у скокі – весяліцца.
Скача польку з дзедам-зухам маладуха,
А музыкі граюць-граюць, што ёсць духу.

Ай, ды полька, ай, ды полька-весялуха!
Эх, ды скача з дзедам-зухам маладуха!
Стук-грук, тра-та-та! –
Аж падлога дыміцца,
Весяліцца барада,
Лысая патыліца!

Расхадзіўся дзед, лятае, бы на крылах.
Ой, дае-дае ён польцы жару-пылу!
Узмалілася малодка: – З ног валюся,
Абскакаць цябе, дзядуля, не бяруся!

– Ой, трымайся, не валіся, маладзіца, –
Я ж хачу яшчэ з табою ажаніцца!
– За табою на край свету я гатова,
Мой дзядочак, зух-малойчык стогадовы!

Ай, ды полька, ай, ды полька-весялуха!
Эх, ды скача з дзедам-зухам маладуха!
Стук-грук, тра-та-та! –
Аж падлога дыміцца,
Весяліцца барада,
Лысая патыліца!

*травень 2001 г.*

## ПЕСНЯ БАБЫЛЯ

Людзі раяць ажаніцца,
Бабылём не славіцца.
Я ж баюся памыліцца,
Каб пасля не жаліцца.

Мой няшчасны сябра Саўка
Ўзяў сабе няўдаліцу:
П'е, гуляе, і гультайка –
З рук работа валіцца.

Ажаніцца – не напасць,
З тым даўно згадзіўся я.
Каб вось толькі не прапасць,
Ажаніўшыся!

Мой гармонік не сумуе,
Звонка заліваецца,
Дорaць песні мне красуні
З вечара да раніцы.

Не з адною сэрца цешу,
Не з адной кахаюся.
Хай гавораць, што я грэшны,
Саграшу – пакаюся.

Ажаніцца – не напасць,
З тым даўно згадзіўся я.
Каб вось толькі не прапасць,
Ажаніўшыся!

У мяне сяброў даволі,
Справы ў нас адзіныя:
І у полі, і ў застоллі
Весялюся з імі я.

Быць жанатым? Божа мілы!
Ці ж я птушкай лётаў бы? –
Абламала б жонка крылы
Хатнімі турботамі.

Ажаніцца – не напасць,
З тым даўно згадзіўся я.
Каб вось толькі не прапасць,
Ажаніўшыся!

*снежань 2000 г.*

# БАЦЬКОЎСКАЕ БЛАСЛАВЕННЕ МАЛАДЫМ

Любыя дзеткі, як міла-чароўна
Славу пяе вам застолле!
Гэтай хвіліны, святой, непаўторнай,
Не забывайце ніколі!

Шчыра віншуем вас, дзетачкі нашы, –
Сталі вы мужам і жонкай –
Дружна жывіце пад зорачкай шчаснай
І пад аховай анёльскай!

Хочацца ўнукаў скарэй дачакацца,
Песціць-люляць іх душою,
Цешыцца сонейкам вашага шчасця
Тут, пад радзімай страхою.

А калі ж доля закіне далёка
Некуды вас, летуценных,
Не забывайце бацькоўскай старонкі,
Помніце родныя сцены!

Помніце, дзеткі, куточак той светлы
З чарамі казак і песень,
Дзе адшукалі вы папараць-кветку
І ў свет шырокі панеслі!

Не разгубіце дарогай крутою
Ласкі адзін да аднога,
Век беражыце у сэрцы святое,
Не расставайцеся з Богам!

*люты 2002 г.*

# КАРАВАЙ

Госці мілыя, сябры,
Хто як можа адары
Маладога з маладою.
Хто адведаў каравай,
Каравайнічкаў вітай
Спеўнаю душою.

Вымагае сват няшмат,
І рублю ён будзе рад,
Хай вядзецца ў нашай хаце.
Сват пакланіцца ў пояс,
Хто "зялёненькі" прыпас,
Пакладзе на шчасце.

Вымагае сват няшмат,
Ён і слоўцу будзе рад,
Што ад сэрца выплывае, –
Павіншуем маладых,
Пачастуем, залатых,
Шчодрым караваем!

Госці мілыя, сябры,
Хто як можа, адары
Маладога з маладою!

*чэрвень 1999 г.*

# ПОЛЬКА З ПРЫПЕЎКАМІ

– Грай жа, грай ты, гарманісцік,
Грай, мой любы Колечка, –
Не хапае мне іскрыстай
Тупатухі-полечкі!

Граў бы зранку я да ранку
Для цябе, каханачка,
Ды не бачу чаркі-скваркі,
Западаюць планачкі!

На вяселле цётка Дуня
Так ужо спяшалася,
Што згубіла чаравікі,
Босая прымчалася!

Задрыжаў у свацці голас,
Ледзь не заікаецца:
– Ты цішэй, сваток вясёлы, –
Столь на голаў валіцца!

Пажадай і мне, сваточак,
І сынка, і дочачку,
Бо кахалася з мілёнкам
З раніцы да ночачкі!

Маладому з маладою
Дорым мы прыпевачкі,
Каб ім скора заспявалі
Салавейкі-дзетачкі!

*сакавік 2002 г.*

# ЭХ, ВЯСЕЛЛЕ!

Эх, вяселле дык вяселле –
Не прыдумаць, не прысніць! –
Госці ўсе за стол паселі,
Толькі сват адзін стаіць.

Толькі сват адзін гаворыць,
Запрашае чаркі ўзняць.
Праз хвіліну ўсё, як мора,
Забурліла – не суняць!

Эх, вяселле дык вяселле –
Незямныя каруселі,
Ходзіць ходырам зямля,
Чутна зблізку і здаля:
– Гоп-ля-тра-ля-ля!

Маладзіца свяцця Зося
Падміргнула Васілю,
Засвяціўся той, як сонца, –
Вось шанцуе бабылю!

І пайшоў, на ўсё забыўся,
Ён са сваццяй танцаваць,
Спатыкнуўся, паваліўся,
Стаў красуню цалаваць.

Б’е ў заслонку дзед Ярмола,
Апрануты ў медзвядзя.
Цягне ў круг і бабка Домна
Свайго дзеда Міхася.

Стукам-грукам, смехам-жартам
Перапоўнены ўвесь дом,
Скача полечку заўзята
І нявеста з жаніхом...

Эх, вяселле дык вяселле –
Незямныя каруселі,
Ходзіць ходырам зямля,
Чутна зблізку і здаля:
– Гоп-ля-тра-ля-ля!

*красавік 2002 г.*

## АГЛАБЛЁВАЯ

– Адыскрылася вяселле –
Сціхлі песні, змоўклі жарты.
Пагулялі, як умелі, –
І пара ўжо нам дахаты!

Да спаткання, да сустрэчы,
Будзе новы дзень і вечар,
Будуць новыя застоллі,
Сэрца ўцехай не натолім!

– Дарагія нашы госці,
Каб жылося ў весялосці,
Радасць біла цераз край,
Аглаблёвую ўзнімай!

Узнімай, брат, выпівай
І суседу налівай!
Коні вас у родны двор,
Хай нясуць, нібы віхор!

– Шчыры дзякуй, гаспадару,
Шчыры дзякуй, гаспадыня,
Каб збыліся вашы мары,
Рады ўзняць мы па адзінай!

Хто па поўнай, хто патрошку,
Вып'ем з вамі на дарожку
І пакінем не надоўга
Маладую й маладога!

– Дзякуй, сват, і дзякуй, сваццця,
Не забудзем вас ніколі.
Па адзінай – і бывайце,
Зачакаліся нас коні.

Маладым жадаем дзетак,
Як у веснім садзе кветак,
Каб шчасліваю гадзінай
Нас пазвалі на радзіны!..

– Дарагія нашы госці,
Каб жылося ў весялосці,
Радасць біла цераз край,
Аглаблёвую ўзнімай!

Узнімай, брат, выпівай
І суседу налівай!
Коні вас у родны двор,
Хай нясуць, нібы віхор!

*красавік 2002 г.*

# ВЯСЕЛЬНЫ ЗВОН

Дзінь-дзінь-дзінь! – пад дугой распісною
Залатыя званочкі звіняць.
Дзінь-дзінь-дзінь! – малады з маладою
На развіхраных конях імчаць.

Дзінь-дзінь-дзінь! Дзінь-дзінь-дзінь! – і над полем,
Дзінь-дзінь-дзінь! – і над борам звініць,
Як наказ маладым жыць няўтольна
І каханнем праз век даражыць.

Э-гэй! Імчыце, вараныя,
Хай пракладаюць маладыя
На шляху жыццёвым
Добры след!
Дзінь-дзінь! Званочкі залатыя,
Як ручаёчкі веснавыя,
Сыпце звон дзівосны
На ўвесь свет!

Дзінь-дзінь-дзінь! Дзінь-дзінь-дзінь! – звон раздольны
Акрыляе напеў маладых.
Дай ім, Божа, ніколі-ніколі
Не забыць родных песень сваіх!

Дзінь-дзінь-дзінь! Дзінь-дзінь-дзінь! – звон іскрыцца,
Праз туман маладых не відаць.
Дай ім, Божа, з дарогі не збіцца
І ад сонечных мар не адстаць!

*ліпень 1998 г.*



# На крылах мелодыі

# НА КРЫЛАХ МЕЛОДЫІ

**песенны альбом***

## РУЖОВЫ ВЕРАС

Іду я ў верасні ружовым верасам,
Ды мне не радасна, ды мне не весесла:
І клён – з рабінкаю, і дуб – з бярозкаю,
А толькі ў нас з табой дарожкі розныя.

Дзе ты, далёкая, дзе ты, жаданая,
З кім ты цяпер, мая, зашлюбаваная?
Ці з сумным роздумам, ці з яснай мараю,
Ці з белым воблачкам, ці з цёмнай хмараю?

Мая ты ластаўка, сумуеш, ведаю,
Па нашым верасні, ружовым верасе,
Ружовым верасе, дзе мы спаткаліся,
Дзе так узнёсла нам з табой спявалася...

Ды разлучылі нас вятры дарожныя,
Іду задумліва ў святле бярозавым
І сніцца-внрыцца: мы зноў сустрэнемся,
Спяем аб вернасці, ружовым верасе.

*студзень 1997 г.*

** – музыка Міколы Алешкі*

## ТАНГА СУСТРЭЧЫ

Колькі лет, колькі зім, любы мой! –
Зноў ласкавы пагляд бачу твой,
Ты ж такі, мне здаецца, як быў,
Толькі з ценем самоты-журбы.

Не журыся, мой любы, цябе
Запрашаю на танша сустрэчы:
Расквітнее ў душы белы бэз
І не будзе там месца журбе.

Любы мой, слаўны мой,
Мы зноў танцуем з табой,
Бы вяслуем ракой юных дзён, –
О танга-танга-плынь, о танга-танга-вір,
Хмель душы мройнай,
Боскай мелодыі звон!

Сніцца мне праз гады дзіва-сон
Закахана-развесненых дзён:
Кружыць нас ля бацькоўскіх акон
Танга-плынь, танга-вір, хмель-віно.

Не сумуй, не тужы, любы мой,
Не разлучыць нас болей дарога,
Танга нашай сустрэчы з табой
Будзе век віраваць над зямлёй.

*красавік 1998 г.*

## ГІМН МУЗЕЯ "МЕНКА"

Калі ласка, – ў наш куточак райскі
Над славутай Менкаю-ракой –
Тут і быль адвечная і казка
Падаруе ўзнёслы вам настрой!

Ветракі на ўзгорках і Бажніцы,
Бы асілкі-волаты, стаяць...
Карагод святочны як зайскрыцца,
Аж у стольным горадзе чуваць!

Дзеля гонару і славы Беларусі,
Дзеля вечнасці і Памяці святой
Садам велічным на цэлы свет красуйся,
Наш музей над Менкаю-ракой!

Малады і сталы, прыпыніся,
Нізка пакланіся хаце той,
Дзе твой слаўны прадзед нарадзіўся
І пакінуў след глыбокі свой!

Двор пад саламянаю страхою
У вякі сівыя завядзе –
Адпачнеш прасветленай душою
І міжволі вырвецца з грудзей:

– Дзеля гонару і славы Беларусі,
Дзеля вечнасці і Памяці святой
Садам велічным на цэлы свет красуйся,
Наш музей над Менкаю-ракой!

*чэрвень 1998 г.*

## ЖУРАЎКІ

Вырайны клін жураўліны
Сумна курлыкае ў ранні...
Журыцца кветка-дзяўчына,
Чуецца плач-уздыханне:

– Ой, памаўчыце, жураўкі, –
Плача і так маё сэрца,
Пэўна, давеку без ласкі
Жыць мне адной давядзецца!

Мой незабыўны, каханы
Томіцца недзе за светам,
Быццам лісток адарваны,
Змецены ярасным ветрам!

Можа, ёсць добрыя весці? –
Мілыя птахі, скажыце.
Светлай надзеяй сагрэйце,
А як няма – памаўчыце!

Ой, памаўчыце, жураўкі, –
Плача і так маё сэрца,
Пэўна, давеку без ласкі
Жыць мне адной давядзецца!

*люты 1999 г.*

# ЯБЛЫЧАК РУМЯНЫ

Наліўныя яблычкі
У маім садочку,
У сяброўак – мужыкі,
А мой недзе ў прочках.

Ой, каціся з рук маіх
Яблычак румяны,
Па сцяжынцы, дзе ішоў
Любы мой, каханы!

Сакавіты, наліўны,
Зачаруй сцяжынку,
Каб вярнула мне хутчэй
Маю палавінку.

Цэлы свет заваражы
Водарам мядовым,
Каб мой любы не забыў
Шлях да майго дому...

Ой, каціся з рук маіх
Яблычак румяны,
Па сцяжынцы, дзе ішоў
Любы мой, каханы!

*сакавік 1998 г.*

# ЛЮБАНШЧЫНА – КРАЙ ЛЮБОВІ ВЕЧНАЙ

Дзе б ні быў я, мроіцца і сніцца
Прыгажосць нябесная твая:
Васількі блакітныя у жыце
І бярозкі белыя ў гаях.

Цішыню любіў тваю Купала,
Над ракой Арэсаю блукаў,
Дзе душа паэтава спявала
І цябе праславіла ў вяках.

Любаншчына – край любові вечнай,
Ты – мой дом і салаўіны сад,
Ты – мой шлях да мары запаветнай,
Сонечна-узнёслая краса!

Песняю сардэчнай я вітаю
І тваіх нястомных рук цяпло,
Што частуюць шчодрым караваем
За святочна-песенным сталом.

На палыннай сцежцы пад калінай
Я стаю ў трывозе дзён былых
І схіляю голаў над магілай
Абаронцаў-воінаў тваіх...

Любаншчына – край любові вечнай,
Ты – мой дом і салаўіны сад,
Ты – мой шлях да мары запаветнай,
Сонечна-узнёслая краса!

*верасень 2003 г.*

## ВІШАНЬКА–ДЗЯЎЧЫНКА

Дзеўчына, як вішня, –
Белы-белы цвет –
У садочак выйшла,
Хлопец ёй услед.

Хлопца закружыла
Дзеўчына красой:
Сінімі вачыма,
Белаю касой.

Лёгкія пушынкі,
Ветрык, развявай!
Вішанька-дзяўчынка,
Хлопца пачакай!

Сонечнай іскрынкай
Ласкавых вачэй,
Вішанька-дзяўчынка,
Ты яго сагрэй!

Ён цябе, красуню,
Цэлы век шукаў,
Прападаў ад суму,
Сэрцам паміраў.

Як жаўронку неба,
Як траве раса,
Ты яму патрэбна,
Юная краса!

*снежань 1997 г.*

## БЛАСЛАВЕННЕ

Загулі халодныя вятры –
Птушкі мкнуць да цёплых берагоў,
І бацькі самоцяцца ў двары,
Сына ў свет праводзячы свайго:

– Ты вазьмі ў дарогу абразок –
Будзь, сынок, пад покрывам святым,
Божа дай табе, мой галубок,
Шчасных дзён у ззянні залатым.

Столькі скрозь абрывістых дарог! –
Мужным будзь, як дзед і прадзед твой,
Зберагчы каб гонар свой ты мог,
Устаяць прад бураю любой.

У якіх ні быў бы ты краях,
Помні, сын, дзе ты радзіўся, рос,
Прылятай часцей пад родны дах,
На святло азёраў і бяроз.

Толькі тут, на дзедавай мяжы,
Толькі тут, пад крыламі буслоў,
Супакой ты знойдзеш для душы
І сваю сапраўдную любоў!

*ліпень 2001 г.*

## ДЗЕНЬ ДОБРЫ, СЛУЧЧЫНА МАЯ!

Вірye Случ у берагах,
У салаўіных вербалозах.
Вярнуўся я пад родны дах –
І на вачах, як росы, слёзы:

Парыў душэўны землякоў
Так міла сэрца мне кранае
Чароўнай песняю дзядоў
І новым шчодрым караваем.

Дзень добры,
Случчына славутая мая,
Прыгожая, што кветка веснавая,
Няхай тваё былiннае імя
Гучыць у вечным гонары і славе!

Гартуе волю нам і дух
Тваіх сыноў высокі подзвіг,
Што адвадзілі злыбяду
Ад родных хат часінай грознай.

Анастасіі Слуцкай след,
Тваёй заступніцы-княгіні,
І праз вякі не страціў свет
І ганарыцца слаўным імем.

Сцяжынкай роснай за сялом
Іду на жытняе прыволле
У васількавае святло –
І вырываецца міжволі:

– О край майстроў-чараўнікоў,
На паясах тваіх шаўковых
Узоры з сініх васількоў
Увекавечыў Багдановіч!..

*жнівень 2003 г.*

## ВЯРТАННЕ

Усё, што было без цябе, мой каханы,
Усё, чым жыла я ў расстанні з табой,
Знікае самотай у шэрым тумане,
Сплывае імклівай ракой.

Толькі тое, што вярнулася з табою,
Толькі тое, што да сэрца прырасло,
Песняй радаснай лунае над зямлёю,
Разлівае непагаснае святло!

Усё, што было без цябе, мой каханы,
Усё, чым жыла я ў расстанні з табой,
Цябе не адпусціць дарогай блукання –
І мой не паўторыцца боль.

Усё, што было без цябе, мой каханы,
Усё, чым жыла я ў расстанні з табой,
Успыхне мо некалі згадкай нязванай,
Застыне на вейках слязой.

*верасень 1998 г.*

## ПЕСНЮ БЯРЫЦЕ З САБОЮ

З вамі, сябры, мы душою,
Рады сустрэцца ізноў,
Песню бярыце з сабою –
Шчырую нашу любоў.

Песню бярыце з сабою,
Песня анёльскім крылом
Вас ахіне, абароніць,
Сэрца напоўніць цяплом.

Песню бярыце, бярыце,
Не забывайце, сябры, –
З песняй – мы сонца ў зеніце,
З песняй – мы зоркі ўгары!

Песню бярыце з сабою –
З ёю – шырэй небакрай,
З песняй – вышэй крылы-мроі,
І даражэй родны край.

Песню бярыце з сабою –
З ёю – і слёзы святлей:
Раны сардэчныя гоіць,
Нібы ў гаі салавей.

Песню бярыце, бярыце,
Не забывайце, сябры, –
З песняй – мы сонца ў зеніце,
З песняй – мы зоркі ўгары!

*студзень 1998 г.*

## МАМІН ДЗЕНЬ

Вясна-красна ідзе па свеце
З букетам кветак і надзей:
У кожнай хаце, ў кожным сэрцы
Квітнее сёння мамін дзень.

Віншуем, мамачка, віншуем
Цябе з тваім дзівосным днём
І песню шчырую даруем
З душэўнай ласкай і цяплом!

Жадаем радасці бясконцай,
Каб не кідаў цябе спакой,
Настрой святочны веснім сонцам
Гарэў штодня ў душы тваёй.

Ты не шкадуеш нам любові,
Жывеш турботай пра дзяцей.
Прымі ў падзяку нашы словы
Што праслаўляюць мамін дзень...

Віншуем, мамачка, віншуем
Цябе з тваім дзівосным днём
І песню шчырую даруем
З душэўнай ласкай і цяплом!

*люты 2002 г.*

## ВЫЙДЗІ НА СУСТРЭЧУ

Апусціўся вечар на прастор азёрны,
Свеціцца зарою, сцелецца туманам.
А самотны хлопец на гітары мройнай
Грае-напявае пад акном каханай:

– Выйдзі на сустрэчу, любая дзяўчына, –
Сёння зорны вечар светлых успамінаў!

Помніш, як нядаўна пад вясёлым клёнам
Салавей спяваў нам да світальных росаў,
Мы плылі з табою ў летуценным чоўне
Ясназорым плёсам, нібы па нябёсах.

Выйдзі на сустрэчу, любая дзяўчына, –
Сёння зорны вечар светлых успамінаў!

Помніш, як з табою слухалі мы казкі
Высі паднябеснай і бароў спрадвечных,
Нібы на паляне веснавыя краскі,
Для цябе збіраў я зоркі Шляхам Млечным.

Выйдзі на сустрэчу, любая дзяўчына, –
Сёння зорны вечар светлых успамінаў!

*сакавік 1998 г.*

## ТЫ ВЯСНОЮ МЯНЕ НАРАДЗІЛА

Ты вясною мяне нарадзіла
У краі цудадзейных азёр,
Напаіла з крыніц, блаславіла,
Правяла на бясконцы прастор.

І плыву я жыццёвай ракою...
Пабываў у заморскіх краях,
Ды нідзе не знайшоў я спакою –
Да цябе скіраваны мой шлях.

Па табе я, матуля, зжурыўся –
Пэўна, доля такая мая,
Што жыву я не там, дзе радзіўся,
Дзе пачуў першы раз салаўя.

У чароўную майскую ночку
Я вучыўся ў салоўкі спяваць
Пра дзяўчыну-красуню ў вяночку,
Пра азерцы, дзе зоркі гараць.

Ой, як мне не стае тых азерцаў,
Ясназорых, як вочы твае,
Да цябе маё сэрца імкнецца,
Пра сустрэчу з радзімай пяе...

Па табе я, матуля, зжурыўся –
Пэўна, доля такая мая,
Што жыву я не там, дзе радзіўся,
Дзе пачуў першы раз салаўя.

*травень 1996 г.*

## КАЛЫХАНКА

Ані зорачкі – у вокнах,
Пазірае цемра ў вочы.
Спіце, дзетачкі, спакойна,
Добрай ночы!

Спі, сыночак, спі, дачушка,
Падаруе вам жар-птушку
Татка любы –
Скора ночка-чараўніца
Зноў вясёла заіскрыцца:
Лю-лі, лю-лі!

Спі, не бойся вокнаў цёмных,
Спі, дзяўчыначка-пястунка, –
Татка вернецца дадому
З падарункам!

Спі, мой хлопчык, не трывожся –
З цуда-птушкай прыдзе татка –
Глянуць зорачкі з нябёсаў,
Спі, дзіцятка.

Спі, сыночак, спі, дачушка,
Падаруе вам жар-птушку
Татка любы –
Скора ночка-чараўніца
Зноў вясёла заіскрыцца:
Лю-лі, лю-лі!

*ліпень 1998 г.*

## ДЗЯЎЧЫНКА–ЗНІЧКА

Дзяўчынка светлая мая,
Мне на цябе не надзівіцца! –
Здаецца, неба і зямля
Тваёй красою залаціцца.

Гукай мяне, гукай мяне
За небакрай святла-пяшчоты –
Няхай міне, хутчэй міне
Халодны змрок маёй самоты.

Ой, не знікай,
Дзяўчынка-знічка,
Кліч мяне за небакрай,
Знічка-заранічка!

Я разгадаю твой пагляд
Такі нябесна-таямнічы!
Тваіх жаданняў зарапад
На зорны шлях мяне пакліча.

Бялюткі лён тваёй касы
Маіх пачуццяў не падмане –
Зліюцца нашы галасы
У песню вечную кахання.

Ой, не знікай,
Дзяўчынка-знічка,
Кліч мяне за небакрай,
Знічка-заранічка!

*люты 1998 г.*

# ОЙ, НЯСІ, МОЙ КОСЮ!

Ой, нясі, мой косю,
Косю вараненькі,
Ты мяне да любай,
Да маёй Надзейкі!

Без яе, адзінай,
Чайкі белакрылай,
Не знаходжу месца,
Проста жыць няміла.

Колькі год сумую,
Колькі год чакаю!
Ад яе, далёкай,
Вестачкі не маю –

Паляцела ў вырай
На зямлю чужую,
За лясы густыя,
За гару крутую.

Радасна-шчымліва
Я вясной вітаю
Жаўрукоў вясёлых,
Бацяноў і чаек,

А маёй Надзейкі,
Чайкі незабыўнай,
Не відаць ні ў полі,
Ні над хваляй сіняй...

*красавік 1998 г.*

## БЛАКІТНАЯ ГАЛІНКА

Блакітнага бэзу галінка
Табе пакланіцца я рад,
Вярнула ты мне на хвілінку
Юнацтва далёкага сад.

Ля весніц матулінай хаты –
Блакітам азёрным кусты,
Ламаю букецік бухматы –
І бегам на бераг круты.

Блакітнага бэзу галінка,
Пяшчота пары залатой,
Вярнула ты мне на хвілінку
Красу маладосці маёй.

Пад звонкія гукі вяснянак
Павольнаю хваляй плывём,
Вясёлыя вочы каханай
Іскрацца блакітным агнём.

Блакітная сніцца дарога,
З блакітнымі вокнамі дом...
Пра час развітання трывогу
Удаль адганяем вяслом.

Блакітнага бэзу галінка,
Пяшчота пары залатой,
Вярнула ты мне на хвілінку
Красу маладосці маёй.

*люты 1998 г.*

# РАСЦВІЛО КАХАННЕ

Узыйдзі-ўзыйдзі скарэй,
Месячык малодзенькі.
Прыйдзі, любы, да мяне
У садок зялёненькі!
    Падарую ручнічок,
    Як сняжок, бялюсенькі –
    Прала-ткала я лянок
    Для цябе, мой любенькі!

Для цябе, о верны мой,
Для вясельнай радасці...
Хай мая саперніца
Не трымае зайздрасці.
    Пра сваё вяселейка
    Так мне светла марыцца!
    Хай мая матуленька
    На мяне не сварыцца.

Не трывожся, мамачка,
Замуж мне не раненька –
Беласнежнай вішанькай
Расцвіло каханейка!..
    Узыйдзі-ўзыйдзі скарэй,
    Месячык малодзенькі.
    Прыйдзі, любы, да мяне
    У садок зялёненькі!

*травень 2001 г.*

# БРАСЛАЎШЧЫНА – ПЕСНЯ ВЕСНАВАЯ

Браслаўшчына – сінь ды сінь без краю,
Срэбрапеннай хвалі звон-струна.
Браслаўшчына – песня веснавая,
Вечна маладая старана.

Весела, як чайкі, ясным раннем
Узлятаюць вёслы над вадой –
Колькі шчасця, радаснага ззяння
У вачах абранніцы маёй!

Ой, што гэта – чары ці мне сніцца?! –
Я ныраю з чоўна ў глыбіню
І лаўлю там знічкі-зараніцы,
Чараўніцы любай падаю.

У дзівосных пацерках-заранках
Любая пяе пра мілы край, –
Нібы гусі-лебедзі, вяснянкі
Кружацца, плывуць за небакрай...

Браслаўшчына – сінь ды сінь без краю,
Срэбрапеннай хвалі звон-струна.
Браслаўшчына – песня веснавая,
Вечна маладая старана.

*ліпень 1998 г.*



# Пад сузор’ем Кахання



Уладзімір Пецюкевіч з жонкай Аксанай. 2002 г.

## БЕЛАРУСАЧКА

На заранку-зару, на світальніцу,
Маладзік-весялун заглядаецца.
Ты смяешся з мяне, перасмешніца,
Што раўную цябе я да месяца.

Ты – заранка-зара найяснейшая,
Ты – анёлаў сястра наймілейшая,
Ты з нябёсаў прыйшла боскай музыкай,
Прыгажуня мая, беларусачка!

У святочны убор ты прыбралася,
Васільковым вянком увянчалася,
Дзівіш белы ўвесь свет вабным голасам –
Спеў над вёскай плыве і над горадам.

Ты і ў полі касьбой – з песняй сонечнай,
І ў застоллі ты з ёй, як з сяброўачкай...
На заранку-зару, на світальніцу,
Маладзік-весялун заглядаецца...

Ты – заранка-зара найяснейшая,
Ты – анёлаў сястра наймілейшая,
Ты з нябёсаў прыйшла боскай музыкай,
Прыгажуня мая, беларусачка!

*студзень 1999 г.*

## БЕРАГІНЯ

Ты – любоў мая святая, Берагіня, –
Зберагаеш верным сэрцам бераг той,
Што купаў юнацтва наша ў хвалях сініх,
Узнімаў, як чаек белых, над вадой.

Да цябе я птахам радасным вярнуся,
Спадзяюся, не забыла ты мяне,
Пакланюся і душою павінюся,
Раскажу, як сумаваў на чужыне.

Берагіня, Берагіня, Берагіня,
Прыгажуня з беларусаю касой,
Беражы кахання бераг, беражы мне,
Я вярнуся ясназораю вясной!

З тога берага святога мы з табою
Будзем зноў у хвалі сінія ныраць,
Завіруюць песні-мроі над зямлёю,
Адгукнецца рэхам звонкім сенажаць.

З тога берага святога нашы дзеці
Палятуць у вырай некалі ад нас...
Столькі ўецца светлых сцежачак на свеце,
А дадому, найсвятлейшая, – адна!..

Берагіня, Берагіня, Берагіня,
Прыгажуня з беларусаю касой,
Беражы кахання бераг, беражы мне,
Я вярнуся ясназораю вясной!

*верасень 1995 г.*

# ВІШАНЬКА–ЧАРЭШАНЬКА

Прыляцеў дадому і застыў раптоўна:
Колькі дзіўнага святла! –
Над вадой азёрнай у цішы садовай
Вішня расцвіла.

О краса нябесная,
Як мяне ты ўсцешыла,
Нібы песня салаўя,
Вішанька-чарэшанька,
Вішанька-чарэшанька,
Любая мая!

Анімала вёснаў адзвінела ў росах,
Покуль я цябе шукаў,
Абхадзіў паўсвету, а такой дзівоснай
Я не сустракаў.

Стану на калені ў дзіўным захапленні
Перад Боскаю красой:
Ты – маё здзіўленне, ты – маё натхненне
І ратунак мой.

О краса нябесная,
Як мяне ты ўсцешыла,
Нібы песня салаўя,
Вішанька-чарэшанька,
Вішанька-чарэшанька,
Любая мая!

*лістапад 1994 г.*

# МЫ ЛЯЦІМ З ТАБОЮ

Узняліся, абняліся
Нашы крылы над зямлёю,
Не нацешымся мы воляй
І нябеснаю красою:
Мы ляцім-ляцім з табою
Да нязнанага парогу –
Блаславіла нас матуля
У шчаслівую дарогу.

Запыталіся мы ў зораў:
– А ці доўга будзе шчасце?
Адказалі ясны зоры:
– Трэба ў сонца запытацца.
Запыталіся мы ў сонца:
– А ці доўгім будзе шчасце?
Адказала ясна сонца:
– Трэба ў ветру запытацца.

Запыталіся мы ў ветру:
– А ці доўгім будзе шчасце?
Адказаў нам мудры вецер:
– А чаго ў мяне пытацца!
Запытайцеся вы ў сэрца,
Вам яно ўсю скажа праўду,
Да яго часцей прыходзьце
На малітву, на параду.

Запыталіся мы ў сэрца
І пачулі: – Будзе шчасце,
Покуль будзеце, як птушкі,
У бацькоўскі дом вяртацца!

*кастрычнік 1991 г.*

# ГУСІНЫМ ШЛЯХАМ

Гусіным Шляхам пад Божым дахам
Імкнуцца птахі, як думкі-мроі.
Гусіным Шляхам з такой адвагай
Ляцім у вырай і мы з табою!

Гусіным Шляхам пад Божым дахам
Нам немагчыма з дарогі збіцца –
Гусіным Шляхам, як кажуць магі,
Усё, што сніцца, павінна збыцца.

Гусіным Шляхам пад Божым дахам
Нас бласлаўляюць сястрыцы-зоркі.
Гусіным Шляхам, святым прасцягам,
Вяртацца век нам у край бацькоўскі...

Гусіным Шляхам пад Божым дахам
Імкнуцца птахі, як думкі-мроі.
Гусіным Шляхам з такой адвагай
Ляцім у вырай і мы з табою!

*ліпень 1995 г.*

# БЕЛАЯ ЧАІЦА

Ой, ты дзяўчыначка, сэрца абранніца,
Краю азёрнага белая чаіца,
Ты мне даруй за блуканне маё
І не раўнуй да нязнаных краёў!

Скора вярнуся я з дальняга выраю,
Радасць і жальба мая белакрылая.
Тое, што свет мне далёкі не даў,
Дома падорыць нам сіняя даль.

Белая чаіца, белая чаіца,
Мары і сны веснавыя збываюцца:
Славячы песнямі родны прастор,
Мы павяслуем з табою да зор!

Недзе на беразе зорнага вострава
Сэрцам распалім купальскае вогнішча.
Мроі акрыліць нам вір-карагод –
І мы адправімся ў новы палёт.

Недзе ў сузор'і Вялікай Мядзведзіцы
Казачны бор перад намі засвеціцца,
Там, дзе чароўная кветка цвіце,
Там, дзе сцяжынка да раю вядзе...

Белая чаіца, белая чаіца,
Мары і сны веснавыя збываюцца:
Славячы песнямі родны прастор,
Мы павяслуем з табою да зор!

*красавік 2003 г.*

## АКСІННІЦА

*Аксане П.*

Калі са мною ты, я – птах у небе веснім,
Калі цябе няма, злятаю я з нябёс.
Калі са мною ты, звіняць пра шчасце песні,
Калі цябе няма, пяю пра сумны лёс.

Аксінніца, Аксіння, сініца любая мая,
Чакай світанкам сінім здалёку жураўля!

Як абразок святы, як талісман надзейны,
У сэрцы я нясу крылаты вобраз твой,
У сцюжы-халады, дарогаю завейнай
Ён беражэ мяне душэўнай цеплынёй.

Аксінніца, Аксіння, сініца любая мая,
Чакай світанкам сінім здалёку жураўля!

Вяртаюся дамоў, у край замілавання,
Дзе кожны каласок – цяпло душы людской,
Блакітны васілёк гарыць маім жаданнем
Хутчэй цябе спаткаць на сцежцы палявой.

Аксінніца, Аксіння, сініца любая мая,
Чакай світанкам сінім здалёку жураўля!

*снежань 1996 г.*

# ЗОРЫ НАС ВЯНЧАЛІ

У куточку светлым,
Нібы ў садзе райскім,
Зяла наша лета
Кветкаю купальскай.
    На зямлі Купалы,
    Ночкаю чароўнай
    Зоры нас вянчалі
    Ў звоне карагодным.

        Зоры нас вянчалі,
        Песні бласлаўлялі
        У святле бяроз.
        Над зямлёй лунала:
        "Ой, рана, на Йвана..." –
        Да світальных рос.

Вогнішча на ўзлессі
На ўвесь свет палала,
І купалка-песня
Чараў не спыняла.
    Сам Пясняр, здаецца,
    Наш вялікі, слынны,
    Чараваў нам сэрцы
    На жалейцы дзіўнай...

        Зоры нас вянчалі,
        Песні бласлаўлялі
        У святле бяроз.
        Над зямлёй лунала:
        "Ой, рана, на Йвана..." –
        Да світальных рос.

*жнівень 2001 г.*

# Я МАГУТНЫ ТАБОЙ

Я табою збяднелы,
Нібы восень травой, –
Ты зямлю мне і неба
Засланіла сабой.

Засланіла красою –
Не адвесці вачэй –
Ані ранкаў з расою,
Ані зорных начэй.

То, як вязень, бяскрылы,
То ляту над зямлёй –
Я табою бяссільны,
Я магутны табой!

Я табою багаты,
Адчуваю, як Бог, –
Мне Сусвет падуладны,
Даль бясконцых дарог.

У нябеснай прасторы
Сыплю зоры з Каўша,
Каб свяцілася зорна
У зямлянаў душа...

То, як вязень, бяскрылы,
То ляту над зямлёй –
Я табою бяссільны,
Я магутны табой!

*верасень 1992 г.*

## ГЛЯНЬ, МАЯ РОДНАЯ

Зоры купаюцца, човен гайдаецца,
Пеняцца цёплыя хвалі...
Помню: з табою мы, юныя, мройныя,
Песнямі свет абдымалі.

Глянь, мая родная, ўдалеч азёрную –
Мора, бяскрайняе мора!
Тут мы радзіліся, не надзівіліся
Чарамі сініх прастораў.

Тоні рыбацкія, мары дзівацкія
Нас у нябёсы ўзнімалі...
Помню: з табою мы сцежкамі зорнымі
Востраў кахання шукалі...

Ясніцца раніца белаю чаіцай
І блаславеннем матулі...
Помню: з табою мы крыламі вольнымі
Вырайны шлях скалыхнулі.

*травень 1994 г.*

## КУПАЛЛЕ

Зорным вогнішчам палае
Чарадзейнае Купалле,
Не змаўкае цішыня –
І над полем, і над гаем
Птушкай вольнаю лунае
Песня мройная твая.

Дзякуй зоркам-яснавочкам –
Падарылі дзіва-ночку,
Пазнаёмілі з табой.
Купалінка-чараўніца,
Як табою не дзівіцца,
Святаянскаю красой!

Косы – промні залатыя,
Вочы – сінь-віры крутыя –
Ой, тану я ў іх, тану!
Ну, а голас, што за голас –
Мілагучны і вясёлы –
Аж да слёз мяне крануў!

На прыродзе, на выгодзе,
Весялімся ў карагодзе
Да світальнае зары
І вітаем казку-долю –
Адшукалі мы з табою
Кветку шчасную ў бары.

*ліпень 1998 г.*

# ВІШАНЬКА

Завіхрылі вятры, рвуць у садзе асенняе лісце,
Засцілаючы нашы сляды.
У бясконцай журбе сню і мрою цябе: адгукніся
І вярніся ў мой сад малады!

У бясконцай журбе сню і мрою цябе,
І гукаю я, вішаньку белую:
– Ой, вярніся, краса, ў мой зажураны сад
І вярні мне пару летуценную!

Буду зноў цалаваць я твае неспатольныя вусны,
Плыць у сны залатыя з табой,
Буду прагна ўдыхаць водар косаў тваіх беларусых,
Піць мядункава-хмельны настой.

Буду зноў адчуваць: нам прастораў азёрных замала,
Сінякрылай цішы над вяслом –
Буду птахам лунаць я з табой над зямлёю світальнай,
Дакранацца да зораў крылом…

У бясконцай журбе сню і мрою цябе,
І гукаю я, вішаньку белую:
– Ой, вярніся, краса, ў мой зажураны сад
І вярні мне пару летуценную!

*студзень 1993 г.*

# БЭЗАВАЯ РАНІЦА

Бэзавая раніца з салаўём вянчаецца
Ў нашым садзе над ракой,
Песня не канчаецца, льецца-разліваецца,
Нас вітаючы з табой.

Знай, мая абранніца, бэзавая раніца, –
Я – твой верны салавей.
Павянчацца з любаю, павянчацца з мілаю
Не губляю я надзей!

Ты з краёў нязведанных назаўсёды вернешся,
Веру я, да родных сцен.
Глянь, мая чароўная, для цябе пад вокнамі
Так дзівосна бэз цвіце!

Цвет пяціпялёсткавы мы знайшлі, узнёслыя, –
Знойдзем шчасце мы з табой:
Будзе вечна ясніцца бэзавая раніца
Ў нашым садзе над ракой…

Знай, мая абранніца, бэзавая раніца, –
Я – твой верны салавей.
Павянчацца з любаю, павянчацца з мілаю
Не губляю я надзей!

*травень 1994 г.*

## МАЛАДЫЯ НАПЕВЫ

З летуценным павевам
Ад відна да відна
Маладыя напевы
Рассыпае вясна.

Над палямі, лясамі
Перагуд, перазвон –
Маладымі вятрамі
Нашых казачных дзён.

Твой пралескавы позірк
Мне прынёс многа дзіў:
Глянеш мройна ў нябёсы –
І плыве маладзік.

Зазірнеш мне у вочы –
Зоркі ярка гараць,
Самай цёмнаю ноччу
Палымнее зара.

А спярша ты мне ў сэрца
Зазірнула да дна.
З той пары ў ім не рвецца
Залатая струна…

З летуценным павевам
Ад відна да відна
Маладыя напевы
Рассыпае вясна.

*красавік 1984 г.*

## КОНІ – ВЁСНЫ МАЛАДЫЯ

Коні, коні, адпачніце,
Бег імклівы прыпыніце,
Лугам росным пахадзіце
У раскошы мурагоў.
Хай заблытаюцца ў грывах
Промні ранкаў зіхатлівых,
Незваротных і шчымлівых,
Нібы крыкі жуаравоў.

Коні – вёсны маладыя,
Лёгкакрылыя Пегасы,
Адпачніце, залатыя, –
Цяжка гнацца вам за часам!

Коні, коні, адпачніце,
Бег імклівы прыпыніце,
Красна-дзеўчына з крыніцы
Вам падасць вады жывой,
Шчырым сэрцам усміхнецца,
Светлай песняй разліецца,
З вамі ўдалеч не памкнецца,
Толькі ўслед махне рукой.

Коні – вёсны маладыя,
Лёгкакрылыя Пегасы,
Адпачніце, залатыя, –
Цяжка гнацца вам за часам!

*люты 1993 г.*

## ВЯСЕЛЬНЫХ БОМАЎ ЗВОН

Чыя душа сагрэе ласкай шчырай,
Падорыць мне цяпло сардэчных слоў?
Дзе б я ні быў, шукаю цёплы вырай,
Ды ўсюды снег і гойсанне вятроў.

Усюды снег, усюды бездарожжа.
І чую я вясельных бомаў звон:
– Ніхто-ніхто цябе сагрэць не зможа,
Апроч Яе, з вачыма – сіні лён!

І сніцца сон: насустрач мне анёлам
Імкне Яна, махаючы крылом,
Сінее лён вачэй Яе вясёлых...
Мінае сон – і зноў зіма кругом.

Зноў сніцца сон: імчымся мы на конях –
Звіняць-шумяць званочкі пад дугой,
Сінее лён вачэй Яе пяшчотных...
Мінае сон – і зноў сняжынак рой.

Усюды снег, усюды бездарожжа.
І чую я вясельных бомаў звон:
– Ніхто-ніхто цябе сагрэць не зможа,
Апроч Яе, з вачыма – сіні лён!

*верасень 2002 г.*

## ПРАЛЕСАЧКА ЛЯСНАЯ

Як цудадзейна і святочна
У веснавым тваім бары! –
Гарыць, як позірк твой дзявочы,
Святло пралескавай зары.

Красою казачнай світае
Над красавіцкаю зямлёй.
У захапленні я гукаю,
Навек губляючы спакой:

– Красы такой нідзе не сустракаў я,
Такога летуценнага святла!
Дзяўчыначка, пралесачка лясная,
О як жа ты чароўна расцвіла!

Тваім пралескавым паглядам
Жыву наяве я і ў сне,
Як неспазнаным зорным садам,
Што вабіць-кліча ўдаль мяне.

За даляглядам таямнічым,
Куды нясуць мяне вятры,
Не раз прыпомню настальгічна
Святло пралескавай зары.

Красы такой нідзе не сустракаў я,
Такога летуценнага святла!
Дзяўчыначка, пралесачка лясная,
О як жа ты чароўна расцвіла!

*красавік 1996 г.*

## ПАД СУЗОР'ЕМ КАХАННЯ

Пойдзем, любая, пойдзем
У дзівосныя далі,
Дзе заранкамі ззяе нам заўтрашні дзень, –
Узнясуць нас у неба
Нарачанскія хвалі,
Белавежская пушча ў вякі завядзе.

Пойдзем, любая, пойдзем
Каля вечнага веча
Жураўліна-самотных сівых курганоў.
Пойдзем, любая, пойдзем
Каля замкаў спрадвечных
І акрылімся духам славутых дзядоў.

Пойдзем, любая, пойдзем
Нашым будучым садам,
Што пасадзім з табою на вольнай зямлі,
Пойдзем, любая, пойдзем
За мяжу далягляда
І насеннем адборным засеем палі.

Пойдзем, любая, пойдзем
Полем яснага рання,
Што дарогу асвеціць нябеснай красой, –
Пойдзем, любая, пойдзем
Пад сузор'ем Кахання
Да сваёй запаветнай Заранкі святой!

*лістапад 1996 г.*

# НОЧКА ЗОРНАЯ КУПАЛА...

Ночка зорная купала
Нашы мары да зары,
Калыхала,
Налічыла нам зязюлька
Ў мройна-казачным бары
Год нямала.

Адплылі, адвіравалі
Маладыя нашы дні
Плыняй быстрай,
Адпалалі, адшугалі
Смех і жарты, як агні, –
Гаснуць іскры.

Адвадзілі, адкружылі
Карагоды мы з табой –
Рэха льецца...
Заўтра нашаму юнацтву
Памахаем мы рукой –
Тужыць сэрца.

Нібы вырай, чарадою
На развілцы трох дарог –
Думкі-мроі:
Па якой ісці дарозе,
На які ступіць парог
Нам з табою?

*лістапад 1991 г.*

## ЧАРОЎНЫ ЎСПАМІН

Чароўны ўспамін маладосці
У казку вяртае мяне –
Над рэчкай калінавы мосцік
І сінь-васількі ў збажыне.

Гараць васількі-незабудкі,
Палаюць нябесным святлом,
Твае лебядзіныя рукі
Мяне атуляюць цяплом.

Як пахне прывабна-спакусна
Лён белы тваіх валасоў!
Гарачыя, палкія вусны
Нам вецер халодзіць расой.

Рачныя пявучыя хвалі
Лагодзяць пяшчотаю слых,
Суладна мы ім падпяваем –
Заслухаўся вецер, заціх...

Чароўны ўспамін маладосці
У казку вяртае мяне –
Над рэчкай калінавы мосцік
І сінь-васількі ў збажыне.

*ліпень 1991 г.*

## ЛІСТЫ КАХАНАЙ

Лісты твае, душою пеpажытыя,
За годам год чытаю-пеpачытваю:
Вясну я ўспамінаю нашу першую,
Напоўненую песнямі ды вершамі.

Пару-красу я згадваю узнёслую,
Цябе, маю дзяўчынку русакосую,
Цябе, маю бярозку стройна-белую,
Вясёлую, гарэзную, нясмелую.

Іду-імкну сцяжынкамі юнацкімі,
Жыву тваімі сонечнымі ласкамі,
Плыву бяздонна-яснымі азерцамі –
На сінь вачэй тваіх мне не нагледзецца.

Лісты твае, наіўныя і шчырыя,
У сны, як лебедзі, імкнуцца з выраю.
Дзе ж ты, лябёдачка мая чароўная?
Пішы мне, мілая, лісточкі новыя!

*сакавік 1991 г.*

## ЗАСПЯВАЙ, КУПАЛІНКА, МНЕ ПЕСНЮ

Разлілося морам неспадзейным
Гарадское яркае святло.
Я плыву пад ветразем надзеі,
Узнімаю мройнае вясло.

Мроіцца мне вогнішча на ўзлессі,
Карагоду дзіўны перазвон:
Заспявай, купалінка, мне песню,
Песню незабыўна-мілых дзён!

Прыгадай азёрны мілы востраў,
Дзе дарыў табе я кветкі сноў –
І завёў у рай рыбацкіх плёсаў,
У прыгоды-казкі рыбакоў.

Незямной, загадкавай усмешкай,
Залаціста-белаю касой
Асвяці мне згубленую сцежку
Там, дзе мы спаткаліся з табой...

Мроіцца мне вогнішча на ўзлессі,
Карагоду дзіўны перазвон:
Заспявай, купалінка, мне песню,
Песню незабыўна-мілых дзён!

*верасень 2000 г.*

# БЕЛАЯ ЧАРОМХА

Белая чаромха зацвітала
З песняй салаўінай над ракой –
Сон-паэму сэрца пачынала
Пра спатканне першае з табой.

На дваіх было нам сорак вёснаў –
Сорак птушак з вырайных краёў,
Што спявалі радасна-узнёсла
Пра любоў да родных берагоў.

Мы з табою мроілі-ляцелі,
Быў нам сад нябесным караблём,
Белая чаромха зіхацела
Таямнічым, казачным святлом.

Сорак вёснаў, сорак зор світальных,
Нам кружылі голаў вышынёй –
Белая чаромха зацвітала
З песняй салаўінай над ракой.

*люты 2002 г.*

# ТАНЕЦ РАССТАННЯ

Адлятае сумны вырай, адлятае,
Пакідае сад асенні ў горкім сне.
Зашчымела сэрца музыкай расстайнай –
І на танец запрашаеш ты мяне.

З намі кружыцца і лісце залатое,
Што вятрыска так бязжаласна сарваў...
Ой, чаму, чаму, салоўка, нам з табою
Звіць гняздзечка ў родным садзе лёс не даў?!

Неба крыламі чародка абдымае,
Узрушае жураўлінаю трубой...
Ой, чаму цябе я, любы, не пускаю,
Хоць і ведаю: не быць мне ўжо з табой?!

Птахі вернуцца вясною на Радзіму,
Зачаруе іх садовая краса.
Толькі ты, мой салавейка, ты адзіны,
Аніколі ўжо не вернешся ў мой сад...

З намі кружыцца і лісце залатое,
Што вятрыска так бязжаласна сарваў.
Ой, чаму, чаму, салоўка, нам з табою
Звіць гняздзечка ў родным садзе лёс не даў?

*травень 2002 г.*

## МАЯ ПЛАНІДА

Лістоту восені халоднай
Змятае вецер у лаўжы,
Нясу я ў свет тугу-самоту,
Няма, здаецца, ёй мяжы.

Такая ўжо мая планіда,
Наканаванасць –
Іду крутою пуцявінай,
Шукаю радасць.

Хачу даклікацца да шчасця
Самотна-звонкаю струной,
Хачу угнацца я за часам
На крылах мроі веснавой.

Не вей, не вей, вятрыска золкі,
Маёй тугі не памнажай,
Прыдзі, прыдзі, мой дзень высокі,
Заззяй, заззяй, мой небакрай!

Такая ўжо мая планіда,
Наканаванасць –
Іду крутою пуцявінай,
Шукаю радасць.

*чэрвень 1995 г.*

# ЗЯЗЮЛЯ

*Т.З.*

Праз лясы-гушчары, праз віхуры вятры
Даляцеў да цябе покліч сэрца майго.
Адгукнулася ты, як зязюля ў бары,
Голас любы лаўлю з веснавых берагоў.

Абдымаю Сусвет родных сонечных слоў,
Каб наслухацца іх не хапіла б жыцця.
Ой, Зязюлька мая, накувай мне гадоў:
Жыць хачу я ізноў, уваскрос з небыцця!

Прамяністых вачэй летуценны пагляд
Уварваўся ў душу і навек паланіў.
Як ніколі, расцвіў мой няўходжаны сад.
Ой, Зязюлька мая, мо цябе я прысніў?!

Светларусай касой ты мой лёс абвіла,
На нябёсы ўзняла сны-лятункі мае,
Каб я памятаў век у зіхценні святла
Дзіўна-казачны бор, дзе Зязюля пяе.

*травень 1986 г.*

# КАБ ТЫ ЗНАЛА, КАБ ТЫ ВЕДАЛА

Каб ты знала, каб ты ведала,
Як хачу я зноў маліцца
На цябе, Зязюлька ветлая,
Шчырай ліры чараўніца.

Слоў тваіх чароўных музыка
Пра віры дзявочай долі
Над зямлёй прыціхлай кружыцца,
Не спыніцца ёй ніколі.

Каб ты знала, каб ты ведала,
Як хачу я зноў прачнуцца –
Песняй самай запаветнаю
У вясну тваю вярнуцца.

Мы з табой навек разлучаны
Вечнай еднасцю душэўнай,
Без журбы тваёй зязюльчынай
Зажурыўся лёс мой спеўны...

Каб ты знала, каб ты ведала,
Як хачу я зноў маліцца
На цябе, Зязюлька ветлая,
Шчырай ліры чараўніца.

*чэрвень 1990 г.*

# СВІТАЛІНКА

Васільковым вянком увянчаная,
З таямнічай усмашкай купалінкі,
Міла свецішся ласкай і чарамі –
Называю цябе я світалінкай.

Вышываная зорамі яснымі,
На табе беласнежная блузачка.
Я спаткаўся з табой, нібы з казкаю,
Чараўніца мая, беларусачка!

Навучылася ты – не развучышся
Хлеб пячы для застолля сяброўскага,
Не забылася ты – не забудзешся
Мовы матчынай, лёсу нялёгкага.

Дзе палі і дубровы Бярэзіна
Павязала блакітнаю стужачкай,
Там мой ранак, табою развеснены,
Песня сэрца майго, беларусачка!

*ліпень 1982 г.*

# РАЗЛІЛАСЯ ШЫРОКА БЯРЭЗІНА

Разлілася шырока Бярэзіна,
Звоніць срэбранай хвалі струной.
Ты смяешся вясёла, гарэзліва,
Як тады, нашай першай вясной.

Так і хочацца вымавіць: родная,
Прыгажэйшай ты стала яшчэ,
Нібы гэта рака паўнаводная –
Адарваць немагчыма вачэй.

Як тады, чарада жураўліная
Не пазнала рачных берагоў.
Як і жыў бы, не ведаю, мілая,
Без гарачага сэрца твайго.

Ты каханнем мяне уваскрэсіла,
Дзеліш веснюю радасць са мной.
Разлілася шырока Бярэзіна,
Як тады, нашай першай вясной.

*красавік 1981 г.*

## ЖУРАЎЛІНЫ АДЧАЙ

Жураўліны адчай над зямлёй –
Плача восень.
Як хацеў я стаць песняй тваёй! –
Не збылося.

Ні каханы ў цябе я, ні госць,
А святкую,
Бо шаную тваю маладосць
Трапяткую.

Даль звініць жураўлінай трубой,
Не сціхае:
Расстаюся навекі з табой,
Бо кахаю.

Пакідаю вачэй светлыню –
Зараніцу,
Неспакойнай душы глыбіню –
Таямніцу.

Закувае зязюля вясной –
Адгукнецца
Цяжкім стогнам не бор нада мной –
Маё сэрца...

Жураўліны адчай над зямлёй –
Плача восень.
Як хацеў я стаць песняй тваёй! –
Не збылося.

*верасень 1989 г.*

## НЕ ПЛАЧ, КАХАНАЯ

Не плач, каханая, не плач,
Не пазірай так сумна ў вокны,
Мінуцца дні трывог-няўдач
І зноў мы пойдзем шляхам зорным.

Не плач, каханая, не плач,
Мінуцца дні трывог-няўдач,
І наша зорка Мілавіца
Над намі радасна зайскрыцца!

Усё мінаецца ў жыцці,
Міне і гэта восень злая,
Пусці вясну ў душу, пусці,
Няхай душа не замярзае.

Усё мінаецца, плыве,
Міне і горкая трывога,
У сэрцы ўцеха ажыве,
Пакліча ў светлую дарогу...

Не плач, каханая, не плач,
Мінуцца дні трывог-няўдач,
І наша зорка Мілавіца
Над намі радасна зайскрыцца!

*чэрвень 1995 г.*

# ТЫ КАХАЛА МЯНЕ

Ты кахала мяне, пачуцця не хавала –
Вылівала душу ў галасісты напеў,
Песня мройна плыла, над зямлёй віравала,
У нябесную высь я за ёю ляцеў.

Цуда-песняй мяне ты здалёк чаравала,
Васільком пазірала з густой збажыны,
І купальскі вянок рэчкай быстрай пускала,
Давярала вадзе запаветныя сны...

Я па-сёння ляту ў найдзіўнейшае дзіва –
Стала доляй маёй тая песня твая:
З ёю ў сэрцы нашу вобраз мілы Радзімы,
З ёю светла тужу ў неспазнаных краях...

Ты кахала мяне, пачуцця не хавала –
Вылівала душу ў галасісты напеў,
Песня мройна плыла, над зямлёй віравала,
У нябесную высь я за ёю ляцеў.

*ліпень 1993 г.*

# ІМЧЫЦЬ ВЯСЕЛЛЕ

Імчыць вяселле, ляціць нястомна,
А я махаю рукою ўслед,
Пад распісною дугою бомы
Чаруюць звонам увесь Сусвет.

Э-гэй, вы, коні вараныя,
Званіце ў бомы весялей, э-гэй!
Разносьце гукі незямныя,
Будзіце радасць у людзей, э-гэй!

Імчыць вяселле, ляціць узнёсла –
Шырэй раздайся, зямны прастор!
Сваты і дружкі пяюць дзівосна,
Нясуць іх коні ў зіхценні зор.

Імчыць вяселле, ляціць адчайна
Крутой дарогай у зарапад –
Здаецца, сам я імкну з каханай
На дзіва-конях у райскі сад...

Э-гэй, вы, коні вараныя,
Званіце ў бомы весялей, э-гэй!
Разносьце гукі незямныя,
Будзіце радасць у людзей, э-гэй!

*лістапад 1994 г.*

## ЗОРЫ ЮНАЦТВА

На небакраі зорным світанкам
Хто нам міргае?
А ці не наша гэта заранка,
Што мы шукаем?

Не наглядзецца ў сінія далі,
Не наспявацца:
Човен люляе весняю хваляй
Зоры юнацтва.

Зоры юнацтва, зоры юнацтва,
Любыя вочы Радзімы,
З вамі ніколі нам не расстацца,
Дзе б ні былі мы!

Не накружыцца, не нажурыцца
Ў небе кахання,
Нам блаславенне шлюць зараніцы
На развітанне.

Бліскаюць знічкі, як бліскавічкі, –
Не наздзіўляцца!
Будуць нам сніцца, ў сэрцы іскрыцца
Зоры юнацтва...

Зоры юнацтва, зоры юнацтва,
Любыя вочы Радзімы,
З вамі ніколі нам не расстацца,
Дзе б ні былі мы!

*чэрвень 1997 г.*

# ЯЗМІНАВЫ САД

*Алесі Таранцовай*

Дзівоснае лета гарыць белацветам
І пахне язмінам пад нашым акном.
З дарогі мяне ты сустрэла прыветна,
І свецішся родным, ласкавым святлом.

Алеся, Алеся, анёл мой нябесны,
Ты мне захавала язмінавы сад.
Алеся, Алеся, ты – летняя песня,
Найсамая дзіўная ў свеце краса!

Дні юныя ўспомні, як весела-звонка
Было нам у садзе над быстрай ракой:
Купаліся ў хвалях купальскія зоркі,
У чоўне крылатым плылі мы з табой.

Я буду з табою ўсе будні і святы,
Надзейныя зоркі вартуюць наш сад,
Звініць, як званочак, сыночак віхрасты,
Мяне ўжо не звабіць чужы далягляд...

Алеся, Алеся, анёл мой нябесны,
Ты мне захавала язмінавы сад.
Алеся, Алеся, ты – летняя песня,
Найсамая дзіўная ў свеце краса!

*жнівень 1995 г.*

# ПОМНЮ

Помню, помню, помню – сіні плёс
Лёгкіх вёсел ласкавыя ўсплёскі.
Промні, промні, промні – да нябёс! –
Белых кос і воч тваіх анёльскіх.

Помню, помню, помню – звон цішы,
Хмельна пахнуць кветкі палявыя.
Поле, поле, поле – без мяжы!
Мы бяжым у мроі залатыя.

Помню, помню, помню – не забыць! –
Льецца ў сэрца зорная залева:
Поўна, поўна, поўна заранiц
І тваіх рамансавых напеваў!

Годзе, годзе зводзіцца журбой,
Годзе сумаваць па маладосці,
Пойдзем, пойдзем, любая, з табой,
Пойдзем да свайго юнацтва ў госці!

*красавік 1994 г.*

## ВЕШЧЫЯ СНЫ

Сняцца і сняцца мне зорныя ночы,
Сняцца каханыя сінія вочы,
Толькі не хочуць збывацца чагосьці
Сны веснавыя маёй маладосці.

Вешчыя, вешчыя, вешчыя сны,
Дзе, залатыя, начуеце?–
Нешта вы, нешта вы вечнай вясны
Сэрцу майму не вяшчуеце!

Можа, вы там, за лясамі густымі,
Можа, вы там, за гарамі крутымі,
Можа, вы там, дзе бяскрайняе мора,
Можа, вы там, дзе нязгасныя зоры?

Можа, вы там, дзе даў Бог нарадзіцца,
Там, дзе чаруюць азёры-крыніцы,
Там, дзе гайдаўся мой човен рыбацкі,
Там, дзе так лёгка было закахацца?..

Вешчыя, вешчыя, вешчыя сны,
Дзе, залатыя, начуеце?–
Нешта вы, нешта вы вечнай вясны
Сэрцу майму не вяшчуеце!

*красавік 1994 г.*

# ЛЕБЕДЗЬ БЕЛЫ

*А.Ц.*

Як на цуда, як на дзіва,
Я гляджу – не наглядзецца:
Кружыць танец лебядзіны –
Лебедзь белы ўвысь імкнецца.

Ой, дзяўчына, лебедзь белы,
Твой палёт чароўна-смелы,
Ты вазьмі мяне ў нябёсы –
Падары мне свет дзівосны!

За палётам чарадзейным
Пільна сочыць маё сэрца:
Кружыць танец летуценна –
Лебедзь белы ўвысь імкнецца.

Незвычайнаю вясёлкай
Над зямлёй святло ліецца:
Кружыць танец вольна, лёгка –
Лебедзь белы ўвысь імкнецца.

Ой, дзяўчына, лебедзь белы,
Твой палёт чароўна-смелы,
Ты вазьмі мяне ў нябёсы –
Падары мне свет дзівосны!

*жнівень 1985 г.*

# СВЕТЛЫЯ ЗГАДКІ

Не забыць мне ніколі
Маладога прыволля –
Бераг той карагодны,
Дзе гулялі з табой,
Дзе спявалі вяснянкі
Да світальнай заранкі
І кружылі, як чайкі,
Над азёрнай вадой.

Буду помніць заўсёды
Час вясёлых прыгодаў,
Як на востраў дзівосны
Мы з табою плылі,
Як ляцелі на вёслах,
Бы на крылах узнёслых, –
Нам дарылі Нябёсы
Райскі міг на зямлі.

Будзе вечна мне сніцца
Твой пагляд таямнічы,
Дзень і ноч прамяніцца
Васільковай зарой.
У святле непагасным
Цуда-кветкі купальскай
Не забудзецца казка
Той пары залатой.

*лістапад 1996 г.*

# ЭДЭЛЬВЕЙС

Колькі я не спазнаў кветак светла-прасветлых,
Толькі ты мне адна дорыш казку вясны.
Толькі ты, Эдэльвейс, белазорая кветка,
Цуда-пах веснавы мне прыносіш у сны.

Эдэльвейс, эдэльвейс – кветка Боскага раю,
Эдэльвейс, эдэльвейс – зорка велічных гор,
Эдэльвейс, эдэльвейс, я цябе адшукаю
Недзе там, недзе там, між палаючых зор!

Нада мною гара – шлях да нашай сустрэчы,
Недзе там, недзе там палымнее твой дзень,
Недзе там, недзе там Дух бясконцы і вечны
Нараджае і мой дзень высокіх надзей.

Падымаюся ўвысь – лёд і скалы без краю,
Слепяць вочы снягі, з ноч збіваюць вятры,
Толькі вера адна, што цябе я спаткаю,
Сілы-моцы дае не сарвацца з гары...

Эдэльвейс, эдэльвейс – кветка Боскага раю,
Эдэльвейс, эдэльвейс – зорка велічных гор,
Эдэльвейс, эдэльвейс, я цябе адшукаю
Недзе там, недзе там, між палаючых зор!

*студзень 1998 г.*

## НЕ ТРЫВОЖСЯ, МІЛАЯ

Не трывожся, мілая,
Што табе прыснілася
Бура-навальніца:
Ліўся дождж, як з возера,
Бліскалі пагрозліва
Стрэлы-бліскавіцы.

Не трывожся, слаўная,
Навальніцы радуйся:
Сніцца дождж – на шчасце.
Заліе нядобрае,
Злое ўсё, разбойнае,
Нам не дасць прапасці.

Адгрыміць, адгрозіцца,
Сонца зноў ускоціцца,
Выйдзем мы на росы.
Пойдзем, закаханыя,
На лугі світальныя,
На рачныя плёсы.

Будзем плысці, вольныя,
Рэчкай паўнаводнаю,
Піць з жывой крыніцы...
Не трывожся, мілая,
Што табе прыснілася
Бура-навальніца.

*ліпень 1992 г.*

## ВЕРАНІКА

Калі я пачую дзівосную песню,
Як “Зорка Венера ўзышла над зямлёю...”,
Пагляд пасылаю ў прастор паднябесны,
І трызню табою.

З табой, Вераніка, як з зоркай Венерай,
І ў думках самотных мне светла-узнёсла.
Я веру ў цябе, Вераніка, я веру,
Як веру ў Нябёсы.

Я веру ў цябе, Вераніка, я веру –
Ты вернешся, вернешся весняй парою,
Узыйдзеш, як некалі, зоркай Венерай
Над верай маёю...

Калі я пачую дзівосную песню,
Як “Зорка Венера ўзышла над зямлёю...”,
Пагляд пасылаю ў прастор паднябесны,
І трызню табою.

*сакавік 1996 г.*

## БЕЛЫ ВЕТРАЗЬ

Куды, ў якія далячыні
Мяне занесла, Божа светлы! –
На даляглядзе сінім-сінім
Лунае белы-белы ветразь.

Стаю на беразе скалістым,
Вада віруе нада мною,
Душа імкне ў прастор імглісты,
І я махаю ўдаль рукою:

– За марскі круты прыбой,
У нязведанае дзіва,
Ты вазьмі мяне з сабой,
Белы ветразь мой імклівы!

Хачу на свой прыснёны востраў,
У княжы сад вечназялёны –
Там я знайду былыя вёсны,
Там я спаткаюся з князёўнай.

Яе ты ведаеш, напэўна,
Яе не ведаць немагчыма –
З дзівосным голасам напеўным,
Вясёла-шчырымі вачыма...

За марскі круты прыбой,
У нязведанае дзіва,
Ты вазьмі мяне з сабой,
Белы ветразь мой імклівы!

*снежань 1996 г.*

# ШТО БУДЗЕ ПОТЫМ?

Бяжым з табою, ляцім, як птушкі,
Сцяжынкай вузкай на луг зіхотны,
Спаўе нас рэчка блакітнай стужкай...
Што будзе потым? Што будзе потым?

Сыйдуцца вочы ў паглядзе светлым,
Сплятуцца рукі ў цяпле пяшчотным,
Мурожны водар закружыць хмелем...
Што будзе потым? Што будзе потым?

Гарачай хваляй зліюцца вусны –
Піць, не напіцца нам асалоды,
Узыйдзе месяц пярсцёнкам шлюбным...
Што будзе потым? Што будзе потым?

Акропіць ранак расой халоднай,
Сляды пакінем за паваротам,
Агорне ростань журбой-самотай...
Што будзе потым? Што будзе потым?

*травень 1993 г.*

## МАЯ КРАСУНЯ ГАРАДСКАЯ

Мая красуня гарадская,
Цябе я ў казку запрашаю –
У мілы край маіх бацькоў.
Здалёк агеньчык нам пасвеціць,
Хаціна родная прывеціць,
Прытуліць матчына любоў.

Мая красуня гарадская,
Цябе я ў казку запрашаю!

Там завяду цябе ў дзівосы:
У зіхаценне белых росаў,
У хмельны пах купальскіх траў –
Вяселле зладзім на прыродзе,
Каля агнішча ў карагодзе,
У звоне песень і забаў.

Мая красуня гарадская,
Цябе я ў казку запрашаю!

Там знойдзем тое мы з табою,
Што сніцца летам і зімою,
І горад нам не можа даць:
Па ціхіх рэчках і азёрах
У свет кахання ясназоры
Мы будзем вечна веславаць.

Мая красуня гарадская,
Цябе я ў казку запрашаю!

*чэрвень 1994 г.*

## БУДУЕМ ДОМ

*Валянціне і Мікалаю Даўгалёвым*

Будуем дом, вянок з вянком злучаем,
І садзім сад – наўкола спеў і звон.
У дзень святы нас доля павянчала
І блаславіла ў шлях руплівых дзён.

Будуем дом, будуем дом,
Вянок з вянком злучаем, –
Віем гняздо, віем гняздо
І песняй асвячаем!

Будуем дом, і ўжо гарыць вясёлкай,
Як шчасця знак, падкова на сцяне,
А на куце ікона Маці Боскай
Глядзіць на нас, бы сонейка ў акне.

Будуем дом утульны і бяспечны –
Звіюць над ім буслянку бацяны,
А дамавік паселіцца ў запеччы,
Аберажэ нам залатыя сны.

Будуем дом, будуем дом,
Вянок з вянком злучаем, –
Віем гняздо, віем гняздо
І песняй асвячаем!

*кастрычнік 1993 г.*

# СЛЁЗЫ РАССТАННЯ

Кліча ўдаль дарога-пуцявіна,
Кліча ўдаль нязнаная зямля.
Да сустрэчы, любая дзяўчына,
Шчырая, харошая мая!

Не заслоніць мне чужое неба
Сонца мілых родных берагоў.
Не хавай, саромецца не трэба
Горкіх слёз – у іх гарыць любоў.

Не хавай – у іх святло надзеі,
Не хавай – у іх святло зары, –
Нас яно з табою абагрэе
У палоне сумнае пары...

Кліча ўдаль дарога-пуцявіна,
Кліча ўдаль нязнаная зямля.
Да сустрэчы, любая дзяўчына,
Шчырая, харошая мая!

*верасень 2000 г.*

## ЛІСТАПАД

Над ракою ў халоднае ранне
Растрывожаны восеньскі сад:
Лісце падае з Дрэва Кахання –
Лістапад, лістапад, лістапад.

Ты пайшоў, азірнуўся ў тумане,
Ды няма ўжо дарогі назад.
Не змаглі абыйсці мы расстання –
Не абыйдзем густы лістапад.

Журавы пракрычалі над намі
І лятуць за сівы далягляд,
А я цёмнымі буду начамі
Сніць і мроіць твой сумны пагляд.

Хто сагрэе душу, хто аблашчыць? –
З-за гары пазірае зіма.
Не хачу я цябе вінаваціць,
Вінавата я ў гэтым сама...

Над ракою ў халоднае ранне
Растрывожаны восеньскі сад:
Лісце падае з Дрэва Кахання –
Лістапад, лістапад, лістапад.

*кастрычнік 1992 г.*

# ЗОРКА ШЧАСЛІВАЯ

Даль невядомая казкі прадзе,
Вабіць таемным паглядам.
Што прынясе нам развеснены дзень
За даляглядам?

Свецяць паходні ў начной цішыні,
Некаму шлях асвятляюць.
Недзе і нашы з табою агні
Ясна заззяюць.

Што там іскрыцца, галубка мая,
Што гэта, што гэта, мілая?
А ці не наша нам свеціць здаля
Зорка шчаслівая?

Хтосьці вясну сустракае у снах,
Хтосьці ў блуканнях па свеце.
Недзе і нам усміхнецца вясна,
Шлях нам расквеціць.

Думкі за думкамі вольна лятуць,
Мроі ў няспынным кружэнні:
Недзе і нашы сады зацвітуць
Шчодрым цвіценнем.

Што там іскрыцца, галубка мая,
Што гэта, што гэта, мілая?
А ці не наша нам свеціць здаля
Зорка шчаслівая?

*жнівень 1991 г.*

## МАРА

Там недзе ўзнёслы вольны дух
Штурмуе мора бурнае,
А я іду, іду, іду
Дарогай непрытульнаю.

За паваротам – паварот,
За марай – мара смелая:
Мяне ў бясстрашны свой палёт
Вазьміце, чайкі белыя!

Там недзе даль шуміць-звініць,
Кіпіць прыбоем, пеніцца,
Пад яркім водбліескам зарніц
Душа свабодай цешыцца.

Там недзе журыцца па мне
Мая князёўна мілая,
На зорным ветразе імкне
У сны мае няспынныя...

За паваротам – паварот,
За марай – мара смелая:
Мяне ў бясстрашны свой палёт
Вазьміце, чайкі белыя!

*студзень 1996 г.*

## ЯДВІСЕНЬКА

*Ядвісі Кваткоўскай*

Ядвісенька, Ядвісенька, абранніца мая,
Дзе б я ні быў, куды б мяне дарога не занесла,
Жыву табой – маёй журбой
І радасцю нябеснай –
Твая краса – як весні сад, як песня салаўя.

Ядвісенька, Ядвісенька, абранніца мая,
Твая краса – як весні сад, як песня салаўя!

Я не кажу, я не кажу: ты ранняя зара,
Я не кажу, я не кажу: ты мой світанак росны –
Ты проста сон, ты проста сон
Мой самы найдзівосны,
Што даравала мне вясна – юнацкая пара.

Ядвісенька, Ядвісенька, абранніца мая,
Твая краса – як весні сад, як песня салаўя!

Я не кажу, я не кажу: ты сонейка ў акне,
Я не кажу, я не кажу: ты белая лілея –
Ты проста плынь, ты проста плынь,
Рака маёй надзеі,
Што будзем верныя мы век сваёй красе-вясне.

Ядвісенька, Ядвісенька, абранніца мая,
Твая краса – як весні сад, як песня салаўя!

*верасень 1995 г.*

# САКАВІК

Сакавік, сакавік – мройных песень выток,
Забруіся ты хмельнымі сокамі.
Эх, вазьму я, вазьму чарадзейны смычок –
Узнімуся пад неба высокае.

Зазвініць-запяе залатая струна –
І заціхнуць вятры несупынныя...
Я гукаю цябе, прыгажуня Вясна,
Прыляці, прыляці, незабыўная!

Залатою струной, закаханай душой
Супакоім завеі-мяцеліцы.
Ад пяшчоты тваёй, ад любові маёй
Акрыяе зямля і расквеціцца.

Сакавік, сакавік – ты мой сон веснавы,
Пад заранкай тваёй нарадзіўся я.
Дакрануся смычком да чароўнай струны –
І пальецца мелодыя дзіўная.

Зазвініць-запяе залатая струна –
І заціхнуць вятры несупынныя...
Я гукаю цябе, прыгажуня Вясна,
Прыляці, прыляці, незабыўная!

*люты 1992 г.*

## АНЁЛ МОЙ

Куды ні пайду я, куды ні паеду –
Усюды крутыя шляхі –
Самота знаходзіць мяне і за светам
І кідае ў мора тугі.

Пад ветразем белым надзеі і веры
Шукаю тваіх берагоў,
Гукаю цябе я з высокага Неба,
Анёла майго!

Анёл мой жаданы – маё ратаванне,
Апошняй надзеяй жыву –
Ад ночы да ночы, ад рання да рання
Плыву да цябе я, плыву.

Анёл мой жаданы – маё ратаванне,
Малюся табе, як Хрысту,
Спусціся з Нябёсаў на крылах кахання,
Ратуй ад самоты, ратуй!

Пад ветразем белым надзеі і веры
Шукаю тваіх берагоў,
Гукаю цябе я з высокага Неба,
Анёла майго!

*травень 1996 г.*

## НЕ ІГРАЙ ТАК СУМНА

Не іграй, мой любы, на самотных струнах,
Не іграй так сумна, не іграй, прашу.
У купальску ночку на сынка-сыночка
Я паваражу.

Упрашу я бусла – мець сыночка будзем,
Вырасце ён дужы, з добраю душой,
Пойдзе кветку шчасця з любаю шукаці,
Як і мы з табой.

Любы мой, каханы, не бядуй зарання,
Не іграй так сумна, не іграй! –
Спраўдзім мы з табою сны і казкі-мроі,
Не перажывай!

Зоркі мне вяшчуюць і я сэрцам чую:
Мы ў жыцці пакінем свой адметны след.
Толькі грай, мой мілы, каб мацнелі крылы,
Быў дзіўнейшы свет.

Грай, як весні ранак, светла-закахана,
Каб не ўпала горкай ні адной слязы,
Што не даіграеш, мой музыка слаўны,
Даіграе сын...

Любы мой, каханы, не бядуй зарання,
Не іграй так сумна, не іграй! –
Спраўдзім мы з табою сны і казкі-мроі,
Не перажывай!

*верасень 1998 г.*

# КУПАЛЯЛЁ

*Галіне Бальчэўскай*

Добры вечар, мілая суседка,
Ясных воч таемнае святло,
Азары мой дом купальскай кветкай –
Заспявай ты мне “Купалялё”

Першы вечар нашага спаткання
Прыгадай мне голасам душы –
Пракаціся водгуллем Купалля,
Памяць юных дзён узварушы:

Над вадой русалкі-купалінкі,
З рук вянкі – бясконцай чарадой,
З іх адна – як тонкая вярбінка,
Да цябе падобная красой...

Добры вечар, мілая суседка,
Ясных воч таемнае святло,
Азары мой дом купальскай кветкай –
Заспявай ты мне “Купалялё”.

*жнівень 1987 г.*

## ТЫ БЫЛА КАЛІСЬЦІ...

Ты была калісьці мне далёкім светам –
Вабіла таемнай, гордаю красой.
Ты была калісьці мне высокім небам –
Акрыляла мары зорнай вышынёй.

Ой, чаму, чаму так позна
Зразумеў цябе я сэрцам:
Для мяне ты красавала,
Ружа-кветкаю цвіла,

Для мяне звінела песняй
Самай вабнаю на свеце,
Ты Нябёсамі святымі
Даравана мне была!

Ты была калісьці мне крыніцай чыстай –
Асвяжала сілы ў неспакойны дзень,
Ты была калісьці мне ракой вірыстай,
Калыхала човен маладых надзей.

Ты была калісьці мне зарой світальнай –
Рассыпала промні ласкі незямной.
Ты была калісьці мне нябеснай тайнай –
Разгадаць імкнуўся я цябе душой.

Ой, чаму, чаму так позна
Зразумеў цябе я сэрцам:
Для мяне ты красавала,
Ружа-кветкаю цвіла,

Для мяне звінела песняй
Самай вабнаю на свеце,
Ты Нябёсамі святымі
Даравана мне была!

*сакавік 1993 г.*

## ІМКЛІВАЯ ЛЫЖНЯ

Іскрысты снег, лясная цішыня,
Бяроз бялюткія ствалы...
Як два крылы – імклівая лыжня,
І я, і ты – як два крылы.

Ну як жа мне не ахнуць ад красы,
Што прада мной імчыць з гары:
З-пад шапачкі пуховай дзве касы,
Як дзве світальныя зары.

Ляцім з табой з вяршыні ледзяной,
Ты падаеш, а я – услед:
У мяккі снег, у смех вясёлы твой,
У непаўторна-дзіўны свет.

*люты 1992 г.*

## САДЗІЛІ САД

Была са мной – быў дом з нялёгкім шчасцем,
А ты пайшла – і ўсё пайшло з табой:
І светлы дом, і саду зелень-засень,
І маладых раскрылены настрой.

Садзілі сад мы для дачкі і сына,
Садзілі сад, каб дзень свяціў ярчэй,
Чакалі: сын народзіцца – асілак,
Дачка-краса – ад вішні прыгажэй.

Ішлі гады, дарылі вёсны квецень,
А жніўні – звон і золата пладоў.
Хадзіла ты ў адведкі да суседзяў,
Казала мне: – Збудуй буслам гняздо!

Дзе бусел наш, дзе мог ён затрымацца? –
Не ўсцешыў нас ні сынам, ні дачкой...
Была са мной – быў дом з нялёгкім шчасцем,
А ты пайшла – і ўсё пайшло з табой.

*верасень 1984 г.*

## ЧАМУ ?

Чаму, чаму, скажы, асыпаліся краскі,
Кахання шчодры луг заўчасна адбуяў?
Няўжо, няўжо пайшлі ў нябыт юнацтва казкі:
Пявучы карагод і звонкі смех забаў?

Чаму, чаму, скажы, рака рачулкай стала,
Якой плылі мы ў свет чароўных сноў і мар?
Няўжо, няўжо яна навек адвіравала,
І месца мне ў душы тваёй ужо няма?

Чаму, чаму, скажы, у нашым садзе вішні
Вясной не зацвілі, забыліся пра нас?
Няўжо, няўжо зіма – твайму я сэрцу лішні,
Ласкавы ў ім агонь, што грэў мяне, пагас?

Каханая, пастой, нічога не кажы мне,
Ад палыновых слоў наш сад не зацвіце,
Ідзі ў жыццё сваёй абранаю сцяжынай,
Хай вечна над табой світае ясны дзень!

*верасень 1997 г.*

## ВАСІЛІНА

Ты мяне ў вясну вярнула, нібы ў плынь рачную,
Радасна-узнёслай хваляй абняла:
Мы плывем з табою мройна ўдалеч незямную –
Недзе там крыніца вечнага святла.

Васіліна, кветка-мара, прыгажуня-чараўніца,
На твае дзівосы-чары не магу я надзівіцца!

Ты мяне ў красу вярнула сноў маіх юнацкіх:
Мы ляцім-ляцім з табой за небакрай:
Недзе там, пад зарападам, сад квітнее райскі
І анёлы славяць песняй Божы рай.

Васіліна, кветка-мара, прыгажуня-чараўніца,
На твае дзівосы-чары не магу я надзівіцца!

Ты мяне ў зару вярнула, у гарэнне страсці,
У агні пяшчотным цела і душа:
Мы ўзнімаемся з табою да сузор'я Шчасця,
П'ем віно кахання з зорнага Каўша.

Васіліна, кветка-мара, прыгажуня-чараўніца,
На твае дзівосы-чары не магу я надзівіцца!

*сакавік 1994 г.*

# КАЛІНАВЫ МАСТОК

Што ў белым вэлюме нявеста,
Цвіла каліна над ракой.
А ты шаптаў мне міла нешта
І зваў каханаю сваёй.

Прыпомні тыя чары-словы,
Што на масточку мне казаў
І паўтараў, нібы замову,
Так мілагучна, як спяваў.

Штодня ад рання да змяркання,
Мой любы, слаўны жаўручок,
Спявай мне песню пра каханне
І наш калінавы масток!

Пачні, мой родны, ўсё спачатку,
Я буду слухаць зноў і зноў,
Ляцець-кружыцца белай чайкай
З табою ў небе зорных сноў.

Прыпомні тыя чары-словы,
Што на масточку мне казаў,
Каб на вачах маіх міжволі
Заззяла светлая сляза...

Штодня ад рання да змяркання,
Мой любы, слаўны жаўручок,
Спявай мне песню пра каханне
І наш калінавы масток!

*верасень 2000 г.*

## БЕЛАКРЫЛЫЯ ВЕШЧУНЫ

Па-над вуліцай, па-над хатамі
Вольна кружацца птахі-бацяны.
Я прыгадваю сны крылатыя
І пытаюся ў вешчуноў вясны:

– Вы скажыце мне, птахі мілыя,
Белакрылыя вешчуны,
А ці збудуцца мае дзіўныя
Запаветныя мроі-сны?

Ой, хачу-хачу я даведацца:
А дзе заўтра шлях мой азорыцца? –
Шлях да ясных зор, шлях да месяца
Днём і ноччу мне сніцца-мроіцца.

Навяшчуйце мне, што звякую век
На зямлі сваёй, не хачу другой –
Не змагу я жыць без азёр і рэк,
Дзе Сам Бог плыве на ладдзі святой...

– Вы скажыце мне, птахі мілыя,
Белакрылыя вешчуны,
А ці збудуцца мае дзіўныя
Запаветныя мроі-сны?

*жнівень 1995 г.*

# ЗДЗІЎЛЯЙ, МАЯ ЧАРОЎНАЯ

Спявай, мая абранніца,
Рачулкай веснавой –
Узнёслая, як раніца,
Іскрыся над зямлёй.

Здзіўляй, мая чароўная,
Здзіўляй мяне часцей
Нябеснаю мелодыяй
Лятункаў і надзей!

Мне помніцца, дзівосная,
Твой спеў часіны той,
Калі ў гаі бярозавым
Гулялі мы з табой.

Твой голас пералівісты
І сёння кліча ў гай
Рачулкай звонка-чыстаю,
Што мкне за небакрай...

Здзіўляй, мая чароўная,
Здзіўляй мяне часцей
Нябеснаю мелодыяй
Лятункаў і надзей!

*снежань 2000 г.*

## РАЗВІТАННЕ

У каханай іскрыстыя вочы –
Два азерцы з блакітнай тугой.
Развітання кароткая ночка
Занялася туманнай смугой.

У каханай мядовыя вусны
З горкім прысмакам траў-палыноў.
Развітання сцяжынкаю вузкай
Нам не выйсці да ранку з лугоў.

Мілавіца ўзышла на дасвецці
Родны край веснавы мілаваць,
Мне ж давеку ў няласкавым свеце
Развітальную песню спяваць!

У каханай русявыя косы –
Кучаравыя змейкі з плячэй.
Развітання світальныя росы
Заблішчалі, як слёзы з вачэй.

У каханай чарнявыя бровы,
Нібы крылы, ўзняліся: бывай!
Развітання апошняе слова
Скалыхнула зажураны гай...

Мілавіца ўзышла на дасвецці
Родны край веснавы мілаваць,
Мне ж давеку ў няласкавым свеце
Развітальную песню спяваць!

*чэрвень 1984 г.*

## МАЯ МАРЫСЬКА

Сцяжынкі ў лесе, сцяжынкі ў полі,
Сцяжынкі нашай трывожнай долі
Пазарасталі палын-травою,
Дзе мы калісьці ішлі з табою.

Мая Марыська, мая кахана,
Ты мне прысніся на свята Яна –
У бор зялёны, як сонца зойдзе,
Чароўну кветку шукаці пойдзем!

Не піў нідзе я такой вадзіцы,
Як з нашай роднай святой крыніцы:
Яна сцюдзёна, яна і чыста,
Яна, жывая, ў душы разліта.

Мая Марыська, мая кахана,
Ты мне прысніся на свята Яна –
З крыніцы светлай вадой жывою
Боль расставання ў грудзях загоім!

Заранкі ў небе, заранкі ў вокнах,
Заранкі ў нашых вачах самотных
Адпалымнелі, бы кветкі ў восень:
Святло не тое, не тая просінь.

Мая Марыська, мая кахана,
Ты мне прысніся на свята Яна –
Заранкі ў сэрцы распалім ласкай:
Пальюцца песні і былі-казкі!

*чэрвень 1993 г.*

## ДЗЕ ТОЕ ДЗІВА?

Кажуць, ёсць недзе краіна дзівос:
Рэкі малочныя, манна – з нябёс,
Радасць і песні імкнуцца да зор,
Птушкай чароўнай іскрыцца прастор.

О Божа мілы, куды павярнуць?
Дзе тое дзіва, што раем завуць?
Дзе тая птушка з бліскучым пяром,
Што памахае мне звабна крылом?

Полем палынным самоту нясу,
Следам няспынна – трывога і сум,
Моліцца сэрца, гукае штодня:
Птушка чароўная, дзе ты, мая?

Сёння прысніў я канька-гарбунка,
Горы-даліны на ім абскакаў,
Нават па небе кружыўся-ляцеў –
Птушкі чароўнай не бачыў нідзе...

О Божа мілы, куды павярнуць?
Дзе тое дзіва, што раем завуць?
Дзе тая птушка з бліскучым пяром,
Што памахае мне звабна крылом?

*жнівень 1999 г.*

## НАТАЛЛЯ

*Н.С.*

Красуня-чараўніца,
Што гэта з салаўём? –
Не можа надзівіцца
Красы тваёй святлом.

Глядзіць, не наглядзіцца,
Нібы ў азёрны плёс,
У ясных воч крыніцы,
У вір чарнявых кос.

Наталля, ой, Наталля,
Такога не чакаў я,
Бяссонніца мая,
Якім ты дзівасілам
Да сэрца прысушыла
Самога салаўя?!

Нямее, замірае,
Расчулены да слёз,
Калі цябе спаткае
У засені бяроз.

Хмялее, летуценіць
Ад голасу твайго,
Ад песень чарадзейных
З палескіх берагоў.

Наталля, ой, Наталля,
Такога не чакаў я,
Бяссонніца мая,

Якім ты дзівасілам
Да сэрца прысушыла
Самога салаўя?!

*чэрвень 1999 г.*

## НАЧНІЦА–БЕРАЖНІЦА

На беразе крутым начуюць беражніцы –
Гарэць агні і спеў нязмушана цячэ...
Начніца-беражніца, дазволь мне памаліцца
Ля полымя тваіх азораных вачэй!

Як неба і зямля, душа мая іскрыцца,
Купаецца, плыве ў раздоллі зорных вод...
Начніца-беражніца, дай воляй акрыліцца –
Пакліч мяне, гукні ў нябесны карагод!

Святочныя агні, не гасніце, гарыце,
Імкніце, песні, ўдаль, за сіні небакрай!..
Начніца-беражніца, у танцы таямнічым
Кружы мяне, кружы, у неба падымай!..

*студзень 1996 г.*

# Я НЕ БУДУ СЁННЯ ДОМА НАЧАВАЦІ

Я не буду сёння дома начаваці,
Папрашу цябе, матуля, мне за гэта даравацъ,
Буду з зорамі ўсю ночку размаўляці,
Ад нябеснага бяздоння пойдзе кругам галава.

Не чакай мяне, матуля, аж да ранку не чакай,
Дай наплакацца ад шчасця,
Нажурыцца ўволю дай!

Я не буду сёння дома начаваці –
Ах, як вабна і таемна ў полі вогнішчы гарацъ!
Па раздольнай і духмянай сенажаці
Паляту я ў бор зялёны кветку-папарацъ шукацъ.

Не чакай мяне, матуля, аж да ранку не чакай,
Дай наплакацца ад шчасця,
Нажурыцца ўволю дай!

Я не буду сёння дома начаваці –
Трэба столькі мне юнацкіх зорных ночак узгадацъ!
Буду вёсламі азерца калыхаці
І купалінку чароўную ў чароце цалавацъ.

Не чакай мяне, матуля, аж да ранку не чакай,
Дай наплакацца ад шчасця,
Нажурыцца ўволю дай!

*верасень 1992 г.*

# ЦЯБЕ ГУБЛЯЮ

Цябе губляю дзень пры дні,
Цябе губляю штохвіліны.
Як страшна падаць з вышыні –
Праводзіць шчасце ва ўспаміны.

У тлуме клопатаў зямных
Іду, шукаючы прытулак,
Па промню-каліўцу штоміг
Губляю сонца. Дзе ратунак?

Губляю твой вясёлы смех,
Губляю твой гарэзны позірк,
Губляю лірыку уцех
У мітусні жыццёвай прозы.

Губляю ўсё, што я здабыў,
Калі ішоў з табою поруч.
Лятуць, зрываюцца ў нябыт
З нябёс кахання знічкі-зоры.

*люты 1982 г.*

## ДЗЕ ТЫ, ВЕНЕРА МІЛОСКАЯ?

Ночка асенняя хмурыцца:
Цёмна-працёмна – ні зоркі,
Песня над полем не кружыцца –
Ой, як самотна і горка!

Дзе ты, світальна-прасветлая?
Ты мне прыснілася летам,
Зацалаваная кветкамі,
Морам і сонечным ветрам.

Дзе тая зорачка Боская,
Што мне дарогу асвеціць?
Дзе ты, Венера Мілоская,
Найпрыгажэйшая ў свеце?!

Косы твае шаўкавістыя,
Хваляй на плечы спадаюць,
Вочы – блакітна-іскрыстыя...
Дзе ты, краса незямная?

Зноў мне прысніся, нябесная,
Песняю зорнага лета.
О галасіста-напеўная,
Дзе ты, дзівосная, дзе ты?..

Дзе тая зорачка Боская,
Што мне дарогу асвеціць?
Дзе ты, Венера Мілоская,
Найпрыгажэйшая ў свеце?!

*кастрычнік 2000 г.*

## ТВОЙ ГОЛАС

Настройваю сэрца
На хвалю жывую:
А мо адгукнецца –
Здалёку пачую

Твой голас, якому
Заўсёды я рады,
Як роднаму дому,
Як весняму саду;

Твой голас, які мне
Не можа не сніцца,
Як спеў салаўіны,
Як плёскат крыніцы;

Твой голас, з якім я
Злію сваю песню
І крылы раскіну
У высі нябеснай.

*снежань 1993 г.*

## ЗОРКА Ў ЖЫТА ЎПАЛА

Цішыня – як боль мой.
Чуйна і трывожна.
У лугах мурожных
Я хмялеў табою.

Зваў за голас звонкі
Песняй вечаровай,
За чарнявы бровы –
Вечарніцай-зоркай.

Помню, ты спытала,
Нібы ў тым сакрэт быў:
– Ці на шчасце гэта –
Зорка ў жыта ўпала?

Адказаў табе я:
– Некага не стала
З верных і адданых,
Добрых і надзейных.

Памаўчалі крыху,
Потым ты: – Як горка! –
Зноў упала зорка,
Недзе ходзіць ліха.

І на слове "ліха"
Затрымцела ўся ты:
– Мне пара дахаты, –
Страшна – дужа ціха.

*ліпень 1978 г.*

## ТРАВЕНЬ

Мая пяшчотная, маё замілаванне,
Давай ад клопату хвілінку адпачнем
Давай згадаем зорны міг – далёкі травень,
Дзівосны травень наш у роднай старане.

Давай згадаем зорны міг, як мы любоўна
З табой глядзелі на квяцістае радно –
Пілі настой травы густой у лузе мройным
І пацалункаў маладое хмель-віно.

Давай згадаем зорны міг, як мы блукалі,
Вілі вянкі з канвалій белых і надзей,
Купалі сны і звон струны ў азёрнай хвалі,
Услед каменьчыкі пускалі па вадзе...

Мая пяшчотная, маё замілаванне,
Давай ад клопату хвілінку адпачнем
Давай згадаем зорны міг – далёкі травень,
Дзівосны травень наш у роднай старане.

*чэрвень 1988 г.*

# ГАЛУБЫ

Над галубятняю дваровай
Высока кружаць галубы,
Як тыя планеры ўсё роўна.
Была журба – няма журбы.

Настрой вясёлы, галубіны
Узняўся мройна над зямлёй,
Нябесным птахам лёгкакрылым
Махае любая рукой:

– О-ёй, о-ёй! – як гэта міла,
Якая ў небе прыгажосць!
Такія мне, здаецца б, крылы, –
А мо яны ў мяне і ёсць?

Чаго ж бы ты, мой любы, клікаў
Мяне галубкаю сваёй,
Ці тут няма якіх разлікаў?
Жартую я, о голуб мой!

*студзень 1988 г.*

# ЗОРКА БОЖАЙ ТАЯМНІЦЫ

Ой, дзяўчына-чараўніца,
Мая зорка Мілавіца,
Асвяці мне пуцявіну да Нябёс!
На цябе не надзівіцца,
На цябе мне век маліцца:
Ты – маё каханне, ты – мой лёс.

Мілавіца, Мілавіца –
Зорка Божай таямніцы,
Асвяці мне, асвяці мне
Пуцявіну да Нябёс!

Дай ускрыліць, дай узняцца
Малітоўна-шчырай песняй
Да тваіх недасягальных берагоў,
Адгукніся, дай паслухаць
Мілы голас твой нябесны,
Зачаруй пяшчотай спеўных слоў.

Мілавіца, Мілавіца –
Зорка Божай таямніцы,
Асвяці мне, асвяці мне
Пуцявіну да Нябёс!

У вясновым карагодзе
Неспатольнага кахання
Мы з табою прывітаем новы дзень.
Навяшчуе ранкаў светлых
Нам зязюльчына куванне,
Да сузор’я Шчасця павядзе...

Мілавіца, Мілавіца –
Зорка Божай таямніцы,
Асвяці мне, асвяці мне
Пуцявіну да Нябёс!

*студзень 1995 г.*

## ГРАЮЦЬ ГУЛКА СУРМЫ

Не скідай, каліна, белацвет няспынна,
Не ўсцілай дарогу белаю журбой.
Не тужы, дзяўчына, – ёсць яшчэ хвіліна
Шчасцем наталіцца ў лузе над ракой!

Ой, як голаў кружыць водар медуніцы! –
Нам не нахмяліцца, любая, да дня...
Ранкам асядлаю, напаю з крыніцы
Я свайго гнядога вернага каня.

Родная, ты чуеш, як за цёмным борам
Граюць гулка сурмы? – мне ў паход пара.
Слёз не лі гаручых – я вярнуся скора,
І над намі ўзыйдзе вольная зара!..

Не скідай, каліна, белацвет няспынна,
Не ўсцілай дарогу белаю журбой.
Не тужы, дзяўчына, – ёсць яшчэ хвіліна
Шчасцем наталіцца ў лузе над ракой!

*кастрычнік 1999 г.*

## НЕЗНАЁМКА–ЧАРАЎНІЦА

Незнаёмка-чараўніца, усміхніся,
Таямніцаю са мною падзяліся.
Незнаёмка-чараўніца,
Падзяліся таямніцай,
Падзяліся.

Ты чаго сумуеш, красачка мая?
Можа, ты чакаеш з гаю салаўя?
Можа, ты чакаеш з неба жаўрука?
Вось табе мая сяброўская рука.

Хто ты ёсць, мая галубка, хто ты ёсць?
Можа, ты мая давеку маладосць?
Можа, я табе давеку голуб твой?
Ой, скажы, скажы, мне сэрца супакой!..

Незнаёмка-чараўніца, усміхніся,
Таямніцаю са мною падзяліся.
Незнаёмка-чараўніца,
Падзяліся таямніцай,
Падзяліся.

*ліпень 1993 г.*

# СВЯТЛАНА

*С.К.*

Непагаснае святло маё – Святлана,
Ты і ў снах маіх праменішся чароўна –
О як мройна мне з табою і світальна
Веснім ранкам у тваім Бары Зялёным!

Непагаснае святло маё – Святлана,
О як мройна мне з табою і світальна!

Прада мною твой світае позірк зорны,
Незабыўная пралесачка лясная,
Так світаюць толькі вокны хаты роднай,
Калі з выраю дадому прылятаю.

Непагаснае святло маё – Святлана,
О як мройна мне з табою і світальна!

Не жаўрук, не салавейка і не голуб –
Гэта я пяю-буркую ў сне натхнёным,
Забываюся на свой сталічны горад
І вію гняздо ў тваім Бары Зялёным!

Непагаснае святло маё – Святлана,
О як мройна мне з табою і світальна!

*красавік 1997 г.*

# КАЛЯДНЫ СНЕГ

*А.І.*

Мой юны снег даўно растаў,
Ён ажывае толькі ў снах.
А твой – маім здзіўленнем стаў:
Мяце на мой самотны шлях.

Мяце і будзіць неспакой –
Ой, дзе ж ён, дзе кружыў раней?! –
Нястомна лье ў душы маёй
Святло святочнае надзей.

Мяце калядны чысты снег
Твайго жыццёвага світання,
Святая радасць ён і грэх
Майго няўтольнага жадання.

Хачу з табою, маладой,
Імчаць на конях вараных
У белы свет, у снежны рой,
У залатыя мроі-сны.

Хачу з табою, незямной,
Лавіць вясельных бомаў звон,
Хачу кружыцца над зямлёй,
Ляцець у небе шчасных дзён...

Мяце калядны чысты снег
Твайго жыццёвага світання,
Святая радасць ён і грэх
Майго няўтольнага жадання.

*студзень 1994 г.*

# ВЯСНА–КРАСНА

Што дзівосней ёсць на свеце
За павольна-зыбкі човен? –
Мы вяслуем па азерцы,
У вадзе заранкі ловім.

Зорны ранак і вясло,
Чайкі белае крыло.
Што яшчэ, вясна-красна,
Прынясеш на шчасце нам?

Ах, як весела спяваюць
З намі хвалі сініх плёсаў!
Спеў імкне да небакраю
І кладзецца ў травы-росы.

Шчырай песні мройны звон,
Плёскат хваляў ёй у тон.
Што яшчэ, вясна-красна,
Прынясеш на шчасце нам?

Як на беразе палае
Наша вогнішча зіхотна
І зязюленька кувае –
Лічыць нам гады ахвотна!

Іскры вогнішча ўгары
І "ку-ку" ў глухім бары.
Што яшчэ, вясна-красна,
Прынясеш на шчасце нам?

*чэрвень 2002 г.*

# Я БЛУКАЎ З ТАБОЮ

У лугах мядовых
Я блукаў з табою,
З мілай, чарнабровай,
З русаю касою.

Я блукаў з табою
У палях жытнёвых,
Пра вяселле мроіў
Сцежкай васільковай.

Ды шчаслівым доўга
Быць не давялося –
Павяла дарога
На чужыя росы.

Ты пайшла на Поўдзень,
Я пайшоў на Захад.
Ды як сум падкоціць –
Паляцеў бы птахам

На палі жытнёвы
З васільковай сцежкай,
На лугі мядовы
З віраванкай-рэчкай,

Дзе я плыў з табою
На чаўночку мройным
З песняй веснавою
Небакраем зорным...

І табе, я знаю,
Не салодка ў свеце:
Сэрца паміраe,
На Радзіму рвецца.

*верасень 2000 г.*

## АДЦВІЛА КАНВАЛІЯ

Пераспелі травы, адцвіла канвалія
Белымі званочкамі надзеі,
Затужыла сэрца – і дарога дальняя
На мяне самотна паглядзела.

Пакідаю сцежкі, што заўсёды сніліся,
У дзівосы-казкі нас вадзілі.
Можа, я змяніўся, можа, ты змянілася?
Што, скажы, з табой не падзялілі?

Ці табе канвалій дараваў замала я,
Ці дароў такіх ты не хацела?
У руках сумуе кветачка прывялая,
І душа – ні слова, анямела...

Пераспелі травы, адцвіла канвалія
Белымі званочкамі надзеі,
Затужыла сэрца – і дарога дальняя
На мяне самотна паглядзела.

*верасень 1991 г.*

# ЖНІВЕНЬ

Здаецца, толькі што квітнеў вясновы ранак,
А ўжо смакуем белы яблык наліўны.
Здаецца, толькі што назваў цябе каханай,
А ўжо аб нашай маладосці сняцца сны.

Стракочуць конікі ў жыце,
Жніво спяшаецца да нас.
Нам суцяшацца ці журыцца? –
Такі імклівы час!

Здаецца, толькі што мы ніву засявалі,
А ўжо гукае перапёлка: “жаць пара!”
Здаецца, толькі што мы птушак сустракалі,
А ўжо збіраюцца яны ў далёкі край.

Здаецца, толькі што Купалле чаравала,
А ўжо і Спас ідзе да нас у спелы сад.
Здаецца, толькі што нас доля павянчала,
А ўжо праводзім мы дзяцей за далягляд...

Стракочуць конікі ў жыце,
Жніво спяшаецца да нас.
Нам суцяшацца ці журыцца? –
Такі імклівы час!

*жнівень 1994 г.*

## ХТОСЬЦІ СУРОЧЫЎ

Хтосьці сурочыў нядобры душой –
Жыць, як раней, мы не можам,
Сталі збівацца з дарогі прамой,
Сталі блукаць бездарожжам.

Покуль, мой Божа, не позна яшчэ,
Хочацца шчасце наладзіць –
Збіцца з дарогі намнога лягчэй,
Як на дарогу патрапіць.

Чорная кошка нам шлях перайшла
Так нечакана-раптоўна:
Меней душэўнага стала цяпла,
Болей развагі халоднай.

Рэўнасць і сваркі не знаюць мяжы,
Нібы іржа, раз'ядаюць.
Хопіць ужо неспакою душы,
Хопіць тугі і адчаю!..

Покуль, мой Божа, не позна яшчэ,
Хочацца шчасце наладзіць –
Збіцца з дарогі намнога лягчэй,
Як на дарогу патрапіць!

*кастрычнік 2000 г.*

## СЦЮАРДЭСА

Ты – паклонніца нябёсаў,
А я – твой паклоннік.
Дзякуй Богу, дзякуй лёсу,
Што з табою сёння.

Ты купаешся у зорах,
Я – ў тваім паглядзе,
Сінім-сінім, як азёры,
З цёплай хваляй шчасця.

Сцюардэса, сцюардэса,
Ты – анёлак мой нябесны,
Узнімі мяне, дзівосная, да зор –
Пакажы мне шлях да раю,
Што нястомна я шукаю, –
Падары мне, падары святы прастор!

На нястрымна-вольных крылах
Паляцець хачу я
Да свайго сузор'я Рыбы,
Мілая красуня.

А яшчэ хачу наведаць
Я сузор'е Дзевы,
Райскі міг з табою зведаць
Пад Кахання Дрэвам...

Сцюардэса, сцюардэса,
Ты – анёлак мой нябесны,
Узнімі мяне, дзівосная, да зор –

Пакажы мне шлях да раю,
Што нястомна я шукаю, –
Падары мне, падары святы прастор!

*жнівень 2002 г.*

## МЯЦЕЛІЦА

Мяцеліца кудзеліцца дарогаю прасёлкавай,
Віруе белы снег, як смех вясёлы твой,
Мяцеліца віхурыцца, нястомная і лёгкая,
Здаецца, мы ляцім з табою над зямлёй.

Мяцеліца вяселіцца, гуллівая, раздольная,
Не ведае мяжы нястрымны санак бег,
Не верыцца, не верыцца, што ты са мною, родная,
Так доўга я блукаў па свеце без цябе.

Мяцеліца не ўцешыцца вясельнымі званочкамі,
На бойкіх рысаках разносіць срэбны звон,
Агеньчыкі, агеньчыкі, як зорачкі паўночныя...
Не верыцца ані, што гэта толькі сон.

Не верыцца, не верыцца, што даль пакуль няясная:
Куды імчымся мы, які прад намі шлях?
Каханая, жаданая, агеньчык ты мой ласкавы,
Свяці мне і будзі мяцеліцу ў грудзях!

*снежань 1989 г.*

## АДГУКНІСЯ

На жалейцы я іграю
І заву цябе, гукаю,
Адгукніся Боскай песняй,
Голас мне падай нябесны.

Заспявай, як вольны вецер,
Адгукніся мне здаля –
Недзе ж, недзе ёсць на свеце
Ты, адзіная мая!

Абшукаў усе прасторы –
Паплавы, лясы і горы,
Пабываў на сінім моры,
Даляцеў да ясных зораў...

Шчасце мне начамі сніцца –
Ветразь белы твой імчыцца,
Ты на зорным даляглядзе –
Як Багіня ў райскім садзе...

Заспявай, як вольны вецер,
Адгукніся мне здаля –
Недзе ж, недзе ёсць на свеце
Ты, адзіная мая!

*кастрычнік 1993 г.*

## БЕЛЫ СНЕГ

На дарогу, дзе ўжо не сустрэцца
Мне ніколі-ніколі з табой,
Белы снег белым сумам кладзецца,
Рассцілаецца белай журбой.

Белы снег, белы снег, заіскрыся,
Нагадай мне вясёлыя дні!
Гэй, юнацтва маё, адгукніся,
Шаргункамі здалёк празвіні!

Адасніўся мой сон васільковы,
Адыскрыўся ў каханых вачах,
Адзвінелі вясельныя бомы,
Снег расстання – як белы адчай.

Б'ецца птушкай самотнае сэрца:
Не сустрэцца мне болей з табой,
Белы снег белым сумам кладзецца,
Рассцілаецца белай журбой.

Белы снег, белы снег, заіскрыся,
Нагадай мне вясёлыя дні!
Гэй, юнацтва маё, адгукніся,
Шаргункамі здалёк празвіні!

*студзень 1992 г.*

## Я БЛУКАЮ НЕСУПЫННА

Я блукаю несупынна
Ліставейнаю сцяжынай
Над асенняю ракой.
Летуценні-успаміны,
Нібы тыя аблачыны,
Праплываюць нада мной.

А калісьці не адзін я
Па-надрэчнаю сцяжынай
Абхадзіў усе лугі.
– Ой, глядзі-глядзі, хлапчына,
Не пакрыўдзі нам дзяўчыну, –
Мне казалі берагі.

Ой, глядзі-глядзі, малойца,
Не ўпусці сваё ты сонца –
Паплыве услед вянку:
Падабаецца красуня
І хлапцу ў чаўночку сумным,
Маладому рыбаку.

Не паслухаў прадказання –
Паплыло маё каханне
Быстрай плыняй веснавой,
І хаджу цяпер адзін я
Ліставейнаю сцяжынай
Над асенняю ракой.

*кастрычнік 1992 г.*

## ДЗІЯНА–ДЗІЯНКА

Ні спевам узнёслым, ні граннем дзівосным
Мой ранак не можа ўзляцець над зямлёй,
Плыве ён туманам у чоўне трывожным,
Сумуе са мною па любай маёй.

Дзіяна-Дзіянка, ты – дзіва, ты – казка,
Мая незабыўная чаіца-чайка.
Вярні мне, Дзіянка, мой ранак крылаты –
Вярніся, Дзіянка, дадому-дахаты!

Я веру, я веру ў тваё захапленне
Нябеснай красою бацькоўскай зямлі,
Дзе возерам сінім у зорным зіхценні
Мы ў свет летуценны з табою плылі.

Я веру, я веру ў тваю пуцявіну,
У родныя далі цябе прывядзе,
Разбудзім з табою святыя ўспаміны,
Разгойдаем човен на светлай вадзе...

Дзіяна-Дзіянка, ты – дзіва, ты – казка,
Мая незабыўная чаіца-чайка.
Вярні мне, Дзіянка, мой ранак крылаты –
Вярніся, Дзіянка, дадому-дахаты!

*жнівень 1996 г.*

# ЯСНА ПАННА

Хмельна-роснай лугавінай рана-рана
Я хаджу зачараваны –
Ты прыснілася мне сёння нечакана,
Ясна панна, ясна панна.

О як я зачараваны,
О як я замілаваны –
Ты прыснілася мне сёння нечакана,
Ясна панна!

Не чакаў я, чараўніца незямная,
Што на свеце ёсць такая –
Запалала заранiцаю світальнай
На таемным небакраі.

Не чакаў я, чараўніца незямная,
Што мне явай стане мара –
Птахам вольным з песняй роднай узлятаю
Да тваіх нябесных чараў.

О як я зачараваны,
О як я замілаваны –
Ты прыснілася мне сёння нечакана,
Ясна панна!

*красавік 1997 г.*

# А МУЗЫКА ІГРАЛА

А музыка іграла, чаравала,
Вяселле наша радасна гуло...
Ты ж плакала, па чым ты сумавала?
Нішто цябе суцешыць не магло.

Не цешылі ні ласкі, ні ўгаворы,
Ні показкі вясёлыя сватоў,
Ты плавала ў сваім самотным моры –
Не чула ані песень, ні размоў.

Ігрыстае віно з вясёлым “горка!”
Цябе не весяліла, як гасцей,
У вэлюме, прыгожая, як зорка,
Свяцілася журботна на куце...

А музыка іграла, чаравала,
Звінела развяселеная медзь.
Ты ж плакала, ты сэрцам прадчувала:
Нядоўга шчасцю нашаму звінець.

*ыліпень 1992 г.*

# СВЕЦІЦЬ МЕСЯЦ

Што за дзіва, што за казка?!
Глянь, Ядвіська, як чароўна
Свеціць месяц, свеціць, ясны,
Залацістаю падковай!

Глянь, Ядвіська, падзівіся,
Годзе плакаць-сумаваці –
Ясны месяц нарадзіўся
Нам на шчасце! Нам на шчасце!

Ты скажы мне толькі слова –
Стану птахам закаханым
І дзівосную падкову
З неба я табе дастану!

Ты скажы мне толькі слова –
І я казачным прасторам
У святле маладзіковым
Павяду цябе да зораў!..

Глянь, Ядвіська, падзівіся,
Годзе плакаць-сумаваці –
Ясны месяц нарадзіўся
Нам на шчасце! Нам на шчасце!

*жнівень 1998 г.*

## Я ХАДЖУ–БЛУКАЮ

Па крутых сцяжынах, па няроўных долах
Я хаджу-блукаю і шукаю долю.
Клён з бярозкай белай і каштан з таполяй,
Толькі я самотны, як дубок у полі.

Па крутых сцяжынах, па няроўных долах
Я хаджу-блукаю і шукаю долю.

Вецер заскуголіць, завіруха ўзвые –
Хоць ляці, хавайся ў гушчары лясныя.
Ані пад сасною, ані пад ялінай
Не знайсці спакою ад тугі-журбіны.

Па крутых сцяжынах, па няроўных долах
Я хаджу-блукаю і шукаю долю.

Супакой у сэрцы я адзіны маю,
Калі на жалейцы запяю-зайграю –
Затанцуе месяц, пойдуць зоркі ў скокі,
Мне тады здаецца: я не адзінокі.

Па крутых сцяжынах, па няроўных долах
Я хаджу-блукаю і шукаю долю.

*сакавік 1997 г.*

## ШВАЧКА

У строкаце швейным, ва ўмелых руках
Тканіна – азёрнаю хваляй.
У швачкі-красуні блакіт у вачах,
Што ў сэрца маё пазіралі.

Нібыта іграла, так шыла яна,
Нябеснаю музыкай – строкат,
Здавалася, з роднага краю вясна
Прынесла бусліны мне клёкат.

Здавалася, сшые мой век са сваім
Кахання трывалаю ніткай.
На жаль, мне красуня мая назусім
Прымерыла ростані світку.

*сакавік 1988 г.*

## РАЗЛІВАЙСЯ, РЭЧКА

Любая, згадаем нашых вёснаў плынь –
Залівала пожні казачная сінь,
І звінела песняй наша маладосць:
Разлівайся, рэчка, з берагоў выходзь!

Толькі ўсё не вечна: паслабеў парыў,
Пацішэлі хвалі, шумныя віры,
У лугі так часта сэрца не заве –
Уваходзіць рэчка ў берагі свае.

Калі ж раптам песня вырвецца з грудзей,
Зноў плывем з табою хвалямі надзей.
Раздаецца рэхам наша маладосць:
Разлівайся, рэчка, з берагоў выходзь!

*красавік 1991 г.*

## О ТАНЕЧКА, ТАНЯ!

*Тацяне Яцкевіч*

– О Танечка, Таня, маё спадзяванне,
Не дай мне, не дай сумаваць!
Па моры бяскрайнім жыцця і кахання
Куды мне, скажы, веславаць?

– Вяслуй, мой Сцяпанка, на дзіва-прасторы,
Дзе ты раўнаваў бы мяне
Да шчырага бору, да сонца і зораў,
Да казак чароўных у сне.

– О Танечка, Таня, маё спадзяванне,
Не дай мне, не дай сумаваць!
Па моры бяскрайнім жыцця і кахання
Куды мне яшчэ веславаць?

– Вяслуй, мой Сцяпанка, у чары-дзівосы,
Дзе вечна квітнее вясна.
Мы будзем узнёсла на поплаве росным
Вяснянкі спяваць давідна.

– О Танечка, Таня, маё спадзяванне,
Не дай мне, не дай сумаваць!
Па моры бяскрайнім жыцця і кахання
Куды мне яшчэ веславаць?

– Вяслуй, мой Сцяпанка, у светлыя мроі
І радуйся Божаму дню.
Мы знойдзем з табою, сагрэем душою
Купальскую кветку сваю.

*чэрвень 1995 г.*

# МЯЖА РАССТАННЯ

Заўтра нам з табою расставацца,
Разляцімся ў розныя бакі
І махнем рукой: – Бывай, юнацтва,
Залатыя, мілыя дзянькі!

Мала ночкі нам нагаварыцца,
Мала слоў, каб выказаць душу...
Як прайсці з табою, чараўніца,
Нам расстання горкую мяжу?

Мы зямлі бацькоўскай возьмем жменьку,
Каб чакаў дадому родны край,
Сумаваў у садзе салавейка,
Углядаўся ў весні небакрай.

Нам з табой ніколі не расстацца,
Хоць дарога ў кожнага свая, –
Будзе з намі мройны сад юнацтва,
Будзем слухаць вечна салаўя!

*красавік 1997 г.*

## НЕ ПАМЯТАЙ МЯНЕ

Не памятай мяне ў далёкім сінім моры,
Не памятай мяне і ў роднай старане,
Не памятай мяне у радасці і горы,
Не памятай мяне на яве і у сне.

Не памятай мяне на сумным раздарожжы,
Не памятай маіх сумненняў і надзей,
Не памятай і тых юнацкіх слоў прыгожых,
Што дараваў табе я з кветкамі лілей.

Не памятай маёй узнёсласці бяздумнай,
Не памятай маёй турботы і забаў,
Не памятай і той дарогі непрытульнай,
Што ад цябе ўдалі пакутліва праклаў.

Не памятай маёй самотна-горкай долі
І песень, што я склаў пра наш нялёгкі час...
Адзінае прашу: не забывай ніколі
Сцяжынкі, дзе спаткаў цябе я першы раз!

*сакавік 1993 г.*



# Гуслі мае, не тужыце !

## ЦЯБЕ ВІТАЮ

Ад Белавежскай пушчы цёмнай
Да ясных Браслаўскіх азёр
Заўсёды юна-векапомны
Чаруе сэрца мне прастор:

Бары імкнуцца ў паднябессе,
А збажына – за небакрай…
Цябе вітаю шчырай песняй,
Мой беларускі родны край!

Цябе вітаю шчырай песняй,
Зямля славутая бацькоў,
Цябе я буду славіць вечна,
Дарыць сыноўнюю любоў!

Перажылі віхур атакі,
Нечалавечую бяду,
Усходзяць ціхія світанкі
Над нівай мірных спраў і дум.

Над Полем Памяці балеснай
Гарыць зарой далёкі Май…
Цябе вітаю шчырай песняй,
Мой гераічны мужны край!

Цябе вітаю шчырай песняй,
Зямля славутая бацькоў,
Цябе я буду славіць вечна,
Дарыць сыноўнюю любоў!

*студзень 1982 г.*

## СНЫ ВЯШЧУЮЦЬ

У самоце далечы няблізкай,
У журбоце матчыных вачэй,
Сніцца мне зямля мая-калыска,
Свеціцца за сонейка ярчэй.

Палымнее пеністаю хваляй
Ля падножжа Замкавай гары,
Непагасным вогнішчам Купалля
На азёрным беразе гарыць.

Краю мой, азёрная старонка,
Сны вяшчуюць – буду я з табой,
Да цябе вярнуся я здалёку
І знайду жаданы супакой!

Ранкам веснім да бацькоўскіх весніц
Прыляту імклівым жаўруком,
Апушчуся з высі паднябеснай,
Нахілюся бэзам пад акном.

Стану на калені, бы язычнік,
Расцалую любую зямлю,
Разліюся радасцю крынічнай
І матулі сэрца наталю…

Краю мой, азёрная старонка,
Сны вяшчуюць – буду я з табой,
Да цябе вярнуся я здалёку
І знайду жаданы супакой!

*травень 1996 г.*

## МУЗЫКА

*Дзмітрыю Даўгалёву*

Музыка, музыка, дай волю жалейцы –
Сагрэй мне, музыка, самотнае сэрца!
Цябе як пачую, здаецца, ляту я
На родныя гоні ў старонку святую.

Музыка, музыка, дай волю жалейцы –
Сагрэй мне, музыка, самотнае сэрца!

Цябе як пачую, здаецца, святкую
Найцуднае свята – сустрэчу з матуляй,
Душой ажываю ў застоллі гасцінным,
Асвечаны боскім святлом успамінаў.

Музыка, музыка, дай волю жалейцы –
Сагрэй мне, музыка, самотнае сэрца!

Цябе як пачую, здаецца, плыву я
Блакітным азерцам у казку жывую –
Туды, дзе юнацтва ў зару веславала
І песняй кахання Сусвет абдымала…

Музыка, музыка, дай волю жалейцы –
Сагрэй мне, музыка, самотнае сэрца!

*жнівень 1998 г.*

# ПЛЫВУ

У зорах азёр і крыніцаў,
У сонцы чарнічных бароў
Дом родны мне сніцца і сніцца,
Гукае здалёку дамоў.

Рыбацкім азораным плёсам
Азёрнай старонкі маёй
Плыву я пад музыку вёслаў
На свята красы незямной.

Плыву я на востраў надзеі,
Дзе юную фею спаткаў,
Зваў ласкава белай лілеяй,
У хмельнай траве цалаваў.

Плыву я да тога прычала,
Дзе першы згубіўся мой след,
Дзе маці мяне сустракала
І сумна праводзіла ў свет…

У зорах азёр і крыніцаў,
У сонцы чарнічных бароў
Дом родны мне сніцца і сніцца,
Гукае здалёку дамоў.

*ліпень 1989 г.*

# СКАЧЫ, МОЙ ГНЕДЫ

Скачы, мой гнеды, імчы, мой верны,
Выкрэсвай іскры падковай срэбнай,
Згубі дарогай журбу і стому,
Нясі, мой косю, мяне дадому!

Пакуль я шчасце шукаю ў свеце,
Яно ж, як маці, мяне чакае:
Над хатай роднай дымком віецца,
Звініць жаўронкам над полем-гаем…

Сню днём і ноччу святы куточак –
Нашто ж было мне шукаць свяцейшы,
Нашто ж было мне туманіць вочы
Слязой расстання з каханнем першым?!..

Скачы, мой гнеды, імчы, мой верны,
Выкрэсвай іскры падковай срэбнай,
Згубі дарогай журбу і стому,
Нясі, мой косю, мяне дадому!

*чэрвень 1999 г.*

* * *

Незваротнае страціў,
Чуўся б сам я не свой,
Каб па матчынай хаце
Не звадзіўся тугой.

І нічога святога
Не было б за душой,
Як лісточак, засох бы
Ля сцяны гарадской,

Каб згубілася дзесьці
Мая прага-любоў
Да матулінай песні,
Да матуліных слоў.

Не пазбыўся б адчаю,
Каб не сніліся сны:
Над азёрамі чайкі,
На лугах бацяны...

Я не зведаў бы шчасця,
Сон не быў бы ў руку,
Каб не зваў гэтак часта
Да сябе родны кут.

*чэрвень 1982 г.*

## АГЕНЬЧЫК

Агеньчык ласкавы мне сніцца –
Чаруе, як сінь-васілёк,
Іскрыцца зарой-заранічай
І кліча дадому здалёк.

Імкну да цябе на сустрэчу,
Старонка святая мая,
На твой цудадзейны агеньчык
Ляту матыльком я штодня!

Ляту я дамоў, як на свята,
У марах крылатых, у сне –
Агеньчык бацькоўскае хаты
Мне свеціць прывабна ў акне.

Гарыць ён увечары-ўранні
І цэлую ночку гарыць,
Як баўлюся я на гулянні,
А маці чакае, не спіць…

Імкну да цябе на сустрэчу,
Старонка святая мая,
На твой цудадзейны агеньчык
Ляту матыльком я штодня!

*ліпень 1998 г.*

## ЯЙКА ВЕЛІКОДНАЕ

Маці яйкі фарбавала,
Дзецям ласкава казала:
– Пацярпіце гэту ночку –
Велікодным ранкам, дзеткі,
Атрымаеце яечкі,
Пакачаеце з лубочка.

Яйка велікоднае, сонейкам зайскрыся,
З краю майго роднага прыкаціся!

Край маленства ўспамінаю:
Фарбаваначкі качаю,
Паўтараю просьбу продкаў:
– Закрасуй, мая зямліца,
Буйным жытам і пшаніцай,
Будзь заўсёды маці шчодрай!

Яйка велікоднае, сонейкам зайскрыся,
З краю майго роднага прыкаціся!

Край маленства ўспамінаю:
Б'ю яечкі, выбіваю
У сяброў азартна-бойкіх
І нясу біткі ў кішэні
На матуліна здзіўленне:
– Мой сынок, які ты лоўкі!

Яйка велікоднае, сонейкам зайскрыся,
З краю майго роднага прыкаціся!

*сакавік 1994 г.*

## ВЕРАБ’ІНАЯ НОЧ

Бура насілася,
Маці хрысцілася,
Шыбы – на друзачкі:
Град вінаваты.

Дзеці не спалі,
Дзеці крычалі:
“Мамачка, мама,
Хістаецца хата!”

Навалач жагала,
Ляскала, бахала,
Выла, шалела
Раз’юшаным воўкам.

Дзеці не чулі,
Дзеці матулі
Кідалі з ложкаў
Падушкі для вокнаў.

Раніцай сціхла ўсё,
Сонца журылася:
Жыта – упокат,
Ні яблычка ў садзе.

Дзеці дурэлі –
Дзеці не ўмелі
Плакаць яшчэ
Ад няшчасця, як маці.

*ліпень 1981 г.*

# СЕНАКОС

Дзевяціручкаю-касою
Мой дзед, бывала, касане –
І ўкруг яго мурог – трубою,
Наўздзіў не толькі для мяне.

Ён смеючыся гнаў пракосы,
А следам я ішоў, ледзь жыў,
Хаваў за кволым жартам слёзы:
– Дзядуля, пяты беражы!..

Вучыўся ў дзеда я старанна:
Кляпаў, мянташыў – не да сну.
Прыйшла пара – пачуў: – Пахвальна,
Ідзі наперадзе, унук!..

Жыцяя нялёгкія пракосы
Кладу на ўдзячную зямлю
З паважным выклікам да лёсу:
– Хутчэй! – на пяты наступлю!

*ліпень 1984 г.*

## ХЛЕБ

У халаце белым
Пекар, нібы лекар,
Пахне жытнім хлебам,
Найсмачнейшым з веку.

Зашчымела сэрца
Памяццю маленства:
У дубовай дзежцы
Падыходзіць цеста.

Рукі маці-пчолкі
Аж па локці ў цесце.
Радасці высокай
Мне ў грудзях не змесціць:

На жарыстым подзе,
На лісці кляновым
Хлеб усходзіць поўняй –
Знакам долі поўнай,

Дзівіць вечным дзівам,
Прымаўкай праўдзівай:
"Хто з сабой хлеб носіць,
Есці той не просіць".

*сакавік 1983 г.*

# КАВАЛІ

Сусед быў кавалём,
Мой дзед – малатабойцам.
З жалезам і агнём
З'яднаныя сяброўствам.

Пачнуць рабіць яны –
Асілкі! Глянуць люба!
Размах плячэй, спіны
Радніў іх з Вярнідубам.

Соп, цяжка дыхаў мех,
Грымеў пудовы молат
Навостраны лямеш
Злятаў з кавадла ўмомант.

Жалезны гром не ціх
Ад ранку да змяркання.
Кароткі перадых –
І зноў з агнём спатканне.

– Паддай жарку, унук! –
Казаў мне дзед Ігналя.
За ім – сусед Касцюк:
– Смялей, малы кавалік!

Мацнеў рукі ўзмах,
Мацнеў і жар у горне.
Хадзіць у кавалях
Вялікі меў я гонар.

*красавік 1988 г.*

## ЯБЛЫНЬКА МАЯ

Над зямлёй плыве яблыневы цвет –
Палымнее сад ружова-бела…
Яблынька мая, абхадзіў я свет –
Не было нідзе мне гэтак светла!

Абхадзіў я свет, скрозь пакінуў след, –
За цябе мілейшай не сустрэў я…
Яблынька мая, гэта не сакрэт:
Ты – мая адзіная надзея!

Веснім жаўруком прыляцеў здалёк
І тваёй красе я пакланіўся…
Яблынька мая, гэта не знарок:
Па табе я, любая, зжурыўся!

Прада мною рай – белазоры май,
Сад майго юнацтва і кахання…
Яблынька мая, прыгарнуцца дай
Да твайго святога красавання!

*снежань 1996 г.*

## КАСЯ, КАСЕНЬКА

Кася, Касенька, мая ластаўка,
Прыляці ў красу майго Браслаўя!
Тут анёльскі сад, тут нябесны рай,
Нібы твой пагляд, сіні небакрай.

Тут на Замкавай на гары крутой
Узмахнем крылом, паляцім з табой.
Як сама вясна, светлыня азёр
Зачаруе нас карагодам зор.

Зорная вада ласкай ахіне,
Мройнае вясло песню скалыхне,
Казак наснуе ціхі астравок –
Травастою хмель, залаты пясок…

Кася, Касенька, мая ластаўка,
Прыляці ў красу майго Браслаўя!
Тут анёльскі сад, тут нябесны рай,
Нібы твой пагляд, сіні небакрай.

*ліпень 1988 г.*

# НІКОЛІ

Ніколі павольна
 не біўся мой пульс
Пад небам замглёным.
Ніколі спакойны
 не быў беларус –
Няволя ды войны.

Акоп затравелы.
Капнуў я нагой –
Іржавая каска.
На першай Сусветнай
 быў дзед, на другой –
Загінуў мой бацька…

*жнівень 1987 г.*

## КАЛЯ ВЕЧНАГА АГНЮ

*Брату Мар'яну*

Каля Агню ўсе родныя,
Як мы вось, брат, з табой,
Каля Агню мы робімся
Дабрэйшыя душой.

Каля Агню мы ранімся
Аб успамін Бяды,
Кладзем вянкі, схіляемся
Над Полымем святым.

Каля Агню нам бачыцца
Далей, шырэй, глыбей.
Да Вечнай Зоркі бацькавай
Прыходзь, мой брат, часцей.

*чэрвень 1981 г.*

## БАЛАДА ПРА САЛАЎІНУЮ ТУГУ

Ляжыць пад калінаю воін забіты,
Прастрэленым сэрцам зямельку абняў,
Над ім каласамі схілілася жыта,
Пяе салавейка, звініць цішыня.

Не плач, салавейка, не плач, мой самотны,
Хай поўніцца гонарам песня твая,
Нясі аж да сонца прасторам свабодным
Байца-абаронцы святое імя.

Не плач, салавейка, вясёлае ўспомні:
Дасціпны юнак не любіў сумаваць,
О як ён дзівосна спяваў пад гармонік
І мроіў з каханай да зораў злятаць…

Ляжыць пад калінаю воін забіты,
Спавіты навек салаўінай тугой…
А недзе матуля шле ў Неба малітвы,
Чакае дадому сыночка свайго.

*ліпень 1982 г.*

# БАЛАДА ПРА САЛДАТА

У сэрцы жалоба Айчыннай,
Бы крык жураўліны над горкай,
Дзе лётчык знайшоў свой спачынак,
Пры ім самалёта абломкі.

У капсуле пуста, ні слоўца,
Як зваць і адкуль – невядома,
У горадзе жыў ён, ці ў вёсцы,
Ці блізка да роднага дому.

Ці блізка дадому, да маці,
Якая, калі шчэ жывая,
Сівою бабулькай у хаце
На свет праз акно пазірае.

На свет пазірае – чакае
Сыночка-салдата з далёку,
Не верыць, што далеч глухая,
Не чуе малітвы глыбокай…

Застылі салдаты ў шарэнзе.
Над ім, несмяротна-былінным,
Салют калыхнуў паднябессе
І зжураны клін жураўліны.

*красавік 1987 г.*

# БАЛАДА ПРА ХЛОПЧЫКА

Хутчэй у схоў, хутчэй у жыта,
Ён будзе жыць там, будзе жыць,
Гаючай цішаю спавіты,
Жыцця і смерці на мяжы.

Над галавой свісталі кулі,
Жахліва ціўкалі ўгары.
А хлопчык бег, каціўся кулем
Цераз канавы і бугры.

Не мелі літасці забойцы:
Гарэлі хаты – плач і крык.
А хлопчык бег, адзін з вяскоўцаў,
Хто з-пад аблавы цудам знік.

Не чуў ён болю, што раптоўна
Апёк спіну, нібы агнём,
Упаў у жыце непрытомна,
Упаў падцятым каласком.

Не чуў малітвы прадсмяротнай:
– Сыночак мой, хоць ты ўцалей!
Не чуў разгневаных грымотаў:
– Агонь за матак і дзяцей!

*сакавік 1987 г.*

## ПАД КРОНАМІ БЯССМЕРЦЯ

Стаяць самотна сосны,
Маўчаць у думе строгай:
Пад імі ў яркім сонцы
Магіла ля дарогі.

Тут спіць адважны воін –
Зямлі маёй асілак,
У аксаміце хвойным,
У цвеце бела-сінім.

Куды іду, ці еду, –
У памяці, у сэрцы
Жыве Салдат з легенды
Пад кронамі бяссмерця.

Не вернецца ніколі
Да роднага парогу,
Не наталіцца Воляй
Асілак Перамогі,

Аплаканы матуляй,
Сястрыцамі, братамі,
Зязюляю-вяшчунняй,
Дарожнымі вятрамі.

Аплаканы, апеты
Тужліва-ўдзячным сэрцам,
Жыве Салдат з легенды
Пад кронамі бяссмерця.

*чэрвень 1987 г.*

# ДЗЕД І ЯГО КАЗКА

Ідзе ён шляхам успамінаў.
Той шлях пакутлівы, даўгі.
Як дуб параненай галінай,
Скрыпіць пратэзам – без нагі.

Малога ўнука песціць казкай,
Калёсы ладзячы ў двары.
Над імі сонца – шчодрай ласкай,
Святла – прыгоршчамі бяры!

У казцы той Іван Царэвіч
Суровы бой са злом вядзе:
З шасцігаловым б’ецца Змеем,
Што адабраў святло ў людзей.

Здзівіцца ўнук, як зразумее:
Іван Царэвіч – родны дзед,
Які адсек галовы Змею –
Абараніў ад цемры свет.

*студзень 1988 г.*

* * *

*Светлай памяці дзядзькі Касцюка*

Пагас мой дзядзька, znічка быццам.
Над ім бацькоўская зямля
Схіліла галаў: не забыць ёй
Свайго ратая, каваля…

Прыйшоў з вайны, узяў сякеру –
Рубіў ён хаты па дварах:
Выходзь, народ, з зямлянак шэрых
На белы свет пад цёплы дах.

Як весні гром, на ўсё ваколле
Грымеў кавальскі малаток:
Скаваць на шчасце мог падкову
І нават месяца сярпок.

Бы церамкі, вуллі-калоды.
Над імі пахкай ліпы цвет.
Быў стол гасцінны ў дзядзькі з мёдам,
Каб не прагорк вакольны свет…

Іду я ліпеньскім прыволлем
Пад шэпат важкіх каласоў:
– Твой дзядзька сеяў гэта поле,
Табе – сабраць, засеяць зноў.

*красавік 1989 г.*

# НАВАЛЬНІЦА

У спякоту-сухмень навальніца –
Як другое дыханне зямлі,
Толькі сэрца маё не іскрыцца –
Успаміны здалёк наплылі.

Хмараў чорных грымотныя орды
Навісаюць над краем лясным,
Барсукі пахаваліся ў норы,
У свае палахлівыя сны.

А зайцы пазашыліся ў травы,
У глухія хмызы-гушчары…
Толькі ў велічнай, гордай паставе
Перад бурай асілкі-зубры.

Ловяць з неба стралу за стралою –
Выклікаюць агонь на сябе,
Засланяючы пушчу сабою,
Адбіваючы чорны набег.

*ліпень 1992 г.*

## СЛЯПАЯ

У вагоне сляпая з кіёчкам
І напеву тужлівага ўзлёт:
“Выпраўляла матуля сыночка,
На Заходні праводзіла фронт…”

Прыўзнялася старэнькая бабка,
Што сядзела паблізу дзвярэй,
Падала ёй манету “двaццатку”,
А сама за хусцінку хутчэй,

Каб на твары ў маршчынках-барознах
Не заўважылі слёз у яе:
Іх хапіла часінаю грознай,
Пра якую сляпая пяе…

“Выпраўляла матуля сыночка…” –
Б’ецца жылкай балючай у скронь.
Доўга-доўга ўздыхаецца моўчкі,
Не сцішаецца ў сэрцы агонь.

*люты 1983 г.*

# МЯДЗВЕДЗІЦА

Такое можа толькі ў сне
Прымроіцца-прысніцца:
Імчыць Мядзведзіца мяне –
Грукоча калясніца.

Мядзведзіца, Мядзведзіца,
Сем зорачак-начніцаў,
Імчы мяне ў нябесным сне
На Боскай калясніцы!

Імчы мяне ў праўдзівы свет,
У ветлівы і чулы,
Дзе добры мой анёл жыве
І шчасце мне вяшчуе.

Хачу спазнаць, што ёсць Любоў,
Якая лёсам вершыць:
Ці гэта Бог, ці гэта Боль,
Каб сэрцам быць дабрэйшым?..

Мядзведзіца, Мядзведзіца,
Сем зорачак-начніцаў,
Імчы мяне ў нябесным сне
На Боскай калясніцы!

*верасень 1997 г.*

# СІНЯЯ ПТУШКА

*Мастаку Міколу Кірэеву*

Мелодыя колеру, музыка ліній
Чаруе-хвалюе нябеснай красой:
Узносіць угору за птушкаю сіняй,
А сіняя птушка звініць вышынёй.

Мелодыя колеру, музыка ліній
Узносіць угору за птушкаю сіняй.

А сіняя птушка мільгае ў прасторы,
Кувае зязюляй, пяе салаўём,
Імкнецца да сонца, імкнецца да зораў,
Здалёку махае прывабна крылом.

Мелодыя колеру, музыка ліній
Узносіць угору за птушкаю сіняй.

А сіняя птушка іскрыцца вясёлкай –
Дарога пад казачнай брамай святла,
Да райскага саду, здаецца, два крокі,
Дзе сіняя птушка гняздзечка звіла.

Мелодыя колеру, музыка ліній
Узносіць угору за птушкаю сіняй.

*лістапад 2001 г.*

# ЧАС

Нестрыманей часу бег –
Чым бліжэй да восені.
Не заўважыш, як табе
Час заснуць пад соснамі,

У апошні міг зірнуць
На бярозку тонкую –
На сваю красу-вясну
Маладую, звонкую…

Супыніцца не прасі –
Хто яго дапросіцца?!
Моўчкі поплаў свой касі
Да глыбокай восені.

*верасень 1984 г.*

# ЗІМОВЫ СОН СЯЛА

*Міхасю Стрыгалёву*

Прыціхла сяло ў абдымках сну,
У мяккіх падушках снегу
І сніць маладую красу-вясну,
У крылах птушыных неба.

Сніць камячок узаранай зямлі,
Расцёрты ў руках мазольных,
У цёмна-зялёных растках палі,
У думках маіх трывожных:

Якую наступную нам вясну
Рыхтуюць вятры на поўдні?
Якая яна не была б, а сну
Не будзе сялу ўсё роўна.

*снежань 1984 г.*

## ЗДАРЭННЕ НА ВОЗЕРЫ

Шуміць навальніца, грыміць навальніца,
Маланкі – страла за стралой,
Нідзе не схавацца, нічым не прыкрыцца,
Мо хваляй страшэннай адной.

А хваля бушуе, а хваля віруе,
Ўстае высачэзнай сцяной:
То кідае ўгору, пад хмару сівую,
То цягне ізноў за сабой.

Цягала і кідала, рвала і секла,
Здавалася: вось і канец!
Як выбраўся толькі я з гэткага пекла,
Дасюль не магу зразумець…

І думка мільгнула: жыццё – навальніца,
І трэба быць добрым плыўцом,
Каб возерам дзён плыць і плыць, не спыніцца,
Змагацца з маланкавым злом.

*ліпень 1991 г.*

## БАБКА–РЫБАЧКА

Ціша гудзе камарыным пагудам
Над азярынай лясной.
Вудзіць бабуля арэхавай вудай –
Ловіць душы супакой.

Дзіўны занятак штораніцы бачу,
Ён і здзіўляць перастаў:
Бабка не стане, як іншы, рыбачыць
Дзеля спартыўных забаў.

Пасмай сівою з-пад шэрай хусціны
Плечы прыкрыты яе.
Ведае тайны рыбацкай сябрыны:
Дзе ні закіне – клюе.

Добрая юшка і смажанка будзе
З плотак, ляшчоў, печкуроў.
Дома ўнучка на сняданак разбудзіць
Казкай бяздонных віроў.

*ліпень 1987 г.*

# КАРАЛЕВА БРАСЛАЎСКІХ АЗЁР*

Славім мы Цябе ў малітвапеснях –
Ты стварыла нам сапраўдны рай:
Пад Тваёй апекаю нябеснай
Самы прыгажэйшы ў свеце край.

Прад Табою голаў мы схіляем
І Тваім дзівосным абразом,
Наша Маці Божая, Святая,
Каралева Браслаўскіх азёр!

Богінскае, Снуды ці Дрывяты –
Скрозь вада асвечана Табой,
Мы сюды прыходзім, як на свята,
І знаходзім радасць і спакой.

Залаціцца, вышытая ў зоры,
Блаславёная Табою, даль,
Чайкі тут, як белыя анёлы,
Сцерагуць святло блакітных хваль...

Прад Табою голаў мы схіляем
І Тваім дзівосным абразом,
Наша Маці Божая, Святая,
Каралева Браслаўскіх азёр!

*верасень 2001 г.*

*–музыка Дзмітрыя Даўгалёва*

# ВЯШЧУННЯ–ЗВАНІЦА

Чую голас вяшчунні-званіцы:
– Бо-ом, бо-ом, бо-ом! – як збавенне, –
Беларус, ты павінен маліцца,
Калі хочаш свайго ўваскрашэння.

Ты павінен са злом не мірыцца,
Бараніцца ад д'ябальскай сілы,
Быццам прадзеды нашы калісьці, –
Зорку Волі святой баранілі.

Дзеля шчасця наноў нарадзіцца –
Асвяціцца нябеснаю Воляй,
Беларус, ты павінен маліцца,
Прытуліцца да Зоркі Хрыстовай!

Не сціхае вяшчуння-званіца:
– Бо-ом, бо-ом, бо-ом! – як бяссмерце, –
Беларус, ты павінен маліцца,
Калі хочаш быць вечным на свеце.

Ты павінен душою схіліцца
Перад Небам і Памяццю продкаў
Дзеля чыстай духоўнай крыніцы,
Дзеля моцы і вечнасці роду.

Дзеля шчасця наноў нарадзіцца –
Асвяціцца нябеснаю Воляй,
Беларус, ты павінен маліцца,
Прытуліцца да Зоркі Хрыстовай!

*люты 2001 г.*

# ДЗВЕ МАЦІ СВЯТЫЯ

Як Божым Нябёсам, таемна-бясконцым,
Малюся я роднай азёрнай старонцы,
Малюся, малюся Святой Беларусі
І з гонарам свету ўсяму прызнаюся:

– За ўсё даражэй мне дзве Маці Святыя:
Матуля-Радзіма і Панна Марыя!

Як Госпаду Богу і Духу Святому,
Малюся нябеснай Матулі Хрыстовай,
Малюся, малюся Прачыстай Мадонне
І зноў паўтараю у сне і бяссонні:

– За ўсё даражэй мне дзве Маці Святыя:
Матуля-Радзіма і Панна Марыя!

Малюся, як Зорам, я Зорцы салдацкай
І голаў схіляю прад Памяццю бацькі,
Стаю на каленях з малітвай удзячнай
Прад Маці Будслаўскай – заступніцай нашай…

– За ўсё даражэй мне дзве Маці Святыя:
Матуля-Радзіма і Панна Марыя!

*жнівень 2000 г.*

## ХРЫСТОС УВАСКРОС!

Празрыста, прасветла ў паветры наўкола,
Бы крылы мільгаюць нябесных анёлаў…
Устань, беларус, глянь у вочы Нябёс –
Хрыстос уваскрос, Хрыстос уваскрос!

З крыжа ты ўжо зняты святымі рукамі,
Прачніся-ўваскрэсні, вярніся у Памяць…
Устань, беларус, глянь у вочы Нябёс –
Хрыстос уваскрос, Хрыстос уваскрос!

Ты волю прыняў, як дарунак ад Бога,
Прачніся-ўваскрэсні, кроч вольнай дарогай…
Устань, беларус, глянь у вочы Нябёс –
Хрыстос уваскрос, Хрыстос уваскрос!

Ты чуеш, як рэкі шумяць крыгаломна?
Прачніся-ўваскрэсні ў краіне свабоднай…
Устань, беларус, глянь у вочы Нябёс –
Хрыстос уваскрос, Ён – Дух твой і лёс!

*верасень 1991 г.*

# НЕДЗЕ ТАМ

Недзе там, у ясных зорах, запаветны край,
Недзе там сады Эдэмскія цвітуць…
Божа, дай мне крылаў вольных,
Дай, ласкавы, дай –
Паляту я ўдаль святую, паляту!

Недзе там знайду я тое, што шукаю век, –
Да грудзей мяне прытуліць неба сінь…
На зямлі ў грахах смяротных,
Сіле злой на здзек,
Не пакінь мяне, мой Божа, не пакінь!

Недзе там знайду я тое, што прысніў вясной, –
Недзе там ляжыць дарога ў вечны рай…
На адзінай той дарозе,
Дзе душы спакой,
Утрымай мяне, мой Божа, утрымай!..

Недзе там, у ясных зорах, запаветны край,
Недзе там сады Эдэмскія цвітуць…
Божа, дай мне крылаў вольных,
Дай, ласкавы, дай –
Паляту я ўдаль святую, паляту!

*чэрвень 1998 г.*

# МАЛІТВА

Зло нішчыць карэнне спрадвечнае наша,
Пагібельна-чорнаю хмараю страшыць –
І дух непакорны, трывожна-балесны
Шле просьбу-малітву ў прастор паднябесны:

– О Божа прамілы, мы просім і молім:
Дай сонечнай сілы, святой, неадольнай!

Дай сілы нязломнай, каб грознай рукою
Не вырвала зло найсвяцейшы той корань,
Што спадчынай роднай спрадвеку завецца,
Яднае з Сусветам наш розум і сэрца.

О Божа прамілы, мы просім і молім:
Дай сонечнай сілы, святой, неадольнай!

Дай сілы на крылах арліных узняцца
І змесці з дарогі драпежныя раці,
Каб несці высока сцяг Волі бясстрашны,
Як некалі слаўныя прадзеды нашы!

О Божа прамілы, мы просім і молім:
Дай сонечнай сілы, святой, неадольнай!

*кастрычнік 1997 г.*

## КРЫЖ ЕФРАСІННІ

Мудрыя людзі
Кажуць: мы будзем
Жыць пад аховай анёльскай,
Як толькі слынны
Крыж Ефрасінні
Вернецца ў край бацькоўскі.

Крыж Ефрасінні,
Цуда-Святыня,
З Неба анёлам спусціся!
Крыж Ефрасінні,
Дай не загінуць,
Молім цябе: вярніся!

Столькі навокал
Злой павалокі:
Ірадаў, хрыстапрадаўцаў...
Крыж Ефрасінні,
Дай Божай сілы
Нечысці злой не паддацца!

Мудрыя людзі
Кажуць: мы будзем
Вольным і вечным народам,
Як толькі слынны
Крыж Ефрасінні
Вернецца ў храм свой родны...

Крыж Ефрасінні,
Цуда-Святыня,
З Неба анёлам спусціся!

Крыж Ефрасінні,
Дай не загінуць,
Молім цябе: вярніся!

*люты 1997 г.*

## САНЕТ

Сніцца дзіўны мне сон: ззяе Волі зара
І трывожна мне ў вочы глядзіць і пытаецца:
"Ці гартуеш свой дух, ці гатоў ты, мой брат,
Вольны край бараніць, як напасце наваліцца?"

І ў той міг прада мной вырастае гара,
Падымаюся ўвысь – далягляд расшыраецца,
Ды яго засцілае драпежная раць
І ў прадонне мяне скінуць так намагаецца!

"Божа мой, дай мне сіл, каб я зло перамог, –
Знемагаю зусім, ледзь не падаю з ног!" –
Мкне малітва мая ў вышыню запаветную.

І тут стаў я скалой, прэч ганю груганоў,
Пунсавее на снезе пралітая кроў –
Засланяю сабою Свабоду прасветлую.

*жнівень 2000 г.*

## БУДСЛАЎСКАЯ БОЖАЯ МАЦІ*

Будслаўская Маці – заступніца наша,
Не раз памагала Ты нам устаяць –
Калі ўсё наўкола гуло і стагнала,
Малілася Ты – і знікала напасць!

З надзеяй прасветлай, з малітвай удзячнай
Глядзім мы на Твой цудатворны абраз.
Будслаўская Маці – заступніца наша,
Маліся, маліся, маліся за нас!

Прасі ў Свайго Сына нам гэтакай сілы,
Каб грозны Чарнобыль адолець змаглі,
Свой дом беларускі ўсім сэрцам любілі
І мову бацькоўскую ў ім бераглі.

Прасі ў Пана Бога, каб сонца і зоры
Святлей асвяцілі нам шлях да Нябёс,
Каб мы ўжо ніколі не зведалі гора:
Ні жальбы сіроцкай, ні ўдовіных слёз!..

З надзеяй прасветлай, з малітвай удзячнай
Глядзім мы на Твой цудатворны абраз.
Будслаўская Маці – заступніца наша,
Маліся, маліся, маліся за нас!

*травень 2001 г.*

** – музыка Дзмітрыя Даўгалёва*

# ВАРШАВА

Варшава, о пані Варшава!
Як песня, твая маладосць,
Легендай пра Варса і Саву
Зачараваны твой госць.

Яго ўсхвалявалі, кранулі
Твой нораў вясёлы, жывы,
І адначасова матулін
Тужлівы нахіл галавы.

Схіліўшыся ля абеліскаў,
Ты некалькі цяжкіх хвілін
Пячэш сваю памяць у прыску
І раніш аб брытвы руін.

Паўстанца Бачынскага вершам
Яго палымяным радком,
Маланку паўстання задзеўшы,
Хвалюючы слухаеш гром.

Выходзіш на брук "Старэ Мяста"
Паслухаць гаворку вякоў,
Дзе самая дзіўная казка –
Палацы былых каралёў.

Сярэбраным поясам Віслы
Ўпрыгожана постаць твая,
Чаруеш прасторы і высі,
Гайдаючы зоры да дня.

*верасень 1981 г.*

## ТО НЕ МОРА ШУМІЦЬ

*Светлай памяці дзядзькі*
*Мар'яна Пецюкевіча, вучонага-этнографа*

То не мора шуміць, нібы ў пушчы пажар,
І якому няма ўтаймавання,
А гамоніць прастор нашых думаў і мар,
Незабыўных сустрэч і расстання.

То не хваляў агні – ў вышыню, з вышыні,
Пырскі-іскры пад самыя ногі –
Гэта нашы з табой неспакойныя дні,
Дым няўдач і агонь перамогі.

То не чайкі лятуць за марскі небакрай
Акрапіцца жывою вадою –
Нашы сэрцы спяшаюцца ў казачны край,
Дзе зямлю называем святою.

Дзе зара залатыя свае невады
Апускае ў азёрныя тоні,
Дзе каменьчык любы даражэй за бурштын
І за сон – веснавое бяссонне.

Дзе матулі ў бядзе клопат я памнажаў,
Нарадзіўшыся ў злую гадзіну,
Калі бацька-салдат два разы паміраў:
За мяне і за Маці-Радзіму...

То не словы выводзім прыбоем ускрай,
Хваля змые – мы зноў паўтараем:
"Хай жыве Беларусь – родны сонечны край!"
То не словы – душу выліваем.

*лістапад 1980 г.*

# ТРЫЯЛЕТ

*Дарагой сястры*
*Міраславе Быблюк*

І ты мяне, сястрыца, блаславіла
У спеўна-мройны шлях паэзіі,
Дапамагла шырэй расправіць крылы.
І ты мяне, сястрыца, блаславіла.

У неба Боскай Музы ўзнесены,
Цябе я дзячу трыялетам шчырым:
І ты мяне, сястрыца, блаславіла
У спеўна-мройны шлях паэзіі.

*снежань 2003 г.*

## ГУСЛЯРЫ

Дзеду, дзеду мой сівенькі,
Чарадзей-музыка,
Навучы мяне іграці –
Гуслі я люблю,
Хоча ўнук з табою
Ў свет пайсці вялікі,
Родным гукам чараваці
Неба і зямлю!

Пойдзем, дзеду, там, дзе скачуць
Пад чужую дудку,
Нашы гуслі заспяваюць
Годнаю струной:
Гэй, браточкі-беларусы,
Нас не будзе хутка,
Калі хочам жыць, павернем
Да ігры сваёй!

Пойдзем, дзеду, чарнабылам,
Там, дзе плачуць маці,
Нашы гуслі заспяваюць,
Звонам зазвіняць:
Гэй, браточкі-беларусы,
Годзе паміраці,
Знойдзем мужнасць уваскрэснуць,
З курганоў паўстаць!..

Дзеду, дзеду мой сівенькі,
Чарадзей-музыка,
Навучы мяне іграці –
Гуслі я люблю,

Хоча ўнук з табою
Ў свет пайсці вялікі,
Родным гукам чараваці
Неба і зямлю!

*красавік 1989 г.*

## ТРЫЯЛЕТ

Гусელькі-гуслі мае, не тужыце! –
Вочы Радзімы і так у слязах –
Зброд ваўкалакаў дратуе нам шлях.
Гуселькі-гуслі мае, не тужыце! –

Звонам бадзёрым дух вольны будзіце –
З люду здымайце скаванасць і страх.
Гуселькі-гуслі мае, не тужыце! –
Вочы Радзімы і так у слязах.

*люты 2004 г.*

## ГУСЕЛЬКІ – ГУСЛІ

Журацца гуслі, трывожна звіняць,
Клінам крычаць жураўлінным –
Блудных сыноў кліча Маці-зямля,
Тужыць па іх несупынна.

Сумныя вокны ўсю ночку гараць –
Сон не прыходзіць да маці:
– Дзе ж вы, сыночкі, калі вас чакаць? –
Добрую вестачку дайце!

Гусэлькі-гуслі, жураўкі мае,
Ой, не тужыце так горка,
Блудных сыноў павярніце вы мне
З дальняй старонкі!

Гуслі рыдаюць, ірвецца струна,
Коціцца рэха над Краем –
Сэрца Матулі сумуе штодня,
З выраю дзетак гукае.

Неба калыша зажураны клін,
Маці глядзіць малітоўна:
– Божа, дай крылы сыночкам маім
Скора вярнуцца дадому!

Гусэлькі-гуслі, жураўкі мае,
Ой, не тужыце так горка,
Блудных сыноў павярніце вы мне
З дальняй старонкі!

*люты 2004 г.*

# МАКСІМАВА КРЫНІЦА

*“У родным краю ёсць крыніца*
*жывой вады...”*
*Максім Багдановіч*

Ад крыніцы Максімавай,
Ад гаючай вады,
Я іду ўдалеч сінюю
Праз нямыя асіннікі,
Праз сухія брады.

Шлях “Пагоняй” асвечаны,
Звонам вострых падкоў,
Громам збруі сярэбранай:
Хай кране вас, няверныя,
Боль на краі бацькоў!

Звоняць струны надрыўныя,
Стогнуць гуслі мае:
– Гэй, бязродна-блудлівыя,
Што вы дом свой пакінулі! –
Маці вас пракляне.

Сэрца “Зоркай Венераю”
Летуценна гарыць –
Спадзяваннем і вераю:
Дзеці блудныя вернуцца
Да бацькоўскіх крыніц...

А ўпаду я, знясілены,
Ад людской глухаты,
Беларусь, занясі мяне
Да крыніцы Максімавай,
Да гаючай вады!

*красавік 1984 г.*

## БЛУКАЮ ПА СВЕЦЕ

Блукаю па свеце, насустрач мне вецер:
– Куды ты, самотны мой браце?!
Ці дождж, ці завея, адчай ці надзея –
Іду, не магу ўтаймавацца.

Дарогі-сцяжыны, як мроі-ўспаміны,
Канца ім не будзе, здаецца...
Душа, нібы скрыпка ў руках Паганіні,
То плача яна, то смяецца.

Нідзе мне не спіцца, нідзе не сядзіцца:
Ні дома, ні ў свеце далёкім –
Хачу нахадзіцца, хачу заблудзіцца
У нечым святым і высокім...

Хвалістае мора, скалістыя горы –
Прасторы арлінага краю.
Спяшаюся ўгору, хаваючы змору...
О, дзе ж ты, сцяжынка да раю?!

*снежань 1992 г.*

# ГІМН КЛУБА "СПАДЧЫНА"

Паклікала Радзіма-Беларусь
Пад родны Сцяг з Пагоняю святою –
І мы, як Волі раннюю зару,
Вітаем слаўнае Былое.

У нашай "Спадчыне",
Што ў садзе казачным,
Цвіце сыноўняя любоў
Да веры матчынай,
Да песні матчынай,
Да першародных каранёў!

Лунае тут натхнёны вольны дух
Скарыны, Багдановіча, Купалы,
Што ўзнеслі Беларусь на крылах дум
Да зораў вечнасці і славы.

У велічным вянку былых падзей –
І Чарадзей, і Вітаўт, і Астрожскі... –
Прыходзьце, людзі, ў спадчынны музей,
Вас так чакае Памяць продкаў!..

У нашай "Спадчыне",
Што ў садзе казачным,
Цвіце сыноўняя любоў
Да веры матчынай,
Да песні матчынай,
Да першародных каранёў!

*сакавік 2004 г.*

## СПАТКАННЕ ГЕНІЮШ З АРСЕНЕВАЙ У МУЗЕІ "СПАДЧЫНА"

Дзве славутыя Паэткі,
Як дзве родныя сястрыцы,
Ціха гутараць-буркуюць,
Бы галубкі-галубіцы.
А пра што яны, не знаю,
Тую гутарку вядуць.

Можа, згадваюць юнацтва,
Казку першага кахання,
Як ля вогнішча кружылі
І вілі вянкі да рання
З васількоў і з даўніх песень,
З паэтычных мрояў-дум?

Можа, згадваюць, як выйсце
З той бяды яны шукалі,
Што прыносілі чужынцы
На святыя нашы далі
І чынілі год за годам
Над народам здзек-прымус?..

Але я ўсім сэрцам чую
Пра што Бога просяць-моляць
Дзве славутыя Паэткі:
– Божа, дай, каб шляхам вольным
Век ішла пад зоркай шчаснай
Наша Маці-Беларусь!

*сакавік 2004 г.*

# І ТЫ ПАЭТ

*Мастаку Алесю Цыркунову*

Там, дзе струменіцца крыніца,
Пад вязавым пахілым голлем,
Купалка, песня-чараўніца,
Прыйшла на свет апець нам долю.

Прыйшоў Пясняр нязломнай волі
За Беларушчыну, за мову,
Пявучую, як сад і поле,
Спрадвечную, як бор сасновы...

І ты Паэт зямлі бацькоўскай –
Яе ўслаўляеш песняй вабнай,
Што саграеш душой узнёслай
І паэтычным жарам фарбаў.

Ляціш акрыленай дарогай:
У вобразах тваіх – бясстрашша,
Магутны дух і перамога
Над крыжакамі Песні нашай.

*сакавік 1993 г.*

# БЕЛАРУС – Я, КРЫВІЧ

Беларус – я, крывіч, непакорнай крыві,
Дзед і прадзед былі крывічамі,
Свет спазнаў нораў мой: не чапай, не гняві –
Не ўзмахну я ніколі мячамі.

Мірна-згодна жыві, з добрым сэрцам прыедзь –
Хлебам-соллю заўсёды прывечу,
Дам паслухаць Курган і Хатынскую медзь –
Жураўлінае вечнае веча.

Каб адчуў ты, з якой я радзіўся душой,
Дам узвысіцца духам вялікіх –
Пакланюся з табой Ефрасінні святой,
Асвячуся Скарынавым лікам.

Дам з крыніцы папіць, што здаўна крывічоў
Наталяе адвагай Свабоды...
А зачэпіш – ну што ж! – не малі ты Багоў,
Не пытайся, якога я роду!

У званы зазваню – шар зямны ўскалыхну,
Хістанецца Сафійская вежа,
І паўстане гара, груганы – аб скалу:
Свет пазбавіцца крылаў драпежных!

*студзень 1985 г.*

## РАГНЕДА

Ты – крывічаначка-князёўна,
І я – крывіч, хоць і не князь,
З'яднаны мы зямлёю роднай –
Вятрам віхурным не разняць!

Твой меч, занесены над князем,
Уратаваў і гонар мой –
Ты не скарылася абразе
І вераломнай сіле злой.

Рагнеда, слаўная Рагнеда,
Князёўна сноў маіх і мрой,
Я верыў, любая, я ведаў,
Што мы спаткаемся з табой!

Тваёй адвагаю ахвярнай
Душа акрылена мая –
Мне адкрываецца, як тайна,
Вякоў славутых глыбіня.

Іду з табою полем вечным
Падзей былінных і надзей,
А перад намі Шляхам Млечным
Палае будучыні дзень.

Рагнеда, слаўная Рагнеда,
Князёўна сноў маіх і мрой,
Я верыў, любая, я ведаў,
Што мы спаткаемся з табой!

*жнівень 1998 г.*

## КАРОНА КНЯЗЯ МІНДОЎГА

Такая была воля Боская –
На трон узышоў Князь Міндоўг,
Вялікае Княства Літоўскае
Каронай абняў залатой.

А княжыя воі бясстрашныя
Пад Сцягам з Пагоняй святой
Ахоўвалі межы дзяржаўныя,
Стаялі за волю сцяной.

О Княжа Вялікі Міндоўг,
Кароль векапомных гадоў,
Мы ў думках высокіх з табой,
Карона твая залатая
І сёння нам сэрца кранае
Вялікадзяржаўнай красой!

Сталічны твой горад Наваградак
Быў ведамы ў розных краях,
Гарою ўзвышалася Замкавай
Літвінская слава твая.

Народзіны Княства Літоўскага
Мы сёння святкуем з табой
І песні спяваем узнёслыя
Пра час найслаўуцейшы твой.

*люты 2003 г.*

# ЭМІЛІЯ ПЛЯТЭР

Літвінка-красуня, паэтка,
Крыніца натхнення і мар,
Цябе, векапомная кветка,
Мы славім, як Жанну д'Арк.

Чаруеш ты сэрца народа
Сваёй несмяротнай красой:
Твой конь баявы за Свабоду
Ірвецца акрылена ў бой.

Эмілія Плятэр, Эмілія Плятэр,
Хай множыцца слава твая!
Эмілія Плятэр, Эмілія Плятэр,
Ты – воін і нашага дня!

Вядзі нас, адважны палкоўнік,
На бітву з навалаю зла,
Што Волю нам топча і мову
І знішчыць імкнецца да тла.

Цябе, векапомная кветка,
Мы славім, як Жанну д'Арк,
І марым пра дзень запаветны
Без лютага ветру і хмар...

Эмілія Плятэр, Эмілія Плятэр,
Хай множыцца слава твая!
Эмілія Плятэр, Эмілія Плятэр,
Ты – воін і нашага дня!

*травень 2002 г.*

* * *

На замчышчы здані –
Як дрэвы ў тумане.
Пра штосьці гамоняць,
Трывожаць бяссонне.

Абрыўкі-паўтоны
Пра нейкія крыўды:
Паўстанне... Пагоня...
На вілы... на дзіды!

Узнімецца Знічам...
Ім вечны спачынак...
Сыноў сваіх кліча:
– Васілька! Вашчылка!

*ліпень 1991 г.*

## У ВЯНОК ПЕСНЯРАМ

Пачулі ў свеце нас, хоць мала
Яшчэ прайшлі дарогай той,
Якую нам праклаў Купала
Сваёю песеннай душой.

Мы памудрэлі, хоць і школы
Яшчэ не скончылі, куды
Завёў калісьці дзядзька Колас.
Яна для нас – на ўсе гады.

Пабагацелі мы, хоць словы
Надзіва простыя, з якіх
Склаў песню-долю Багдановіч,
Каб нас запомнілі вякі.

*кастрычнік 1981 г.*

# САЛАВЕЙКА ЗАМОРСКІ

*Багдану Данчыку*

Ты прыляцеў да нас у госці,
Вясну з-за мора нам прынёс –
Шчымлівы голас твой узнёслы
Душу кранае нам да слёз.

Палаюць "Зорачкі" трывожна:
"Дні прыходзяць, дні адходзяць,
дні лятуць..."–
Туга па дому, боль астрожны
На струнах Памяці гудуць.

Табе мы дружна падпяваем,
Натхнёныя святым радком:
"Беларусь, Беларусь залатая,
За Цябе, за Цябе мы ідзём!.."

Звініць гітара мілагучна,
Пяе, здаецца, ўся зямля:
"Беларусачка, беларусачка,
Дарагая сяброўка мая!..."

О салавейка наш заморскі,
Часцей у госці прылятай,
Вясну прынось у край бацькоўскі –
Нас роднай песняй сагравай!

*ліпень 1993 г.*

## СУАЙЧЫННІКАМ ЗАМЕЖЖА

*Беларусам свету І-га З'езда*

Здаецца, ўсю вечнасць чакалі мы Вас.
Здаецца, ўсю вечнасць да нас Вы плылі.
І вось надыйшоў гэты радасны час:
Мы Вас абдымаем на роднай зямлі.

Прычаліў да берага Ваш карабель,
Лунае над ім бел-чырвон-белы сцяг,
Яго не застрашыў ні шторм, ані мель –
Прад Вамі шырокі Радзімы абсяг.

Вялікі Вам дзякуй, браты-спадары, –
Збываюцца нашы прарочыя сны:
Купальскую кветку ў бацькоўскім Бары
Цяпер мы ўжо будзем шукаць не адны.

Не выпусцім з сэрца мы Ваш карабель,
На хвалях любові хай вечна плыве…
Жыве Беларусь! Сёння мы не ў журбе –
Увесь белы свет адгукнуўся: – Жыве!

*ліпень 1993 г.*

## СЛАЎСЯ, НАШ МУЗЕЙ НАД МЕНКАЙ!

Пра цябе хай вечна ходзіць
Слава добрая ў народзе!
Ва ўсе часы, ва ўсе векі
Слаўся, наш музей над Менкай!

Узвышай душу і сэрца
Аднадумцам, аднаверцам,
Узвышай і тым, хто збочыў
І не той дарогай крочыць.
Паварочвай, як да сонца,
Іх да прасніц і красёнцаў –
Хай адчуюць мудрасць продкаў:
Сэнс і лад жыцця высокі.

Пра цябе хай вечна ходзіць
Слава добрая ў народзе!
Ва ўсе часы, ва ўсе векі
Слаўся, наш музей над Менкай

Прамяніся песняй даўняй,
Што на сэрцы гоіць раны,
Што спрадвек спявала Маці
На жніве і сенажаці.
Слова матчына жывое
Сей, як зерне веснавое, –
Песня родная і слова –
Нашай вечнасці аснова!

*снежань 2001 г.*

# ГАСПАДАР

*Дырэктару Белдзяржмузея*
*народнай архітэктуры і побыту*
*Ткацэвічу Г.А.*

Вось ідзе Гаспадар запаведнікам-садам,
Прыпыняе хаду ля вясновага тыну,
Задуменна-жывым, клапатлівым паглядам
Азірае сядзібы і храмы-святыні.

Там патрэбна падладзіць страху,
Там – вароты,
Там падмурак царквы ўмацаваць,
Як належыць...
– Адпачні, Гаспадар!
– Не пускаюць турботы,
Расквітнее наш Сад –
Адпачну непазбежна.

Вось ідзе Гаспадар і няўрымслівым крокам
Ажыўляе надрэчныя ўзгоркі крутыя –
Памяць продкаў нясе, след жыцця іх глыбокі:
Вы прыходзьце, нашчадкі, на сцежкі святыя!

*сакавік 1992 г.*

# МУЗЕЙНАЯ ЦІША

Былое-святое, як дальнія зоры,
Вядзе ў таямніцы і ўдзень, і ўначы...
Музейная ціша, пра што ты гаворыш,
Музейная ціша, аб чым ты маўчыш?

Гаворыш званамі святыняў царкоўных,
Калі спавядаемся словам імшы,
Гаворыш пяшчотаю песень народных,
Калі разгуляецца свята ў душы.

Маўчыш ветракамі на ўзгорках пакатых,
Як перад адлётам у вырай буслы,
Маўчыш абразамі на покуце хаты,
Дзе белым абрусам засланы сталы.

Маўчыш ручнікамі з бабуліных куфраў,
Што сцелем з мінулага ў заўтрашні дзень,
Маўчыш і гаворыш па-просту і мудра
Слядамі глыбокімі даўніх падзей...

Якім ты было, наша слаўнае Ўчора? –
Скажы, пакажы, мудрым быць навучы...
Музейная ціша, пра што ты гаворыш,
Музейная ціша, аб чым ты маўчыш?

*жнівень 1991 г.*

# НА РАДЗІМЕ КАСМАНАЎТА

*Уладзіміру Кавалёнку*

Кут як кут, такіх прывабных шмат:
Лес і нівы, дзе красуе лета,
Хат пафарбаваных стройны рад,
Толькі, можа, крыху болей кветак.

Гэткая зычлівасць, як наўкол,
Кожны госць увагаю сагрэты,
Не абдзеліць хлебам-соллю стол,
Толькі, можа, крыху больш гасцей тут.

Гэткі працавіты, рупны дзень
У дварах і ў полі дружны гоман,
Дабрыня і шчырасць у людзей,
Толькі, можа, крыху большы гонар.

Радасць і журба, агонь і лёд,
Як і ўсюды пры палёце ўгору,
Мары зорнай гэткі смелы ўзлёт,
Толькі, можа, крыху бліжай зоры.

*ліпень 1989 г.*

# КОЖНЫ МАЕ СЦЕЖКУ

Кожны мае сцежку, і святы і грэшны, –
Свой адзін-адзіны Млечны Шлях,
Па якой нясе ён крыж цяжкі, спрадвечны:
Мы на гэтым свеце – у гасцях.

У гасцях хоць добра, кажуць лепей дома,
Ды ніхто не сніць пра вечны дом.
Прыйдзе сейбіт з поля – валіцца ад стомы,
Заўтра зноў, ледзь свет, ён за сялом.

Густаруннай нівай, росамі абмытай,
Радуецца шчыра, як дзіця...
Паміраць збярэцца – будзе сеяць жыта.
Ці не ў гэтым моц і сэнс жыцця?

*чэрвень 1983 г.*

* * *

Выйшлі з гадоў адзічэлых,
Нібы з пракураных хатаў.
Дыхаць крыху палягчэла:
Подых Вясны вінаваты.

Весні прыход мы прыспешым
Па запавеце Купалы.
Стала ў Бары нашых песень
Меней прасекаў-прагалаў.

Часу шалёнага беды,
Трэскі шальмоўства, абману
Змыем у чорную бездань
Бурным патокам вясняным.

*сакавік 1991 г.*

## УЗЫХОДЗІЦЬ ЗАРА

Узыходзіць Зара – абуджаюцца далі,
Песня новага дня льецца вольна ўгару:
Беларусы ідуць пад Крывіцкім штандарам,
Крыгаломна грыміць: – Жыве Беларусь!

Крыгаломна грыміць на Дзвіне і на Нёмне,
Прысягальна ляціць над палынным Дняпром:
– Мы адродзім Цябе пад святою Пагоняй,
Твой народ, Беларусь, адбудуе свой Дом!

Краю наш векавы, Край былінны, курганны,
Прычакаў ты Вясны – ажыўленне, узрух:
Рэкі, нівы, лясы загулі раскавана,
Зазванілі званы: – Жыве Беларусь!

Зазванілі званы – скалыхнуліся долы,
Нібы ў час, як ішлі нашы прадзеды ў бой:
– Нас вядзі, Беларусь, па шчаслівую долю –
Годзе Зорцы Палын навісаць над зямлёй!..

Узыходзіць Зара – абуджаюцца далі,
Песня новага дня льецца вольна ўгару:
Беларусы ідуць пад Крывіцкім штандарам,
Крыгаломна грыміць: – Жыве Беларусь!

*верасень 1991 г.*

## БЕЛ–ЧЫРВОНА–БЕЛЫ

Бел-чырвона-белы наш адвечны сцяг
З небыцця, як птушка з выраю, вярнуўся
Дабрыні на радасць, сіле злой на страх,
На дзяржаўны гонар Маці-Беларусі.

На руках адданых, мужных змагароў
Вырваўся ён з пекла здзеку і прымусу,
Запаліў у сэрцы Памяць і Любоў,
Асвяціў дарогу Волі беларусам.

Пазіраю ў неба – ясніцца яно:
Гэта сцяг наш родны палымнее горда,
Пасвятлела ў хаце змрочнае акно –
Адступае цемра ад майго народа.

*кастрычнік 1991 г.*

* * *

Бяжыць агонь – не азірнецца –
Па полі з леташняй травою.
Гарыць трава, а мне здаецца,
Што нехта рупнаю рукою

Запалку чыркнуў смелай праўды,
Каб абярнуўся ў дым паганскі
Быльнёг адступніцтва і здрады,
Палын прыніжанасці рабскай.

Бяжыць агонь даўгачаканы,
Каб тут, на гэтай ніве горкай
Закрасаваў аднойчы ранак
Пасевам годнасці высокай.

*люты 1982 г.*

# У ЧАКАННІ МУЗЫКІ

У чаканні музыкі жаданай
І вятры прыціхлі – не гудуць,
Бел-чырвона-белыя штандары
Узняліся – неба сцерагуць.

Уздыхнуць узрушана цымбалы
І жалейкі з гуслямі ў цішы,
Адгукнуцца думамі Купалы,
Роднымі напевамі ў душы.

Музыка, нам дадзеная Богам,
У прыстылых венах забруіць,
Зашуміць спрадвечным шчырым борам,
Галасамі продкаў зазвініць.

Здзівім свет мелодыяй чароўнай,
На сябе ў здзіўленні паглядзім,
Што умеем плакаць мы па-свойму
І смяяцца голасам сваім.

Выйдзем з нематы, нібы з цямніцы,
Разагнемся, пойдзем ва ўвесь рост,
Запалае сэрца – разгарыцца
Вечным гордым Znічам: мы – Народ!

*ыверасень 1991 г.*

* * *

Мо дзіўны сон мой вінаваты?
Чым так узрушана душа?
Мне сонца снілася з-за кратаў, –
Як Боскі лік, праменны шар.

У сны не веру – праўдзяць рэдка,
Але усё ж, усё ж, усё ж...
З-за кратаў сонца – ці не вестка,
Што распачнецца гнеўны дождж.

Запаласуюць бліскавіцы,
І загрукочуць перуны,
І势 стануць грэшнікі маліцца,
Прасіць ратунку груганы.

Ды будзе позна – ўтоне злое,
І паплыве ў патопе тым
Каўчэгам Ноевым святое,
А сонца – німбам па-над ім.

*ліпень 1993 г.*

* * *

Мы сонныя сталі, счарнелыя
Ад гора – то войны, то стронцый...
Прачнуцца ці здолеем белымі,
Ці ўбачым вясёлае сонца?

Праб’ем разняволеным розумам
Шкарлубку няпамяці крайняй?
Мы – людзі, мы ў Бога – не розныя,
Хто выдумаў класы ды кланы?

Хто вызначыў, “мудры, настойлівы”,
Пасаду старэйшага брата?
На белыя плямы гісторыі
Спускаецца цень Курапатаў.

Нам хочацца чыстага, светлага,
І цягнемся крыламі ўгору,
Працятыя думкай паэтавай:
Ляцім мы ўсе разам да зораў.

*кастрычнік 1994 г.*

* * *

У цёплыя норы забіліся
Паўзучыя гады і лісы –
Даволі за век наглуміліся
З крывёю нявінных на пысах.

Не каркаюць хітрыя вораны,
Паўзвыюць ваўкі ды – у логавы...
Што гэта? Спакой нам падораны,
Ці бітвы пачатак бяскроўны?

Што здарыцца з намі, не ведаю,
Ды страшнае ёсць прадчуванне,
Што страцім мы штось запаветнае
І сэрцы глыбока паранім.

Ці лёгка нам будзе іх вылечыць?
А можа зусім немагчыма?
Што хочуць сказаць нам і выплакаць
Самотныя вочы Айчыны?

*красавік 1994 г.*

* * *

Без соку дрэва чахне
Над парасткам нясмелым.
Пяюць чужыя птахі
У голлі адранцвелым.

Свае ж бяздумна скачуць
Пад дудку-спакусніцу,
Калі ім ёсць паплакаць,
Калі ім пажурыцца?

Калі паіць карэнне,
Засмяглае гадамі? –
Як д'ябал, ачмурэнне
Душою заўладала.

А вольны дух прарочыць,
Не ведаючы страху:
У вырай незваротны
Злятуць чужыя птахі,

Напоўняцца крыніцы,
Угору пойдуць сокі –
І сад разгалініцца
Шырока і высока.

*снежань 1990 г.*

# КУРАПАЦКІЯ СОСНЫ ШУМЯЦЬ

Многатысячных рук калыханне,
Вусача ўдратаваны партрэт...
"Злыдням-катам няма даравання, –
Праўда судзіць – чуваць на ўвесь свет, –

Годзе страху гарбаціць нам плечы,
Вырываць і сушыць карані,
Мы ачысцім наш край векавечны
Ад гайні бездухоўя, хлусні!.."

Помста сыкае злосна ў засадзе
І рыхтуе рысіны скачок:
"Курапаты вам новыя зладзім,
Пакладзем на магільны пясок..."

Сыкай-сыкай ты, чорная помста,
І за ўласныя локці кусай,
Вар'яцей, можа, лопнеш ад злосці –
Атрымаеш заслужаны рай.

*кастрычнік 1989 г.*

## НЕСЦІХАНАЯ ТРЫВОГА

Ці лятаю ў светлых марах,
Ці іду ў мальбе да Бога,
У душы маёй пажарам –
Несціханая трывога.

Што з зямлёю роднай стала?
Колькі душ падшыта чортам!
Людзі-цені пад забралам,
Незлічона масак чорных.

Не хавайце жорсткіх твараў,
Воч бязлітасна-суровых –
Я вас бачу, янычары,
Вы ўчынілі глум над мовай.

Адњялі святло святое,
Што свяціла нам спрадвеку.
Як жа вытрымаць такое!
Не даруем вам за здзекі.

Праклянуць вас нашы дзеці
За змялелыя крыніцы,
Ад суда знямелых сэрцаў
Вам нічым не адкупіцца!

*ліcтапад 1995 г.*

# КРУМКАЧЫ

Ёсць такіх нямала, знаю,
З крумкачынаю павадкай:
Хітрым крумканнем даймаюць:
– Мы гарой – за праўду-матку!

Больш за ўсіх крычаць: – Панішчым
Бездухоўе і бяздушша!
Галасуюць, пішуць-свішчуць,
Словы праўды мужнай глушаць.

Падаюць наверх даклады:
– Беспраблемна ў нашым краі,
З роднай школаю – парадак
І двухмоўе расцвітае.

Падтрыманы талент рэдкі,
Бесталанны – з трэскам з крэсла,
П'янства знішчана, банкеты –
Дзён былых дрыгва і плесня...

Свет наіўна-дабрачынны
Крумкачамі ашуканы,
А яны за свой учынак
Медалямі абчапаны.

*кастрычнік 1991 г.*

## АДРАЧЭНЦУ

Ад мовы матчынай адрокся –
Ці ты ўжо сын сваёй зямлі?
Твае жыццёвыя палосы
Травой курганнай параслі.

Сябе самога ты забойца:
Забіў душу сваю – о жах! –
Ні ясных зораў, ані сонца,
Ні поля ў важкіх каласах.

Ні песень жніўных, ні купальскіх,
Ні казак-быляў, ані-ні –
Таго, што з матчынае ласкі
Ўзрасціла нашы карані.

Усё прапала: вера, вернасць,
Дзядоў магілы, родны кут...
Няма на макавае зерне
Ні ўцехі шчырай, ні пакут.

Адна турбота: як кішэні
Набіць тужэй, сабраць вяршкі...
Няўжо не чуеш, адрачэнец,
Твой прад Айчынай грэх які?

*верасень 1991 г.*

## ДАВОЛІ !

Фізічна-духоўны Чарнобыль
Павесіў на плечы нам торбы –
Жабруем і хлеба, і волі
На шчодрым матуліным полі.
Ой, злітуйся, Божа, над намі,
Няўжо і памром жабракамі!

Аж неба чарнее ад гора,
Як злыдні дратуюць прасторы –
Рвуць з коранем колас жытнёвы
Гісторыі нашай і мовы –
І хочацца крыкнуць пачварам:
– Прэч з нівы святой, янычары!

У наступе грозным манкурты, –
Нібы ў кайданы мы закуты,
Трываем знявагу-глумленне
Няпомнячых роду і племя –
І крык вырываецца болем:
– Даволі трываць нам, даволі!

*верасень 1995 г.*

## БЕЛАРУСКІЯ ЗВАНЫ

Дзе ты, ахоўнік-анёл,
Наш белакрылы? –
Страшныя цені наўкол
Нас аблажылі.

Сняцца жахлівыя сны,
Як перад сконам...
Звонка званіце, званы,
Клічце анёла!

Скрозь курганы, скрозь палыны,
Горкія рэкі, крыніцы...
Біце, званы, біце, званы,
Край наш будзіце!

Ганьбіць разгул сатаны
Нашы святыні...
Моцна званіце, званы,
Біце няспынна!

Топчуць, ірвуць груганы
Наша карэнне...
Гучна званіце, званы,
Клічце збавенне!..

Скрозь курганы, скрозь палыны,
Горкія рэкі, крыніцы...
Біце, званы, біце, званы,
Край наш будзіце!

*жнівень 1999 г.*

## ВОГНІШЧЫ ПРАЎДЫ

Цяжка, ды няможна
Жыць нам не трывожна,
Не ўзнімаць дарожны
Пыл і дым ад вогнішч.

Вогнішчамі праўды
Мы з табой павінны,
Хай праз боль і страты,
Растапіць ільдзіны:

Люду распавесці,
Што з ім можа стацца,
Калі Слова звесці,
Страціць Песні Маці.

Каб людзьмі застацца,
Што рабіць нам варта?..
Сёння згуртавацца,
Позна будзе заўтра:

Цемра-ноч атуліць –
Ашалелым гуртам
Белы край здратуюць
Здрайцы і манкурты...

Цяжка, ды няможна
Жыць нам не трывожна,
Не ўзнімаць дарожны
Пыл і дым ад вогнішч.

*кастрычнік 1988 г.*

# РАТУЙЦЕ РОДНЫ ДОМ, СЫНЫ!

Па краі гойсае гайня
Навалы злой: сваёй і чужазброднай –
Аж стогне матухна-зямля,
Заве сыноў пад Сцяг святы з Пагоняй:

– Ратуйце родны дом, сыны,
Ад сатанінскай грознай хмары –
Ударце ў звонкія званы,
Узвейце вольныя штандары!

Я нарадзіла вас, каб жыць,
Быць вольнымі, як птахі ў паднябессі,
Ад злыдняў Волю бараніць,
Як гонар свой і Бацькаўшчыны песні.

Я нарадзіла вас, каб жыць
І лёс тварыць па запаведзях Божых,
Прад сатаной не падаць ніц –
Перамагаць і славу продкаў множыць...

Ратуйце родны дом, сыны,
Ад сатанінскай грознай хмары –
Ударце ў звонкія званы,
Узвейце вольныя штандары!

*верасень 1999 г.*

# ДАЙ МНЕ, БОЖА, ВОЛЮ!

Хто маўчыць – ні слова,
Хто крычыць так нема,
Хто нахмурыў бровы, –
На каго ён гнеўны?

Я маўчу – ні слова,
Я крычу, знямелы,
Я нахмурыў бровы,
На сябе я гнеўны.

Людзі ўсе, як людзі, –
Фін, француз, японец –
Вольны сцяг галубяць,
Дом свой шчасцем поўняць.

На сябе крыўдую,
На сваю нядолю,
У Хрыста прашу я:
– Дай мне, Божа, волю!

Дай мне, Божа, волю,
Дай навек, святую, –
Для шчаслівай долі
Дом свой адбудую!

*верасень 1995 г.*

* * *

– Куды ты, Шчасце?
Сядзела б дома.
Нашто шукаці
Вятроў і грому.

– Мне дома сумна,
Мне дома цесна:
Ірвуцца струны
І моўкне песня.

Пайду па свеце
З сяброўкай Марай.
Зазвоніць вецер
На струнах-чарах.

А гром у бубен
Ударыць звычна,
Паўсвету ўзбудзіць,
У круг пакліча.

У карагодзе
Спадзе трывога...
Ну, хлопцы, годзе!
Пара ў дарогу.

Назад вярнуся,
Як дом абвесціць:
"Тужу па гуслях,
Па роднай песні!"

*кастрычнік 1987 г.*

# ЦІ ВАРТА!

Ці варта, мой сябра, на свет наракаць,
Што столькі даводзіцца нам бедаваць! –
Карэнне ўсіх бедаў у нас у саміх,
Паможа нам Неба пазбыцца ад іх.

Давай малітоўна ў Нябёсы глядзець
І бачыць у зорах свой заўтрашні дзень –
Настроім пачуцці і думы свае
На хвалю, якую сам Бог нам дае.

Давай узнімацца ў нябесны прастор
На крылах мелодыі сонца і зор!

Услухайся, дружа, як Неба звініць,
Анёльскую музыку лье ў цішыні,
Разносіць па свеце святую любоў,
Шукаючы новых адданых сяброў.

Зірні, як лунаюць буслы над зямлёй,
Вось так бы зрадніцца і нам з вышынёй!
Давай не стамляцца сябе акрыляць –
Шчаслівую зорку ў Нябёсах шукаць!

Давай узнімацца ў нябесны прастор
На крылах мелодыі сонца і зор!

*студзень 1999 г.*

# ЧОРНАЯ ПТУШКА

Чорная птушка ляцела,
Каркнула ў змрочнай цішы:
"Болей атручана цела –
Болей здароўя ў душы!..

Матчына свечка трымцела:
"Божа магутны, прашу,
Выратуй нашае цела,
Гора ўратуе душу".

Мама, ты верыш у цуда,
Бачыш праз памяць вайны:
Збавяцца людзі ад бруду –
Здрады, распусты, маны?

Цяжкага часу хваробы
Снегам растануць, згараць:
Чорнае гора – Чарнобыль
Лекарам можа нам стаць?..

Чорная птушка ляцела,
Каркнула ў змрочнай цішы:
"Болей атручана цела –
Болей здароўя ў душы!.

*ліпень 1989 г.*

# ЖАЛЕЙКА ЗАЙГРАЛА

Зямля беларуская ў горы застыла,
Ссівелай матуляй глядзіць на прасторы:
Разбітыя сцены спрадвечных святыняў,
Разліты Чарнобыль атрутлівым морам.

Пакутніца наша – зямелька святая,
Ты з гора заўсёды выходзіць умела...
Надзея ўзыходзіць зарою над краем –
Не ўсё, дзякуй Богу, аглухла-знямела.

Гукаю ў змярцвелым гаі салавейку –
І чуецца песня яго, ледзь жывая...
Тады я прыпомніў, што недзе ў куфэрку
Жалейка старая – ад прадзеда маю.

Жалейка зайграла, малітваю стала:
– Дай сілы нам, Божа, адолець пакуты,
Вярні нам усё, што няшчасце забрала,
Зрабі Беларусь несмяротна-магутнай!

*травень 1987 г.*

## ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ МАІХ

Зямля атручана, зямля знявечана –
Палыннай Зоркаю прастор гарыць...
Старонка бедная, трывога вечная,
Дзе мне знайсці табе жывых крыніц?

Дзе мне знайсці табе, мая гаротная,
На раны цяжкія гаючых траў?
Глыбока ранена душа народная.
За што нас, Божа, гэтак пакараў?

Зямля бацькоў маіх, дзядоў і прадзедаў,
Люблю я твой прастор, як весні дзень,
Нясу твой сум і боль з суровай праўдаю,
А думкі кружацца ў святле надзей:

Мы ў Памяць вернемся дарогай вечнасці,
Збяромся ўсёй сям'ёй пад родны дах,
І Ефрасінін Крыж дадому вернецца,
Навек асвеціць нам у Заўтра шлях.

З нябыту вернецца і Сцяг з Пагоняю –
Мы дачакаемся сваёй Вясны:
Паветра вольнага і слова роднага,
Жывых крыніц і шчодрай баразны...

Зямля бацькоў маіх, дзядоў і прадзедаў,
Люблю я твой прастор, як весні дзень,
Нясу твой сум і боль з суровай праўдаю,
А думкі кружацца ў святле надзей.

*кастрычнік 1997 г.*

# ВЕРЫЦЦА Ў СВЕТЛАЕ

Летняя ночка на ўзлессе кладзецца
Іскрамі вогнішча, кроплямі рос.
Мы прыціскаем з табою да сэрца
Лёгкія постаці белых бяроз.

Тут адчуваем мы еднасць з Прыродай,
З духам язычніцкіх вольных часоў:
Хто мы, адкуль і якой мы пароды?
Прыпамінаем паганскіх Багоў.

Знічкі Сварога лятуць і згараюць,
Наш карагод чарадзейна звініць.
А навакол ваўкалюдныя зграі
Муцяць ваду нашых чыстых крыніц.

Верыцца ў светлае – зграі разгонім,
Вольна ўзлятуць нашы песні да зор,
Кінем у вогнішча злое-старое,
Пойдзем па кветку чароўную ў бор.

*ліпень 1995 г.*

* * *

Веру ў сілу-моц падковы.
Мне б скаваць яе на шчасце
З песень добрых, светлых словаў,
Што, як дар, прыняў ад маці.

Каб яна звінела небам,
Вышынёю жаўруковай,
Пахла кветкамі і хлебам, –
Прагну гэткае падковы.

Да вугла прыб'ю, каб хата
Не спазнала духу злога:
Вокны – з клопату пра Заўтра,
Сцены – з памяці Былога.

А падмурак – з камянёў тых,
Што завем душой, сумленнем,
З несціханае турботы
Пра адвечнае карэнне...

*ліпень 1983 г.*

## РЫСАКІ – МАЕ ГАДЫ

Ой, куды вы так, куды,
Рысакі – мае гады,
Шляхам звіліста-разбітым?
Аж заходзіцца душа –
Там, наперадзе, мяжа,
За якою змрок нябыту.

Рысакі – мае гады,
Не ляціце ў нікуды,
На зямлі няўжо зацесна?
Хто ж тады, скажыце мне,
Даспявае за мяне,
Даснуе лятункі-песні?

Рысакі – мае гады,
Не ляціце ў нікуды,
Мала вам зямной сцяжыны?
Хто ж тады, скажыце мне,
Хто далюбіць за мяне
Вочы сумныя Айчыны?

Ой, куды вы так, куды,
Рысакі – мае гады,
Шляхам звіліста-разбітым?
Аж заходзіцца душа –
Там, наперадзе, мяжа,
За якою змрок нябыту.

*верасень 1996 г.*

* * *

Бору шчыры, бору светлы,
Накувай зязюлькай шэрай:
Колькі зімаў, колькі летаў
Мне яшчэ жыццё адмерыць?

Колькі быць наканавана
Мне ў палоне згадак юных:
Косы русыя каханай –
Над бярозкай промні-струны.

Мне яны шляхі прарочаць,
Цешаць музыкай надзеі,
Што з дарог прамых не збочу
Ні ў спякоту, ні ў завею.

Узляту не раз высока
У душэўным узрушэнні
Закаханым жаваронкам,
Апяю тваё карэнне.

Засланю цябе ад ветру,
Нагавораў, недаверу...
Бору шчыры, бору светлы,
Закувай зязюлькай шэрай!

А калі раптоўна ў буру
Упаду з крылом зламаным,
Прытулі мяне, мой бору,
Пад бярозкаю курганнай!

*чэрвень 1993 г.*

* * *

Гібеюць помнікі без рэстаўрацыі –
На сценах трэшчыны... і на душы.
Няма гісторыі – няма і нацыі,
Камусьці хочацца, каб я не жыў.

Камусьці выгадна, каб я адмовіўся
Ад мовы матчынай, ад казак-сноў,
Каб сохнуў, згорблены душой бязмоўнаю,
Жыўцом адлучаны ад каранёў.

Таго не ведаюць, што я не страчаны:
Іду, абуджаны, – мой дух не знік,
Праз пыл чарнобыльскі сябе убачыў я,
Пачуў нявольніцкі свой немы крык.

Іду пакутліва, іду напружана
У зону чыстую, на востраў той,
Дзе можна выстаяць, хоць і акружаны
Бядою страшнаю і сілай злой.

Іду наперад я – назад вяртаюся
У нетры Памяці: адкуль мы, хто?
Ускрылім некалі мы ў Неба яснае
З гары гісторыі сваёй крутой.

*верасень 1988 г.*

* * *

Бог белы з чорным
Ваюе ўпарта
За наша Ўчора,
За наша Заўтра...

Сышліся мужнасць
І зло-навала.
Каму адужаць
Наканавана?

Бог белы моцны
Любоўю, праўдай...
Бог чорны грозны
Манocc, здрадай...

Любоў і праўда
Спрадвеку б'юцца
З маной і здрадай
І не хіснуцца.

Аднойчы змусяць
Прызнаць свет цэлы:
На Беларусі
Адзін Бог белы.

*люты 1987 г.*

## МАЛІТВА ЗА БЕЛАРУСЬ

Божа, молім Цябе: не пакінь у Бядзе,
Загаі нам глыбокія раны –
Чарнабыл, чорны пыл, нібы град, нас пабіў –
Мы самімі сабой пакараны.

Божа наш дарагі, адпусці нам грахі,
Асвяці пуцявіну крутую –
Уратуй Беларусь, блаславі Беларусь –
Нашу Маці святую!

Божа, што з намі, што? – самі нішчым свой Дом:
Час каменне збіраць – раскідаем,
Час душу ратаваць, сцежку ў Храм пракладаць –
Мы сцягі нашы з Неба зрываем.

Божа, не прызямлі, да Нябёс прытулі,
Дай нам зорнага ўзлёту натхнення,
Дай праз Боль і Любоў полем слаўных дзядоў
Нам дайсці да свайго Ўваскрашэння...

Божа наш дарагі, адпусці нам грахі,
Асвяці пуцявіну крутую –
Уратуй Беларусь, блаславі Беларусь –
Нашу Маці святую!

*верасень 1995 г.*

## ЗМЕСТ

Трыялет ..... 8
Зямля мая ..... 9

**ЗОРКА ПАЛЫН, араторыя** ..... 10
Узняўся белы птах ..... 12
Шляхам палыновым ..... 13
Зорка Палын ..... 13
Знямелі салаўі ..... 14
Даруй, зямля мая ..... 15
Мая князёўна ..... 16
Споведзь збуджанага ..... 17
Божа, малітву паслухай ..... 18
Малітва ..... 19
Курганы ..... 20

**ДАРОГА-СЦЯЖЫНА МАТУЛІ І СЫНА**
**Кантата** ..... 21
Матчына благаславенне ..... 22
Праводзіны ..... 23
Язмін цвіце ..... 24
Едзь, сыночак, з Богам ..... 24
Зборы ў дарогу ..... 26
Гэй, вандроўнік-месяц ..... 27
Да цябе вяртаюся ..... 28
Там ..... 28
Матчына трывога ..... 30
Не ўглядайся так, матуля ..... 31
Не трывож ..... 32
Разбудзі мяне, матуля ..... 33
Дзякуй, матуля ..... 34
Я веру, сыночак ..... 35
Бывайце ..... 36
"Не спяваем, што нам песні..." ..... 37

## БАЦЬКОЎСКІ КРАЙ

**песенны альбом** ........................ 38
Не сумуй, матуля ........................ 39
Спатканне ........................ 40
Бацькоўскі край ........................ 41
Балада ........................ 42
Гаю мой, не кліч ........................ 43
Калыханка ........................ 43
Браслаўская чайка ........................ 45
Застольная ........................ 46
Грай, Багрыме ........................ 47
Поле горкіх палыноў ........................ 48
Чарадзейная птушка ........................ 49
А ты кажаш: вясна ........................ 50
Лета ........................ 51
Заспявай мне песню, крывічанка ........................ 52
Развітальны вальс ........................ 53
Гімн Бацькаўшчыне ........................ 54

## МЕЛОДЫЯ СЭРЦА

**песенны альбом** ........................ 55
Не спяшайся, восень ........................ 56
Палачаначка-князёўна ........................ 57
Мелодыя сэрца ........................ 58
Зараніцы ........................ 59
Светлячок ........................ 60
Не кувай, зязюленька ........................ 61
Лецейка, бывай! ........................ 62
Рэха жураўлінае ........................ 63
Ой, зіма, зіма ........................ 64
Наша рэчанька ........................ 65
Твіст ........................ 66
Азярцо ........................ 67
Не курлыкай ........................ 68
Летуценніца ........................ 69

Незабыўная мая ........ 70
Божая кароўка ........ 71
Песня пра Мінск ........ 72
Адпраўляўся хлопец на чужыну ........ 73
Агні залатыя ........ 74

**МІЛАЯ СПАДАРЫНЯ**
**песенны альбом** ........ 75
Цішыя звінела ........ 76
Рака кахання ........ 77
Да сузор'я Лебедзь ........ 78
Мілая спадарыня ........ 79
Белая лілея ........ 80
Для цябе адной ........ 81
Беласнежка ........ 82
Ты пачуй мяне ........ 83
Мы адны з табой на свеце ........ 84
Алёна-Алёнка ........ 85
Ты толькі ўслухайся, Алеся ........ 86
Ай ды жоначку я маю ........ 87
Ой, ляці зязюленька ........ 88
Акіян жыцця ........ 89
Дарога да неба ........ 90
Кахання лівень ........ 91
Беражанка-ластаўка ........ 92
Цяжка саду без зязюлі ........ 93
Клён з таполяю ........ 94

**ЛІТВІНАЧКА**
**песенны альбом** ........ 95
Прыдзі з чароўных сноў ........ 97
Гусі-лебедзі ........ 98
Навасельная ........ 99
Русалка ........ 100
Браслаўчанка ........ 101

Нас вянчалі анёлы ........ 102
Ой, ляці, казачанька ........ 103
Пажадай мне, мама ........ 104
Літвіначка ........ 105
Нарач ........ 106
Рыбка залатая ........ 107
Рэчка-рэчанька ........ 108
Эх, вазьму я дудку ........ 109
Голуб галубку цалуе ........ 110
Асяніны ........ 111
Ад панядзелка да панядзелка ........ 112
Дзе ж вы, маладыя дзянькі ........ 113
Дружа, не сумуй ........ 114
Бывай, дваццаты век ........ 115

**ПТУШЫНЫ КІРМАШ**
**дзіцячая музычная казка** ........ 116
Песня-уступ ........ 117
Песня Жаўрука ........ 118
Песня Вераб'я ........ 119
Песня Сарокі ........ 120
Песня Вароны і варанят ........ 121
Песня Індыка ........ 122
Песня Глушца ........ 123
Песня Жураўля ........ 124
Песня Дзятла ........ 125
Другая песня Жаўрука ........ 126
Песня-фінал ........ 127

**НЯБЕСНЫ РАЯЛЬ**
**песенны альбом** ........ 128
Флейта ........ 129
Клавесін і габой ........ 130
Скрыпачка-багіня ........ 131
Нябесны раяль ........ 132

Гавайская гітара ........ 133
Арфа ........ 134
Губны гармонік ........ 135
Мандаліна ........ 136
Акарына ........ 137
Цымбалы ........ 138
Віяланчэль ........ 139
Жалейка ........ 140
Гармонік ........ 141
Анёльскі арган ........ 142
Трамбон ........ 143
Ліра ........ 144
Валторна і фагот ........ 145
Туба ........ 146

**КРУЖЫЦЦА МЕСЯЦ З ЗАРАНКАЙ**
**абразкі з народнага жыцця** ........ 147
Каляда ........ 148
Новы год ........ 149
Гуканне вясны ........ 150
Валачобнікі ........ 151
Радаўніца ........ 152
Вясна і каханне ........ 153
Кветка купальная ........ 154
О мой месяц ........ 155
Крывічаначка-купаліначка ........ 156
Сенакосная пара ........ 157
Ты пастой, дзяўчынка ........ 158
Ты прыедзь, не спазніся ........ 159
Месячная ночка ........ 160
Дажынкі ........ 161
Кладачка ........ 162
Красуня і дзівак ........ 163
Дочачка мая, не журыся ........ 164
Ой, мая ты ластаўка ........ 165

Яблычны Спас .......... 166
Сёння ў нас вяселле .......... 167
Адвіхрылася вяселле .......... 168
Бярозка .......... 169
Добра будзе – накрасуешся .......... 170
Ой, дзяўчына-капрызуля .......... 171
Плача кветка-дзеўчына .......... 172
Кум і кума .......... 173
Шукае цар царыцы .......... 174
Не вер каню ў дарозе .......... 176
Плача дудачка .......... 177
Ой, вы, крылы-вёслы .......... 179
Сустрэча .......... 180
Я зайздрошчу Васілю .......... 181
Русалачка .......... 182
Трэба жоначцы дагаджаць .......... 183
Гаманіла сяло .......... 184
Рамонкі .......... 185
Дзе ты быў? .......... 186
Ой, чаму ты, Янка .......... 187
Я дзяўчына хоць куды .......... 188
Ягадка мая .......... 189
Ой, сябровачка .......... 190
Не дзівіся, мой сусед .......... 192
Ты не кліч мяне .......... 193
Цешча і зяць .......... 194
Што за звычай гэткі? .......... 195
Зацвіла каліна .......... 197
Годзе, сынку мой! .......... 198
Хлопцы-малойцы .......... 199
Непагода .......... 200
Ой, што дзеецца! .......... 201
Суседкі .......... 202
Прымакі .......... 203
Гара святая і бярозка .......... 204

Чайка белакрылая ........................................................ 206
Спеў карагодны ............................................................ 207
Не трывожся, Марыська! ................................................ 208
Горачка чубатае ............................................................ 209
Ой, сынку! ..................................................................... 210
Ад'яснела заранка-зара .................................................. 211
З добрым мужам – нажывешся ....................................... 212
Вясковая ўдава .............................................................. 213
Адчапіся, барадаты ........................................................ 214
Што мне тыя грошы! ....................................................... 215
Каліна ........................................................................... 216
Каля млына ................................................................... 217
Шуры-муры ................................................................... 218
Як ажэніцца – пераменіцца ............................................ 219
Ой, не чаруй! ................................................................ 220
Хто кахае, той знойдзе ................................................... 221
Беражы, каліна .............................................................. 222
Няхай сабе мужык, як лапаць ......................................... 223
Спелая сунічка .............................................................. 224
Дзе ты, мой харошы? ...................................................... 225
Нашто замуж пытаеш? ................................................... 226
Чараўніца ..................................................................... 227
Дзед мяне вучыў ............................................................ 228
Не сватай мне, мама ...................................................... 229
Чаму ты, хмелю? ............................................................ 230
Не ўтрымаеш сэрца на аброці ......................................... 231
Кумачкі ......................................................................... 232
Дубочак, не хіліся .......................................................... 233
Навіна ........................................................................... 234
Пра што я мару, любы мой ............................................. 235
Скардзіцца суседка ....................................................... 236
Голуб ............................................................................ 237
Не чапай, не заляцайся .................................................. 238
Ой, не стукай! ................................................................ 239
Бывай, каханы! ............................................................. 240

За пасагам не ганіся ........ 241
Калі любіш – ажаніся ........ 242
Мроі бабыля ........ 243
І не сцерпіцца, і не злюбіцца ........ 244
Ой, гады мае, гадочкі! ........ 245
Б'юцца хлопцы ........ 246
Не сварыся, матуля ........ 247
Слёзка-разбітае сэрца ........ 248
Ночка зорыцца ........ 249
Кліча хлопец ........ 250
Не б'е жонкі мужык ........ 251
Ах, Сымоне! ........ 252
Змяніў галубку на саву ........ 253
Князь вялікі ........ 254
Васілёк ........ 255
Раскажу табе я, маці ........ 256
Не верыцца ........ 257
Затужыў хлапчына ........ 258
Насільна люб не будзеш ........ 259

**ПАД ЗОРКАЙ МІЛАВІЦАЙ**
**песенны альбом** ........ 261

Зорная ноч ........ 263
Пад Зоркай Мілавіцай ........ 264
Браслаў ........ 265
Радзіма сніцца ........ 266
Мая Беларусь ........ 267
Купала-Купалле ........ 268
Наш край ........ 269
Ясны гай ........ 270
О Беларусь, цябе як не любіць! ........ 271
Веснавыя ветры ........ 272
Медыцынскія сёстры ........ 273
Маці-Краіна ........ 274
Зорка першая ........ 275

Песня пра Гомель ........................................ 276
Мінск ........................................ 277
Дым расстання ........................................ 278
Канвалія ........................................ 279
Калінавы масточак ........................................ 280

**КВЕТКА НАДЗЕІ**
**песенны альбом** ........................................ 281
Не свяці, бліскавіца ........................................ 282
Я рад, мая Радзіма ........................................ 283
Кветка надзеі ........................................ 284
Мая жураўка ........................................ 285
Свяці мне, зара ........................................ 286
Купальская ........................................ 287
Алёна ........................................ 288
Рэчанька ........................................ 289
Не сумуй, дзяўчына ........................................ 291
Для каго так гараць васількі ........................................ 292
Конь Каліноўскага ........................................ 293
Трубі, турыны рог ........................................ 295
Душа Максімава ........................................ 296
Сон галубкі ........................................ 297
Мілавіца ........................................ 298
Дзіва-край ........................................ 299
Касавіца ........................................ 300

**ЗА МАЛАДЫХ !**
**песенны альбом** ........................................ 301
Жаўручок, скажы ........................................ 303
Ой, хадзіла я, гуляла ........................................ 304
Кліча сэрца ........................................ 305
Збірайся да шлюбу, дзяўчына ........................................ 306
Замуж выйсці – трэба знаць ........................................ 307
Жывая крыніца ........................................ 308
Сваты ........................................ 308

Заручыны .......... 310
Вяночак .......... 311
Вянчанне .......... 311
Выкуп маладой .......... 312
Пасад .......... 314
Вяселле віруе .......... 315
За маладых! .......... 316
Танец для маладых .......... 317
Ай ды полька .......... 318
Песня бабыля .......... 319
Бацькоўскае блаславенне маладым .......... 321
Каравай .......... 322
Полька з прыпеўкамі .......... 323
Эх, вяселле! .......... 324
Аглаблёвая .......... 325
Вясельны звон .......... 327

**НА КРЫЛАХ МЕЛОДЫІ**
**песенны альбом** .......... 328
Ружовы верас .......... 329
Танга сустрэчы .......... 330
Гімн музея “Менка” .......... 331
Жураўкі .......... 332
Яблычак румяны .......... 333
Любаншчына – край любові вечнай .......... 334
Вішанька-дзяўчынка .......... 335
Блаславенне .......... 336
Дзень добры, Случчына мая! .......... 337
Вяртанне .......... 338
Песню бярыце з сабою .......... 339
Мамін дзень .......... 340
Выйдзі на сустрэчу .......... 341
Ты вясною мяне нарадзіла .......... 342
Калыханка .......... 343
Дзяўчынка-знічка .......... 344

Ой, нясі, мой косю! ........ 345
Блакітная галінка ........ 346
Расцвіло каханне ........ 347
Браслаўшчына – песня веснавая ........ 348

**ПАД СУЗОР'ЕМ КАХАННЯ** ........ 349
Беларусачка ........ 351
Берагіня ........ 352
Вішанька-чарэшанька ........ 353
Мы ляцім з табою ........ 354
Гусіным Шляхам ........ 355
Белая чаіца ........ 356
Аксінніца ........ 357
Зоры нас вянчалі ........ 358
Я магутны табой ........ 359
Глянь, мая родная ........ 360
Купалле ........ 361
Вішанька ........ 362
Бэзавая раніца ........ 363
Маладыя напевы ........ 364
Коні – вёсны маладыя ........ 365
Вясельных бомаў звон ........ 366
Пралесачка лясная ........ 367
Пад сузор'ем Кахання ........ 368
Ночка зорная купала ........ 369
Чароўны ўспамін ........ 370
Лісты каханай ........ 371
Заспявай, купалінка, мне песню ........ 372
Белая чаромха ........ 373
Танец расстання ........ 374
Мая планіда ........ 375
Зязюля ........ 376
Каб ты знала, каб ты ведала ........ 377
Світалінка ........ 378
Разлілася шырока Бярэзіна ........ 379

Жураўліны адчай .................................................. 380
Не плач, каханая .................................................. 381
Ты кахала мяне .................................................. 382
Імчыць вяселле .................................................. 383
Зоры юнацтва .................................................. 384
Язмінавы сад .................................................. 385
Помню .................................................. 386
Вешчыя сны .................................................. 387
Лебедзь белы .................................................. 388
Светлыя згадкі .................................................. 389
Эдэльвейс .................................................. 390
Не трывожся, мілая .................................................. 391
Вераніка .................................................. 392
Белы ветразь .................................................. 393
Што будзе потым? .................................................. 394
Мая красуня гарадская .................................................. 395
Будуем дом .................................................. 396
Слёзы расстання .................................................. 397
Лістапад .................................................. 398
Зорка шчаслівая .................................................. 399
Мара .................................................. 400
Ядвісенька .................................................. 401
Сакавік .................................................. 402
Анёл мой .................................................. 403
Не іграй так сумна .................................................. 404
Купалялё .................................................. 405
Ты была калісьці .................................................. 406
Імклівая лыжня .................................................. 407
Садзілі сад .................................................. 408
Чаму? .................................................. 409
Васіліна .................................................. 410
Калінавы масток .................................................. 411
Белакрылыя вешчуны .................................................. 412
Здзіўляй, мая чароўная .................................................. 413
Развітанне .................................................. 414

Мая Марыська ........................................ 415
Дзе тое дзіва? ........................................ 416
Наталля ........................................ 417
Начніца-беражніца ........................................ 418
Я не буду сёння дома начаваці ........................................ 419
Цябе губляю ........................................ 420
Дзе ты, Венера Мілоская? ........................................ 421
Твой голас ........................................ 422
Зорка ў жыта ўпала ........................................ 423
Травень ........................................ 424
Галубы ........................................ 425
Зорка Божай таямніцы ........................................ 426
Граюць гулка сурмы ........................................ 427
Незнаёмка-чараўніца ........................................ 428
Святлана ........................................ 429
Калядны снег ........................................ 430
Вясна-красна ........................................ 431
Я блукаю з табою ........................................ 432
Адцвіла канвалія ........................................ 433
Жнівень ........................................ 434
Хтосьці сурочыў ........................................ 435
Сцюардэса ........................................ 436
Мяцеліца ........................................ 437
Адгукніся ........................................ 438
Белы снег ........................................ 439
Я блукаю несупынна ........................................ 440
Дзіяна-Дзіянка ........................................ 441
Ясна панна ........................................ 442
А музыка іграла ........................................ 443
Свеціць месяц ........................................ 444
Я хаджу-блукаю ........................................ 445
Швачка ........................................ 446
Разлівайся, рэчка ........................................ 447
О Танечка, Таня! ........................................ 448
Мяжа расстання ........................................ 449

Не памятай мяне ........................................ 450

**ГУСЛІ МАЕ, НЕ ТУЖЫЦЕ** ........................ 451
Цябе вітаю ........................................ 452
Сны вяшчуюць ........................................ 453
Музыка ........................................ 454
Плыву ........................................ 455
Скачы, мой гнеды ........................................ 456
“Незваротнае страціў...” ........................................ 457
Агеньчык ........................................ 458
Яйка велікоднае ........................................ 459
Вераб’іная ноч ........................................ 460
Сенакос ........................................ 461
Хлеб ........................................ 462
Кавалі ........................................ 463
Яблынька мая ........................................ 464
Кася, Касенька ........................................ 465
Ніколі ........................................ 466
Каля вечнага Агню ........................................ 467
Балада пра сала’іную тугу ........................................ 468
Балада пра салдата ........................................ 469
Балада пра хлопчыка ........................................ 470
Пад кронамі бяссмерця ........................................ 471
Дзед і яго казка ........................................ 472
“Пагас мой дзядзька...” ........................................ 473
Навальніца ........................................ 474
Сляпая ........................................ 475
Мядзведзіца ........................................ 476
Сіняя птушка ........................................ 477
Час ........................................ 478
Зімовы сон сяла ........................................ 479
Здарэнне на возеры ........................................ 480
Бабка-рыбачка ........................................ 481
Каралева Браслаўскіх азёр ........................................ 482
Вяшчуння-званіца ........................................ 483

Дзве Маці Святыя ........................................ 484
Хрыстос уваскрос! ........................................ 485
Недзе там ........................................ 486
Малітва ........................................ 487
Крыж Ефрасінні ........................................ 488
Санет ........................................ 489
Будслаўская Божая Маці ........................................ 490
Варшава ........................................ 491
То не мора шуміць ........................................ 492
Трыялет ........................................ 493
Гусляры ........................................ 494
Трыялет ........................................ 495
Гусолькі-гуслі ........................................ 496
Максімава Крыніца ........................................ 497
Блукаю па свеце ........................................ 498
Гімн клуба "Спадчына" ........................................ 499
Спатканне Геніюш з Арсеневай у музеі "Спадчына" .... 500
І ты Паэт ........................................ 501
Беларус я, крывіч ........................................ 502
Рагнеда ........................................ 503
Карона князя Міндоўга ........................................ 504
Эмілія Плятэр ........................................ 505
"На замчышчы здані..." ........................................ 506
У вянок песнярам ........................................ 507
Салавейка заморскі ........................................ 508
Суайчыннікам замежжа ........................................ 509
Слаўся, наш музей над Менкай! ........................................ 510
Гаспадар ........................................ 511
Музейная ціша ........................................ 512
На радзіме касманаўта ........................................ 513
Кожны мае сцежку ........................................ 514
"Выйшлі з гадоў адзічэлых..." ........................................ 515
Узыходзіць зара ........................................ 516
Бел-чырвона-белы ........................................ 517
"Бяжыць агонь..." ........................................ 518

У чаканні музыкі ... 519
"Мо дзіўны сон мой вінаваты?..." ... 520
"Мы сонныя сталі, счарнелыя..." ... 521
"У цёплыя норы забіліся..." ... 522
"Без соку дрэва чахне..." ... 523
Курапацкія сосны шумяць ... 524
Несціханая трывога ... 525
Крумкачы ... 526
Адрачэнцу ... 527
Даволі ! ... 528
Беларускія званы ... 529
Вогнішчы праўды ... 530
Ратуйце родны дом, сыны! ... 531
Дай мне, Божа, волю! ... 532
"Куды ты, шчасце?..." ... 533
Ці варта? ... 534
Чорная птушка ... 535
Жалейка зайграла ... 536
Зямля бацькоў маіх ... 537
Верыцца ў светлае ... 538
"Веру ў сілу-моц падковы..." ... 539
Рысакі – мае гады ... 540
"Бору шчыры, бору светлы..." ... 541
"Гібеюць помнікі без рэстаўрацыі..." ... 542
"Бог белы з чорным..." ... 543
Малітва за Беларусь ... 544

## Анатацыя

У паэтычнай кнізе прадстаўлены творы аўтара, напісаныя ў розныя гады яго жыцця. Тут вы сустрэнеце вершы пра каханне, пра долю і нядолю нашай Бацькаўшчыны, яе гістарычнае мінулае, пра яе сённяшні дзень.

Многія вершы паэта пакладзены беларускімі кампазітарамі на музыку: Дзмітрыем Даўгалёвым, Мар'янам Пецюкевічам, Міколам Алешкам, Леанідам Захлеўным, Паўлам Ярашэнкам і іншымі.

Створана араторыя "Зорка Палын", кантата "Дарога-сцяжына матулі і сына", дзіцячая музычная казка "Птушыны кірмаш" - музыка Дз. Даўгалева, а таксама - песенны альбом беларускага вяселля "За маладых!" - музыка М. Алешкі.



УЗНЯЎСЯ БЕЛЫ ПТАХ
ПЕСНІ ВЕРШЫ БАЛАДЫ

2004 07 20, 17.625 sąl.sp.l.
Tiražas 500 egz.
Spausdino firma „Jusida"
T. Ševčenkos g. 16, 03111 Vilnius

Уладзімір ПЕЦЮКЕВІЧ

# Узняўся белы птах